Содержание

1. - Содержание -
2. Глава 1: Масква
3. Глава 2: Званок
4. Глава 3: Veni Creator
5. Глава 4: Сустрэча з Богам
6. Глава 5: Каханьне
7. Глава 6: Дзень першы
8. Глава 7: Мешыах
9. Глава 8: Матэра
10. Глава 9: Елена
11. Глава 10: Чалавек
12. Глава 11: Зіма
13. Глава 12: Хрыстас
14. Глава 13: Дзіця
15. Глава 14: Жюсьціна
16. Глава 15: Мілан
17. Глава 16: Споведзь
18. Глава 17: Абуджаньне
19. Глава 18: Душа
20. Глава 19: Горы
21. Глава 20: Грандэ віта
22. Глава 21: Боль
23. Глава 22: Коза ностра
24. Глава 23: Пакуты
25. Глава 24: Дапаможніца
26. Глава 25: Укрыжаваньне
27. Глава 26: Спакуса
28. Глава 27: Цемра
29. Глава 28: Кола
30. Глава 29: Венера
31. Глава 30: Сяброўкі
32. Глава 31: Эра Вадалея
33. Глава 32: Д'ябал

Глава 1: Масква

Сьнег сыпаў за вакном. Вялікія, мокрыя сьняжынкі ліплі да шклу, зрываліся, і вільготнымі камякамі падалі ў туманную бездань - калодзеж, нагадваючы абрыў у скалах, аточаны высокімі шэра-шызымі сьценамі, губляючыміся ў такім жа бяздонным, шэрым небе. Неба было непрагляднае, яно навісла над высоткамі, як цяжкая баваўняная коўдра, успучанае хмарамі, але ж яна ведала – недзе у гэтых хмарах зараз снуюць самалёты – заходзяць на пасадку над вялікім горадам. Яны неяк ляталі сюды на самалёце – бізьнес-клясам, сядзелі наперадзе ўсіх, у прасторным пакойчыку зь мяккімі канапкамі. Ён заўсёды браў бізьнес, таму што ў эканоме не памяшчаўся. Жартаваў:

- Надта доўгія ногі.

Ды яму і бізьнес быў ледзь-ледзь у пору: як цесны дарагі касьцюм.

Яны спыніліся ў нумары на адным зь верхніх паверхаў, дзе намераваліся заставацца яшчэ некалькі дзён, пакуль ня вызваліцца віла Фёдара ў Фларэнцыі, на якой гасьцявалі яго сябры.

- Хутка ўжо паедзеце, - суцяшаў іх ён. – Не хвалюйцеся. Усё будзе добра. Сядзеў, піў віскі ці каньяк, а потым сыходзіў. Ішоў у бар, дзе ужо адзін ці зь некім выпадковым піў водку, якую Міхась на дух не пераносіў.

- Што гэта за напой? – пасьмейваўся ён зь Фёдара. – У яго ж ні смаку, ні колеру, ні паху – нічога няма. Якое ад яго задавальненьне?

- Смак, пах і колер толькі ў бабінай самагонкі, а водка павінна быць такой, як вада. Вогненная. Каб выпіў, і не адчуў, што выпіў.

- А потым не адчуў, як цябе з бару на руках у нумар несьлі. Добра, што я табе нумар аплаціў, а тое б прачнуўся ты недзе ў

мусарках у тых вунь хрушчоўках. Міхась кіўнуў за вакно.

- І як яны тут жывуць – дзіва! – падумалася яму. – Глядзяць звысока на шматпавярховікі, за якімі раськінулася дзікае поле, і ў вус ня дуюць. Яму спачатку было прыкра жыць так, над галовамі астатніх, якія нічым не былі горш за жыхароў моднага “сіті” – ні паходжаньнем, ні адукацыяй. Ды вось – гэтым хмарачосы, а гэтым – поўзаць унізе, пад нагамі, мясіць гразь на разьбітых тратуарах. Ён ніколі ня думаў, што будзе сацыялістам, аднак тут сам для сябе нечакана стаў. Адна справа, калі ты бачыш такое расслаеньне ў Афрыцы ці Індыі – там гэта неяк звыкла, хоць і прыкра таксама, але ж калі такую “індыю” назіраеш за час палёту ад Мінску, тое неяк нават палохае. Аднак людзі тут прымірыліся і з хмарачосамі, і з гразьзю, і зь мітусьнёй і нахабнымі дарагімі “тачкамі” і ня меньш нахабнымі іх уладальнікамі. Кожны жыў сваім жыцьцём – хаваў галаву ў каўнер, і ні аб чым асабліва ня думаў. А калі думаў, то ўслых не казаў. Навошта. Каму казаць? Такім жа небаракам? Хіба яны ня ведаюць?

Калі прыехалі, сэкратарка Фёдара ўжо забраніравала для іх нумар. Яны засяліліся, і ляглі, змучаныя, спаць, а раніцой, пасьнедаўшы, пайшлі прагуляцца па магазінах. Вечарам была сустрэча, і ён купіў сабе цёмна-шэры касьцюм Armani, ёй – некалькі сукенак, упрыгожваньні – простыя, тонкія, зь белага золата, як яна любіла.

Вечарам Фёдар прыйшоў не адзін. Зь ім была высокая, смуглявая дзяўчына ўсходняй зьнешнасьці – Айгуль, з каштанавымі валасамі да плечаў, вузкімі вачыма, падмаляванымі шырокімі стрэлкамі, пухлымі, як у афрыканкі губамі. Апранутая ў нешта амаль адсутнічаючае, з тонкага белага атласу, на нагах – такога ж малочнага колеру басаножкі на высачэзным абцасе, нагадваючым стылет.

- Можна ў якасьці зброі выкарыстоўваць, - падумаў ён, і ўсьміхнуўся, але ж нічога ўслых не сказаў. Работа ў дзяўчыны, напэўна, небясьпечная. Эскорт – заняцьце не для слабых духам і целам. Падкачанае цела Айгуль было загарэлым, пабліскваючым, нібыта шаўковым. Пругкія грудзі пад тонкай тканінай нават ня рухаліся. Пластмасавая лялька, а не

жанчына. Твар яе быў прыгожы, але такі ж застылы, нерухомы. Толькі вочы паварочваліся з боку ў бок, і вусны прыадкрываліся, калі яна нешта казала. Голас у яе быў грамкаваты, візглівы, ды больш часу яна, дзякуй Богу, маўчала.

Летыцыя, сама высокая і стройная, выглядала побач зь ёй дзіцём – маленькай танюткай дзяўчынкай зь белай, празрыстай скурай, якая быццам бы ніколі ня бачыла сонца, яе чорныя валасы, бліскучыя і густыя, роўна падрэзаныя ля таліі, не былі нават і адценены фарбай, на вузкім тварыку з чорнымі, як вугаль бровамі і вейкамі, нафарбаваныя былі толькі вусны – чырвонай, як кроў, памадай, якую яна любіла, ды доўгія вейкі былі ледзь кранутыя тушшу. Яна апранула чорную зь белым сукенку, глыбока, амаль да поясу адкрытую сьперадзі, длінную, за калена, з высокім разрэзам, які быў бачны толкі калі яна садзілася. Яе маленькая ручка з доўгімі пальцамі, з пазногцямі, афарбаванымі празрыстым лакам, трымала танюткі, нібы ільдзяны бакал з шампанскім, якое яна ледзь прыгубіла. Айгуль хутка выпіла адзін бакал, потым яшчэ адзін, трымаючы яго загарэлай рукой з вострымі срэбнымі пазногцямі. На шыі Айгуль віселі грудай упрыгожваньні-медалі з лагатыпамі – Guci, Vecace, Bulgary. Амаль як сапраўдныя. Яна гульліва кранала іх, гледзячы на яго. На Фёдара наогул не глядзела – ён ужо, пэўна, заплаціў.

- А откуда ваша спутница? Давайте, угадаю? – томна вымавіла яна. – Наверное, Татарстан. Или Якутия? Там таких чёрненьких много. Яна паблажліва кранула гладкія, як шоўк, тонкія рыжаватыя валасы.

- У меня свои тоже чёрные. Только я не люблю, как все. Люблю выделяться. Яна з выклікам глянула на Летыцыю.

- Вам дужа пасуе вашая прычоска. Летыцыя нахіліла галаву.

- Мы з Беларусі, карэнныя жыхары. Як у нас кажуць, тутэйшыя. Міхась усьміхнуўся. – Каранёў з Татарстану ці Якуціі не прыпомню. Хаця – хто ведае. Некалькі тысяч год таму, калі адбылося першае вялікае перасяленьне народаў, магчыма што хтосьці з маіх продкаў і прыбыў у Еўропу са ськіфамі, сарматамі

ці кемерыйцамі.

- Мая маці напалову татарка, Айгуль, так што вы правільна здагадаліся. Яна з беларускіх татараў, якія жывуць у нас з пятнаццатага веку. Толькі татарамі іх назваць цяпер складана, бо ж і мова – тутэйшая, і вера - праваслаўная, ці каталікі. Маці і я – з каталікоў. А тата мой габрэй. Яна спакойна вымавіла ўсё гэта, і Айгуль зьдзіўлена глянула на яе. Так адкрыта кажа, што напалову татарка, напалову габрэйка? Дзіўная дзяўчына.

- А мне вы болей нагадваеце італьянку, Летыцыя. Найперш хацеў сказаць – французанку, аднак вы больш вытанчаная, дасканалая ва ўсім, як антычная статуя. Французанкі, яны такія casual, як ускудлачаныя вераб'і. Я такіх не люблю. Люблю дагледжаных жанчын. Фёдар па-апякунску абняў Айгуль за плечы.

- Мая пастаянная спутніца, - вымавіў ён. – Добрая дзяўчына, і прафесіяналка.

Летыцыя зьдзіўлена глянула на яго. Так адкрыта казаць пра сваю жанчыну, што яна зь ім за грошы?

Айгуль жа, здаецца, фраза зусім не кранула. Яна пакорпалася ў залатой сумачцы, выцягнула візітку, і працягнула Міхасю праз стол.

- Вось, трымайце. Можа, калі спатрэблюся. Яна заклікальна ўсьміхнулася.

- Дзякуй, але ж ня трэба. Мы тут у дваіх з жонкай. Ён узьняў руку Летыцыі, і крануў вуснамі пярсьцёнак на яе пальцы. Айгуль імгненьне глядзела на іх, адкрыўшы рот.

- Я думала …, - ціха вымавіла яна. … Извините…, - адчуўшы, як рука Фёдара крэпка сьціснула яе руку.

- Дура грёбаная, - у паўголаса вымавіў ён. – Извините её, Михаил. Вы просто ещё не привыкли к нашим нравам. У нас тут так – что думают, то и говорят. Только не все себе это могут позволить, и иногда напоминать приходится. Об элементарных

манерах. Он яшчэ мацней сьцінуў яе кісьць, так, што Айгуль паморшчылася.

- Это – штраф, красавица. Запомни, и следи за языком.

Летыцыя глядзела на ўсё гэта з жахам. Рука Міхася ззаду лягла на сьпінку крэсла, ахінаючы яе, пагладзіла густыя шаўкавістыя пасмы.

- Вы ведаеце, - нарэшце вымавіла яна. – Для мяне тут усё такое новае, і я ніколі яшчэ не была ў такім шыкоўным месцы, на такім высокім паверсе. Гэта сапраўды ўражвае!

- І я таксама ня быў, сонейка. Я ж і Маскву амаль ня ведаю. Быў калісьці ў юнацтве, ды тое яшчэ ў дзевяностых было. Вы, Айгуль, дык і не нарадзіліся тады.

- Ой, как интересно! А какая была Москва в 90-е? Как вы её помните? – Айгуль, нарэшце, справілася зь нялоўкасьцю, якую адчувала пасьля сваіх словаў. Усё ж, была прафесіяналка. – Расскажите?

- А чаму не? – ён усьміхнуўся. – Такая ж, як зараз. Нічога не зьмянілася, акрамя гэтага “сіті”, і аэрапорт палепшыў. Трошку.

Фёдар рассьмяяўся.

- Вот не в бровь, а в глаз, Михаил Альгердович. Почему мне вас Михалычем назвать всё время хочется?

- Ну, пэўна Альгерд для цябе складанае імя. Гэта табе тэст на цьвярозасьць. Як пачнеш мяне Міхалычам называць, дык усё – піць хопіць.

- Выдатны жарт! – Фёдар усьміхнуўся. – Я дзеля вас мову вывучыў, дык што я, Альгердавіча не запомню?

- За мову мая пашана. А я вось рускі зусім ужо забыў. Праўда. Мне па-ангельску прасьцей. Таму выбачайце, я ўжо буду па-свойму. Як і яна.

- Нічога, мы разумеем. Фёдар кіўнуў.

Айгуль паморшчылася. – Тогда я буду по-казахски!

- Ага. Давай. Только сама с собой. Ты уже наговорила тут. Так что может лучше и по-казахски. Фёдар цяжка глянуў на яе, і выпіў яшчэ чарку.

- Вы знаете, я и по-русски могу. Я училась в русской школе до десятого класса. Ничего страшного. Давайте так, чтобы всем было удобно. Летыцыя усьміхнулася, і ўзьняла бакал.

- Хочу выпить за нашу встречу, и за дружбу народов. И вообще всех людей на земле. Чтобы все были счастливы, - вымавіла яна.

- Если все станут счастливыми, то кто-то обязательно окажется несчастным, - философски заметил Фёдор. – Когда кто-то что-то находит, значит это что-то кто-то потерял. Поэтому самый счастливый всегда будет тот, кто сильнее. Предлагаю выпить за силу. Пусть у нас всегда её хватает, чтобы получить то, что принесет нам счастье.

- Чалавек можа быць шчасьлівым толькі ў дзьвух выпадках – калі ў яго ёсьць Бог, і калі ў яго ёсьць каханьне. Насамрэч, шчасьлівы чалавек мае і тое, і тое. Бо ж Бог дае адразу і каханьне, а каханьне дазваляе нам спазнаць Бога.

- Таму – прапаную выпіць адразу і за шчасьце, і за каханьне. Каб яны заўсёды ішлі разам. І каб у гэтым нам дапамагаў Бог.

Міхась узьняў кубак. Айгуль далучылася, праўда, няўпэўнена, яе вусны расплыліся, вочы блішчэлі. Яна прама глядзела на Міхася, не адводзячы вачэй.

Шкада, што гэты прыгожы мужчына адмовіўся, і не ўзяў у яе візітку, падумалася ёй. Яна б зь ім з задавальненьнем бы пасябравала… папрацавала. Словы блыталіся ў яе галаве. Хай ён размаўляе на гэтай сваёй дзіўнай мове, і ўвесь такі дзіўны, незвычайны, быццам бы ня з гэтага часу, і наогул аднекуль, дзе яна ніколі не была. Зь якогасьці свайго сьвету. Можа, ён араб які? Чорны, смуглы. Аднак – не. На араба не падобны. У тых твар вузкі, нос загнуты. І яны худыя звычайна. А гэты – моцны,

шыракаплечы, багатыр. І не італьянец – яны таксама мелкія, ня дужа высокія. Можа, гішпанец? Але ж ён казаў, зь Беларусі. Што там нарадзіўся. Цікава б было падрабязна пра яго вызнаць. І багаты, тое ж бачна. Яна адразу заўважыла, якія на дзяўчыне ўпрыгожваньні – настаяшчыя Tiffany, золата і дыяманты, хоць і выглядаюць сьціпла. Як і сукенка. Гэта была апошняя калекцыя, і каштавала гэтая сукня некалькі тысячаў даляраў. Яна ж вымушана апранацца ў турэцкія копіі, і ніколі сабе ня можа дазволіць гэтыя трапкі з цумаўскай вітрыны, сколькі б яна ня бавіла час з гэтым Фёдарам і такімі ж, як ён. А ўсе грошы сыходзяць на зьнешнасьць – салярый, вусны, уколы, валасы, пазногці, спортзал. Бо ж свая ў яе зьнешнасьць далёкая да мадэльнай, і паўнаватая яна заўсёды была, крупная. Толькі ліпасакцыя і выратоўвае. І вочы яна сабе зрабіла, і нос, і вусны, і скулы, і ботакс - усё каштуе грошы, і ўсё трэба паднаўляць.

Гэтая ж дзяўчына, бачна, зусім ня робіць ні вуколаў, ні пластыкі ня мае. Яна такая тонкая, якая ёй ліпасакцыя. І твар у яе ідэальны. Такі б вялікія грошы каштаваў. Толькі выглядае яна неяк зусім молада і сьціпла. Усё ж, жанчына павінна быць ярчэй, каб здалёк было бачна. А можа, гэты, Міхась, маладых любіць? Ну, зусім маладых, падлеткаў? – падумалася ёй. – Можа, яна яму ніякая ня жонка? Ёй жа на выгляд ледзь васемнаццаць ёсьць. А можа, і няма. Ну, тады яна, Айгуль, для яго старая. Бо ж ёй ужо дваццаць два. Аднак можа, ён захоча разнастайнасьці. Стоміцца ад сваёй, ад гэтай. Канешне, яна яму павінна хутка надакучыць! Айгуль сама сабе ўзрадвалася. Сто працэнтаў так і будзе! Ну што такая малалетка можа яму паказаць у ложку? Косткі свае? Яна ж, напэўна, нічога ня ўмее. І хутка ён захоча сапраўднага прыгожага жаночага цела – з грудзямі, як у яе, з лацінскай попай. А яна такія рэчы зможа яму паказаць – ён, пэўна, у сваёй Бе-ла-рус-сі-і і ня бачыў. Адкуль яму ведаць, што можа прафесыйны маскоўскі эскорт высшага ВІП-клясу? А яна – з самых дарагіх. Скажуць – марозіва попай есьці, значыць – будзе есьці. Што скажуць, тое і зробіць. І не такое рабіла. Калі б ён ведаў … яна летуценна прыкрыла вочы. А потым выцягнула нагу пад сталом, і дакранулася да яго нагі каблуком.

Ён нагу не ўбраў, але ж выразна палажыў руку на руку гэтай

сваёй малалеткі. Не нагуляўся яшчэ, вырашыла яна. Нічога. Ён ёй абавязкова пазвоніць. А калі не, яна Фёдара папросіць. Ён ня жадны, і не раўнівы, і разумее, што ёй патрэбны грошы. Яна падцягнула нагу пад сябе, а потым дастала візітку, і нібыта незаўважна паклала на стол.

Фёдар усё накідваўся і накідваўся. Нарэшце яны ўсталі, і, хістаючыся, як кот базіліа і ліса аліса, пакрочылі да дзьвярэй. Ён праводзіў парачку і ўцёр пот з ілбу.

Добры Фёдар, канешне, чалавек, і друг надзейны, але ж усё гэта было ўжо, як кажуць too much.

- Яны табе ўжо надакучылі, пэўна, сонейка? Ты выбачай мяне, што прыйшлося табе гэта ўсё цярпець і слухаць. Ён абняў яе.

- Нічога страшнага, каханы. Яна абняла яго за талію, прытулілася галавой да яго грудзей. – Ён жа нас выратаваў, і вілу сваю прапанаваў. А тое, што яны такія, што з гэтым зробіш. Мы – такія, а яны іньшыя. Ня могуць жа ўсе быць аднолькавымі ў сьвеце. Тым сьвет і прыгожы.

- Ну, такімі паводзінамі сьвет не ўпрыгожыш. Ён сумна ўсьміхнуўся. – Хутчэй, наадварот. Таму ён і не такі дасканалы, як хацелася б. Якім ён мог бы быць. Пайшлі адпачываць, сонейка, - вымавіў ён.

Глава 2: Званок

Мяккі, вялікі ложак так і вабіў у сябе. Ён абняў яе, адчуваючы далонямі яе шаўкавістую аголеную сьпіну, вузкую, тонкую. Апусьціў з плечаў палавінкі яе дарагой сукенкі – даўно хацеў так зрабіць, увесь вечар, пакуль гэтая казашка талкала яго пад сталом нагамі, і строіла вочы. Айгуль. Ён уявіў, што зарас замест Летыцыі зь ім тут магла б быць яна, і адразу прагнаў уяўленьне з галавы. Жах. Аднак затое тое, што ён бачыў перад ім, стала яшчэ больш прыгожым, прывабным. Ён пагладзіў яе мяккі вузкі тварык далоньню, і прыпаў да яго вуснамі. Яна ўздыхнула, быццам бы ўсхліпнула, і прыціснулася да яго губамі. Ён абняў яе вузкія плечы, крануў грудзі – маленькія, з узьнятымі саскамі, якія ўпіраліся ў яго далоні. Грудзі зусім юнай дзяўчыны, амаль дзіця. Ніякага сілікону. Навошта яму сіліконавыя мячы. Ён не ўяўляў, як бы ён кранаў вуснамі такія сіліконавыя красоты, яны ж не адчуваюць нічога, пэўна. Яна ж ўздрыгвала пад яго рукамі, адгукалася на кожнае яго дакрананьне, праз яе тонкую скуру ён адчуваў біеньне яе сэрца, пульсацыю крыві ў венах, яе тонкае, гібкае цела ільнула, прытулялася да яго, быццам бы яна губляла прытомнасьць ад яго ласкаў. Яе закрытыя вочы з пухнатымі вейкамі былі зусім блізка да яго твару. Ён дакрануўся вуснамі да яе ілбу, крануў нос, і ізноў апусьціўся на вусны, рассоўваючы іх больш прагна, каб яна пусьціла яго ў сябе. Яго язык увайшоў ёй у рот, глыбока, і сустрэўся зь яе языком.

Раптам зазваніў тэлефон. Каб ён ляжаў на стале – дык не! Зазваніў у яго ў кармане. Нехаця ён адарваўся ад яе.

- Выбачай, сонейка. Я адкажу.

Ён узяў апарат. На экране высьвяцілася імя – Вольга.

Ён нахмурыўся. Хто такая? Але ж потым успомніў. Журналістка. Канешне. Газета такога-та раёну. Не хацеў адказваць, але ж быццам бы яго штурханула нешта. Ён прылажыў палец да вуснаў, каб Летыцыя маўчала, і вымавіў:

- Слухаю.

Амаль ня вымавіў: “Pronto”. Бо ж у думках ужо быў у Італіі. Ледзь не спаліўся.

- Міхась? Гэта вы? Я хацела б з вамі пагаварыць. Прыватна. З вамі можна сустрэцца, ці куды пад’ехаць? Гэта срочна і істотна.

- Пагаварыць можна, але ж сустрэцца будзе складана. Я ня дома, і наогул не ў стране. А што такое?

Ён намагаўся гаварыць як мага спакайней, аднак яго душыла абурэньне. Што яна хоча пасьля гэтай стацьці?

- Ну, тады буду казаць прама. Я засьняла вас, тады, ля крамы. Цэлых дзесяць хвілінаў здымала. Што гэта зрабілі вы. Усё бачна. Але ж пакуль я нічога нікому не паказвала. І не пакажу, калі вы зробіце тое, што папрашу вас я.

- Што вы хочаце? – коратка запытаў ён.

- Я? Яна раптам рассьмяялася. – Вас. Усяго толькі адна ноч. Адзін раз. А потым вяртайцеся да сваёй … анарэксічкі. Калі захочаце. Можа, вам лепей спадабаецца з нармальнай жанчынай? Ну, што скажаце? Каштуе вашая свабода адну ноч са мной? Інакш - вас усё роўна знойдуць, дзе б вы не былі. Бо справа дужа сур’ёзная. Напад пры выкананьні. Вы разумееце?

- Разумею. Яго голас быў спакойным, нават абыякавым. – Я многа што разумею. І тое, што ня гледзячы на маладыя гады вы ўжо навучыліся, як быць шантажысткай, Вольга. Далёка пойдзеце з вашай працай. Толькі, баюся, ісьці прыйдзецца ня доўга. Перад тым, як кагосьці шантажыраваць, трэба спачатку сабраць больш інфрамацыі пра гэтага чалавека. Я не баюся, нават калі вы і пакажаце мяне на ўсю страну. Перш за ўсё, гэтае не адбудзецца. А чаму, я вам тлумачыць ня буду. Паспрабуйце спачатку паказаць гэтую плёнку камусьці з тых, хто адказвае за разьмяшчэньне падобнага кантэнту. Да таго ж, ня думаю, што ў нас нешта б атрымалася і ў больш спрыяльных умовах. Вы разумееце наогул, што такое каханьне? Я не кахаю вас. Я кахаю сваю жанчыну, і здраджваць ёй не зьбіраюся.

- Жанчыну? Вольга ўсьміхнулася. – Назваць яе жанчынай можа толькі скончаны педафіл.

- Вось любіце вы гэтае слова. Ну што ж, называйце мяне, як хочаце. Я на пакрыўджаных жанчын ня крыўджуся. Дарэчы, жадаю вам, Вольга, шчасьця. І трывалых шчырых адносінаў. Я веру, недзе ёсьць той хлопец, які вас чакае. І вы забудзеце ўсё гэта, як нейкае глупства. Болей прашу мяне не турбаваць. Усяго добрага. Ён адключыўся, і адразу выключыў тэлефон.

Летыцыя глядзела на яго ўстрывожана.

- Каханы, што яна хоча? – вымавіла яна. Яе вусны ўздрыгвалі.

- Яна? Шантажыраваць мяне сабралася. А наогул, сьмех. Засьняла, ці не засьняла нешта. Дарэчы, я нікога з камерай там ня бачыў, ну, дапусьцім, што нешта ў яе ёсьць. І што? Праблемы яна нам ня зробіць. Ва ўсякім разе, за ноч. А заўтра мы ўжо будзем далёка. Заўтра выляцім у Рым.

- Я забраніруюбілеты. Яна ўзяла ноўтбук.

- Сонейка, ня трэба клапаціцца.

Ён набраў тэлефон Фёдара. Той праз некалькі гудкоў адказаў. І адразу працьвярэзіўся. І як у яго тое атрымоўвалася?

- Праблемы? Лецець? Пачакай, я тут, у нумары. Што? Не, я ўзьнімуся. Ня трэба. Тут недалёка.

- Я цябе сустрэну. Ён выйшаў у калідор, каб паймаць хістаючагася Фёдара – яшчэ ня ў той нумар уваліцца.

І праўда, той ледзь не праскочыў міма.

Увайшоў, і адразу зваліўся на канапу. Ён растлумачыў яму коратка суць размовы. Фёдар нечакана стаў сур’ёзным.

- Цябе за ноч могуць заблакаваць у такім выпадку. Пачакай. Зараз. Ён набраў нумар.

- Иван Иванович? Да, это я. Фёдор. Да, я тоже рад вас слышать.

Ваш вопрос? Конечно, конечно. Послушайте, тут такое дело. Нужно, чтобы один человек завтра беспрепятственно вылетел по дипломатическому коридору. Не проблема? Как зовут? Михаил Альгердович Волкович. Да. Нет, не поляк. Белорус. Ну да, ну да… вы же понимаете. Ён усьміхнуўся.

- Да никаких проблем. Свой человек, хороший. Надёжный. На моей вилле жить будет. Конечно. Без проблем.

- Слушай, Михась, все отлично. Моя Манька вам самолёт бизнес-класса организует. Частный. Полетишь, как … друг депутата! Он рассмеялся. С компанией. В Милан на шоппинг. Там куча народу летит, всякие дети, жёны, друзья. Можно сказать, что чартер. Ну и по дипломатическому пройдёшь. Зачем тебе светиться. Короче, завтра будь к десяти готов. Они рано не встают. За вами машина приедет, и спокойно поедешь в аэропорт. Да. И соску эту я пробью. Завтра, с утряка, когда пацаны на работе будут. Чтобы она знала, с кем дело имеет. Чтобы трыньдела поменьше.

- Слушай, задолбала мяне эта … Айгуль. Тупая, как баран. Мееее… Он заблеял. Міхась сеў у крэсла, і спакойна глядзеў на яго.

- Дзякуй, ты сапраўдны сябар, - нарэшце вымавіў ён. – Ня ведаю, як мне ўдзячыць табе за ўсё, што ты робіш.

- А я не за грошы. Я – шчыра. Фёдар усьміхнуўся. – Денег у нас тут хватает, и за деньги мы друзей не покупаем, и не продаём. Не в деньгах суть. Суть – чтобы человеком быть. Вот ты – человек. И Летиция твоя – человек. А моя баба – овца. Си-ли-ко-но-вая. Раптам яго галава звалілася на грудзі.

- Пойду. К себе, в номер. Спать хочется. Ён узьняўся. – Утром встретимся!

Хутка дзьверы за ім зачыніліся, і ён уздыхнуў з палёгкай.

- Які хуткі. Міхась усьміхнуўся. А цяпер і я патэлефаную, толькі, прабач, сонейка, я адыду. Праз пяць хвілін буду. Ён выйшаў у калідор, прайшоўся да вялікага пустога лобі.

Набраў нумар.

- Слухай, Марк. Гэта я. Тут у мяне праблемы. Былі. Ты, можа, нешта чуў? А хто ня чуў? Вось як? І што? Прытрымаеш? Каб час даць? Ну заўтра ў мяне яшчэ час ёсьць? Дзякуй.

Ён вярнуўся ў нумар.

- Каханая, добра, што Фёдар усё з раніцы арганізаваў. Там і без яе ўжо ўсё ведаюць. Камеры ж усюды. Але мне абяцалі, што дадуць час, каб мы ўляцелі. Аднак вярнуцца нам, нажаль, прыйдзецца не скора. Ён падыйшоў, і абняў яе. Яна палажыла яму галаву на плячо, абняла за шыю, і заціхла.

- Прабач мяне, - ціха вымавіў ён.

- За што, каханы? – яна ўзьняла на яго вочы.

– За тое, што ўсяго цябе пазбавіў – сям'і, радзімы, будучыні, аб якой ты марыла. Ты ж вучыцца жадала … а цяпер што?

- А цяпер – нічога благога, - спакойна адказала яна. – Мая сям'я – гэта ты, мой любы. І радзіма мая там жа, дзе і ты. Вучыцца ж я буду. Толькі у цябе. Хіба ёсьць на сьвеце такі выдатны настаўнік, хто зможа навучыць мяне лепей? Мне акрамя цябе ніхто не патрэбны. Толькі ты скажы мне, гэта я не абцяжарваю цябе? Яна запытальна глядзела яму ў вочы. – Бо ж я разумею, колькі са мной клопатаў, і як на цябе глядзяць жанчыны, я тожа бачу. Прыгожыя, значна прыгажэй за мяне. Ці не пашкадуеш ты, каханы, што зьвязаў са мной сваё жыцьцё? Бо ж ты – высока, а я – усяго толькі простая дзяўчына, не адукаваная, і, пэўна ж, ня самая прыгожая ў сьвеце. Яе вочы вывучалі яго твар, вялікія, як зоркі.

- Падумай. Калі ты скажаш мне сысьці, я сыду. Падумай, каханы мой. Ці трэба я табе? Там, у тваім падарожжы? Бо ж мне ніхто і нішто акрамя цябе не патрэбны, і ці ня буду я абцяжарваць цябе сабой?

- Любая мая, што ты кажаш. Без цябе ў мяне няма жыцьця. І да цябе яго не было. Ён ахапіў яе. – Я жыву толькі дзеля цябе, і

табою. Усё, што я раблю, раблю дзеля цябе, і калі я што і змог, і дасягнуў, то толькі таму, што гэта ты натхняла, і натхняеш мяне. Натхняла зь нябёсаў, калі я цябе яшчэ ня ведаў, перад тым, як ты нарадзілася на сьвет, і натхняла з тых пор, як прыйшла на зямлю, і цяпер, калі ты ў маіх руках, ці ты думаеш, я цябе адпушчу? Да я цябе буду цяпер усю ноч вартаваць, каб ты ня зьбегла, і ў самалёт павяду за руку. Толькі паспрабуй мне некуды дзецца. Я цябе знайду ў адзіны міг. Ты ж бачыш, як у Фёдара тут усё схоплена. Ён усьміхнуўся, і пацалаваў яе. Яна адказала яму са сьлязамі на вачах.

- Тады я заўсёды буду з табой, і ніколі цябе ня кіну, любы мой, - вымавіла яна. – Ні цяпер, ні потым. Ні на гэтым сьвеце, ні на тым. Памятай, што я заўсёды буду з табою. Бо ж я – твая душа цяпер, якую ты знайшоў. А ад душы сваёй няма куды ісьці. Нават і ў пекла я пайду за табой, і на нябёсы ўзьнімуся – толькі трымай мяне крэпка, прыцягні мяне да сябе.

- Ты ведаеш, любая, я адчуваю, што наперадзе нас чакае нешта цудоўнае, - вымавіў ён, абдымаючы яе. Нешта вялікае, прыгожае, такое, ад чаго разрываецца душа.

- А табе праўда не падабаюцца ніякія іньшыя жанчыны? – запытала яна яго сур’ёзна. Яе тварык, узьняты на яго, быў сапраўды заклапочаны. – Бо ж калі гэтая прыгажуня прыйшла разам зь Фёдарам, я сабе здалася нейкай шэрай мышкай.

- Кацяня ты маё, а не мышка! – усьміхнуўся ён. – Беленькае з чорнай галоўкай. Навошта мне паўлін, скажы? Я што, сам на паўліна падобны? Ці ты ўяўляеш мяне з такой Айгуль побач? Я б быў, як цыганскі барон – і красуня адпаведная ў дадатак. І што б я зь ёй рабіў?

- Нешта. Яна ссунула бровы.

- Не, любая. Ён пакачаў галавой. - Для яе ня я, Фёдар патрэбны. Яна б мяне фокусамі зьдзіўляць пачала, і ў мяне б наўрад ці што атрымалася пасьля іх. З фокусаў толькі ў цырке пасьмяяцца добра, а жанчына – гэта ж ня клоўн.

Яна сур’ёзна глянула на яго, а потым шчыра зарагатала. Ён

рассьмяяўся таксама, а потым падхапіў яе на рукі.

- На чым мы там спыніліся? – вымавіў. – Зараз камусьці будзе не да сьмеху. І ізноў накрыў яе вусны сваімі.

Глава 3: Veni Creator

Яны стаялі перад цёмным вакном. Ён абдымаў яе, яна ж палажыла галаву на яго сэрца, быццам бы слухаючы, як яно біецца – вялікае, моцнае, роўна ходзячы ў запоўніўшым пакой змроку. Ціха грала музыка – мелодыя лілася зь яе тэлефона, а насамрэч – зь нябёсаў.

- У мяне баліць душа, калі я слухаю гэта, - вымавіла яна. – Але ж баліць салодка. Быццам бы нехта загойвае на ёй раны. Ён нахіліўся да яе: яна ня бачыла яго твар, толькі чула голас, і адчувала цяпло яго цела. Яно было нават гарачым у гэтай паўцемры, якую разьбіваў чорны прамавугольнік вакна, нагадваючы адпаліраваны онікс, за якім так жа пяшчотна да шыбы прытулілася ноч.

- Veni Creator Spiritus, - мякка паўтарыў ён словы, апускаючы твар да яе. Яна ўзьняла на яго вочы, якія нагадвалі дзе ціхія зоркі ў цемры.

- Чаму мне так хораша, і адначасова так сумна, каханы? – прашаптала яна, і прыціснулася да яго шчакой. Яго рукі гладзілі яе сьпіну, абдымаючы.

- Няма чаго сумаваць, мая любая, - вымавіў ён, ахінаючы яе. – Бо ж я тут, з табою. Ты – маё жыцьцё. Я хачу, каб ты ведала гэта. У сьвеце няма болей нікога, акрамя мяне і цябе.

- Я ведаю, - прашаптала яна. – Мой любы. Я проста ўспомніла, як слухала гэту песьню, калі мне было сумна, і самотна на душы. Так жа як цяпер, яна грала ў цемры, але ж ужо тады я адчувала, што сустрэну цябе. І мне так хораша слухаць яе, і так балюча салодка, быццам бы я адразу і тут, і там, у мінулым. Як добра адчуваць, што ўсё благое скончылася, і тое, аб чым я марыла, я атрымала наўяве. Што ты – тут, са мною, і я магу да цябе дакрануцца – ня толькі ў душы, але ж і ў целе.

Я адчуваю твой пах, і тканіну твайго касьцюму, і цябе ўсяго. Гэта так цудоўна, што маё сэрца быццам бы працінае меч, які я

не жадаю вынімаць. Хай яно цячэ крывёю заўсёды, бясконца – для цябе, бо я так кахаю тябе, што мне і салодка, і балюча. Я баюся, каханы, баюся, што я ня годная цябе, што я зраблю нешта, што цябе пакрыўдзіць, бо ж я такая недасканалая. Прашу цябе, не пакідай мяне, любы мой. Не дай мне загінуць. Бо ж я прападу без цябе, і болей мяне ня стане.

- Любая мая, гэта я прападу без цябе. Яго голас, глухі і ціхі, крыху дрыжэў.

- Ніколі не кажы так, любая. Як ты можаш мяне пакрыўдзіць? Прабач, але ж ты мне – як дзіця. Ты – маё любае дзіця, якое я ніколі б не пакінуў, як бы блага яно сябе не паводзіла. А ты – сапраўдны анёлак. Ты – чыстая, як сьвятло. Ты можаш рабіць са мной усё, што хочаш. Ты ж гэта ведаеш. Як мяне можа пакрыўдзіць такое маленькае кацяня? Калі б ты пачала адштурхваць мяне, я б найперш падумаў, што нешта зрабіў ня так. Бо ж я далёкі ад ідэалу. Заўсёды кажы, калі нешта раніць, ці абражае цябе, любая. Бо ж я ня маю такую тонкую анёльскую душу, як твая. Я ведаю, што ў мінулыя часы, калі мы былі разам, цябе давялося праз мяне пакутваць. Я ніколі не прабачу сабе гэта.

- Ты помніш нашыя мінулыя жыцьці? – запытала яна яго.

- Так, каханая. Але ж яны прайшлі, як сон. Цяпер мы з табой – іньшыя, больш дасканалыя, і ізноў мы разам. Мы вывучылі свае ўрокі – у кожнага свой. Сьвет шмат разоў выпрабоўваў нашае каханьне, і яно заўсёды праходзіла праверку на трываласьць.

Яго рукі абдымалі яе, прытуляючы да сябе яе тонкае цела.

- Ты і сапраўды магла б быць маёй дачкой, - ціха вымавіў ён. – Тое, што я адчуваю да цябе, я не магу апісаць. Яно вялікае, болей, чым гэты сусьвет. Каб выразіць яго, я ня маю словаў. Гэта і пяшчота, і нешта такое, што я назваў бы радасьцю, і набожнасьцю, адчуваньнем сакральнага. Цяпер, калі гучыць гэтая песьня, я адчуваю, што яна гучыць для цябе – каб ушанаваць цябе, прыйшоўшую ў маё жыцьцё. Ведаеш, гэта быццам бы калі рыцар уваходзіць у храм, яго дасьпехі пыльныя і памятыя, запэцканыя крывёю, за яго плячамі – многія гады і

кіламетры дарогі, бясконцыя бойкі, якія ня малі сэнсу, бо ж вайна ніколі яго ня мае. Яго душа – такая ж брудная і параненая, як і яго цела, і ён адчувае, што болей ня зможа зрабіць і кроку. І ў гэты апошні момант, калі ён ужо гатовы расстацца з жыцьцём, ён падае на калені, і бачыць сьвятло, зь якога да яго сыходзіць нехта. Ён ведае, што гэта – яна, і ён увесь гэты час ішоў да яе, ішоў сюды. Шэкіна абдымае яго, і ён ведае, што прабачаны.

- Ён ведае, што ён – Бог, любы мой, - вымавіла яна. – Бо ж толькі Шэкіна можа сказаць аб гэтым чалавеку.

Ён апусьціў вусны на яе мяккія губы, быццам бы піў зь іх ваду жыцьця. Яна была дзіця, і ў параўнаньні зь ім, і наогул. Яго пачуцьці да яе мяшалі жаданьне з пяшчотай, заліваючай яго душу. Ён адчуваў прагу яе цела, цяжкое, моцнае жаданьне яе плоці, аб якім яму ўладна казала яго плоць, і ў той жа час такую непамерную радасьць душы, і востры боль, і жаль, і нешта экстатычнае, адчуваньне нябёснай прыгажосьці, дасканаласьці, ідэальнасьці яе, і таго, што адбываецца паміж імі. Гэта было і дзіўна, і страшна, так, што захоплівала подых. Ёй ня трэба было рабіць ніякіх асаблівых штук з тых, што робяць жанчыны, ня трэба было ўзрушваць яго, распальваючы вагонь жаданьня, які гарэў у ім так моцна, што ён адчуваў, як суцэльна сгарае ў ім толькі ад аднага дакрананьня да яе, ад яе паху, адчуваньня пад пальцамі яе мяккай скуры. Яе цела было тонкім, такім, што яго было страшна крануць. Ён пяшчотна зьняў зь яе плечаў верх адзеньня, і яго ўразіў кантраст паміж яе аголенай плоцьцю і сваім целам, апранутым, нібы ў латы, у плотнае сукно дарагога касьцюма, паміж гэтым атачэньнем, якое пасавала б найбольш да якой Айгуль, а не да гэтага пяшчотнага дзіця, якое ўздрыгвала пад яго рукамі. Яе пальцы асьцярожна рассунулі яго піньжак, крануўшы гузікі жылету – тугаватыя. Ён накрыў яе руку сваёй, і прыціснуў да сэрца. Асьцярожна адвёў яе, разшпіляючы адзеньне, і яе рукі ляглі яму на цела, адчуваючы яго праз тканіну кашулі. Яе прыгажосьць была прыгажосьцю жывой статуі, сышоўшай з алтару ў храме, хараством нябёснага дзіця, якое апусьцілася да яго, несучы вялікую божую ласку, але ж гэта была прыгажосьць жывая, цёплая, трапяткая, адгукаючаяся, як струна, на яго каханьне.

Маленькая танюткая дзяўчынка, якая глядзела на яго даверлівымі вачыма. Якая яго жадала. Такога, які ён ёсьць, ня істотна, у дарагім гатэле і ў касьцюме, ці ў бездані бяды і нястачы, ці нават у вязьніцы ці на крыжы. Яе каханьне было неабумоўленым гульнямі сусьвету, бо яна бачыла яго душу, якую ўладна клікала да сябе.

Ён прыцягнуў яе да сябе, адчуваючы яе маленькія грудзі, яе вузкія плечы пад сваімі рукамі, яе сьцёгны, акруглыя, якія ён гладзіў, пакуль ён прагна цалаваў яе вусны.

У сьвеце засталіся толькі яна, і ён.

- Люблю цябе, - ціха вымавіла яна.

- Я люблю цябе болей, сонейка маё. Сьвет спыніўся, і болей у ім нічога не было.

Глава 4: Сустрэча з Богам

Дзяўчына, высокая, тонкая, стаяла ля вакна. Яе сілуэт наскрозь пранізвала сонца, і ён зажмурыў вочы. Чорныя валасы дзяўчыны, доўгія і густыя, ліліся па яе сьпіне, як паток цемры, вэлюм, закрываючы ад прагных вачэй яе белае цела.

- Якая дасканаласьць вобраза! - падумалася яму. Хараство грацыёзнае, прыроднае, як толькі што расквітнеўшая кветка. Уся яна, здаецца, вылучала сьвятло - асаблівае, ціхае, спакойнае і ўрачыстае, як толькі што адчынены на ранку храм, дзівосны вытанчаны сабор, у якім была безьліч паветра і сьвятла. І цяпер, калі ён назіраў яе, у гэтым саборы ён быў сам-насам з Богам, які паўставаў перад ім у нявінным дзявочым абліччы.

Нарэшце, яна павярнулася, і ізноў стала для яго зямной - тонкая юная дзяўчына, абцягнутая вузкімі джынсамі, нізка адкрываючымі жывот, і чорнай кофтай да таліі, паміж якімі бялела палоска гладкай скуры зь ценем пупка, які нагадаў яму пупок Венеры. Яна зусім не хавала свайго цела і не саромелася яго, быццам бы яе прыгажосьць - гэта адзеньне, якое бароніла яе ад нячыстых позіркаў. На яе вузкім, тонкім тварыку з’явілася пяшчотная вусьмешка, цёплая, як праменьчык вясновага сонейка.

- Вам зрабіць яшчэ кавы? - вымавіла яна, усьміхаючыся. Яе голас гучэў, як музыка, ціхі і мяккі, зь нейкім неверагодна мілагучным акцэнтам.

- Зрабіце, калі ласка, - вымавіў ён, з такой жа мяккай вусьмешкай, павольна асьвятліўшай яго твар - цёмны, у глыбокіх зморшчынах, з чорнымі выразнымі вачыма і кароткімі пасмамі кучаравых валасоў.

Мужчына ў крэсьле насупраць пільна глядзеў на яго, і адначасова - нібыта міма, быццам бы біў наводмаш. Позірк яго, востры і пякучы, як лязо, здаецца, застыў у палёце праз вечнасьць.

- Так вы кажаце, што гатовы запрасіць нас у фільм, Паола? - нарэшце вымавіў ён голасам густым і нізкім, цяжкім, як пліта, выразаная Мікеланджэла. Словы важка падганяліся ў яго ў фразу, але ж, стаўшы на месца, зрасталіся так трывала, што набывалі моц камяню, выяўляючы нейкую варварскую дасканаласьць і акрэсьленасьць, быццам бы барэльеф магутнага цела на шэрым мармуровым фоне.

Ён сустрэў іх абодзьвух у саборы сьвятога Пятра, і ледзь не ўскрыкнуў ад зьдзіўленьня.

Ён прыйшоў сюды раніцой, пакуль не сабраўся натоўп, каб сустрэць Бога, безь якога болей ня мог існаваць. Яго задумка паліла яму розум. Ён бачыў, наяўна бачыў Яго, і яго словы молатам крыві білі ў яго вушах, джалілі вогненнымі бізунамі яго скуру, працінаді, і выпальвалі вочы полымем маланак.

Яны ахоплівалі яго вакол, як языкі полымя, і паўставалі мурамі, засланяючы ад сусьвету. Такім чынам ён заставаўся сам у сабе, акаляючы сябе самога нібыта вогненным колам, сьвятлом жывога агню, праз які цемра болей не магла прабіцца.

І тады ўсё вакол зьнікала акрамя яго думак, гарачых, кідаючыхся ў вар'яцтве, шукаючых выйсьця.

Ён прагнуў Бога, і Бог яго пачуў. Адказаў на яго заклік.

Гэтай раніцой ён яго ўбачыў.

Мужчына стаяў з жанчынай побач і разглядаў мазаіку. Здаецца, гэта было Праабражэньне, ці, можа, нешта іньшае. Мазаіку ён не заўважыў, бо яго позірк прыцягвалі людзі.

Высокі чалавек з доўгімі, ніжэй плечаў, чорнымі валасамі, вялікі і моцны, сьпіна якога, абцягнутая чорным кашэмірам швэдару, нагадвала рэльефныя целы з мазаік, што ўзвышаліся вакол, абдымаў за талію тонкую высокую жанчыну, валасы якой падалі яму на руку, як цёмны, нібы ноч, шоўк, апранутую ў вузкія блакітныя джынсы і скураную кароткую куртачку карычневага колеру, у нізкіх белых туфельках-сьнікерсах.

Тонкія лыткі жанчыны выглядалі па-дзіцячы кранальнымі, здаецца, іх можна было ахапіць рукамі. Уся яна была незвычайна стройнай, эфірнай, быццам бы не кранаючай зямлі, з ідэальна акрэсьленымі сьцёгнамі, доўгімі нагамі. Зусім маладая дзяўчына, нібыта падлетак.

Ды яго прыгожымі мадэлямі з нерэальна-ідэальнымі целамі было не зьдзівіць. Бо ж – Рым, і каго толькі тут няма. Тым больш што як раз пачаліся восеньскія тыдні моды, і мадэлі на розны колер і густ проста наваднілі ўсё вакол. Прыгожыя юныя багіні ў вольна вісячых на плечах сьвіцерах і пацёртых джынсах блукалі з адсутнічаючым відам, пагарджаючы позіркамі натоўпу і воклікамі маладзёнаў, елі “желата” і ляніва аглядалі гарадскія славутасьці.

Аднак тут яго нешта прыцягнула. Як зачараваны, ён глядзеў на іх, і думаў: “Айцец з дачкой? Ці каханак з каханкай?” Мужчына быў старэйшы, гэта было бачна нават ззаду. У яго чорных валасах пабліскваліі тонкія сівыя пасмачкі. Яна ж, відавочна, была маладая. Гэта было бачна па стройных лытках і запясьцях, па вузкіх прамых плечыках і той дзіцячай даверлівасьці і пяшчоце, зь якімі яна хілілася да яго, трымала яго вялікую руку, прыхіляла маленькую галоўку да яго пляча. Здаецца, ён казаў ёй нешта нягромка. Здаецца, яна яму адказвала. Ён не разумеў словаў мовы, якая была для яго незнаёмай, далятаючых да яго. Ён болей нічога не разумеў. Раптам постаці на мазаіцы закружыліся перад ім, нібыта ажылі, быццам бы іх ахапіла полымем.

- Што зь ім? Ён схапіўся за каўнер, разшпіліў кашулю. На яго вачах сьвятло вакол Хрыста на блакітным нябёсным фоне пачало зьзяць, і той нібыта раствараўся ў бездані. А потым ярка абазначыўся, і пачаў выдвігацца да яго. Мазаіка гуляла зь ім, робячы нейкі дзіўны эффект у сьвятле ранішніх промняў.

А потым ён зразумеў, быццам бы пачуў словы, недзе глыбока ў сэрцы.

- Ідзі да мяне. Голас гучэў уладна, заклікальна. Голас у яго галаве, якога раней ён ніколі ня чуў, і ў той жа час – звонкі, зьнешні голас, які абдаваў яго вадападам, біўся вакол рэхам.

- Падыйдзі да мяне, - пачуў ён яшчэ раз, і, як зачараваны, зрабіў крок наперад. Пасунуўся бліжэй, і стаў амаль адразу за парай. Цяпер ён чуў выдатна: яны гаварылі на мове, якую ён ня ведаў, і нават вызначыць ня мог. Раптам думка-маланка працінула яго: яны былі падобныя.

Як брат і сястра, ці блізьняты, ці – як дзьве паловы адной душы, і аднаго цела. А яшчэ яны былі падобнымі да іх – тых, пра каго ён хацеў здымаць.

Ідэя зьняць фільм пра Хрыста прыйшла яму ў галаву даўно. Але ж тое, што ён хацеў здымаць, наўрад ці прыцягнула б фінансаваньне, ці, наогул, зацікавіла бы кагосьці, акрамя яго і некалькіх такіх жа аматараў патаемных ведаў і дзіўных легендаў. Бо ж Хрыстос у яго фільме павінен быў быць незвычайным. І наогул, ён не павінен быў быць Хрыстом. Скажэньне ведаў ад сапраўдным прышэсьці і адкравеньні і аднаўленьне вобразу мешыаха такім, якім сапраўды ведалі яго яго вучні, а таксама асэнсаваньне тых ведаў аб Богу, чалавеку і сусьвету, якія даўно ўжо вылiваліся зь яго сэрца стала яго адзінай мэтай і апантанасьцю. Па начах ён пісаў сцэнар. Днём жа часу не было, бо ён працаваў, як шалёны. Хадзіў з аднаго паказу на другой, з адной тусоўкі ў другую, рабіў безьліч фатаздымкаў для модных альбомаў, здымаў партфоліа. Ды што толькі не рабіў. І вось, здолеў стаць вядомым, накапіць грошаў, і набыць сувязі. Яго ідэяй зацікавіўся адзін з паважаных дзеячоў мастацтва, імя якога ён не жадаў называць. І гэты патаемны мецэнат, да таго ж, высокага рымскага роду, зь якога калісьці нават выходзілі і папежы, пагадзіўся фінансаваць яго праэкт. Ён узрадваўся, і шчыра падзякваў Богу. А потым засумаваў, бо ж апынулася, што ня змог падабраць акцёраў. Колькі твараў ён не праглядваў у альбомах з мадэлямі, студэнтамі і маладымі акцёрамі, сьпецыялізуючыміся на арт-хаўсным кіно, ён не сустракаў ніводнага, які б падыходзіў на галоўныя ролі. Усе яны былі ня тымі. Сучаснымі. У іх не адчувалася таго, старога, біблейскага духу, у які ўдыхнула жыцьцё полымя новай веры. Колькі ён пераглядзеў фільмаў пра Хрыста і евангельскія падзеі – напэўна, усе, што былі. І ніводны не нагадваў яму той вобраз, што ён даўно ўжо насіў у сваім сэрцы. Надта еўрапейскі, надта прыглажаны, надта ідэалізаваны, надта спрошчаны – усе яны,

гэтыя кіношныя Ісусы, праходзілі міма яго сумнымі, не кранаючымі яго сэрца ценямі. У кожным зь іх нешта было, але ж не было – больш. Нават калі б аб'яднаць іх усіх, тое, што ён жадаў, не атрымалася б. Можа толькі Мэл Гібсан прыблізіўся да таго, што ён жадаў, ды яшчэ яму падабалася раскадроўка і ракурсы Пазаліні. Паступова ён пачаў губляць розум. Грошы былі, а здымаць ён ня мог. Бяздзейнасьць марудна атручвала яго, напаўняла гораччу, выматвала жылы. Як п'яны, ён хістаўся па вуліцах, ня гледзячы ні на кога, вывучаючы вобразы ў сваёй запаленнай галаве. Заходзіў у бясконцыя музеі і галерэі, і вывучаў малюнкі. Можа, яны нешта падкажуць? І ізноў хадзіў па вуліцах, глядзеў на твары – шукаў, шукаў і шукаў. Яго і яе. Яму быў патрэбны Шымон, і патрэбна была Елена. Бо ж Шымон і Елена, і не Хрыстос і Марыя павінны былі стаць галоўнымі героямі. Імёны былі яму не важныя, яны даўно згубіліся ў гісторыі. Яму істотная была праўда, якую ён ведаў, і адчуваў усім сэрцам.

Цяпер жа, калі ён убачыў іх, ён аслупянеў. Стаяў, нібыта баяўся спугнуць прывід.

Нарэшце яны быццам бы наглядзеліся, і адарваліся ад мазаікі. Павярнуліся адно да другога. Яго сэрца затахкала, і ён зрабіў крок наперад.

- Прабачце!

Яго голас, хрыплы ад няспаньня і курыва, і ад літраў кавы, якую ён піў, каб не зваліцца на паўдарогі недзе пасярод лабірынту рымскіх вуліц, на якіх промні ранішняга сонца бязьлітасна гвалцілі паміраючую манашку-ноч, прагучэў нечакана ўпэўнена нават і для яго самога.

Мужчына павярнуўся да яго. Дзяўчына зь цікавасьцю глянула ў яго бок.

- Сі? – голас мужчыны, глухаваты, нізкі, густы, быццам бы сыходзіў з мазаікі недзе пад стольлю.

- Скузі. Ён справіўся з сабой, і падышоў да іх. Усьміхнуўся, і ўпэўнена працягнуў візітку.

- Паола Сакро. Рэжысёр. Ён працягнуў візітку.

- Прабачце, але ж я – чалавек прамы, і не люблю хадзіць вакол ды наўкола. Я жадаю запрасіць вас з'няцца ў сваім фільме. Абодзьвух, і ў галоўных ролях. Гэта будзе артхаўсны фільм, аднак я заплачу добры ганарар. Скажыце, вы пагаджаецеся?

Ён глядзеў на іх з адчаем шыбеніка, які бачыць свой апошні шанец выратаваньня. Мужчына ўзьняў бровы, і зь цікавасьцю агледзеў яго. Яго вусны кранула лёгкая вусьмешка.

Ён ужо жадаў нешта вымавіць, як раптам яны пачулі тонкі, нягромкі дзявочы голас.

- Я згодная! – вымавіла яна зь нечаканым палам. І сьціснула пабялелымі пальцамі яго вялікую руку. – Мы згодныя, - паправілася яна, і амаль са сьлезамі на прыгожых вачах заглянула ў яго вочы. – Праўда, каханы? Яе галасок дрыжэў ад жаданьня, і ад страху, што ён адмовіць ёй.

Ён глянуў на яе, і ўсьміхнуўся.

- Калі ты жадаеш, сонейка маё, хай будзе па-твойму.

- Жанчына жадае здымацца ў кіно. Я не магу ёй адмовіць, - вымавіў ён.

- Мы можам абмеркаваць дэталі?

- Канешне, канешне. Абавязкова. Голас Паола нечакана дрыгнуў. Ногі яго раптам падкасіліся, і ён пераступіў, але ж утрымаўся.

- Прабачце, я ня спаў некалькі начэй. Усё хадзіў, і шукаў вас, - шчыра вымавіў ён.

- Тады запрашаю да нас на госьці. Мужчына ўсьміхнуўся, і працягнуў яму руку. – Міхал.

- Летыцыя, - прадставілася дзяўчына.

- А што за фільм, магу я пацікавіцца? Бо ж вы яшчэ не расказалі нам нічога аб тым, што жадаеце здымаць.

Мужчына працягнуў руку, і наліў каньяк у невялікі крышталёвы кубачак. Ён машынальна ўзьняў яго, і залпам выпіў напой. У галаве адразу праяснілася.

- Ведаеце, я хачу зьняць Евангельлле, аднак – альтэрнатыўнае. Гнастычнае. Якое б складалася з усіх маючыхся зараз гнастычных тэкстаў. Я доўга працаваў, каб зьвесьці іх у адно цэлае, і цяпер я маю пэўнае бачаньне таго, як павінна строіцца канцэпцыя.

Галоўнымі героямі будуць Ісус, аднак – не звычайны, не біблейскі, а ў вобразе Шымона-мага, і, канешне ж, будзе галоўная жаночая роль – Елены. І калі я вас убачыў, я адразу зразумеў, што вы – тыя, каго я даўно шукаў.

- Цікава, - вымавіў мужчыну, качнўшы галавой, быццам бы і пагаджаючыся, і сумняваючыся адначасова. – Тое, што вы нас знайшлі, гэта, сапраўды, дзіўна. Бо ж я – гісторык, і апошняя тэма, зь якой я працую – менавіта гэта. І я як раз планаваў прачытаць вялікую лекцыю, доўгі семінар пра гэтае гістарычнае ліцо. Але ж пэўныя падзеі спынілі мае пляны, і кінулі мяне сюды. Мне прыйшлося раптоўна з’ехаць, і цяпер мы чакаем, калі вызваліцца нашае пастаяннае жытло, пакуль жа мы спыніліся тут, у гэтай кватэры.

- Прабачце, а мілая донна – вашая спадарожніца – яна ваша радзіна, ці вы проста – разам? – запытаў Паола, сам ня ведаючы, чаму.

- Усе думаюць, што яна – мая дачка. Але ж гэта ня так. Летыцыя мая жонка. І мы ня проста разам. Мы разам назаўсёды, і нават сьмерць нас ня раз’яднае. Ён узьняў на Паола вочы – выразныя, цёмныя, пад чорнымі нізкімі бровамі, нагадваючымі крылы вялікай птушкі.

Яна маладая для мяне, я разумею, - працягнуў ён. Яна ціха пагладзіла яго руку.

- Але ж так адбываецца. Мы сустрэліся ў гэтым жыцьці крыху пазнавата. Для мяне. Але ж што значыць нашае чалавечае жыцьце ў параўнаньні з бясконцасьцю, у якой мы існуем адвечна. Праўда, сіньёр Паола?

Сонца афарбавала пакой у залатыя адценьні колеру, у якіх твар мужчыны здаваўся зусім па-сапраўднаму біблейскім, быццам бы высячаным з часу. Дзяўчына ціха сядзела побач, і з каханьнем у вачах глядзела на яго.

- У нас будзе шмат часу, каханы. Я ведаю, - ціха вымавіла яна. – Гэты час ніколі ня скончыцца. Ён глянуў на яе, і пяшчотна накрыў яе руку сваёй.

- Ты – маё жыцьцё, - вымавіў ён. – Яна прыўкраная, Паола? Праўда? – вымавіў ён, гледзячы на яго.

- Донна прыўкрасьнее за ноч, дзень і раніцу, і за заход і ўсход, і за ўсіх магчымых багіняў гэтае зямлі і іньшых краёў. Яе прыгажосьць – дасканалая. Паола нахіліў галаву.

Крыху яны маўчалі.

- Ведаеце, я прапаную абмяркаваць дэталі ў натарыўса, калі вы жадаеце падпісаць кантракт, - вымавіў ён. А цяпер дазвольце мне азнаёміць вас са сцэнарам.

Ён дастаў з сумкі прашытую папку, і працягнуў праз стол.

Глава 5: Каханьне

Яна села яму на калені, тварам да яго твару. Абняла яго за шыю. Ён ахапіў яе сьцёгны рукамі. – Хачу пацалаваць цябе, - вымавіла яна. Яе дзіцячы тварык нахінуўся да яго. Пяшчота цёплай хваляй залівала яму грудзі.

- Пацалуй мяне, каханая. Любае маё птушаня. Ён усьміхнуўся, і яе вусны наблізіліся да яго вуснаў. Яна нясьмела кранула яго, трапятліва і горача, як цалуе дзіця, якое даверліва прыціскаецца да бацькоўскіх грудзей. Ён закрыў вочы, і яе пацалункі асыпаліся на яго дажджом ружовых пялёсткаў, песьцячы яго, кранаючы павейкі, бровы, нос і шчокі, і імгненьне замірая на вуснах. Яна нібыта гуляла зь ім, жартавала, цалуючы яго кароткімі, лёгкімі дакрананьнямі, а потым доўга прыціскаючыся да яго, кранаючы языком яго скуру, быццам бы пчолка, якая зьбірае з кветак духмяны нектар. Яго рукі ляглі ёй на талію, накрылі маленькія грудзі. Ён адчуваў яе вострыя саскі, і асьцярожна гладзіў іх, насалоджваючыся адчуваньнямі ў коньчыках пальцаў, якія быццам бы скальзілі па тонкаму шоўку. Яна насалоджвалася новай гульнёй, калі яна рабіла зь ім, што жадала. Зьняла праз галаву майку, і апынулася аголеная ў яго руках.

- Адкрый вочы! – папрасіла яна яго. Ён узьняў павейкі. Яна сядзела перад ім, нагадваючы русалку ці Леду, якая ў сваёй цнатлівасьці нават і ня ведае, што спакушае. Яе маленькія грудзі, ледзь абазначаныя, даверліва глядзелі на яго, па вузкім плячам хвалямі ліліся валасы. Яе твар усьміхаўся.

- Я прыгожая? – запытала яна.

- Ты самая прыгожая ў сьвеце, - шчыра вымавіў ён.

- І ты мяне жадаеш? – яна працягвала запытваць яго з вусьмешкай.

- Я ня проста жадаю цябе. Я – ўвесь увасобленае жаданьне. Але я адначасова і магчымасьць. Ён усьміхнуўся. І воля ўзяць цябе,

каханая.

- Але ж толькі – з тваёй волі. Бо гэта ты запрашаеш мяне ў сябе. І тады я прыходжу, бо ж нікуды і не сыходзіў. Я заўсёды чакаю ля тваіх дзьвярэй. Яго вусны кранулі яе шыю, і яна ўздрыгнула.

- Мне здаецца, што ты – мой айцец, - ціха вымавіла яна. – Ты – усё для мяне, увесь сусьвет, і болей за яго. Маё каханьне да цябе такое вялікае, што мне і радасна, і страшна адначасова, - вымавіла яна.

- Чаму табе страшна, сонейка? – запытаў ён яе.

- Страшна, што я ня годная такога вялікага каханьня праз свае грахі, і што я не вартая яго. Я не хачу яго згубіць, ціха вымавіла яна. – Я нікому не аддам гэтае маё каханьне да цябе. Толькі ты маеш над ім уладу. Я хачу кахаць цябе адвечна, любы, - прашаптала яна.

- Будзь заўсёды ў маім сэрцы. Прашу цябе. Ніколі мяне не пакідай.

- Любая мая, маленькае маё птушаня. Я ніколі не пакіну цябе, і колькі б твайго каханьня не вылівалася на мяне, ты заўсёды атрымаеш яго ў адказ у безьліч разоў болей.

- Пацалуй мяне, - прашаптала яна. Яе рука ўзяла яго далонь, і палажыла сабе на грудзі. Ён абняў яе, і апусьціў на ложак, нахінаючыся над ёй. Правёў вуснамі па яе грудзям, убіраючы ружовыя саскі. Цяпер, калі яна ляжала, яе грудзі нагадвалі грудзі дзіця, як і яе прыгожы твар са стрэльчатымі вейкамі і пухлявымі ружовымі вуснамі маленькага рту. Яго цёмная рука гладзіла яе цела, закрываючы яго амаль поўнасьцю. Яна аддавалася яго ласцы, закрыўшы вочы, уздыхаючы ад жаданьня, расслабленая, мяккая, пакорлівая волі яго рукі, якая вывучала яе цела.

Ён нахінуўся, і ўзяў вуснамі маленькі сасок, а потым – другі. Правёў тварам па яе ўлоньню. Яго рука адчувала, якімі вільготнымі становяцца яе сьцёгны.

- Я хачу цябе, - ціха прашаптала яна, саромячыся сваіх словаў, быццам яе голас выдаваў нейкую страшную, вядомую толькі ёй таямніцу.

Ён нахінуўся над ёй, і прыпаў вуснамі да яе вуснаў. Яго рука ўвайшла ў яе, і ў яго вусны ўвайшоў яе ўскрык. Ён ізноў ня мог стрымаць сваю плоць і сваю жарсьць, уваходзячы ў яе спачатку асьцярожна, а потым – усё мацней, гвалцячы яе, уплываючы ад асалоды, якую дарыла яму яе цела, прыціснуўшаеся да яго, якое ён шчыльна накрываў сабою. Яго штуршкі рабіліся хуткімі і глыбокімі, запаўняючымі яе поўнасьцю, вымушаючымі стагнаць і ўскрыкваць, быццам бы ён забіваў яе, нібыта зь яе выцякала не яго семя, а яе кроў.

Яе вузкія плечы, худзенькія ключыцы пад яго далонямі, маленькія грудзі, прыціскаючыся да яго шырокіх грудзей, пакрытых чорным воласам, тонкія сьцёгны, прыціскаючыся да яго сьцёгнаў вымушалі яго чэлес запаўняцца крывёю, узрушваючы яго так, як ніколі не ўдавалася ніводнай жанчыне. Ён губляў галаву ад каханьня і жарсьці, і кожны раз здзіўляўся, што асалода ад фізічнае блізасьці можа быць такой моцнай. Яе цела было нявінным, ня гледзячы на тое, што цнатлівай яна не была. Аднак яе цнота быццам бы не належыла гэтаму сьвету. Яна прысутнічала ў ёй нібыта заўсёды, і гэта было нешта дзіўнае, такое, што вымушала яго сэрца біцца. І калі яна называла яго айцом, ці Богам, ён ведаў, што гэта праўда і так яно і ёсьць, паўстаючы на калені перад яе шчырай верай у яго, адчуваючы сваю поўную ўладу і адказнасьць за яе цела і яе душу, якія ляжалі бязабароненыя і аголеныя перад ім, і якімі ён валодаў з такой жарсьцю. Нічога не было вакол акрамя яе, і яго, і іх каханьня, поўнага зьліцьця душы з душою і цела зь целам, якія ўваходзілі адно ў адно, і ўжо, здаецца, не раз’ядноўваліся. Яна прыняла яго ў сябе, а ён увайшоў у яе.

- Ты – Бог, Божа мой, як я кахаю цябе, - прастагнала яна, ахопліваючы яго рукамі. Якая асалода кахаць цябе ўсёй душою сваёю і аддавацца табе ўсім сваім целам.

- Душа мая каханая, - ён прыціснуўся тварам да яе грудзей, яго валасы накрылі яе, як покрыў, гладзячы яе скуру. Саскамі яна адчувала яго твар, і яго дыханьне, яго подых на сабе, гарачы,

глыбокі. Яшчэ адна рымская ноч пераходзіла ў новы рымскі дзень, і ўсё адбывалася ўсё больш і больш дзівосна, так, як яна не магла і марыць.

Яна ляжала аголеная ў яго руках. Ён асьцярожна гладзіў яе грудзі, якія зьнікалі пад яго далонямі. Чыстае, нявіннае, нагадваючае анёла цела. Вялікае жаночае цела было яму агідным. Глыбы плоці, якія проста душылі яго сваёй цялеснасьцю. У яго хутчэй паўставала на статую, чым на тую жыцьцёвую нядасканаласьць, якая звалася "звычайнай" жанчынай - плотнай, плоцкай, прагнай асалоды, патрабуючай ад яго ўсе магчымае і немагчымае, і кпліва параўноўваючай яго зь іншымі, якія былі, ёсьць, і будуць.

Гэтае ж дзіця не прасіла ў яго нічога, аднак атрымала ўсё. І разам зь ёй да яго прыйшло яшчэ больш, аб чым ён нават і ня марыў. Ён ведаў, што пра яго казалі. Стары распусьнік, дурань, які на старасьці год знайшоў сабе маладую дзяўчыну, якая яго абавязкова кіне. Аднак што казалі пра яго, яму было не цікава. Калі ж нешта казалі пра яе, ён хацеў забіваць. Яна была для яго сьвятой. Тое, што было паміж імі, ня мела нічога роднаснага зямлі. Гэта было суцэльна нябёсным, сакральным. Яна нагадвала яму Марыю, юную хрысьціянку-пакутніцу, дзеву, якая даверліва ляжала ў яго руках. Яе маленькія грудзі так і прасілі яго пацалункаў, і ён цалаваў іх - прагна, горача, як распяцьце на алтары, расьпінаючы яе цела сваёй любоўю. Яго чэлес проста імгненна паўставаў ад яе, ён жадаў яе моцна, так моцна, што сам баяўся свайго жаданьня. Усё ж, яна была юнай, тонкай дзяўчынай, якую яму і кранаць было страшна. Але ж менавіта гэта яго і заводзіла. Нешта было ў гэтым пачуцьці такое - па-за межамі гэтага сьвету, які рассыпаўся ад аднаго дакрананьня да яе.

Калісьці яны былі разам - гэта ён таксама памятаваў. Там, дзе не было нічога акрамя сьвятла. І там, где сьвятло і цемра перапляліся так густа, што аддзяліць адно ад другога было немагчыма, каб не сысьці крывёю.

Калісьці ён быў для яе цемрай, яна ж стала яго сьвятлом. І цяпер ён жадаў стаць сьвятлом для яе, зрабіць для яе тое, што

можа зрабіць Бог, і ня можа чалавек, даць ёй каханьне сапраўды боскае, такое, якое можа спапяліць сусьвет сваёю гарачынёй, ачысьціць яго ў тыгелі боскае жарсьці і пераўтварыць нанова.

Яны былі ў Рыме, і гэты горад пасаваў ёй як нельга лепш. Сваім хараством яна гарманічна ўлівалася ў баланс яго вуліц, быццам бы была адной з мармуровых багіняў, сышоўшых з надгробій і пастаментаў да простага люду, плывучай над натоўпам, недасяжнай у сваёй дасканаласьці.

Яны доўга гулялі па гораду, узяўшыся за рукі, і ён распавядаў ёй яго гісторыю, старажытную, насычаную падзеямі крывавымі і драматычнымі, захопліваючымі і сэрца і розум тых, хто вандраваў па яго вуліцах.

Ён кахаў яе на гэтых вуліцах Рыма, на плошчах і ў вузкіх дворыках, кахаў сэрцам і душой, ня целам, любуючыся ёй вачыма мастака, які ў думках малюе палатно за палатном у сваім уяўленьні. Вось яна сядзіць у тонкім белым швэдары, мяккім, праз які бачна ўсё яе цела і карункавая бялізна на яе маленькіх грудзях, у белай доўгай спадніцы, хвалямі ўючайся ля яе доўгіх ног, абдымаючай стройныя сьцёгны, за маленькім столікам кафе пад раськідзістымі пажухлымі шатамі старых дрэваў, а ён сядзіць збоч ад яе, і крыху насупраць, назіраючы, як восеньскае сонца лашчыць яе скуру. І яму хочацца зьняць гэтыя карункі і дакрануцца вуснамі да яе грудзей, мяккіх, ледзь бачных, адчуць губамі і языком шаўкавісты аксаміт яе скуры, правесьці па ёй языком, каштуючы смак яе цела, якое і чалавекам ня пахне, а пахне мёдам і кветкамі, і сакавітымі пладамі.

Тонкі пах яе поту, каб адчуць які, трэба было апусьціць твар блізка-блізка ля самай паверхні яе цела там, дзе дасканалая лінія грудзі перацякае ў антычнае плячо, правесьці ім ўверх і ўздрыгнуць, дакранаючыся да яе тонкай шыі. Ён жадаў маляваць яе сваім целам, рукамі і губамі, як пэндзалем на палатне свайго сэрца, там, дзе гэты вобраз зможа заставацца адвечна, і радаваць яго, і болей - нікога.

І цяпер, калі ён нахінаўся над ёй, абдымаў яе, гладзіў, цалаваў, ціха кранаючы вуснамі, зьдзіўляючыся дасканаласьці і

блізкасьці яе цела, ён сам сабе да канца ня верыў, што так адбываецца, што гэтая дасканаласьць цяпер належыць яму, ляжыць перад ім адкрытая, аддаючаяся яго ласкам, і яна адказвае яму з пяшчотай і жаданьнем, яе тонкія рукі гладзяць яго цела, вусны прыціскаюцца да яго вуснаў, аддаючыся яго каханьню, і яго ўладзе над ёю. Яна поўнасьцю аддала яму сябе, даверылася бяз рэштку, бяз страху і недаверу, і ён адчуваў гэтую сваю адказнасьць і шчасьце, якое яна яму дарыла.

Дні ляцелі за днямі, і нічога не адбывалася. Яны падпісалі кантракт с Паола, і той аддаў яму таўставатую папку сцэнарыя, які ён увесь пакрэсьліў, робячы заўвагі і каментары. Апынулася так, што прасьцей было напісаць усё самому. Некаторыя сцэны не былі гістарычнымі, іньшыя выклікалі нават і сьмех скрозь сьлёзы. Аднак было і нямала моцных, яскравых хадоў, і арыгінальных думак і паваротаў сюжэту. Нарэшце ён прапанаваў Паола пачакаць, калі ён сконьчыць сваю працу над цыклам лекцый, якія потым мяркаваў пераўтварыць у кнігу. Былі часы, калі яму здавалася, што ён ведае ўсё - яму проста трэба было адпусьціць час, і вызваліць успаміны. Апусьціцца туды - у глыбіні, дзе часу няма, і знайсьці там самога сябе. Забываючыся ў працы, ён ня спаў начамі: чытаў, сядзеў за ноўтбукам, пісаў, і думаў, шмат, так, што перад вачыма пачынала плаваць крывавая пустэча. Нарэшце ў яго пачаў атрымоўвацца твор - нешта не асэнсаванае, ня маючае формы, яе паступова набывала.

І вось аднойчы ён проста сеў, і напісаў:

- Чалавек, захінуты плашчом, ішоў па вуліцы.

Глянуў на словы і зьдзівіўся, як гэта проста. Адразу ў чалавека з'явілася і гісторыя: ішоў адкуль, дзе і куды, і чаму ў плашчы? З'явілася і мінулае, і будучае, і цяперашняе. Галоўнае было зрабіць апошні крок - туды, і пайсьці побач разам зь ім. Пайсьці ў мінулым з самім сабою.

Ён задаволена пацягнуўся, устаў, і пайшоў у ложак. Яна ляжала мяккая, як кацяня, такая ж расслабленая, быццам бы бяз костак, у сьне павярнулася да яго, прыціснуўшыся да яго боку. Ён абняў рукой яе плечы, яна прачнулася і сонна глянула на яго.

- Ты прыйшоў, - праз сон вымавіла яна.

- Я заўсёды тут, каханая. Ён пацалаваў яе тонкае плячо і шыю, яна павярнулася, і ён адчуў, што ізноў ня зможа ўтрымаць сваё жаданьне.

- Хачу цябе, - вымавіў. Ізноў.

Яна ахапіла яго плечы рукамі, і ён апусьціў твар ёй на грудзі, убіраючы вуснамі яе саскі - сасочкі, нагадваючыя ягадкі брусьніц.

Яна ледзь чутна ўздыхнула, і ён накрыў яе сваім целам.

Яе стогны і жарсьць адгукаліся ў ім шалёнствам жаданьня, якое ня мела межаў у сваёй празе валоданьня ёю. Ізноў адчуваць яе пад сабою, блізкасьць яе скуры і вузкі твар з паўзакрытымі вачыма, з доўгімі вейкамі, якія адкідваюць цень на бледныя шчокі, яе аголеннасьць, кволасьць, безабароннасьць, пяшчотную скуру, чуць ускрыкі, і ізноў і зноў працінаць яе сабою, а потым пакрываць яе белы твар пацалункамі, і ізноў цалаваць яе грудзі, шыю, плечы, зьдзіўляючыся таму, якая яна нерэальная, быццам бы намаляваная ў нябёсным прасторы, быццам бы сонца зьзяе праз яе, ізноў праводзіць па ёй тварам і рукамі, лажыць яе сабе на грудзі і трымаць у абдымках, зусім ня адчуваючы яе вагі. Ён помніў той момант, калі ён убачыў яе ўпершыню – там, на выставе. Яна ішла праз натоўп, разразаючы яго, як плаўнік акулы разразае стаю мелкіх рыбёшак, тонкая і юная як Дыяна, прыгожая, як Венера, і велічная і пагрозная ў сваёй прыгажосьці, як Афіна Паллада. Гэтае дзіцё ня ведае моцы сваіх чараў, падумалася яму. У мінулыя часы за яе б забівалі, і бралі гарады. Яе цела вагалася полымем сьвячы, якую цалаваў вецер. Ён адразу пажадаў яе – цалаваць яе, абнімаць яе прыгожае цела, закрыць яе ружовыя вусны сваімі і ўвайсьці ў яе – глыбока, так, каб не выходзіць ніколі.

І цяпер яна належыла яму і была зь ім. Ці гэта ня дзіва? Ён мог толькі дзякваць за гэта Богу, за той цуд, які адбыўся, калі яны сустрэліся, за гэтае вялікае дзіва каханьня, за яе душу, якую яна працягвала яму, за тое, што аддавала - аддавала яму бясконца, і была гатовая аддаваць усё больш і больш, бо яе скарбніца была

невычэрпнай. І ён з удзячнасьцю браў, і аддаваў ёй у адказ, столькі, што гатоў быў вырваць свае сэрца, выліць на яе сваю душу, зьдзейсьніць дзеля яе любыя подзьвігі, у яе імя і дзеля служэньня ёй, каб яна магла ганарыцца ім, была абароненай і захінутай, быць яго каралевай, Шэкінай, адзінай у цэлым сьвеце.

- Я гатовы ўсё аддаць цябе, - улюбённа казаў ён ёй, абдымаючы і песьцячы яе, запоўнены каханьнем і пяшчотай.

- Я гатова ўсё прыняць ад цябе, каханы, - ціха вымавіла яна. – Няма таго, што я не прыняла б ад цябе, бо ўсё, што ты даеш мне, ты даеш праз сваю найвялікшую любоў.

Глава 6: Дзень першы

Высокі, шыракаплечы чорнавалосы мужчына прайшоў праз пляцоўку, і сеў у крэсла грымёру. На імгненьне вакол усталявалася цішыня. Мноства вочаў зь цікаўнасьцю глядзелі на яго. Пагода стаяла сонечная і ясная, але ж не сьпякотная, і яны вырашылі выкарыстаць апошнія дні восені для здымкі, каб потым зрабіць паўзу, перагледзець напрацаванае, і працягнуць работу ўжо ў Афрыцы – у Егіпце, ці ў Марока.

Дзённае сьвятло падкрэсьлівала твар мужчыны – вуглаваты, з рэзкімі рысамі, абазначанымі скуламі і моцным падбародкам, пакрытым чорнай барадой. Яго густыя бровы былі строга ссунуты, карыя вочы зь нейкім аксамітна-зяленаватым, залатым адценьнем уважліва аглядалі натоўп, праходзілі праз яго, як нож праз масла, і спыняліся недзе там, у далечыні, якая была бачная толькі яму.

- Вас зусім ня трэба грыміраваць!

Сандра ў захапленьні глядзела на яго, вывучаючы яго рысы.

- Паола, дзе ты знайшоў такую выдатную фактуру? – нарэшце вымавіла яна, зьвярнуўшыся да рэжысёра.

- Дзе знайшоў, там ужо няма, Сандра. У саборы Сьвятога Петра. І гэта ты яшчэ “Елену” ня бачыла. Я знайшоў іх разам, і шаноўны Міхал і яго жонка пагадзіліся прыняць удзел у нашай стужцы.

- А дзе Елена? – вымавіла Сандра зацікаўлена.

- Яна не з’явіцца раней трэцьцяй сцэны. Сёньня мы здымем колькі здымем, а заўтра ты зь ёй папрацуеш. Міхал, а Летыцыя дзе? – Паола зьвярнуўся да чалавека, на твар якога Сандра пачала накладаць цёмны грым, каб зрабіць адценьне сьпечанай сонцам скуры.

- Летыцыя тут, у вагоньчыку. Міхась прама глядзеў перад сабой,

каб не перашкаджаць Сандры працаваць. - Яна прыйдзе крыху пазьней – хоча пабачыць мяне адразу ў грыме. Думае, што не спазнае. Міхась усьміхнуўся вугалкамі вуснаў, і Сандра лёгка стукнула яго кісьцю па носу.

- Не варушыцеся, спадар воўхв. Ці – хто вы там яшчэ ў нашага Паола. Цяпер ваш Бог – гэта я, і я загадваю вам мне не перашкаджаць, а тое ўвесь будзеце ў плямах – грым застывае хутка.

Яна лоўка расьцірала фарбу спонжам, і даводзіла да дасканаласьці кісьцямі.

- Ну вось і гатова! -нарэшце вымавіла яна. Ён падняўся з крэслу, і глянуў у люстэрка. Перад ім стаяў высокі, малады іўдэйскі мужчына. Год на дзесяць маладзей за яго – Сандра пастаралася. Яго смуглы твар, прыгожы, скуласты, з гарашчымі вачыма, якія цяпер выглядалі пранізьліва-чорнымі пад густымі бровамі, быў нібыта спалены сонцам. Ён стаў выглядаць больш худым, нярвовым – твар аськета і містыка, які праводзіць дні ў самоце, сам насам са сваімі думкамі, кнігамі і Богам, які адзіны яго суразмоўца, сябар, настаўнік і гаспадар там, дзе няма абмежаваньняў паміж гэтым і тым сьветам.

- Зараз апранешся, і пабачыш, як усё будзе дасканала! Паола быў шчыра задаволены працай. Сандра была вядомым візажыстам і грымёрам, і адпрацавала разам зь ім не адзін паказ. Яна радасна ўсьміхалася, папраўляючы рукой пышныя, кучаравыя валасы, якія на макушцы былі забраны ў высокі хвост, як у дзяўчыны-падлетка. Рэшткі пасмачак тырчэлі вакол, буйная чолка падала на лоб.

- Ну да, добра атрымалася. Яна прыдзірліва агледзела сваю працу, і яшчэ раз махнула пэндзалем – напасьледак.

- Цяпер цябе трэба крыху запыліць. Дарэчы, не крыху, а добра. Паола хлопнуў яго па плячы.

- Перакур! – вымавіў ён. Усе адразу громка залапаталі, пачалі зьбівацца ў групкі, і пацягнуліся ў бакі.

Ён дастаў мабільнік, і набраў нумар.

- Каханая! Усё гатова. Можаш на мяне глядзець.

На том канцы зазьвінеў радасны жаночы голас. Сандры здалося, што дзяўчына маладая. На твары мужчыны з’явілася прывабная вусьмешка.

- А ён яе кахае, - чамусьці падумалася ёй, і нават стала неяк па-жаночаму зайздросна.

Хутка ад вагончыка аддзялілася стройная постаць, якая хуткім крокам накіравалася да іх. Высокая чорнавалосая дзяўчына ў вузкіх блакітных джынсах і вольнай белай туніцы, упрыгожанай карункамі, якія пенай спадалі на яе тонкія рукі, у сандаліях-эспандрыльлях, з густым конскім хвастом на затылку, які дасягаў сярэдзіны яе сьпіны. Яна зусім ня мела загару, яе скура толькі набыла ад сонца малочна-залацісты колер. Твар дзяўчыны, чысты і прыгожы, вузкі, зь невялікімі пухлявымі вуснамі, закрывалі чорныя акуляры-авіятары. Па таму, якая яна закрытая, Сандра зразумела, што прыгажуня баіцца сонца, і паціснула плячыма, нібыта не разумеючы. Яна была, наадварот, смуглая, шакаладная, і яе мускулістае атлетычнае цела было максімальна адкрытым ва ўсіх месцах, дзе толькі можна. Кароткія шорты і топ не хавалі яго, было бачна, што яна ганарыцца сваёй стройнай постацьцю, праработанымі мышцамі, якія мелі мяккі, але ж заўважны рэльеф. І акуляраў яна таксама не насіла – навошта. Яе вачам трэба бачыць рэчы такімі, якія яны ёсьць. А сонца яна не баіцца – яна зь ім, наадварот, сябруе.

Некалькі рабочых разышліся ў бакі, і нехта прысьвіснуў дзяўчыне ўсьлед. Яна, здаецца, зусім не зьвярнула на іх увагі, толькі паправіла акуляры, якія і так сядзелі ідэальна на яе авальным тварыку.

Падышла да іх, і спынілася. Ён ужо пасьпеў апрануць пыльную туніку, якую быццам бы качалі па пяску – шэрую, з грубай воўны, накінуў на плечы цёмна-блакітны плашч, і толькі што завязаў рэмні скураных сандалій з вострымі насамі. Стаяў, і глядзеў на яе ўсьміхаючыся.

- Ну, як я табе, каханая? – нарэшце вымавіў, бачучы зьдзіўленьне на яе твары.

- Ты – проста як Майсей! – вымавіла яна. – І барада ў цябе вырасла. Яна ўсьміхнулася, падышла, і асьцярожна абняла яго.

- Я яшчэ не пасьпеў запэцкацца ў пылу – паваляцца, як мяне вучыў Паола. Толькі Сандра сказала, што гэтага ня трэба. Пясок на тканіне – гэта фарба, і яна трывалая. Так што можаш мяне абдымаць, колькі захочаш. Толькі не цалуй, а тое станеш такая жа чорная, як я.

Яна ў захапленьні глядзела на яго.

- Ты такі прыгожы! – нарэшце вымавіла. Зьняла цёмныя акуляры, і зазірнула яму ў вочы. Толькі цяпер Сандра ў поўнай меры асэнсавала, якая прыгожая яна. Твар дзяўчыны меў настолькі правільныя, клясычныя рысы, што нават галоўка Нефертыты побач зь ёй здалася б грубай і недасканалай. Яна больш нагадвала антычныя скульптуры, толькі яе рысы былі танчэйшымі, пазбаўленымі ўсходняга цяжару, нос быў вузкім, ідэальнай формы – ня доўгім і не кароткім, вочы – вялікімі і раскрытымі, з чорнымі тонкімі бровамі дугамі, лінія скулаў і ськівіцы – мяккай, амаль дзіцячай. І адначасова ўсе гэтыя рысы разам вылучалі такое хараство, што ў Сандры захапіла подых. Як прафесіянал, яна магла бачыць і ацаніць прыгажосьць. Гэтая ж прыгажосьць была бясцэннай.

І адначасова нешта ў гэтай дзяўчыне адштурхвала яе. Яна здалася ёй манернай, ня шчырай, нейкай лялькай-ламакай, якая з салодкім выразам на твары прыціскаецца да чарговага “папіка”, прыкідваючы ў вуме, што зь яго можна памець, пакуль не зьмяняе яго на другога. Яна была значна маладзейшая за яго, амаль дзіця ў параўнаньні зь ім, і ён глядзеў на яе закаханымі вачыма, у захапленьні, як багач на новую цацку, якую яму яшчэ мае быць разгарнуць.

- Канешне, ён закаханы! – падумалася Сандры. – Яны заўсёды абіраюць такіх, юных, і глупых. Ні на вошта ня вартых. Пагледзем, якая яшчэ яна будзе актрыса.

Але ж яна зробіць сваю работу ідэальна, як і заўсёды. Такі мадэльны твар нафарбаваць прасьцей простага. Пэўна, такая гэтая “Елена” і павінна быць – ніякая, спакусьлівая хцівая блудніца ў параўнаньні зь ім, у вачах каго гарыць Божы вагонь. Яна прызвана падкрэсьліць яго падзеньне, сыход у матэрыю, так казаў ёй Паола, калі яны абмяркоўвалі сцэнар. Жанчына, якая выконвае роль Шэкіны, прыгожа апранутай статуі, якая красамоўна маўчыць, пакуль ён сыпе палымянымі словамі, запальваючы імі натоўп.

- Пачынаем! – голас Паола, гучны, ня гледзячы на малы рост, абляцеў лагер, і на яго пацягнуліся аператары і шмат іньшых, падсобных рабочых.

Ён узяў з полу прыгаршню пяску, і кінуў Міхасю ў валасы, пацёр рукой па плячы.

- Надта ты чысты, - вымавіў ён. – Пакачацца б было трэба.

- Я табе пакачаюся! Сандра раз’юшана стала рукі ў бакі. – Усё дасканала прамалявана. Ня псуйце мне працу, і адзеньне, яго мыць нельга!

- Ну ладна, раскрычалася. Паола махнуў на яе рукой, а потым – далей, у накірунку, па якім Міхась павінны быў ісьці на камеру. Здымаць планавалася і ззаду, і сьпераду, і з бакоў – Паола жадаў мець розныя ракурсы. І кожны раз трэба было прайсьці па дарозе некалькі сотняў метраў.

Міхась ішоў і ішоў, яму здавалася – бясконца. Сонца апальвала яго, жгло вострымі промнямі-джаламі. Хутка яго адзеньне пакрылася пяском, валасы намоклі і зблыталіся, ногі былі пакрытыя пылам.

- Вой, як добра! Як натуральна! Ты быццам бы тыдзень па пустыне хадзіў! Паола пакрэхтваў ад задавальненьня, кожны раз сустракаючы яго на пачатку шляху.

- А зараз – крупны ракурс здымем! Вой, як цудоўна! Ён нават пляснуў у далоні. Міхась заглянуў ў камеру, і пакачаў галавой. Твар яго цяпер быў і сапраўды страшны. Нейкі пустыньнік-

аськет, Ян Хрысьціцель, які ўсе свае дні праводзіў пад палячым сонцам, плёскаўся ў вадзе Іардану, і з год не часаў ні бараду, ні валасы.

- Паола, я стаміўся, як ніколі ў жыцьці. Быццам бы я і сапраўды апошнія некалькі дзён ташчыўся па пустыні ад самага мора недзе ў Палесьціне да бліжайшага паселішча. Мне цяпер адмывацца прыйдзеца таксама тыдзень. Міхась узяў мокры рушнік, і выцер твар. На рушніку адбілася цёмная фарба.

- Пайшлі, Мікеле. Я табе сама ўсё змыю. Сандра пацягнула яго да крэсла, на якое ўсадзіла, і хутка зьняла грым. Ён зьдзівіўся, як лёгка стала яму дыхаць.

- А дзе твая жонка? – запытала яго Сандра. Яна стаяла, пацягваючыся, запракінуўшы рукі за галаву, выставіўшы наперад вострыя грудзі афрыканкі ў маленькім топіку.

- А што ёй тут рабіць? У вагоньчыку. Міхась пацінуў плячыма. – Навошта ёй смажыцца на сонцы? Гэта ты сонца не баішся, бо ж такая ты нарадзілася. А яна – другая. Ён усьміхнуўся.

- Дзякуй табе за працу. Ты – сапраўдны майстар. Ён лёгка хлопнуў Сандру па плячу – па-сяброўску.

- Пайду адпачываць.

- Прыходзь да нас. Мы “party” ладзім. Пасьля вячэры. Сандра шырока ўсьміхнулася ў адказ.

- Party? – ён глянуў на яе. – Ведаеш, мы з жонкай хацелі паглядзець Матэру. Яна і так увесь дзень прабыла адна. Але ж дзякуй за запрашэньне. Калі вернемся, і ваша party яшчэ ня скончыцца, мы далучымся да вас.

- А я нічога не казала пра жонку. Сандра пацінула плячыма. Яна вымавіла гэта яму ўсьлед, калі ён ужо добра адышоў, і, пэўна, ён не пачуў.

- Добра атрымалася! – Паола падыйшоў да яе. – Прама з першых дубляў. Ён быццам бы народжаны для гэтай ролі, нібыта ўсё жыцьцё па пустыні хадзіў.

- Як табе яго жонка? – запытала яна. – Думаеш, зь яе атрымаецца актрыса?

- У мяне – атрымаецца. Я ўпэўнены. Пры яе фактуры ня здыме яе толькі поўны дурань. А я ж ня дурань. Я магу ўбачыць і адлюстраваць прыгажосьць. Хоць, канешне, мадэль гэта не актрыса, і тут трэба і гаварыць, і паказваць эмоцыі. Аднак яе роль амаль пазбаўлена словаў. Ды не скажу, што гэта значна прасьцей. Паола пацёр рукой падбародак.

- Ведаеш, мне здаецца, я здымаю шэдэўр, - раптам даверліва вымавіў ён, гледзячы ёй у вочы. Сандра сардэчна абняла яго рукой.

– Канешне, так яно і будзе, Паола – зь мяккасьцю гледзячы на яго, вымавіла яна.

Глава 7: Мешыах

- У тым, што вы робіце, няма Бога!

Ён з выклікам глядзеў у твар Зарававеля, сухі, вастраносы, нагадваючы арліны, з навіслымі сівымі бровамі над чорнымі вачыма.

- Вы ня ведаеце Яго, а я - ведаю! І тут - Яго няма! Ён паказаў рукой на скруткі торы, якія ляжалі на стале. Браты, як чорныя цені, стаялі ля сьцяны насупраць.

Яго паклікалі на суд. Што ж, хай будзе суд. Суд, і пакараньне. Яму было ўсё роўна пасьля таго, што ён даведаўся і ўбачыў. Зь ім гаварыў сам Бог, і ён прыйшоў перадаць ім Яго словы. Будзе Новы Закон, сказаў Ён. Новы Запавет. Усё зьменіцца. Ужо зьмянілася. Людзі будуць жыць па-іньшаму, і гэта ўсё будзе ім непатрэбнае.

- Гэта ўсё ня трэба. Яно залішне. Ён рашуча падыйшоў да сталу, на якім ляжалі скруткі.

- Храм старой веры будзе зруйнаваны, і аднавіцца ў сьвеце новым, у тым царстве, якое ўжо нападыходзе. І я нясу вам яго!

З гэтымі словамі ён размахнуўся, і скруткі пасыпаліся на падлогу. Яны разьляцеліся ў бакі, і ў пакоі пачуўся адзіны ўздых-ускрык. Цені кінуліся да яго, пэўна, прагнучы на месцы пакараць за блюзьнерства. Ён рашуча павярнуўся да іх, і стаў прама, раскрыўшы грудзі.

- Вы жадаеце кроў і плоць маю? Вось яна! Ешце і піце ад мяне. І ведайце, што прымаеце цела Бога.

Натоўп спыніўся - па манавеньню тонкай старэчай рукі.

- Пакіньце яго. Ён - вар'ят, - прарыпеў сухі, тагасьветны голас.

Хай сыходзіць. Ня пэцкайце рукі і сьвятое месца трапезнай крывёю.

Ён і так загіне - ад голаду і смагі. Ідзі! Ідзі, куды ты жадаў. Туды, дзе пануе Сатана, і пячэ сонца. У пустыню. Яна прыме цябе. Мы ж болей ня можам цябе тут бачыць.

Зарававель спакойна апусьціў руку. Яго позірк не выражаў нічога акрамя ўпэўненасьці - што ён адзіны правы. І ён, Шымон, памрэ. Як паміралі ўсе з братоў, якіх праглынала пустыня.

- Я пайду, - спакойна вымавіў ён. - Туды, дзе пануе Сатана - ваш Бог. У сьвет, які чакае Бога новага, сапраўднага, якога яму нясу я.

- Словы вар'ята - пустэча, ня вартая ўвагі. Зарававель павярнуўся да яго сьпіной. Гэта ж зрабілі і ўсе астатнія.

Ён таксама павярнуўся - ісьці. Ззаду раптам пачуліся тараплівыя крокі. Ён спыніўся, ня гледзячы. Нехта ўзяў яго за руку. Узяў крэпка.

- Ойча, я пайду за табой! - вымавіў юначы голас.

- Ян? Ён не глядзеў, але ж у думках убачыў твар, прыгожы, малады, з прывабнай шырокай вусьмешкай.

Юнак апусьціўся ля яго на калені, і прыціснуўся да яго рукі

вуснамі.

Пустыня сустрэла іх негасьцінна - воем халоднага ветру, які ўзьбіў іх валасы, уськінуў над плечамі плашчы нібы крылы, кінуў у твар прыгаршні пяску.

Неяк яны здолелі знайсьці прытулак за вялікай скалой, за якой схаваліся ад ветру. Паспрабавалі разпаліць вогнішча, ды яно ўспыхвала, і адразу патухала, пакуль пад наваленным грудай вецьцем не зацяпліўся кволы, але трывалы агеньчык, над якім хіба толькі можна было грэць рукі.

Яны паселі ля яго, прытуліўшыся сьпінамі да скалы, і амаль адразу паснулі.

Ён прачнуўся ад крокаў. Ян іх ня чуў - спаў, але ж яго спрактыкаванае вуха былога воіна храму адразу злавіла гукі нечага набліжэньня.

Ён прыўзьняўся, асьцярожна загарнуўшыся плашчом, сьціскваючы ў руцэ шырокі востры нож. Нажаль, мяча ў яго не было, аднак, падумаўшы імгненьне, ён і нож адкінуў. Ня з гэтага яму трэба пачынаць новае жыцьцё. Меч застаўся ў мінулым, разам з пыльнымі агромністымі сьвіткамі. Цяпер у яго была адна толькі зброя - Слова. І Слова было ў Бога, і Слова было Бог.

- Хто там? - гучна вымавіў ён. Ян прачнуўся, і адкрыў вочы. Вецер разьнёс яго словы па пустыне, і, прыўмножыўшы, кінуў гук наперад.

- Рабі, гэта мы! - пачуўся з-за камянёў нечы напалоханы, усхваляваны і адначасова радасны голас.

- Мы ледзь адшукалі вас. Барадаты чалавек зрабіў крок да яго -

да сьвятла.

- Мы прынесьлі рыбу! Ён працягваў яму карзіну, накрытую белай ільняной тканінай. Некалькі чалавек, стаяўшых за ім, раптам апусьціліся на калені, акунуўшы твары ў пыл.

- Гэта ты, Пётр? Сапраўды, ты прыйшоў да мяне, - радасна вымавіў ён. - Устаньце. Прайшоў час, калі наш народ стаяў на каленях. Бо цяпер ідзе царства новае, у якім роўны сядзе побач з роўным, і ня будзе ні цара, ні сьвятара, ні храму, а толькі еднасьць усіх і кожнага ў іх аб'яднаньні з Богам.

- А як гэта - еднасьць? І як гэта ўсе могуць быць роўныя? - не разумею.

Пётр пасунуўся бліжэй, паставіў кошык, і сеў ля вагню.

- Еднасьць - гэта царква, - патлумачыў ён. Але ж храм ня будзе каменным. Ён будзе жывым. Кожны з вас - гэта храм, і разам вы ўтвараеце нябёсную царкву, з усімі праведнікамі, пакутнікамі, прарокамі і іньшымі, хто казаў аба мне і быў у Ім. А цяпер трэба прыгатаваць рыбу, бо ж нам трэба паесьці. І калі рыба будзе прыгатаваная, і кожны з нас насыціцца, я працягну вучыць вас і адказваць на вашыя пытаньні.

- Трымай нож, Ян. Ён працягнуў юнаку лязо.

- Бо вум твой востры, і такім жа будзе тваё слова. Ты прыгатуеш шмат рыбы для мяне, але ж гэта будзе пазьней.

Глава 8: Матэра

Ён увайшоў у вагоньчык стомлены, але ж шчасьлівы. Яна ляжала на ложку, і чытала. Убачыўшы яго, узьнялася, падышла, і абняла за шыю.

Яго вялікія рукі ахапілі яе талію, ён мякка крануў вуснамі яе шчаку, адчуваючы тонкі духмяны пах. Ад яе заўсёды пахла неяк па-новаму, дзівосна, водарамі, якім ён ня мог падабраць назвы. Ля яго вачэй яе доўгія вейкі ўздрыгнулі, паўпразрыстыя павейкі апусьціліся, і яна прыціснулася да яго нахінутага твару сваім.

- Саскучала, кацяня маё? – вымавіў ён. – Як ты тут была без мяне?

- Саскучала, каханы. Яна прыціснулася да яго, адчуваючы яго гарачае цела пад тонкай ільняной тканінай.

- Нічога, зараз адпачнем крыху, і пойдзем прагуляемся. У горад сходзім, павячэраем. Знойдзем нейкі прыгожы рэстаран. Там, пэўна, іх шмат.

Ён падхапіў яе на рукі.

Яго вочы, цёмныя ў паўзмроку вагоньчыку, зазіралі ёй у твар.

- Якая ты прыгожая, - вымавіў ён.

Яе твар і сапраўды набыў нейкія таямнічыя, новыя для яго рысы. У гэтым горадзе ўсё было па-іньшаму. Усё было не так, як звычайна. Нібыта ён трымаў яе на руках упершыню, і дагэтуль ня ведаў яе, і пры гэтым яна была яму даўно знаёмая, родная, такая, што радней ня можа і быць у сьвеце. Быццам бы ён трымаў на руках сваю дарослую дачку, якую даўно ня бачыў. Яго каханьне да яе было цяпер ціхім і пяшчотным, але ж ад гэтага ня меньш, нават больш моцным. Яно набыло трываласьць камяню, у якім была высячана Матэра – адвечнае, простае, грубае і ідэальна дасканалае ў сваёй недасканаласьці ліній, якія казалі аб адвечным. Як скульптар, ён разумеў дзіва

Матэры, месца, якіх ня многа засталося ў сьвеце. Гэтыя пячоры дыхалі Богам, і цела чалавека здавалася ў іх нібыта працягам пяшчаніку, такое ж карычневатае і цёплае побач з шурпатай плоцьцю зямлі, адпаліраванай часам.

- І ты прыгожы для мяне, каханы, - вымавіла яна. Яе ружовыя вусны прыадкрыліся, звалі яго прыціснуцца да іх, адчуць смак яе губ, іх вільгаць, убачыць яе закрытыя вейкі перад яго вачыма. Яна заўсёды закрывала вочы, калі ён цалаваў яе. Закрыла яна іх і цяпер. Ён прыціснуўся губамі да яе губ, апаляючы яе сваім подыхам. Яе дыханьне было чыстым, лёгкім і сьвежым, як вецярок раніцой, які калыша тонкія белыя шторы адчыненага вакна.

Яго вусны рассунулі яе вусны, убіраючы іх. Яна ўздрыгнула, і яе язык дакрануўся да яго губ, а потым – да яго языка. Яна паглыбілася ў яго глыбіню, а ён – у яе, мера адкравеньня паміж імі дасягнула такой паўнаты, што яны згубілі адчуваньне межаў паміж іх вуснамі, і цяпер гэта было адзінае Слова і адно дыханьне. Калі спачатку ён цалаваў яе асьцярожна і мякка, як цалуюць дзіця, ледзь кранаючы вуснамі яе маленькія ружовыя губы, баючыся пакрыўдзіць ці адштурхнуць яе, ня ведаючы тых межаў, якія яна жадала дасягнуць і меры, у якой яна магла яго прыняць, цяпер ён ведаў, што і меры і межаў болей няма, і яна прыме яго ўсяго і ўсюды, кахаючы кожную часьціну яго плоці, так, як і ён кахаў яе, усю і ўсюды, поўнасьцю і бяз рэштку, прагна і горача, узносімы на нябёсы жаданьнем і магчымасьцю ёй валодаць. І цяпер яна так жа валодала ім, поўнасьцю, прагна і горача, і жадала ўсё больш і больш яго, каб спатоліць смагу, якую суцішыць у ёй мог толькі ён.

Яго пацалунак быў глыбокім, сапраўды бязьмежным. Ён поўнасьцю увайшоў у яе вусны, і яна прыняла яго і адказвала яму горача і палка. Яны апусьціліся на ложак, і, ужо не валодаючы сабой, ён неяк зьняў зь яе адзеньне, вызваліўшы яе тонкае цела, яшчэ больш белае у паўзмроку закрытых штораў, з цёмнымі цяпер саскамі, цёмным ценем унізе ўлоньня - пагрознае ў сваёй прыгажосьці юнае цела, якое заклікала яго быць неасьцярожным, уладным, прагным, поўнасьцю аддацца гэтай зводзячай з розуму прыгажосьці, нават па-за межамі

прыстойнасьці і болю, па-за ўсім, што мела катэгорыі можна ці нельга, апусьціцца, ці, наадварот, узьняцца да сьвятога вар'яцтва, рабіць тое, ад чаго абывацель закрывае вочы, што можа зразумець толькі такі ж ап'янёны, распалены жарсьцю розум, і сэрца, бязьмежнае ў сваёй любові. Яна адказвала яму так жа, зьліваючыся зь ім ўсім і усюды, яднаючыся рукамі, вуснамі, і ўсім, што магло дакрануцца адно да аднаго, увайсьці адно ў адно, прыціснуцца да процілегласьці у яго целе, якую яна бязьмерна жадала, каб дапоўніць ім сябе.

Для яго і яе не было межаў ні ў еднасьці, ні ў роднасьці іх целаў і душаў. Яны зліліся так поўна, быццам бы ён нарадзіў яе, а яна – яго, ап'янённыя каханьнем адначасова і роднасным, і адштурхваючым, такім моцным было яго прыцягненьне, настолькі цесным і глыбокім, яно вымушала яе ускрыкваць і адсоўвацца ад яго, жадаючы, каб ён пераадолеў гэтае яе імкненьне супраціва, скарыў яе, і вымусіў падпарадкавацца яму, не зважаючы на яе боль і нежаданьне, якое было вяршыняй жаданьня такога моцнага, што яно дасягнула сваёй поўнай процілегласьці. Яго пацалункі былі прагнымі, глыбокімі і бессаромнымі, яго валоданьне ёю палохала яе цела, вымушаючы ўздрыгваць ад жаданьня яе душу, якая гэтым робкім целам пагарджала, штурхаючы яго насустрач асалоде такой глыбокай, што яна была б для цела сьмяротнай, але ж сьмерці не наступала, і новае і новае жыцьцё ізноў і зноў улівалася ў яе з кожным рухам ў ёй яго плоці.

Яна даўно ўжо згубіла лік часу і асэнсаваньне таго, што адбывалася. Усё зьлілося ў суцэльную асалоду адчуваньня яго цела, і таго, што ён так блізка, над ёй, у ёй і зь ёй, што яна аддаецца яму поўнасьцю, і ён поўнасьцю бярэ яе, ня стрымліваючыся, на ўсю глыбіню сваёй моцы, і свайго каханьня.

Яны ляжалі мокрыя, пакрытыя потам і яе і яго семенем, сплёўшыся адно з адным, і не маглі раз'яднацца.

- Анёлак мой. Ён пагладзіў далоньню яе твар.

- Я нічога дрэннага табе не зрабіў? Прабач мяне, бо ж калі я валодаю табой, я не магу стрымлівацца. Ты клічаш мяне так

глыбока, што я перастаю сябе кантраляваць. Не магу спыніцца.

Яна пацалавала яго руку.

- Я жадаю, каб ты быў нястрыманым. Каб ты зрабіў са мной усё, што ты пажадаеш. Валодай маім жыцьцём і сьмерцю, любы, бо ўсё, што ты робіш, усё для мяне праведна, і так і павінна быць. З табой толькі я пачынаю асэнсоўваць сябе такой, якая я ёсьць сапраўдная. Я – у поўнай тваёй уладзе, і ў асалодзе, і ў болю, які ўсё роўна асалода, калі я атрымоўваю яго ад цябе праз нашае каханьне, бо ж я веру, што ты вядзеш мяне туды, дзе болю болей няма, па-за межы яго, туды, дзе толькі найвялікшая радасьць.

- Я ніколі не жадаў прычыніць табе боль, любая. І не пажадаю. Ён прыціснуўся тварам да яе твару, абнімаючы яе.

- Ты – мой анёлак, маленькі і любы, і я хацеў бы прыносіць табе толькі радасьць. Прабач, калі маё каханьне для цябе балючае. Ён пацалаваў яе руку.

- Яно для мяне сьвятое. Яна прыціснула яго руку да шчакі, і пацалавала яе ў адказ.

Ён і сапраўды адчуваў блюзьнерства ў тым, як ён яе кахае. Яна была для яго даражэй, чым увесь сусьвет. Ніхто і нішто болей не былі яму патрэбныя. Калі ён з'ядноўваўся зь ёй, калі трымаў яе ў сваіх руках, ён адчуваў нешта, невыразнае словамі. Быццам бы ён ведаў усё. Калі ён глядзеў у яе твар, калі кранаў яго губамі, абдымаў яе, цалаваў яе вусны і вочы, гладзіў яе валасы, ён адчуваў, што кранае Бога. І гэты Бог быў для яго жанчынай. Сябе ён ведаў, яе ж – спазнаваў, і разумеў, што ў ёй спазнае сусьвет. Яна была для яго Прыгажосьцю, Праўдай, Чысьцінёй, Веліччу і Нябёсамі. Усімі эонамі, і самой учалавечаннай Сафіяй. І ў той жа час яна была яго дзіцём. Ён ня ведаў, як гэта атрымоўваецца, і не жадаў ведаць.

- Ты – усё для мяне. Я бачу цябе ўсюды, і знаходжу цябе ўсюды, - казаў ён ёй, і яна прыціскалася да яго грудзей, да яго твару – сваім тварам.

- Ты – быццам бы і маё дзіця, і ўсё для мяне, самае прыгожае, чыстае, сьветлае, што ў мяне ёсьць. Калі я бачу цябе, я пра сябе забываю, быццам бы я паміраю, і нараджаюся ў табе нанова – іньшым, больш дасканалым, і гэта адбываецца бясконца.

- А я паміраю, і нараджаюся ў табе, каханы.

Яе вусны кранулі яго шчаку, і ён быццам бы прачнуўся ад сну. Яна ляжала перад ім, і ўсьміхалася.

- Табе хораша са мною, сонейка? – запытаў ён яе.

- Мне хораша з табой, каханы, - адказала яна. – Ты – для мяне ўсё. Я нарадзілася, каб кахаць цябе, і быць з табою. Без цябе б я загінула. Як добра, што ты выратаваў мяне, вызваліў з гэтага сьвету. Ён быў вязьніцай для мяне, але ж цяпер ён стаў для мяне палацам, бязьмежным, які хавае столькі скарбаў, што іх нельга і зьлічыць.

Яна узьняла на яго вочы, і ён крануў яе вусны сваімі, нахінаючыся над ёй.

- Пойдзем, прагуляемся, любая? – прапанаваў ён ёй. – Сьпякота ўжо спала.

- Пайшлі, каханы. Яна ўзьнялася на ложку. Ён жа імгненьне марудзіў, любуючыся ёю. Яна высока ўзьняла рукі, закалваючы валасы, выгнуўшыся, як лук, зь якога гатовіцца выляцець страла Амура. Яе грудзі, маленькія, не парушаючыя гармонію яе цела, надавалі яму нейкую незямную нявіннасьць, быццам бы яна была анёлам, які апусьціўся да яго, і сядзеў, падставіўшы твар нябёснаму сьвятлу, а ён, незаўважаны, дапушчаны назіраць гэтую прыгажосьць, цноту якой нельга апаганіць нават і позіркам. Касыя промні вячэрняга сонца лашчылі яе цела, абліваючы яго жыдкім золатам, і чырваньню – як крывёю, быццам бы на яе белай скуры з’яўляліся палосы ад удараў бізуна. Яму здавалася, што яе пяшчотнай скуры балюча нават і ад гэтых сонечных дакрананьняў, якія былі для яе надта плоцкімі, надта зямнымі. Ён захінуў бы яе ад усяго, нават і ад сонца, асьвятляючы яе толькі сабою. Схаваў бы яе глыбока ў сваім сэрцы, у атачэньні свайго каханьня, якое было адзінае

годнае кранаць яе дасканаласьць.

Асьцярожна ён правёў рукой па яе сьцягну.

- Ты такая прыгожая, што цябе і кранаць страшна. Як анёлак, спусьціўшыйся зь нябёсаў. Мне здаецца, ты не належыш гэтаму сьвету.

- Я належу табе, - вымавіла яна. Устала, нахінуўшыся, пацалавала яго, і пайшла ў душ.

Вечар хутка апускаўся. Калі яны выйшлі з вагоньчыка, на небе ўжо панаваў раскошны, чырвона-барвовы закат, быццам бы горад, які узвышаўся на скале пад імі, гарэў. Яны знаходзіліся вышэй па ўзроўю, і адтуль ім была бачная ўся Матэра – старая, нібыта адвечная, з дамамі, вырастаючымі прама зь цела скалы, якія зьбягалі ўніз тэрасамі. Узяўшыся за рукі, яны пайшлі да горада па дарозе. Яна не захацела браць машыну, вырашыла прагуляцца. Яе кароткая белая туніка і шорты з карункамі, шаўковыя, лёгкія, нагадвалі дарагую бялізну, на маленькіх нагах былі апранутыя рымскія сандаліі. Яна высока ўзьняла валасы, і закалола іх вузкай чорнай шпількай.

Пасмачкі падалі ўздоўж яе шчокаў, віліся па шыі. Яна з радасьцю пазірала на яго. У чорных джынсах і рубашке ён выглядаў побач зь ёй як пагрозны цень – сам адчуваў гэта, і ўсміхаўся.

- Не стамілася? Хочаш, панясу цябе? – прапанаваў ён.

- Панясі! – вымавіла яна, узрадваўшыся.

Ён узяў яе на рукі, зусім не адчуваючы яе вагі. Яна ахапіла яго за шыю. Яму сапраўды здавалася, што ён нясе на руках анёла.

- Грэшная зямля ня годная, каб яе краналі твае ножкі, - пажартаваў ён.

Сандра стаяла, і глядзела, як па дарозе ад яе падалялася чорная постаць мужчыны, які нёс на руках дзяўчыну, апранутую ў белае. Відовішча зачаравала яе.

- Нібыта дземан зносіць кудысьці анёла, - падумалася ёй. Сонца акрэсьлівала горы закатнымі промнямі, паліваючы ўсё патокамі расплаўленага золата, серы і кінавары. Хутка буйства фарбаў згасьне, і ўсё закрэсьліць срэбрам ртуці ноч – стары алхімік, які будзе тварыць сваё чараўніцтва да раніцы, пакуль зь яго тыгелю ня ўзьнімецца філязоўскі камень сонца.

Сандра не магла сказаць, што яна адчувала. Нейкія веды раптам увайшлі ў яе, такія, якія не былі акрэсьлены словамі.

Яе сэрца раптам працінула глыбокая пячаль.

- У гэтым жорсткім, нядасканалым сьвеце Бог павінны быць Сатаной, - падумала яна.

А хто тады – сапраўдны Бог? І калі Сатана нараджаецца ў бліскучыя адзеньні цноты, узвышаючыся над сьхіленымі галовамі ў абліччы Бога, то тады, пэўна, той Бог, які ісьціны, павінны сыйсьці сюды ў абліччы Сатаны, Лючыпара, які будзе страшным караючым мячом для гэтага сьвету, акрываўленным, пакрытым ранамі боек, аблічаючым, вобраз якога будзе ўражваць і палохаць, бо тое, што ў дасканаласьці не-існаваньня мае воблік прыўкрасны, пройдзячы праз адмоўны фільтр нядасканаласьці, будзе выглядаць жудасным. Як Хрыстос, які, пэўна ж, недасканаламу розуму ўнушаў не любоў, а жах, і для бесаў і дземанаў плоці меў аблічча страшное і палохаючае.

Мужчына трымаў тонкае дзявочае цела асьцярожна, зь любоўю. Яго вялікія рукі вакол яе пяшчотнага цела раптам сталі для яе блізкімі, быццам бы ён нёс яе.

- Сьмерці няма, Сандра. Я нясу яе ў жыцьцё, - пачулася ёй.

Яна прыкрыла вочы. Карціны мінулага раптам сталі перад ёй, як наўяве.

Мноства рук трымаюць яе. Яна крычыць, вырываецца. Атрымоўвае ўдар па твары, і вакол настае цемра. Сьпякотна. Сонца паліць. Яна ідзе па дарозе. Яе валасы растрапаліся, і яна ня ведае, дзе яна, і што зь ёй. З апошніх сілаў яна робіць яшчэ адзін крок, і падае. І праз ускользваючую сьвядомасьць чуе

гудок. Побач спыняецца аўтамабіль. Малады мужчынскі голас кажа ёй устрывожана нешта – на мове, якую яна ня ведае. Тады яна яшчэ ня ведала гэтую мову, якая потым стане яе роднай.

Яна адчувае, як нечыя рукі ўзьнімаюць яе, і нясуць. На сядзеньні аўтамабіля яна прыходзіць у сябе. Кіроўца паварочваецца да яе, і нешта кажа, усьміхаючыся.

- Bella, - чуе яна. Гэтае слова ўсе казалі, калі бачылі яе, перад тым гэтым.

Твар мужчыны малады, худы, нярвовы, зь вялікімі чорнымі вачыма і доўгім носам. Яго кароткія валасы тырчаць провалакай. Ён не прыгожы, бачыць яна. Але ж у яго твары няма ні злосьці, ні юрлівасьці.

- Bene? Ambulanza? – яна ківае, сама ня ведаючы, чаму.

З успамінаў яе выводзіць знаёмы голас.

- Ты толькі паглядзі, якая scena, Сандра! – Паола ўзьнімае камеру, клікае затвор, і ён здымае, здымае, пакуль яны не губляюцца недзе ў змроку на подступах к гораду.

- Навошта табе гэта? – Сандра ўсьміхаецца.

- Ня ведаю. Паола шчыра паціскае плячыма. – Проста прыгожа. Можа, калісьці я выкарыстаю яе.

Калісьці. Яна абдымае яго за плечы.

- А памятаеш, калісьці ты здымаў мяне? – запытвае яна.

- Канешне. Паола глядзіць на яе пацяплеўшымі вачыма.

- Колькі год таму гэта было? Дзесяць?

- Пятнаццаць, Паола. Мы разам ужо пятнаццаць год. Мне тады як раз і было пятнаццаць.

- Повад адсьвяткаваць нашую сустрэчу. Паола абдымае яе.

- Ня дужа жадаю я сьвяткаваць гэты дзень, - прызнаецца яна шчыра.

- Ты ня правая, Сандра. У гэты дзень ты нарадзілася нанова. Цяпер я гэта ведаю. Ён цалуе яе, і яна адкідвае твар насустрач гаснучаму захаду. Яна яго не кахае, аднак лёс прывёў яе да яго. Пяшчота, і журба заліваюць яе сэрца.

- Ня ў гэтым жыцьці, - думае яна. Ня ў гэтым жыцьці. Дзень гасьне, і на іх ціхенька апускаецца ноч.

Яны разам ўваходзяць у горад – чорны, палаючы агеньчыкамі. Мошчаная дарога асьветлена мноствам ліхтароў, і запоўнена натоўпам. Сем'і, пары, малыя і старыя, турысты і мясцовыя – усе высыпалі прагуляцца, падыхаць сьвежым паветрам, адчуць прахалоду ночы пасьля дзённай сьпякоты.

Ён крэпка трымае яе за руку - каб не згубілася, жартуе.

Яна ідзе зь ім побач – незразумела, ці дачка з бацькай, ці жанчына з каханкам. Яны падобныя, як адлюстраваньне мужчынскага ў жаночым, а жаночага – у мужчынскім, быццам бы адная і тая ж сутнасьць раздзялілася на двое.

- Дачка, - вырашае афіцыянтка ў рэстаране, куды яны заходзяць – з залітай сьвятлом ліхтарэй вуліцы ў жаўтаваты паўзмрок сьвечаў. Рэстаран месьціцца ў пячоры, якая акуратна дароблена з улікам навейшых распрацовак дызайну: схаваныя сьвяцільнікі, кандыцыянеры, камфортная мэбля і аўтарскія скульптуры у нішах, нагадваючыя прымітыўнае мастацтва. Садзяцца за столік, маленькі, круглы, накрыты белай скацерцю, з прыборамі для прыправаў у сярэдзіне. Ён накрывае яе руку сваёй. Афіцыянтка падазрона глядзіць на іх, а потым качае незаўважна галавой. Усё ж такі не дачка.

- Надта маладая для яго, - вырашае яна. – Яна ўзросту майго Джаваньні. Вось Джаваньні б спадабалася такая дзяўчына. Белая, як анёлак, і танюткая, як трасьцінка.

Яны ўзьнімаюць бакалы чырвонага віна, стукаюцца, яна

прыгубляе крыху, і ставіць бакал на стол. Ён адпівае палову, і таксама адстаўляе.

- Раскажы, як прайшлі здымкі. Бо ж ты мне так нічога і не расказаў, - просіць яна.

- Цудоўна, сонейка. Ён усьміхаецца, качае галавой.

- Калі так пойдзе і далей, я доўга не працягну. Цэлы дзень хадзіў туды і сюды па пустыні, нахадзіў, можа, зь дзясятак кіламетраў. Але ж куды гэтыя сцэны войдуць, невядома. Бо ж сцэнар я ўсё ж перапішу. Аднак Паола настойвае, што кудысьці войдуць. Ён бачыць мяне ідучым, гэта нешта сімвалічнае. Толькі па кнізе я ўваходжу ў горад не адзін, а з вучнямі.

- Ты ўсё ж такі будзеш пісаць асобную кнігу? – запрашае яна.

- Так. Ня ведаю, колькі зь яе ўвойдзе ў фільм Паола, аднак мяне гэта ня дужа цікавіць. Ён хоча, каб кіно ўсё ж такі было біблейскім. Каб я прапаведваў і сустракаў апосталаў у акаляючых паселішчах, і нас станавілася ўсё больш і больш.

- А калі ты сустрэнеш Яна? – запытала яна.

На ўваходзе ў горад. Па задумцы Паола, яго будуць зьбірацца забіць камянямі. Паола так бачыць. Далей мы пойдзем разам, і сустрэнем Матфея – мытара. А потым я вызвалю цябе.

Яна кіўнула.

- Адкуль ты вызваліш мяне, каханы?

- Я вызвалю цябе з аковаў сусьвету, - адказаў ён, гладзячы яе руку. Яго вочы глядзелі на яе, лашчачы яе цела, быццам бы дакранаючыся да яго.

- Ніхто не павінны пакутваць. Я вызваляю ўсіх, каго сустракаю. Такі сцэнар. І мужчынаў, і жанчынаў. Раблю шмат цудаў, і аблічаю Закон. Паступова вакол мяне зьбіраецца шмат вучняў, і мы ідзем у Ерузалем – вызваляць храм. Але ж іўдзеі выклікаюць атрад рымлянаў, і пасьля бойкі паўстанцы церпяць паразу. Хоць ёсьць сьведкі, што ні я, ні мае вучні не хацелі распачынаць

беспарадкі, мяне выдаюць рымлянам, як зачыншчыка. Па рымскім законам мяне павінны распяць, але ж Пілат вагаецца. І тады я сам прашу яго пагадзіцца, і зрабіць гэта, напісаўшы над маёй галавой “INRI” Праз расьпяцьце я пазбаўляюся сваёй зямной прыроды, і вяртаюся да сваіх вучняў у целе са сьвятла, у якім яны неаднаразова мяне назіралі. І пасьля гэтага мы ўсе разам сыходзім, каб несьці добрую вестку – далей, бясконца. Дарога пераходзіць у Плерому, а над ёй паўстае крыж, воткнуты ў зямлю, як нож у цела. Па крыжу сьцякае кроў, і гучыць голас:

- Ня мір прынёс я вам, але ж меч.

- Так Паола бачыць сваё кіно, і я гатовы пагадзіцца зь ім, што гэта добра. Але ж што я сам напішу, я ня ведаю. Пачатак маёй кнігі ўжо адрозьніваецца ад сцэнара. Мы дамовіліся, што пазьней уключым у яго сцэну, дзе я кідаю на пол скруткі з Торай. Паола лічыць гэта моцным правакацыйным ходам, прыназначаным, каб узьняць пачуцьці. У фільме павінна быць нешта шакуючае. Як мага больш. Такое публіка любіць. Ён кажа, што людзей трэба абудзіць. Каб яны прачнуліся, і адкрылі вочы. І ўбачылі. Толькі што яны павінны ўбачыць, ён і сам ня ведае.

- Можа, ён убачыць гэта ў канцы фільма? – выказала яна меркаваньне.

- Можа. Ён усьміхнуўся. – Ведаеш, колькі разоў я ўжо ўпэўніваўся – галоўнае пачаць, а потым усё можа пайсьці зусім непрадказальным шляхам. Мы думаем адно, а калі паглыбляемся ў нешта, прыходзім да зусім іньшых вынікаў.

Ён замаўчаў, і як раз на двух талерках прынесьлі заказ.

Яны паелі: ён – стэйк і салату, яна – ньёкі з крэветкамі, і яшчэ заказалі піццу - вырашылі ня есьці тут, а забраць з сабой. Усё было смачным – простая дамашняя ежа, як і сам рэстаран, не вялікі, сямейны. Гаспадыня сама ж была і шэф-поварам. Напрыканцы яна прыйшла запытацца, як ім падабалася, і расказала, што гэтая пячора некалі належыла яе сям’і. Яе бабуля жыла тут разам зь дзясяткам братоў і сясьцёр, бацькай,

бабуляй і маці. І яшчэ з курамі, казой і парсючком, які жыў у невялікім закутку там, дзе зараз месьціцца кухня. Яна зьдзівілася – як яны тут усе памяшчаліся? Плошча рэстараньчыку была каля паўсотні метраў, на што Моніка адказала, што гэта яшчэ вялікая пячора, шыкоўная. А яе суседзі былі бяднейшымі і жылі ў пакоі плошчай каля сарака квадратаў. А дзяцей у іх было нават болей. Толькі не было парсючка і казы – адны куры. Таму яны пакупалі малако ў іх, і бабка здолела накапіць крыху грошаў, каб аддаць маці вучыцца шыцьцю.

- Вось так мы і жылі, мілая, - вымавіла Моніка. – Я ўжо нарадзілася ня тут, а ў горадзе, у новым доме. Толькі кватэра там была значна меньшая, можа якіх квадратаў трыццаць. І парсючка і казу мы ўжо не трымалі. А бабка дык усё жыцьцё сумавала, што яе пазбавілі жытла, дзе іх сям'я жыла з часоў, калі сам Пан Езус хадзіў па зямлі, і можа нават і недзе ў гэтых мясьцінах.

- Пан Езус хадзіў тут дакладна, я вас упэўніваю. Ён, усьміхаючыся, глянуў на Моніку. Яна кінула на яго падазроны позірк, недаверлівы, склаўшы на жываце пад грудзямі моцныя рукі, якія вымесілі не адзін дзясятак кіляграмаў ньёкі і піццы.

- Адкуль вы ведаеце? Вы ж тады не жылі. Яна строга паглядзела на яго. – Ніхто ня ведае такія рэчы.

- Гэта так, шаноўная панна. Ён пагадзіўся. Але ж П'ер Паола Пазаліні здымаў тут фільм па евангельскіх падзеях, і яшчэ – Мэл Гібсан. Ён таксама здымаў у Матэры. Лепшы фільм пра Хрыста з існуючых.

- Мне не падабаецца. Моніка паціснула плячыма. - Там дужа шмат крыві, жорсткасьці. І, калі вы жадаеце пачуць маё меркаваньне, такія фільмы больш угодныя Сатане, а не Богу. Я адчуваю ў ім д'ябла, сіньёр. Прабачце, я ўжо старая, і нясу невядома што. Не зьвяртайце на мае словы ўвагі.

- Вашае меркаваньне каштоўнае, як і ўсякае іньшае, - супакоіў ён яе. – Да таго ж, я тут таксама менавіта з гэтай нагоды. Мы іграем у кіно.

- Вось як! Гэта цудоўна! – голас Монікі зьмяніўся, набыў шчырую зацікаўленнасьць. – А пра што будзе фільм?

- Пра Бога, - адказаў ён. – Пра Ісуса, яго зямны шлях і апошнія дні.

Моніка зьдзіўлена глянула на яго, і па крысе пачала нешта асэнсоўваць.

- А якую роль вы выконваеце? – раптам запытала яна.

- Здагадайцеся, - ён усьміхнуўся.

Некалькі імгненьняў яна глядзела на яго, а потым прыжмурылася.

- Сатану? Мне здаецца, вы падыходзіце на роль таго, хто спакушае. Вы прыгожы, але ж у вас ёсьць нешта д'ябальскае. Ваша зьнешнасьць, валачы, твар – вы выглядаеце, як той, хто па пісаньню паў зь нябёсаў. Ва ўсякім чыне, мне так здаецца. Яна задзірыста аглядала яго.

- А каго, па вашаму меркаваньню, іграе сіньёра? – запытаў ён.

- Сіньёра такая маладая, прыгожая і нявінная, што можа іграць толькі Марыю, - адрэзала Моніка. - У іншай ролі я яе не ўяўляю.

- Марыі ў фільме няма, а я іграю роль блудніцы, дзяўчыны, якую вызваляюць ад гандляроў рабамі. А ён іграе галоўную роль – таго, каго расьпялі. Пяшчотны галасок Летыцыі прагучэў у пячоры нечакана гучна.

Моніка зьдзіўлена глянула на яе.

- Праўда? – вымавіла яна. – Дык вы – Хрыстос! – яна павярнулася да яго, аглядаючы яго так, як быццам бы бачыла ўпершыню.

- Як я адразу не здагадалася. Яна ўзмахнула рукамі. – А я яшчэ ахрысьціла вас Д'яблам, сіньёр …Як вас завуць?

- Міхал. Мікеле. Да вашых паслугаў, пана Моніка. Ён нахіліў галаву.

- Блаславіце мяне, сіньёр Мікеле, - раптам папрасіла яна – сур'ёзна. – Бо ж я веру, што той, хто гатовы прыняць на сябе такую роль, як Хрыстос, і сапраўды мае ў сабе яго часьціну. Часьціну Бога, сіньёр.

- Бласлаўляю вас, панна Моніка, і хай усё у вас будзе добра, і ваш бізьнес квітнее і далей.

- Дзякуй вялікі. Прыходзьце да мяне ізноў, раскажаце, як праходзяць здымкі, - папрасіла яна.

Яны разьвіталіся з гасьціннай гаспадыняй, і выйшлі на паўцёмную начную вуліцу.

Неба ўсыпалі яркія, дрыготкія зоркі. Іх было столькі, што ўсё яно здавалася адзіным суцэльным зьзяньнем. Яны знаходзіліся ў верхняй кропцы, і горад зьбягаў пад ухіл адмечанымі агнямі хвалямі. Натоўпу не паменьшыла, і вакол чулася розная музыка – дзе вясёлая, дзе – рамантычная. Пахі курортнага гораду віліся навокал, пахла ежай, кветкамі і дымам – недзе на адкрытым агні смажылі мяса. Ён абняў яе за талію.

- Навошта ты зьбянтэжыла сіньёру? Ён усьміхнуўся, нахінаючыся да яе. Яна цяпер будзе пакутваць, што прыняла Хрыста за Д'ябла.

- Так бывае, - ціха вымавіла яна. – Бо ж у гэтым сьвеце – як у люстэрку, усё выглядае наадварот. Блудніцы тут – зьнешне сьвятыя і цнатлівыя, праведнікі – ваўкі ў авечай шкуры, а ў абліччы праклятага па сьвету ходзіць пан Езус. Сапраўдны ж Сатана павінны мець дужа прыстойны погляд, бо ж тады як бы ён здолеў упэўніць усіх, што ён – Бог, і менавіта яму трэба прыносіць бясконцыя ахвяры? Зямля цячэ крывёю мільёнаў укрыжаваных, і да гэтага нікому няма справы.

Яна прыціснулася да яго.

- Гэты бог ня мае сапраўднай улады, сонейка. Бо ж ён ня ведае

мяне. Ён усьміхнуўся, і пацавалаў яе.

- Толькі той, хто мяне ведае, сапраўды валодае сусьветам, і мае ўладу і над жыцьцём, і над сьмерцю так, як маю яе я. Бо ж ён – адзіны са мною, і ў ва мне, і сьмерць яго не кране, і Сатана яму ня страшны.

Яна абняла яго за шыю, і ён нахінуўся да яе вуснаў. Раптам яны пачулі заклапочаны голас побач, які аклікнуў іх:

- Сіньёр Мікеле!

Ён узьняў твар, і павярнуўся.

Цераз дарогу перад імі стаяла Моніка, і махала рукой. Убачыўшы, што яе заўважылі, яна шпарка перайшла на іх бок, трымаючы ў руках вялікі папяровы пакет з плямамі масла на ім.

- Вось, булачкі для вашай дачкі, сіньёр. А тое там, дзе вы здымаеце, ваш гэты, як вы кажаце, фільм, я ўпэўнена, няма нічога паесьці, акрамя кавы і цыгарэтаў. Вы ж ня лічыце гэтую піццу, якую заказалі, дастатковай ежай на дваіх?

- Колькі я вам вінен, сіньёра Моніка? – Міхась дастаў партманет, і вынуў зь яго купюру. Самая малая апынулася ў пяцьдзесят еўра. Моніка выставіла далонь, папярэджваючы, і строга глянула на яго.

- Ня трэба, сіньёр. У мяне няма з сабой здачы, і я ўжо не маладая бегаць туды-сюды.

- Ня трэба здачы. Міхась працягнуў ёй купюру. – Вазьміце.

- Не вазьму, - сказала яна, як адрэзала. Сунула Летыцыі ў рукі пакет, плямы на якім сталі яшчэ большымі, адкуль падымаўся густы духмяны водар.

- Дзяўчыне трэба добра есьці, мілая. Трэба думаць аб сабе, і сваім здароўі. Калі прыйдзеце ў наступны раз, я палажу табе ўдвая больш, чым яму.

Летыцыя напалохана глянула на яе, трымаючы ў руцэ пакет.

Міхась нечакана рассьмяяўся.

- Моніка, не палохайце маю … дачку, а тое яна адмовіцца да вас прыходзіць. Дзякуй вам за падарунак. Ён сунуў партманет у кішэню, абняў Моніку, і асьцярожна пахлопаў па шырокай сьпіне.

- Чао, даражэнькія. Моніка вызвалілася ад яго, громка чмокнула Летыцыю, і рашучым шырокім крокам накіравалася да рэстарана, куды ўжо зайшла пара.

Летыцыя з пакутніцкім відам узьняла пакет перад сабою.

- Як я гэта панясу? – запытала яна.

- Дай мне, золатка. Ён узяў папяровую сумачку у руку. Пайшлі, зойдзем у краму. Купім пакет, і можа яшчэ штосьці на заўтра. Заўтра будзе заняты дзень, Паола мне ўжо гразіўся. І ў горад схадзіць наўрад ці атрымаецца.

Яны зайшлі ў краму, набралі вялікія пакеты з рознай усячынай – фрукты, віно, віскі, сыр, вэндліна, некалькі пачак ньёкі: “Зварым у мульціварцы”, - прапанавала яна. Мульціварку ён купіў на другі дзень па прыезду, убачыўшы, што сілкуюцца тут у асноўным піцай і віном, а таксама кавай і цыгагэтамі – Моніка была правая.

Адразу ад супермаркета ўзялі таксі, і паехалі дамоў – на пляцоўку. Ужо было болей за дзесяць гадзінаў, і яна амаль спала ў яго на плячы – стамілася.

Ён жа ехаў, і думаў, глядзеў на пагоркі, праплываючыя за вакном, на высокія таполі ўздоўж дарогі, і далёка раськінуўшыяся цёмныя краявіды. У галаве яго пачаў складацца працяг кнігі. Наступная глава. Як жа гэта, аказваецца, проста, толькі трэба пачакаць. У яго кніге Шымон сышоў з горада ў пустыню, дзе пад кіраўніцтвам главы секты есеяў праз незвычайна кароткі срок дасягнуў нечага, чаго многія не маглі дасягнуць і за жыцьцё. Ён убачыў Бога, пасьля чаго жыць, як раней, ужо не атрымоўвалася. Цяпер вакол яго было не аўто, а сьцены, складзеныя з грубага шэрага камяню. Як раз такія, як ў

рэстаране Монікі, дзе яны правялі вечар. Масьляная лямпа тускла ірдзела у нішы, і хутка і яна пагасла. Перад ім стаяла сьвяча, полымя на якой гарэла ціха і роўна. У адрозьненьне ад яго душы і думак, якія кідаліся ў галаве, як шалёныя. Думкі аб ёй ахапілі яго ізноў. Дзяўчына, што ён убачыў пад вэлюмам, якая ціха шла, апусьціўшы галаву. Наляцеў вецер, і нечакана сарваў покрыў зь яе валасоў. Яна схапілася вузкай рукой у бранзалетах за саскользваючы шаль, аднак моцны парыў закруціў яго, і кінуў убок. Нахінуўшыся, ён падабраў вэлюм і працягнуў ёй.

Яна ўзяла яго, прыкрыўшы твар рукой.

- Дзесяць манет, - пачуў ён нечы голас. Непрыятны, рыпучы.

Мужчына, вялікі, мажны, падышоў да яго.

- Дзесяць манет, і яна – твая. Гэта ня дорага, бо яна цнатлівая.

Ён працягнуў вэлюм, і пакачаў галавой.

- Не магу, - вымавіў.

- Справы твае. Чалавек пацісну́ў плячыма. Дзяўчына глядзела на яго, быццам бы яго ня бачыла. Яе твар, вузкі, сьветлы, не нагадваў твары мясцовых.

- Грэчанка? – падумалася яму. Яе валасы, крыху хвалістыя, цёмныя, ня маючыя адценьня фарбы, былі ахоплены ланцужком па ілбу, і закручаны ў вольны жгут, які ляжаў на яе сьпіне да таліі. Апранутая яна была ў паўпразрыстую чорную туніку. Яе цела ад яго закрывалі толькі грозьдзі пацерак, якія зьвісалі з тонкай шыі, ды вытыя шоўкам па шоўку кветкі. Прыглядзеўшыся, ён заўважыў, што яна зусім маладая - толькі што выйшла з дзіцячага ўзросту.

Ён сам ня ведаў, чаму ён спыніўся. Замёр, разглядаючы яе. Яе цела было яшчэ не разьвітым, але ж твар – прыгожым, такім, якія ён бачыў у статуяў аголеных жанчынаў у Александрыі. У Ерузалеме такіх статуяў не было. Іх бы адразу закідалі камянямі.

- Іўдэйка? – запытаў ён.

- Напалову. Яе бацька быў рымлянін. Ён памёр, і яе аддалі мне за даўгі. А маці памёрла яшчэ раней. Блудніца. Жыць з рымлянінам. Чалавек сплюнуў.

- І ты – дачка патаскухі. Ён лягонька штурнуў дзяўчыну. - Цяпер станеш такой, якой была твая маці.

- Можа, яе маці вымусілі? – запытаў ён.

- Якое там! Чалавек з агідай усьміхнуўся.

- Яна жыла, як царыца. Насьмяялася над нашымі законамі і звычаямі, адмовіла прадстаўніку шаноўнага роду левітаў, а потым стала наложніцай рымляніна, прычым – па сваёй уласнай волі. Калі б не рымскае грамадзянства і высокі чын, мы б забілі камянямі і яе, і яго. Аднак да іх было не падступіцца. А потым яна ізноў абхітрыла нас – памёрла першай. І вось цяпер памёр і ён. І апынулася так, што ён быў вінен нашым купцам шмат грошаў, як і ўсе яны. Па закону мы змаглі забраць гэтую дзяўчыну, бо ж яна – іўдэйка па крові, хоць і дзіця граху. І цяпер адпрацуе ўсе даўгі сваёй сям'і. Хай радуецца, што ёй пакінулі гэтыя трапкі і цацкі, - ён з пагардай кінуў дзяўчыне ў твар вэлюм.

- Колькі ён быў вінен? Можна, я выкуплю яе? – раптам прапанаваў ён.

- Выкупіш? Тысяча манет. Гэта доўг. І яшчэ тысяча – за яе. Бо ж па закону цяпер яна – рабыня. І таксама каштуе грошы. Ты ведаеш закон, іўдэй? – ён глядзеў на яго, звузіўшы вочы.

- Закон кажа, што кожны павінен плаціць за свае грахі. І за грахі тых, хто яго парадзіў. Да сёмага калена.

- Я ведаю закон. Ён нахіліў галаву. – Калі ты бачыш, я – вартаўнік храму.

- Бачу. Мая павага, шаноўны. Дзьве тысячы стацёраў, і яна – твая. Чалавек зацікаўлена глядзеў на яго.

- Колькі дасі мне часу, каб сабраць грошы? – запытаў ён.

- Часу? А сколькі табе трэба? – чалавек хітра прыжмурыўся.

- Калі ты пачакаеш, я прынясу табе грошы да Песаха.

- Гэта – паўгода. Чалавек уськінуў бровы.

- Я дам табе задатак. Трымай. Ён працягнуў яму кашэль. Тут – каля пяцідзесяці залатых денарыяў. Гэта значна болей, чым калі б яна кожны дзень прымала па дзесяць чалавек.

Ён аддаў усё, што ў яго было, і нечакана застаўся ні з чым. Стаяў з пустымі рукамі, і глядзеў, як чалавек уводзіць дзяўчыну ў нейкі дом за высокім заборам, цераз сьцены якога зьвешваліся цяжкія галіны смокваў. Ці не абманулі яго? Ці праўда ўсё гэта? Але ж нешта падказвала яму, што гэта і сапраўды так. Чаму ён зрабіў гэта? А можа, яго прывёў сюды Бог? І хто, як ня ён, зможа даць яму адказ на тое, што яму цяпер рабіць?

Машына спынілася ля іх лягеру, ён заплаціў кіроўцы, і асьцярожна абудзіў яе – яна салодка спала на яго плячы, і яны пайшлі ў вагоньчык. Яна забралася ў ложак, а ён яшчэ выпіў стакан віскі, і потым далёка за паўноч сядзеў за ноўтбукам – пісаў, пісаў і пісаў. Словы самі ліліся на белы ліст, разгорнуты на маніторы. Калі ён адарваўся ад клавіятуры, была ўжо глухая ноч, але ж спаць яму не хацелася. Ён яшчэ наліў віскі, марудна піў, і проста слухаў цішыню сваіх думак, якую адцяняў блюз ў навушніках, лістаў на маніторы нейкія кнігі, якіх сабралася дужа шмат, сартыраваў іх па папках, нарэшце выбраў адну, і пачаў чытаць. Хутка віскі сконьчылася, і думкі ў яго пачалі блытацца. Цела запоўніла прыемная расслабленасьць. Ён лёг у ложак побач зь ёй, выцягнуўся, і адразу паснуў.

Глава 9: Елена

- Табе было хораша са мной, мая любая? - запытаў ён яе.

Яна абвіла яго шыю мяккімі рукамі, палажала галаву на плячо.

- Хораша, каханы. Мне заўсёды хораша з табою. Ня істотна, які гэта час ці месца, усе яны асьвечаны тваім сьвятлом.

Яго вялікія рукі гладзілі яе сьпіну пад тонкай тканінай сарочкі-сукенкі.

- У Сярэднявеччы я быў грубым. Я нагадваў сабе нейкага зьвяра. І жарсьць мая да цябе была зьвярыная. Але ж каханьне заўсёды было адное - боскае. Я кахаў, і кахаю цябе так, як, здаецца, чалавек ня можа. Гэтае каханьне ірве мне душу, і адначасова вылечвае яе, катуе, як пякельная смага, і адначасова яе спаталяе.

- Мне падабаецца, як ты пішаш, - вымавіла яна.

- Калі пісала я, усё атрымоўвалася неяк па-дзіцячы.

- А потым прыйшоў я, і ўсё стала па-даросламу. Ён усьміхнуўся, і прыціснуў яе да сябе.

- А ведаеш? - працягнула яна, - мне нравілася нашае каханьне тады. Я дужа жадала цябе, - вымавіла яна шэптам.

- Я жадала гэтай асалоды, зьмешанай з болем.

- Марыя, - ціха вымавіў ён, нахінаючыся да яе. Апусьціўся на калені, і яе грудзі апынуліся ва ўзровень зь яго тварам. Ён адвёў убок тканіну, і ўзяў вуснамі маленькі ружовы сасок. Яна палажыла яму рукі на плечы.

Ён кахаў яе як тады, у мінулым. Груба, горача, прагна, нястрымана. Падхапіў на рукі і аднёс на ложак, і адразу ўвайшоў у яе. Яна ўскрыквала і бессаромна прыціскалася да яго, выгіналася яму насустрач. Яго чэлес уваходзіў і выходзіў зь

яе, як поршань, плоць білася па яе сьцёгнах, і яна стагнала, губляючы розум ад асалоды. Ён быў усімі тымі, хто жадаў і браў яе, і адначасова ён быў ім - самім сабой, вар'яцеючым ад пульсу гарачай крыві ў яго чэлесе, ад яе твару, экстатычнага, на якім боль мяшаўся з асалодай, па якому беглі крышталёвыя сьлёзы. - Летыцыя, - вымавіў ён. - Каханая мая. Яго сэрца ірвалася прэч з грудзей, так, як і яго семя, якое лілося ў яе, вымушаючы скарочвацца яго цяглы. Яна сьціснула яго нагамі і абхапіла рукамі, убіраючы ў сабе. Ён ізноў быў там, быў рыцарам і паганскім лордам, і адначасова ён быў Хрыстом, і Богам. Цяпер ён наяўна адчуваў гэта. Нябёсы раскрыліся перад ім у сваёй бясконцасьці, і ў іх ён бачыў сябе, і яе.

- Ну вось і ўсё, - вымавіла Сандра, і адклала ўбок пэндзаль. На пляцоўцы паўстала цішыня.

Жанчына, якая глядзела на іх, амаль не нагадвала тое юнае, пяшчотнае дзяўчо з доўгім хвастом чорных валасоў, закручаным у высокі вузел, тонкую дзяўчынку-падлетка, накшталт мадэлі з чарговага моднага паказу, прыгожыя твары і стройныя постаці якіх зьліваліся ў бясконцыя чэргі эфемерных вобразаў, далёкіх ад рэальнага жыцьця.

Замест дзяўчынкі цяпер на іх глядзела багіня. Яе чорныя валасы былі акуратна ператвораны ў локаны і ўложаны ў складаную грэцкую прычоску, туніка ў складку падкрэсьлівала яе тонкае цела, якое раптам апынулася перад імі ідэальным, такім дасканалым, што ўсе, ня толькі мужчыны, а і жанчыны спынялі на ім позірк, і не маглі адвесьці вачэй.

Бранзалеты на яе руках і каралі на шыі, а таксама дыядэма ў густых валасах ціха зьзялі, падкрэсьліваючы залацістую скуру, якую ўжо крыху пасьпела крануць, ці – зьлёгку пацалаваць – сонца, і бляск якой Сандра падкрэсьліла тонкай залатой і пярлінавай пудрай.

Цяпер на іх паглядала сапраўдная Елена, тая, з-за якой спалілі Трою, за якую біліся і нішчылі адзін аднаго цары, і якая спакойна глядзела на кроў, ліючуюся ля яе ног. Яна была самадастатковая сама ў сабе, нібыта яна была вышэй за ўсіх, і

зямныя справы яе не краналі. І адначасова яна была царыцай нябёснай, багіняй, сыйшоўшай з Алімпу, Афрадытай, але ж ня той, якая спакушае, а той, якая дае агапе, каханьне безумоўнае, шчырае, боскае, узьнімаючае душу. Глядзячы на яе, хацелася паўстаць на калені. Яе твар адлюстроўваўся ў сэрцах, быццам бы твар месяца ў спакойнай вазёрнай гладзі – крыху сумны і неймаверна прыгожы, да болю, выклікаючы журбу па адсутнічаючым, не належачым гэтаму сьвету, запальваючым у сэрцы белае містычнае полымя, спальваючае ўсё зямное, ачышчаючае, вымушаючае прагнуць далёкага, а ня блізкага, каханьня на ўзроўні абагаўленьня і растварэньня душы ў яго аб'екце, які на гэтым узроўні яднаецца для любячага з Богам.

- Бэлісіма! Бэла! Бэла донна!

Паола ня мог стрымаць словы захапленьня, аглядваючы яе, задаволены зробленай Сандрай працай.

- Ну што, праходзім! Усе на пляцоўку! – нарэшце прысьпешыў ён іх, і ўсе, нібыта прачнуўшыся, пацягнуліся да будынку. Крака – горад закінуты, пасеўшы на верхавіне скалы, сапраўдная скарбонка лакацый, абраная самім Мэлам Гібсанам для яго славутых "Жарсьцей Хрыстовых", знаходзіўся недалёка ад таго месца, дзе яны спачатку паўсталі лягерам ля Матэры. Спачатку яны думалі знайсьці патрэбныя месцы, адпавядаючыя складаным патрабаваньням гістарычнай праўды, у горадзе, але ж усе пячоры з часоў Пазаліні былі ці закрытыя жалезнымі кратамі, ці пераўтвораныя ў прыгожыя сучасныя рэстараны. Частка ж зь іх, больш-меньш вольная для выкарыстаньня, знаходзілася няўдала, ці зусім згубіла воблік, нагадваючы жытло, пераўтварыўшыся ў звычайныя прыродныя пячорныя фармаваньні і гроты.

Крака ж прапаноўваў багацьце самых розных будынкаў розных памераў, вуліц і памяшканьняў, некаторыя зь якіх яны поўнасьцю ачысьцілі ад рэшткаў камяню, абваліўшыхся балак і сьмецьця, зрабіўшы ідэальна прыгоднымі для здымак. У адным з памяшканьняў яны зьнялі сцэну – "шэнэ", як казаў Паола, дзе Міхась-Шымон кідаў на падлогу сьвіткі Торы з доўгага драўлянага сталу. Стол яны самі скалацілі зь вялікіх старых досак-балак – атрымалася настолькі аўтэнтычна старажытна,

што яны нават зьдзівіліся, і Паола ў шчырай радасьці заплёскаў у далоні.

Міхась у ролі раз'юшанага ваяра-ваўхва глядзеўся жудасна натуральна, у чальцоў масоўкі нават мароз прабег па скуры. У грубым ільняным адзеньні-мешкавіне, са зблытанымі валасамі і палаючым позіркам, ён і сапраўды нагадваў біблейскага прарока, больш падобнага на пагрознага Бога-Айца, чым на яго любячага і мяккага сэрцам сына. У тым гуку, зь якім перароблены са старых рулонаў абояў сьвіткі на круглых драўляных прутах падалі на пліты падлогі, чуўся гук камянёў, падаючых з руйнуемага храму. Яго голас, абвяшчаючы, што "тут няма Бога", і сапраўды гучаў страшным прысудам, пасьля якога грэшнікам не заставалася нічога, як толькі пакаяцца і паўстаць на калені, пасыпаючы попелам нізка нахіленыя галовы.

Сцэна, якую здымалі сёньня, называлася "вызваленьне Елены".

Паола так спадабалася сачынённая Міхасём у машыне гісторыя сустрэчы Елены і Шымона, што ён цалкам уключыў яе ў сцэнар. Насамрэч, гэтае каханьне ніяк не ўдавалася Паола, як ён да яго не падыходзіў. Быццам бы нехта заплюшчваў яму вочы і не даваў яму бачыць праз завесу часу, зазірнуць у патаемныя глыбіні душы старажытнага мага, якія ад яго ўпарта хаваліся.

Міхась жа ня проста зазіраў туды. Ён іх, здаецца, ведаў.

Пасьля сустрэчы ля варот зь Янам і Матфеям Шымон напрамкі накіраваўся да кварталу граху, дзе ў схаваным смоквамі доміку яго ўжо некалькі месяцаў чакала яго каханая. Убраная для продажу багатаму пакупніку, які нарэшце знайшоўся, каб заплаціць поўную сумму за яе цнатлівасьць, яна, нібыта замарожаная, сядзела ля вакна ў пакоі, ня думаючы ні аб чым акрамя свайго няшчаснага лёсу.

Чалавек, які абяцаў выкупіць яе, даўно ўжо сьцёрся зь яе памяці. Нават і рысы яго яна не разбачыла як сьлед. Здаецца, ён быў высокім і моцным, і ваяром храму, як яна запомніла зь яго словаў. Але ж хто можа сабраць такую суму, як дзьве тысячы залатых денарыяў, каб заплаціць за яе? Тое было ня проста не

рэальна – гэта было б дзівам, параўнаць зь якім можна было толькі сапраўднае ўваскрошаньне памерлага. І цяпер гэтым памерлым была яна – сядзела ля вакна ўжо тры дні, і пакорліва чакала вырашэньня свайго лёсу. Тэрмін скончваўся заўтра, і заўтра яна мае быць праданая. Праданая першаму таму, хто дасі гэты мех клятага золата яе ўласьніку, і купіць яе цела, як ахвяравальнае ягня на кірмашы, каб прынесьці яго ў ахвяру свайму юру, і тым самым назаўжды кінуць яе ў пякельнае полымя, бо ж яна станавілася нячыстай па закону, а значыць – адвечна праклятай, і лёс яе быў толькі згарэць у Геене, як блудніца, хоць тое і адбылося зусім не па яе ўласнай волі.

Ужо сьцямнела, калі яна ўбачыла факелы. Працэсія набліжалася да іх, і была яна не малая. Прыглядзеўшыся, яна ўбачыла мужчынаў. Трое зь іх ішлі наперадзе, астатнія цягнуліся доўгім ланцугом, запаўняючы сабой увесь правулак.

Яна пачала лічыць іх, і зьбілася зь ліку. Трынаццаць? – падумалася ёй. Не, пэўна, значна больш, бо натоўп усё рос і рос, і ў правулку для яго ўжо не было месца.

Шум яго наблізіўся да яе вакна, як марскі вал, і яна раптам замёрла. Яе сэрца пачало адчайна калаціцца, бо наперадзе, паміж прыгожым стройным юнаком і каржакаватым мужчынай рабаўнічага выгляду з густой нячосанай чорнай барадой ішоў ён.

Ён быў прыгожы, цяпер яна гэта бачыла, бо сьвятло факелаў залівала яго твар – змучаны постам і апалены сьпякотай, з доўгімі чорнымі валасамі, якія ляжалі ільвінай грывай на плячах, з густой барадой, адрослай да грудзей, у нейкай рваніне, якая калісьці была адзеньнем. Яго вочы палалі, і ён рашуча накіроваўся сюды. Відавочна, ішоў да яе.

- Пэўна, грошы ён ня здолеў здабыць, і цяпер хоча адбіць яе сілай, - вырашыла яна, і з сумам падумала, што ў гэтым доме цярпімасьці дастаткова моцных стражаў, каб адбіць напад і рымскай кагорты. Шмат хто з іўдэйскай знаці наведваўся сюды, бо ж яны былі зусім не сьвятыя – цяпер яна гэта ведала. Усе яны сьвятыя толькі на словах. Садукеі, якія толькі робяць выгляд шчырых вернікаў, паважаючых Закон, які для іх даўно ўжо стаў

толькі зброяй, ланцугамі для ўтрыманьня ў пакоры народу, які яны параўноўвалі са стадам. Пасьвілі, як яны казалі, сьмеючыся, падносячы чашы зь віном да вуснаў, якія яна налівала.

Усе яны глядзелі на яе з пажаднасьцю. Толькі ён адзіны так не глядзеў на яе тады, бо ж юру ў яго вачах не было. Там было нешта іньшае, ад чаго ў яе моцна забілася сэрца, і чаго яна яшчэ ня ведала.

- Можа, цяпер даведаецца? - падумалася ёй.

Натоўп падыйшоў да варотаў, і ён упэўнена грукнуў у дзьверы. Праз хвіліну яны адчыніліся, і ён увайшоў унутр – адзін. Натоўп застаўся вонкі, і пагрозна маўчаў.

Яна замёрла, між волі прыслухоўваючыся, і, сапраўды, хутка па лесьвіцы ўгару, дзе месьціўся яе пакой, пачуліся крокі.

Дзьверы адчыніліся, і на парозе зьявіўся яе гаспадар, якога пасунуў плячом высокі, зарослы чорнымі зблытанымі валасамі мужчына ў рваным адзеньні, праз якое было бачнае яго аголенае цела. Нават і тыя часткі, якія яна зусім не павінна была бачыць.

- Я выкупіў цябе, Елена. Зьбірайся, мы пойдзем адсюль. Пойдзем туды, дзе цябе ніхто не пакрыўдзіць. Я забіраю цябе з сабой.

Ён падыйшоў, і ўзяў яе за руку – рашуча, але ж асьцярожна. Яго далонь была моцнай і цьвёрдай, і яго вочы палалі нейкім нязвыклым экстатычным, як у вар’ята, полымем. Ён быў тут, і быццам ня тут – быццам бы гэтаму сьвету не належыў. Яна ўскрыкнула, і страціла прытомнасьць.

Прыйшла ў сябе яна ў яго на руках. Ён трымаў яе, стоячы перад натоўпам.

- Дзівіцеся, бо Царства Боскае бліска! – гучна вымавіў ён.

- Гэты мытар, Матфей, дабравольна аддаў грошы, каб вызваліць з заточаньня чыстую і нявінную дзеву, якую ўкінулі ў гэты дом

граху садукеі, славутыя сваёй дабрачыннасьцю. Гэта ён вымавіў з пагардай. Натоўп завыў – злосна і пагрозна.

Мужчына з барадой побач узьняў руку. Усе замаўчалі, і працягнулі слухаць.

- Цяпер дзева гэтая вызвалена, і яна пойдзе са мною. Але ня каб аддавацца граху, а каб заставацца цнатлівай і абароненай мною, і маім Словам, бо ж яна – сама Сафія, учалавечаная Шэкіна і мая нябёсная жонка, якую я прыйшоў вызваліць з аковаў сусьвету.

- Цяпер ты мая, каханая, і імя тваё сапраўднае – Мудраць, напісанае на нябёсах, - нягромка вымавіў ён, зварочваючыся да яе.

- Ты пойдзеш са мной побач, каб слухаць і разумець маё слова, бо ж Ты – увасобленая Біна, разуменьне нябёсных таямніцаў, якія толькі ты можаш умесьціць. Душа мая.

Ён нахінуўся, і пяшчотна пацалаваў яе. Яна напалохана глядзела на яго, а потым страх сышоў, пакінуўшы месца нечаму іншаму. Яна болей яго не баіцца, яна яго кахае – прыйшло да яе разуменьне, аб якім толькі што казаў ён.

- Я кахаю цябе, Госпадзі, - ціха вымавіла яна, і яе словы ружовымі пялёсткамі апалі на сьціхлы натоўп. Натоўп пачаў апускацца на калені, першым – прыгожы юнак, а потым – астатнія.

Чалавек паставіў яе на зямлю побач з сабою, крэпка трымаючы за руку.

- Як завуць цябе? – запытала яна яго.

- Я згубіў сваё зямное імя, - вымавіў ён мякка. – Яны завуць мяне Хрыстас, што значыць – Мешыах. На зямлі ж калісьці я быў Шымонам. У хрышчэньні ж сьвятым духам я атрымаў імя новае, якое пакуль схавана. І яно будзе яўлена тады, калі мне прыйдзе час вярнуцца да таго, хто мяне паслаў.

- Я буду зваць цябе Госпадзі, - вымавіла яна, і пацалавала яму

руку. – Бо ж ты вызваліў мяне. Ты зрабіў цуд, і імя тваё – Гасподзь і Бог мой, той, што сышоў дзеля мяне ў сусьвет.

- Матфей, Матфей, ці ты чуеш мяне? – голас, гучны, нізкі, раздаўся над самым яго вухам.

Зборшчык падаткаў уздрыгнуў, і ледзь не ўраніў свае манеты, якія трымаў у меху, крэпка зажатым у руках.

Два вартаўніка побач зь ім устрывожана аглядалі натоўп, які насунуўся на яго бліжэй.

- Адкуль ведаеш, хто я? Бо я цябе ня ведаю. Матфей з-пад ілбу глянуў на высокага, нагадваючага аськета-пустэльніка чалавека, адзеньне на якім вісела лахманамі, а вочы гарэлі полымем з-пад нізкіх прамых броваў, нагадваючых крылы вялікай птушкі.

- Цяпер ведаеш, бо я – Гасподзь твой, Мешыах, той, хто прыйшоў хрысьціць вадой і агнём сьвятога духа. Бо прыйшоў час вызваліць народ іўдэйскій з-пад рымскага ярма. Зьбірайся, пойдзеш за намі, бо час наблізіўся.

Натоўп пагрозна пасунуўся да яго.

- Чаму я павінен верыць табе. Ты ведаеш маё імя, аднак яго ўсе ведаюць. Як дакажаш, што ты – Гасподзь?

Чалавек усьміхнуўся, і глянуў на манеты, ляжачыя грудай на стале.

- Гэта скарб зямны, што ты назьбіраў, чалавек? – зьдзекліва вымавіў ён.

- І сапраўды, гэта ня шмат, каб выкупіць у Сатаны сваю душу. Аднак я магу даць табе столькі, што хопіць ня толькі на цябе, але ж і на ўсе душы, якія сабраліся тут. Глядзі. З гэтымі словамі ён палажыў вялікую далонь на прыгаршню манет. Яго вочы быццам бы спапялялі, вымушаючы глядзець на яго, і слухаць. Нават жаўнеры побач не варухнуліся.

Калі ж ён узьняў руку, груды медзі і срэбра на стале перад ім не было. На стале ляжала груда залатых манетаў, якая зьзяла, як сонца, у сьвятле паходняў, якія натоўп ва мностве трымаў у руках.

З горла людзей выляцеў нібыта адзіны зьлітны крык. Матфей ня верыў сваім вачам. Толькі што гэты вандроўнік пераўтварыў яго дзённыя зборы ў нешта ў разы большае. Як гэта магло адбыцца?

- Хто ты? – хрыпла запытаў ён.

- Я – Гасподзь твой і Бог, скарбы якога і сапраўды бясконцыя, - спакойна вымавіў чужынец.

- Высып на стол усё, што ў цябе ёсьць. Матфей падпарадкаваўся, і хутка на стале заблішчэла золатам груда чыстых, новых денарыяў.

- Тут – роўна дзьве тысячы, - пералічыўшы, вымавіў ён, узьнімаючы вочы на чужынца.

- Так, і ты аддасі іх, каб выкупіць бедную сірату, якую трымаюць у доме граху тут, недалёка. Бо гэтыя манеты прыназначаны, каб выкупіць яе душу ў цемры, - гучна вымавіў чалавек.

- Ты што мне прынёс? – Каіфа накінуўся на нізкага, барадатага таўстуна, зьбіў яго з ног, і пачаў пінаць. Вартаўнікі ня ўмешваліся. На палу тускла блішчэла куча мелкай манеты – некалькі срэбных, але ж большасьць – мядзяных, у асноўным – лептаў.

- Ці ты зьдзекваешся? Гэта твая плата за тое, што я дазваляю табе парушаць закон тут, прама ў мяне пад бокам? Ля самых маіх вачэй?

Гнеў і ярасьць сьвятара, здаецца, дасягнулі мяжы, за якой раскрыла пашчу сама вогненая геена.

- Я сам бачыў, там было золата! Чыстае, дзьве тысячы. Я пералічыў. Таўстун ня мог зразумець, і толькі разводзіў рукамі,

намагаючыся ўварочвацца ад тычкоў сьвятарскага посаха.

- Золата? І дзе тваё золата? – зьдзекліва вымавіў нарэшце ён. – Хто яго табе прынёс? Я хачу ведаць імя гэтага ашуканца.

- Шымон. Стражнік з храмавай гары. Я чуў, як народ называў яго Мешыахам, і … прабач мне маё блюзьнерства … Богам! – з жахам вымавіў чалавек, прыкрываючы рукамі галаву.

- Богам? – Каіфа паморшчыўся.

- Не хапала нам яшчэ мешыаха-штукара. Гэты – сапраўды апасны, не такі, як тыя, якія прыходзілі раней. Тыя толькі гаварыць маглі, і ўболтвалі можа зь сотню якую абарванцаў, якая разьбягалася, як толькі ім пачынала надакучваць аднастайнасьць пустых размоваў. Гэты ж можа трымаць народ доўга, бо нейкім чынам ён навучыўся штукарству, а гэта дужа для нас небясьпечна. Ты кажаш, за ім ішоў вялікі натоўп?

- Так. Чалавек пакорліва нахіліў галаву.

- Ён, здаецца, узьнімае народ на бунт. Супраціў Рыму, і супраціў цябе, Каіфа. Бо ж ты таксама прадаўся, як кажа ён.

Каіфа спыніўся. Яго твар не выражаў нічога. Ён апёрся на посах, і хвіліну, здаецца, думаў, а потым вымавіў:

- Хай ходзіць, і гаворыць. І робіць свае штукарствы. Як толькі мы ўбачым усіх, хто трымае за пазухай камень, мы заб’ем іх адным ударам. Ударам рымскага мяча – на нешта ён усё ж патрэбны. Рым – толькі рукі і зброя. У іх няма галавы. Галавой жа іх будзем мы. Хай ваюць, і зьбіраюць з усяго сьвету багацьці, нясуць іх у сваю скарбніцу. Яны напаўняюць яе для нас. Я ведаю, што гэты настрой даўно ўжо лунае ў паветры. Іўдэя хутка запалае, аднак мы выкарыстаем гэты пажар на нашую карысьць. Ідзі, Іўда. Ідзі, і скажы, што ты ўражаны, і хочаш далучыцца да яго. Скажы, што разумееш, чаму золата пераўтварылася ў медзь. Бо ж ты – грэшны, і Бог справядліва пакараў, і правучыў цябе. Золата ня могуць утрымаць рукі нячыстыя. Толькі праведная душа сапраўды багатая, і яе скарбніца заўсёды поўная. Ідзі, і скажы яму гэта. Ён пыхлівы і

горды, узрадуецца, і прыме цябе да сябе. А потым ты будзеш мне ўсе дакладаць – дзе, як і калі яны зьбіраюцца, што робяць. Што гавораць. Усё будзеш запісваць. Евангельле ад Іўды! Каіфа зарагатаў.

- Ідзі! Не марудзь. Чакаю цябе тут жа з дакладам заўтра. Апоўначы.

Чалавек нізка пахіліўся, і выйшаў. Каіфа ж пэўны час, не адрываючыся, глядзеў у вузкае, забранае кратамі вакно, за якім раськінуўся буйны сад. У саду сьпявалі салаўі. Была глухая ноч.

- Вось у такую ноч яно і адбудзецца, - падумаў ён. – Менавіта ў гэты час.

Яна сьціпла сядзела ў куце ля дальняй сьцяны пакою. У пакоі ніжэй чуліся галасы - громкія, вясёлыя. Раз-пораз раздаваліся ўспышкі рогату. Здаецца, там былі і жанчыны, высокія галасы якіх далучаліся да нізкіх мужчынскіх. А потым яны сьціхалі, калі нешта пачынаў казаць ён.

- Царства Божае - у нас саміх. Толькі сам чалавек можа вырашаць, што для яго закон. Закон не сышоў да нас ад Бога. Ён быў напісаны тымі, хто жадае зрабіць нас рабамі - архонтамі, уладарамі гэтага сьвету. Гэта яны, самі ня маючы ведаў, зьдзекваючыся, напісалі аж шесць сотняў бязглуздых запаветаў, каб розум чалавека быў заўсёды заняты страхам. Той жа, хто баіцца, ведаў ніколі не атрымае. Рабіце, што жадаеце, чаго сапраўды прагне вашае сэрца. І ведайце, што сапраўды, і найперш, яно прагне Бога, як прагнуў яго я. Бог літасьцівы, і я яго атрымаў. Чаму ж вы думаеце, што ня зможаце знайсьці яго ў сабе? Ён, усемагутны, гаворыць з вамі мноствам галасоў. Калі вы несяцё манету Закону, голас жабрака, заклікаючага да вашай міласэрнасьці - гэта голас Бога. Калі вы ўзьнімаеце камень, стогн і мальба аб літасьці таго, каго вы жадаеце пакараць, гэта стогн Госпада вашага.

Калі вы затыкаеце вушы, каб ня чуць Яго, і слухаеце левітаў і фарысеяў, вы Яго выганяеце з вашага сэрца, дапускаючы туды зло, пануючае ў гэтым сьвеце. Кожны з вас ведае яго голас - толькі ня ўсе гатовыя яго сапраўды пачуць.

- Рабі, - запытаў нехта. - Скажы, як нам жыць цяпер. Калі ўсе левіты і кніжнікі ілгуць, і Бог тут, не аддзелены ад нас сьцяной запаветаў, то што рабіць нам? Ня слухаць сьвятароў? Не хадзіць у храм? Перастаць чытаць свяшчэнныя пісаньні? Але ж што нам тады застанецца?

Голас быў разгублены, чалавек, здаецца, і сапраўды ня ведаў, што яму рабіць. - Што вам тады застанецца? Бог, - памарудзіўшы, адказаў голас, нізкі, хрыплы, сарваны голас чалавека, які прывык аддаваць загады, але ж цяпер ён гаварыў нягромка, мякка, нават крыху стомлена.

- Ці ж ты лічыш, Марк, што з Богам табе ня будзе вядома, што табе рабіць? Што ён не ўкажа табе шлях?

Запытай яго, і Ён сам табе адкажа. Што гаворыць табе цяпер Ён? Прама зараз, што кажа ён табе ў тваім сэрцы?

Сумнявацца ты можаш - так, як сумняваецца чалавек. Але ж Ён - усё ведаючы, і Ён ня можа сумнявацца. Ён лёгка адкажа табе на ўсе твае пытаньні, толькі трэба слухаць яго, і шчыра прыняць, што ён кажа.

Ці можа Бог загадаць табе кінуць камень у твайго брата, пакутуючага з табою тут, на зямлі? Ці ты ўяўляеш Бога, які загадае табе аддаць грошы яму, пазбавіўшы іх бедную ўдаву і асірацелых дзяцей? Ці ты можаш уявіць сабе такога Бога - сапраўднага, літасьцівага і ўсёведнага спадара сусьвету?

- Не, рабі. Такога Бога я не ўяўляю. Голас чалавека паступова набываў моц і годнасьць.

- Тады запытай сам сабе, і скажы, што цяпер кажа табе Бог у тваім сэрцы? Голас працягваў запытваць, і адначасова быццам адказваў, так, што разуменьне само ўваходзіла ў сэрца.

- Мой Бог кажа мне, што я павінны несьці Слова яго ўсюды, - нарэшце цьвёрда адказаў той, каго назвалі Маркам. Цяпер ён быў спакойны і ўпэўнены.

- Так ідзі і кажы, - пачулася ў адказ. - Кажы, толькі не аба мне,

але ж тое, што ты тут пачуў. Кажы не аб чалавеку, кажы аб Богу.

Бо ж я - ня Бог, і я не разумею, чаго вы мяне так клічыце. Я толькі чалавек, які адкрыў у сабе Бога.

Яны ўжо громка размаўлялі на двары звонку, і словы далятали да яе праз вялікае не забранае рашоткай вакно, вакол якога віліся вінаградныя лозы.

Яна прытулілася да сьцяны збоч, і ціха слухала. Яна магла слухаць гэтыя словы яго бясконца.

Нарэшце, галасы пачалі сьціхаць. Натоўп, відавочна, разыходзіўся. Па лесьвіцы ўгару раптам пачуліся нечыя крокі. Не яго. Мяккія, жаночыя. Жанчына, захінутая ў покрыў, ужо сталага ўзросту, але ўсё яшчэ прыгожая, ціха ўвайшла ў пакой. У руках яе быў скрутак адзеньня, які яна моўчкі палажыла перад ёй.

- Мяне завуць Марыя, - вымавіла яна. Яе голас быў добры і крыху сумны, быццам бы поўніўся даўнім жалем.

- Ён прасіў перадаць вам адзеньне. Вам будзе ня зручна ў гэтым ... яна памаўчала ... ў тым, што на вас зараз.

- Канешне. Яна нахіліла галаву, устала, і ўзяла скрутак.

- Дзякуй вялікі.

- Калі пераапранецеся, дайце мне знаць. Я буду чакаць вонкі. З гэтымі словамі жанчына ўстала, павярнулася, і выйшла.

Яна разгарнула скрутак - цёмна-сіняе вольнае плацьце, чорны покрыў на галаву, просты, з тонкай шэрсьці, па краю затканы вузкай бліскучай стужкай.

Яна зьняла хітон, паўпразрысты, з выраблянага ільну, адкрываючы адну з грудзей, і грэбліва адкінула яго ў бок. Калі б яна магла, яна б яго спаліла. Перад ёй на палу стаяў вялікі гарлач і мядзяны таз, куды яна наліла вады, асьцярожна нахіліўшы посуд, старанна ўмылася - доўга цёрла твар, капнуўшы ў далоні алею, каб змыць краску, якая шчодра была

нанесена на вочы, шчокі і вусны, нарэшце пляснула ў твар вадою, і выцерлася падалом старога хітона.

Апранулася ў прапанаванае адзеньне - новае, крыху пахнучае нейкім духмяным прыціраньнем, і асьцярожна прыадкрыла дзьверы.

- Я гатовая, - вымавіла яна.

Марыя нахіліла галаву, і сышла па ступеньках.

Ён увайшоў у пакой амаль адразу за ёй - нібыта гэтага чакаў. Апрануты ў чысты і цэлы ільняны кафтан, доўгі, за калена, на якой была накінутая сукня бяз рукавоў накшталт доўгага плашчу.

Яна стаяла перад ім, трымаючы покрыў рукой, захінаючы далоньню твар. Чорныя хвалістыя пасмы, доўгія, амаль да сьцёгнаў, выбіваліся з-пад тонкай тканіны, спадалі ёй на грудзі, нібыта покрыву было нядастаткова, каб скрыць ад яго яе цноту.

Але ж ён бачыў яе прыгажосьць. Чаму ж яна хаваецца? Ён - яе гаспадар, выкупіў яе, заплаціў дзьве тысячы манетаў. Цяпер ён мае поўнае права рабіць зь ёй усё, што пажадае. Нават і забіць ці катаваць яе. Канешне, ён гэтага ня зробіць - не такі ён, бачна, чалавек. Але ж для нечага ён яе выкупіў. Пэўна ж, для таго, для чаго мужчыне наогул патрэбная жанчына - для асалоды, каб расслабіцца пасьля доўгага цяжкога дню.

Яна ўжо рабіла ўсё гэта - амывала, расьцірала, падносіла напоі і ежу, і многа чаго рабіла яшчэ, акрамя таго, што магло папсаваць гэты яе скарб. Мужчына не ўваходзіў у яе ніколі.

Напэўна, гэты жадае атрымаць усё. У думках яна ўздрыгнула. Яна ведала, што некалі гэта адбудзецца. Да таго ж, ён і сапраўды быў прыгожы, хоць і страшнаваты і дарослы для яе. Яна б лепш аддалася таму прыгожаму юнаку, што стаяў тады побач зь ім. Ён для яе зусім ня быў страшны, ці пагрозны, быў стройным і лёгкім, і яна не баялася ўявіць побач з сабой яго тонкае, гібкае цела, якое ня так ужо і адрозьнівалася ад яе ўласнага.

Гэты ж быў надта высокім, надта вялікім, з надта шырокімі плячамі, чорнымі вачыма і барадой, якія рабілі яго выгляд яшчэ больш пагрозным.

Яна не магла ўявіць, што будзе, калі ён сьхіліцца над ёй, калі яго рукі сьціснуць яе і яго плоць ўвойдзе ў яе, разрываючы яе цела. Яна чула адчайныя крыкі там, у доме, дзе яна была раней, і некалькі разоў са двару незаўважна выносілі загорнутае ў прасьціны цела. Для гэтых пакутніц усё скончвалася там, у геене. Але чым яна лепей за кагосьці. І калі яна памрэ, такі ўжо будзе яе лёс.

Задумаўшыся, яна не заўважыла, як покрыў зваліўся зь яе пляча на падлогу. Ён падыйшоў да яе, і зазірнуў ёй у твар. Яго вочы былі пранізьлівымі, спакойнымі. Сьветлымі, ня гледзячы на цемру, якая панавала ў іх, чорных, як ноч, тым больш пранізьлівым у якой здаецца сьвятло няшматлікіх зорак.

Яго рука дакранулася да яе шчакі, і выцерла бягучую па ёй сьлязу.

- Ня бойся мяне, дзіця. Я не крану цябе, - нягромка вымавіў ён.

- Толькі калі ты сама пажадаеш, і ты будзеш гатовая прыйсьці да мяне. Пакуль жа ні ты не гатовая для гэтага, ні я не гатовы прыняць цябе так, як тое мае быць паміж супругамі.

Ты станеш маёй жонкай, калі прыйдзе час. І калі на тое будзе твая ўласная воля. Ты - ня рэч, хоць так і вырашыў закон. Бо ніхто ня мае права распараджацца лёсам чалавека, акрамя Бога. Ён жа найперш запытвае нас саміх. І толькі калі мы здаем сваю волю яму, ён робіць для нас так, як найлепш. Ніхто ня мае права вымушаць нас. Нават і Бог. Запомні гэта. Бог заўсёды прыходзіць да нас праз каханьне, і толькі каханьне ў нашым сэрцы адчыняе дзьверы, каб пусьціць да нас яго.

Яго вочы, гарашчыя, палымяныя, глядзелі на яе. Ніхто і ніколі не гаварыў зь ёй так, і не казаў ёй такіх рэчаў.

Жарсьць яна ведала - ськіраваную на яе, хоць сама і была халодная, як луна. Каханьне ж да сябе яна наогул не ўяўляла.

Бацька любіў яе, маці песьціла - толькі гэта было даўно. Няўжо нехта зможа палюбіць яе так, як яе любілі яе бацькі?

І вось гэты чалавек кажа ёй пра каханьне, пра Бога і пра волю, і цяпер яна мае права зрабіць свой уласны выбар.

Ён глядзеў на яе мякка, пранізьліва, з журбой і жалем у вачах. Нешта было ў іх яшчэ - вялікае, глубокае, сумнае, ціхмянае і пакорлівае, быццам бы ў вачах ільва яна ўбачыла позірк ягня. Гатоўнасьць скарыцца лёсу і прыняць яго.

- Ён аддаў сваю волю Богу! - гэта яна раптам зразумела.

Цяпер ён быў гатовы атрымаць ад яго ўсё - нават, калі трэба, і пазбавіцца самога жыцьця. Ён жадае яе, і ўзяць ня можа. Адмаўляе сабе ў тым, у чым бы ні адзін з мужчынаў, якія ёй сустракаліся, ніколі б не адмовіў.

Раптам ёй стала яго шкада. Асьцярожна яна кранула рукой яго шчаку. Ён накрыў яе руку сваёй, і моўчкі глядзеў на яе неадрыўным позіркам.

- Я згодная, - ціха вымавіла яна. - Я аддам табе сваю волю, Госпадзі. Цяпер у мяне няма волі, і як захочаш, так і зробіш са мной.

Ён пакачаў галавой.

- Я зраблю з табой па волі тваёй, і ніколі яе ў цябе не забяру. Але ж я цябе зразумеў, дзіця. Ці згодная ты прыняць святое хрышчэньне ў вадзе Іардану, і абвянчацца са мной шлюбам не зямным, а нябёсным? Такім, які разарваць ужо будзе нельга ні на зямлі, ні на небе?

- Згодная, - адказала яна. Ён узьняў покрыў і закрыў яе.

- Заўтра раніцой мы пакінем гэты дом, - вымавіў ён.

- Бо на шляху да айца спыняцца нельга. Яго вусны апынуліся блізка да яе твару, і кранулі закрываючы яе покрыў. А потым ён устаў, і хутка выйшаў.

Воды Йардану кіпелі вакол, не апальваючы яе.

Яе белая кашуля плыла па хуткіх хвалях, лашчачых яе ногі, блытаючыся вакол. Худы высокі чалавек, твару якога амаль не было бачна з-за густых нячосаных валасоў, тры разы акунуў яе ў ваду, вымавіўшы:

- Хрышчу цябе ў імя Айца нашага нябёснага. Амін.

Мокрая і са зблытанымі валасамі, яна выйшла на бераг, дзе яе ўжо чакаў ён, такі ж мокры, і неяк дзіўна шчасьлівы. Зь яго мокрых валасоў таксама цяклі струі, беглі па кашулі, якая прыліпла да цела, але ўжо пачала падсыхаць на плячах - шырокіх, як у Самсона.

Ён абняў яе, захінуўшы ў сухую тканіну, і радасна вымавіў:

- Адчуваеш Царства Божае? Цяпер яно ўнутры нас. Ці згодная ты цяпер злучыцца са мной шлюбам, Елена, душа мая? Стаць маёй Шхінай, якая давеку будзе ляжаць на маіх грудзях?

- Згодная, Госпадзі, - ціха адказала яна, і яго рукі самкнуліся вакол яе ў трывалае кола.

У пакоі невялікай глінабітнай хацінкі нікога не было, акрамя іх. Яны зьнялі падсохлае адзеньне і засталіся аголенымі, стоячы адно насупраць другога.

Ён наблізіўся і абняў яе, мякка прыціскаючы да сябе. Яго вусны апусьціліся на яе вусны, і яна адчула смак яго пацалунка. Ён меў смак і водар неба, зразумела яна. Яе ногі падагнуліся, і яны апусьціліся на падлогу разам. Яна адкінулася ў яго руках, закрыўшы вочы, адчуваючы, як яго вусны вывучаюць яе цела, праходзяць па грудзях і апускаюцца ніжэй, туды, дзе было схаванае тое, што было адзіным яе скарбам.

Ён узяў яе хутка, прагна і моцна, бязьлітасна паглыбляючыся ў яе, запаўняючы яе плоць сваёй, быццам бы пераўтвараючы яе ў сабе.

Калі б яна не была прыгатаваная да таго, што адбудзецца, яна б, напэўна, памерла. Яна ўяўляла гэта, але ж не магла ведаць

праўды - як Ён уваходзіць у цела і падпарадкоўвае душу, як гэта балюча і як гэта салодка - аддавацца і скарацца яму, ня ведаючы сконцу, не спыняючыся, поўнасьцю ахвяруючы сябе Яму, прапаноўваючы Яму сваё цела так жа, як і Ён аддаваў сваё - бязьлітасна, апантана, не шкадуючы цела і суцэльна ім пагарджаючы і праз гэта ўзносячы яго, быццам бы ўзьнімаючы якар, які болей не трымаў ні цела, ні душу

Калі ён выйшаў зь яе, на ім была яе кроў. Кроў яе цноты.

- Што цяпер, каханы? - запытала яна яго. - Ці ты прымеш мяне да сябе ў сваё нябёснае царства?

- Прыму, любая мая. Ён пацалаваў яе вочы. Апусьціўся, і пацалаваў улоньне, і ізноў апусьціўся ніжэй, нібыта аднаўляючы і закрываючы яе сваімі вуснамі.

- Толькі да нябёсаў у нас з табой наперадзе яшчэ доўгі шлях.

Глава 10: Чалавек

Ён адразу пазнаў гэтую хваробу. Яна не была праказай. Ён сустракаў такія выпадкі там, калі жыў зь есеямі. Хвароба скуры, якая вылечвалася даволі лёгка.

- Тыдзень амывайся, потым акурвайся серай, і нанасі алей зь некалькімі кроплямі сумясі ладану, хвоі і ... ён назваў яшчэ некалькі расьлінаў. Ты ачысьцішся праз тыдзень, і тады пойдзеш у храм, каб засьведчыць гэта і прынесьці ахвяру.

- Ачышчуся? - зьдзіўлена-радасна вымавіў чалавек, аглядаючы свае парэпаныя, у белай каросьце рукі.

- Так. Ачысьцішся. Ён кіўнуў, упэўніваючы.

- Гасподзь ачысьціў мяне!!! Чалавек з крыкам пабег прэч, узьняўшы над галавой рукі, радасна разштурхваючы натоўп.

- Якія людзі дурныя. Ён уздыхнуў.

А потым быў гэты памерлы. Тры дні праляжаў у бінтах у халодным склепе з падвязанай ськівіцай, і ледзь сапраўды не сканаў.

Яму адразу было няўцям, як гэта Лазар, які быў жывы і здаровы некалькі дзён таму і наогул ніколі не хварэў, раптам памёр ад нейкай нечаканай хваробы. Тое, што ён страціў прытомнасьць і наогул не варушыўся, зусім нічога не казала. Прыпадак здарыўся раптоўна, ён зваліўся, закаціў вочы, брызнуў пенай, а потым ляжаў, ня дыхаючы. Амаль. Праверыць дакладна ніхто не здагадаўся. Дзень паплакалі, а потым намазалі алеем, і пацягнулі ў склеп.

Як ён быў рады вызваленьню, тое было немагчыма і ўявіць. Толькі розумам памуціўся, ды хто б тут здолеў пазьбегнуць вар'яцтва?

Тыдзень бегаў голы па наваколькі, і крычэў:

- Гасподзь ажывіў мяне!

Ізноў паляцелі чуткі, і да яго пачаў сьцякацца натоўп. Колькі ён не казаў ім аб Богу ў сабе, яны яго не разумелі. Для народу Богам быў ён - выратавальнікам, які мог вызваліць людзей ад рымскае ўлады і хцівых крывадушных "фарысеяў", якія душылі сваіх горш за рымлян.

Паступова вакол яго сабралася вялікая колькасьць народу, разам зь якім ён ганарова ўвайшоў у Ерузалем - Мешыахам. На осьліку ехала цяжарная Елена. Яе натоўп таксама вітаў як царыцу.

- Што гэта адбудзецца? - думаў ён. Але ж назад ходу ўжо не было.

Ён уздыхнуў, і адлажыў сцэнар. Стаяла ўжо глухая ноч.

А заўтра ізноў бойка з Паола, бо ўсё зусім ужо пачало выходзіць з-пад яго кантролю. Бога не атрымоўвалася - атрымоўваўся чалавек. Ды і яшчэ такі сабе - не ідэальны. Яму ж дарэчы ён спадабаўся: шчыры, сьмелы. Добры. А што ня ведае выніку сваіх дзеяньняў, ня можа прабачыць далей за сёняшні дзень - тое не яго віна. Хто ж іх ведае, ці можа прадказаць – вынікі? Суцэльна даверыўшыся Богу, чалавек губляе права распараджацца сваім уласным жыцьцём. Бог кліча яго. Кліча ўладна - так, як калісьці яго паклікаў. І як яго паклікала яна. Яна была для яго Богам, як і ён для яе ім быў. У гэтай еднасьці, роднаснасьці душаў болей не засталося нічога залішняга, належачага сьвету. Не засталося нічога, акрамя сьвятла.

Сандра глядзела на яго праз паўпрыкрытыя вочы. Полымя кастру таньчыла ў бязьмежнасьці, лашчыла гладкую скуру цемры. Яны сядзелі разам вакол вогнішча - апошні разьвітальны вечар перад тым, як праэкт закрываўся да вясны наступнага году, а яны ад’язжалі на нарэшце вызваліўшуюся вілу ў Фларэнцыі, якую сябры Фёдара пакінулі больш чым праз месяц пасьля заяўленай даты. На ўвесь гэты час Фёдар аплаціў

ім кватэру ў Рыме, якая, як апынулася, ім амаль не спатрэбілася. Цяпер толькі трэба было вярнуцца туды і забраць рэчы, сесьць на цягнік, і паехаць да Фларэнцыі, ад якой да вілы на марскім беразе было крыху больш за сотню кіламетраў.

Касьцёр вясёла патрэскваў – не адчуваў урачыстасьці моманту. Каманда вакол “натрэскалася”, як сказаў бы Фёдар. Гучна грала нейкая заліхвацкая музыка з калёнак, ля якіх зь дзясятак чалавек вясёла трэсьліся ў нейкім хіповым танцы. Астатнія разьбіліся на парачкі, і разышліся па навакольлі, схаваўшыся пад засеньню купінаў дрэваў, ці за якім кустом, бо дрэваў было няшмат.

Ён ужо звыкся зь весялосьцю тутэйшых нораваў, якія спачатку яго адначасова забаўлялі, уражвалі і палохалі.

Італія – краіна сонца! Што папішаш. Ён усьміхнуўся пра сябе.

Паола побач нешта горача распавядаў Летыцыі. Яна італьянскага не разумела, а Паола, выпіўшы, ніякімі мовамі акрамя роднай мовы жэстаў не валодаў. Вось і цяпер ён апантана жэстыкуляваў, узьнімаў рукі над галавой, потым хапаўся імі за яе, і раптам прыціскаў іх да сэрца, працягваючы ў бок Летыцыі, і ізноў махаў рукамі вакол сябе – ці то скардзіўся на нешта, ці радаваўся – было не зразумела нікому, акрамя яго.

- Donna … bella … Dei … capisci … molto … Летыцыя ветліва ківала.

Яна таксама крыху выпіла – зусім нямнога белага віна. Два ці тры бакалы.

Ён жа неяк набраўся за разьвітаньне. Раніцой яны ўшчэнт пасварыліся, ледзь не пабіўшыся, а потым горача памірыліся з рэжысёрам, які груддзю паўстаў супраціў фіналу і наогул таго накірунку, у якім разьвівалася кіно.

З эпічнага і ўзьнёслага яно паступова пераўтваралася ў трагікамедыю чалавечых жарсьцей і пакутаў.

Міхась упарта настойваў, што менавіта так яно і было, а Паола

крычэў, што ён блюзьнер, і на прым'еры народ выцарапае яму вочы, вырве валасы, адарве рукі і ногі, і выкіне рэшткі сабакам на корм.

- Калі такое здаралася? – Міхась рассьмяяўся ад нечаканасьці эпітэтаў, уявіўшы каляровую "шена", як натоўп разьдзірае "на мыла" небараку-творцу, які надта далёка зайшоў у сваім жаданьні ўразіць.

- Не было, дык будзе, - сказаў Паола, як адрэзаў. Яны дамовіліся, што за зіму Паола зьбярэ ў цэлае адсьняты ўжо матэрыял – набралася на добрых тры гадзіны разам зь бясконцымі Міхасёвымі размовамі, а Міхась прыдумае канцоўку, такую, каб глядачы адчулі тое, што называецца катарсісам, каб у іх ручаямі паліліся сьлёзы, і яны б адразу ачысьціліся і пераўтварыліся. Ад чаго, і ў каго, Паола не ўдакладніў.

Цяпер жа, памірыўшыся, яны сядзелі ля кастру, які вясёла таньчыў пад гукі калёнак, пілі "граппу", жартавалі, размаўлялі, успамінаючы забаўныя моманты здымак, і Паола адказваў на мноства пытаньняў гасьцей, раіўшы ім месцы, каб паглядзець і адпачыць, знаёмячы з асаблівасьцямі месцовага менталітэту і краю, ды проста распавядаючы невядома што.

Стаканы ўжо даўно перасталі хадзіць па кругу, і вялікая кампанія разьбілася на маленькія групкі "па інтарэсах". Парачкі зьнікалі некуды за небасьхіл, а для кагосці небасьхіл апынуўся надта ўжо блізка, ледзь ня ў дзясятку метраў ад вогнішча. Хтосьці проста паваліўся, і спаў у спальных мяшках.

Ён адчуў, што трэба прайсьціся некуды і яму. Устаў, і зразумеў, што выпіў можа і залішку. Аднак ішоў роўна, упэўнена. Ізноў, можа – занадта. Пакуль жа прайшоўся далей – амаль працьвярэзіўся. Перад абрывам групка соснаў узьнімалася высока, чарнеючы на фоне чырвонага небу. Хутка на зямлю апусьціцца змрок – густая паўднёвая ноч. Ён стаў за дрэва, справіў свае справы, зашпіліў штаны, і толькі засьцягнуў рэмень, як ззаду пачуліся нечыя крокі – ня дужа ўпэўненыя, але ж хутка і рашуча накіроўваючыяся да яго.

Ён павярнуўся, і прама перад сабой убачыў жаночы твар. Перад ім стаяла Сандра, і глядзела на яго адчайнымі вачыма. А потым, нічога ня кажучы, працягнула рукі, і паспрабавала абняць яго за шыю. Ён пасунуўся, утрымліваючы яе на адлегласьці. Хмель зусім вывятрыўся – як ветрам здула.

- Сандра, што ты робіш? – вымавіў ён, разгублены ад нечаканасьці.

- Volio te, - пачуў ён яе нізкаваты, хрыплаваты, аксамітны голас. Яе твар, смуглявы, зь вялікімі чорнымі вачыма, прамым носам і пухлявымі вуснамі быў зусім побач ад яго твару. Яна была прыгожая – дзікай, варварскай прыгажосьцю. Шыракаватыя нострыафрыканскага носу раздуваліся, позірк нагадваў позірк апантанай.

- Тут ня толькі алкаголь, а і яшчэ нешта, - здагадаўся ён. Ад яе густа салодка пахла – нейкім духмяным дымам. Яе рукі, моцныя, трымалі яго за запясьці – не па-жаночы крэпка. Не дарма ж яна праводзіла столькі часу ў спартыўным зале, яшчэ і сама хвалілася.

Ён мог бы лёгка адарваць яе, адкінуць, але ж шкадаваў. Яна ўчапілася ў яго так, што яму прыйшлося б зрабіць ёй балюча.

- Я хачу цябе. Яна падумала, што па-італьянску ён не зразумеў, і перайшла на ангельскую мову.

Яе голас стаў яшчэ больш хрыплым, перарывістым. Раптам яна ўзьняла яго далонь, і палажыла сабе на грудзі – пругкія, даволі вялікія, але ж дасканалай акруглай формы. Усё яе цела было ідэальным – ні складачкі, ні воднай косткі ня бачна, прафесійна пракачанае, нагадваючае антычнага юнака-атлета. Толькі сьцёгны былі шыракаватыя для юнака, сказвалася маўрытанская кроў.

- Сандра, ідзі, знайдзі каго. Да Паола ідзі. Чаго ты яго кінула? Ён сумуе.

Нарэшце ён вызваліўся ад яе, і проста стаяў насупраць. Пачуўшы яго параду, яна крыху адсунулася, але ж не адышла.

Ён сеў на лаву ля сталу, апёрся на яго рукой. Плечы яго сагнуліся. Які непамерны цяжар ён узьняў на сябе! - падумалася яму. Толькі нядаўна быў звычайным ваяром, воінам храму, потым – манахам-пустэльнікам, а цяпер жадае пераўтварыць гэты сусьвет. І ўсё – праз яе. Бо яе ён ня мог пакінуць. А вызваліўшы яе, адчуў, што павінен вызваліць і астатніх. Ён ня мог жыць побач з Законам, пад яго ўладай. Годнасьць чалавечая не дазваляла. Бо ж чалавек у сваёй сутнасьці роўны Богу – таму, найвышэйшаму, які і ёсьць каханьне. І толькі праз каханьне і годнасьць ён можа наблізіцца да яго. Не пахіліцца злу. Здаецца, гэта складана. Цяпер жа для яго гэта было зусім проста. Але ўсё ж тут ён быў чалавекам у чалавечым целе, зь яго абмежаваньнямі і сумненьнямі, і яно стамілася.

- Калі ж сконьчыцца гэтая бясконцая ноч, у якую яму не даюць адпачыць? - падумаў ён.

Чалавек хутка прайшоў у пакой, і схіліўся перад ім.

- Іўда? Што здарылася? Ты хочаш сказаць мне нешта? Ён, здаецца, ведаў, што хоча сказаць яму былы гаспадар дома

граху, які ўжо колькісь дзён таскаўся за ім у натоўпе. Яму было прыкра яго бачыць, але ж ён нічога не казаў. Калі ён тут, то, напэўна, так вырашыў Бог, які дагэтуль вёў яго ўладна і хутка, яўляючы сябе так моцна, і што і самога сябе ў ім ён пачаў забываць.

- Рабі, да цябе прыйшлі людзі. Яны кажуць, што прысланыя Каіфай. Ён хоча паразмаўляць з табой прыватна.

- Каіфа? Аб чым нам размаўляць? – ён узьняўся.

Пётр, высокі, крэпкі галілеянін, таксама былы ваяр храму, паўстаў высокім цяжкім ценем збоч ад яго. Ён узьняў руку.

- Ня трэба. Хай сьвяршыцца яго воля. Я пайду. Пайду адзін. Мне няма чаго баяцца.

Нахіліўшыся, ён выйшаў за Іўдай праз вузкія нізкія дзьверы.

Каіфа чакаў яго ў багата прыбраным пакоі вялікага дома ў аточаньні густога саду.

- Шымон! Колькі часу! Я рады бачыць табе. Ты стаў іньшым. Ён абняў яго – здаецца, шчыра, цёплымі абдымкамі.

- Каіфа, я таксама рады бачыць цябе. Ты ведаеш, хто я, і што я жадаю. Я жадаю пераўтарыць Закон, адмяніць яго, і назначыць Запавет новы, і вызваліць наш народ з-пад Закона, і рымскае ўлады. Мяркую, што прыйшоў час для таго, каб усім нам зьмяніцца. Адкрыць вочы, і ўбачыць, як мы жывем.

- Я згодны. Каіфа кіўнуў.

- У мяне да цябе прапанова. Ён прайшоўся па пакоі, нібыта вагаўся пачаць. Яго адзеньне шапацела, дарагое, расшытае золатам.

У думках ён убачыў сябе побач са сьвятаром – высокі, спалены сонцам, у простым ваўняным хітоне і плашчы. Грошаў ён даўно ўжо не насіў пры сабе, ды і ня меў іх. Навошта яму грошы. Усяго і так было дастаткова. Тыя, хто прыходзілі ў абшчыну, аддавалі ў яе ўсё, і цяпер усяго было столькі, што яны нават

змаглі надбаць вялікі кавалак зямлі ля мора. І яшчэ надбалі зямлю ў Александрыі – ён сам туды ездзіў, аглядаў. Прыгожае месца, з вадаёмам і апрацаванымі палямі, недалёка ад гораду. Александрыя вабіла сваёй адкрытасьцю, касмапалітычнасьцю, і там было лёгка дыхаць. Ерузалем жа давіў – сваім храмам, старыной, коснасьцю, сухой камяністай зямлёй, раськінуўшайся вакол.

- Слухаю цябе, Каіфа. Ён нахіліў галаву.

- Ведаеш, Шымон. Ты здолеў узьняцца над натоўпам. Шмат народу ідзе за табой. Не пабаюся сказаць, што нават і болей, чым засталося вернікаў Закону, якіх прадстаўляю я. Здаецца, што ты – мацней, і што ты перамог. Але ж я прашу цябе выслухаць мяне, і зрабіць так, як, я ведаю, ты насамрэч зробіш – мудра.

Ты павінен сабраць як мага болей людзей, і ў голас абвесьціць ім новае Адкравеньне. Сказаць, што ты памыляўся. І што ў пустыне цябе спакушаў Д'ябал. Ты паддаўся яму, бо ён паабяцаў табе ўладу, якую ты атрымаў. Але ж цяпер ты насамрэч пачуў голас Бога, і той, Бог айцоў нашых, адкрыў табе сябе, як Моше на сьвятой гары. Ты прызнаеш свае памылкі, і скажаш, што адзіны ісьціны Бог – гэта Бог, які спаслаў нам Закон, якому мы павінны падпарадкавацца да веку. Рымляне ж пасланыя нам праз нашыя грахі, і толькі шчыра выконваючы запаветы, мы зможам пазбавіцца іх улады. Тое ж, што прапаноўваў ты, гэта было блюзьнерства, якое ў твае вусны ўклаў Д'ябал. І цяпер ты каешся і плачаш па сваіх грахах. Тут выйду я, і пры ўсіх прабачу цябе, палажу на цябе руку, і скажу, што ты ачышчаны ад граху. А потым ты працягнеш прапаведваць, толькі ня тое, што ты вёрз, а Закон, які, адзіны, што дан нам Богам, мае ўладу над народам іўдэйскім – праз мяне, яго сьвятара. Паколькі ты - зь левітаў, то зможаш заняць маё месца, калі я памру. Я паклапачуся і аб гэтым. Твая ж блудніца спакойна народзіць, і будзе жыць у палацы, і ніхто яе не кране. Бо ж ты за яе заплаціў – столькі, сколькі яна і сапраўды вартая. Ён шырока ўсьміхнуўся.

- Дзякуй за прапанову, Каіфа. Я цаню тваю шчырасьць. Але ж выканаць яе не змагу. Бо я і сапраўды спазнаў Бога. Больш за

тое, я сам – Бог у чалавечым целе, тут на зямлі. Айцец мой гаворыць праз мяне, бо я суцэльна адмовіўся ад сваёй волі, і мае вусны кажуць толькі яго Слова. Як я магу пайсьці супраціў Бога, Каіфа? Як магу я пайсьці супраціў самога сябе? Ён спакойна глядзеў на сьвятара - вачыма стомленага, даўно ня спаўшага чалавека.

Каіфа глядзеў на яго ў адказ. Яго вусны крывіліся, быццам бы ён жадаў сказаць нешта.

- Ты можаш ісьці, - нарэшце вымавіў ён. – Я ня буду цябе затрымліваць. Але ж я даю табе час – тыдзень, каб асэнсаваць тое, што я сказаў, і выканаць мае словы. Калі пасьля Песаха ты ня скажаш народу тое, што загадаў табе я, бо волей Закону, які ты не прызнаеш, я магу загадваць табе, іўдэй, ты пашкадуеш. Я даю табе слова. Ты сабраў вакол сябе народ, але ж не народ мае тут уладу. Рым – вось хто пануе над Іўдэяй. Вось хто – сапраўдны Бог для яе народа. Рым і кесар – яны вяршаць нашае жыцьцё. Вяршаць яго па волі Закону і праз нашыя грахі. Мы павінны падпарадкаваць сабе Рым, уплываць на вумы варвараў – бо яны варвары, пакланяючыеся дземанам, а не Богу, і рукамі дземанаў-рымлян, як калісьці Саламон, аднавіць храм нашае веры, і нашую веліч. Мы, а ня Рым, будзем панаваць над сусьветам – праз яго, станем душой у яго вялікім целе, розумам ў яго пустой галаве. Вось аб чым павінны думаць шчыры іўдэй – як захапіць уладу, а не як разбурыць самое сабе, бо ж іўдэй – гэта той, хто пачытае Закон, Шымон. Ідзі, і рабі то, што я сказаў. Калі ж да гэтага часу ты ня зробіш загаданае, ты, і ўсе, хто з табой, пашкадуеце.

- Храм будзе разбураны, Каіфа. Слова Божае ўжо не спыніць - нікому. Ты ўспомніш мае словы, але ж будзе позна.

З гэтымі словамі ён разьвярнуўся, і выйшаў у цемру з асьветленага лямпамі дварцу, дзе за варотамі чакалі яго яго людзі.

Пётр першы кінуўся насустрач.

- Госпадзі! – вымавіў ён. – Мы ўжо хацелі ісьці вызваляць цябе. Цябе не было так доўга.

- Гэта я прыйшоў вызваліць вас, Пётр. Ён палажыў руку яму на плячо. – Ты ня верыш у мяне. Але ж гэта таму, што ты мяне яшчэ ня ведаеш. Прыйдзе час, і ты таксама даведаешся, хто я. За мяне ня трэба баяцца. І я ніколі не пакідаў, і не пакіну вас.

З гэтымі словамі ён адкінуўся ў вялікім скураным крэсьле. На вілу апусьціўся позьні, глухі вечар. Халодны і стылы.

Яна падышла, хутаючыся ў мяккі пушысты кардыган – сама зьвязала, белы, пярлінавы, як воблачка.

- Хочаш кофе, каханы? Я табе звару. І яшчэ я прыгатавала пасту – баланьезе.

Ён павярнуўся да яе, ахапіў рукамі.

- Любая мая. Прыціснуўся да яе мяккасьці, адчуў цяплыню яе цела. – Зрабі кофе. Слухай, а бульбы ў нас няма? Я, выбачай, есьці хачу. А то я ўжо ў італьянца пераўтварацца пачынаю. Стану скора як Паола – цень чалавеку.

- Магу і бульбу зварыць. Яна ўсьміхнулася. Ці, калі хочаш, магу і дранікі пасмажыць. З фаршам. Яшчэ застаўся.

- Давай ты іх заўтра зробіш, сёньня позна гатаваць такія складаныя стравы.

Ён пацалаваў яе, яна сышла, хутка загула кава-машына, і яна вярнулася з чашкай. Паставіла перад ім на стол. Сама села на стул побач.

- Раскажы, што будзе далей з Шымонам, - папрасіла яна.

- Каіфа зрабіў Шымону прапанову, ад якой нельга адмовіцца, і на якую ён, канешне ж, не пагадзіўся. На выкананьне прапановы Каіфа даў яму тыдзень, пасьля якога яго возьмуць рымскія салдаты, якія адвядуць яго ў вязьніцу, як бунтаўшчыка супраціў закону і кесара. Пасьля дапросу ў Пілата Шымон будзе асуджаны на сьмерць, як бунтаўшчык і злодзей. Да суда Шымон будзе знаходзіцца ў вязьніцы, куды да яго будзе прыходзіць Елена, якая да таго часу народзіць дзіця. У вязьніцы Шымон сьхіліць да веры ў Слова рымскага жаўнера, які будзе

суправаджаць яго на Галгофу. Па дарозе на гару Шымон зь Кірынеі дапаможа яму несьці крыж, і калі прыйдзе час расьпяцьця, выдасьць сябе за яго. Ніхто не паверыць сапраўднаму Шымону, і жаўнер, якому ён прапаведваў Слова, Лонгін, штурхане яго прэч у натоўп. Ён будзе прысутнічаць пры пакараньні Шымона, які стане ў вачах астатніх Мешыахам, а потым вернецца ў горад, дзе ўсе вырашаць, што ён уваскрос. Усе яго намаганьні распавесьці праўду людзі будуць успрымаць як інасказальныя прытчы. Шымон зьмірыцца з тым, што народу патрэбнае дзіва, з'едзе ў Александрыю, і будзе прапаведваць яшчэ колькісь год. Там ён вывучыць шмат вядомых філосафаў, якіх потым назавуць гностыкамі, і дажыве да таго часу, калі будзе разбураны храм. Ён пераадолее спакусу ізноў стаць павадыром паўстанцаў, але ж яго сын, таксама Шымон, загіне пры асадзе гораду. Ды гэта ўсё ужо будзе другая гісторыя, любая. Пакуль я бачу яго лёс так, але ж што будзе ўгодна Богу, ня ведае ніхто.

- Я думаю, што менавіта так і было, каханы. І Шымон і сапраўды пазьбегнуў расьпяцьця, і прапаведваў слова Божае. І яшчэ я думаю, што Хрыстос такі вялікі, што ён ня можа быць абмежаваны адным целам. Бог быў і ў Шымоне Ваўхве, і ў Елене, і ў Шымоне-Кірыяніне, які вызваўся несьці крыж, і ў Пятры, і ў Яне – усюды. Ён ёсьць і ў табе, і ўва мне, любы. Яна абняла яго, і мякка кранула яго вусны сваімі. Зь яе губ у яго ўваходзіў подых Сьвятога Духа, і ён закрыў вочы, убіраючы яго ў сабе зь яе подыхам.

Глава 13: Дзіця

- Паола, я хачу сказаць табе нешта. Я сыходжу. Прабач, але ж я не магу болей заставацца з табой. Прыйшоў час, калі мне трэба застацца сам насам з сабою. Я ўдзячная табе за ўсё – за тое, што ты спыніўся тады, што падабраў мяне і завёз у шпіталь, што дапамог мне атрымаць адукацыю і пабудаваць кар'еру. Ты быў маім анёлам, праўда. Але цяпер я павінна сыйсьці. Я не магу болей ісьці тваім шляхам, бо адчуваю, што ў мяне з'явіўся свой, уласны. Можна сказаць, што дзяўчынка нарэшце стала дарослай.

Яна крыва ўсьміхнулася. Было бачна, што яна нярвуецца. Яе рукі камячылі сурвэтку, а потым кінулі яе на стол. Яна ўзяла кубак з кавай, адпіла, і замаўчала.

Паола таксама маўчаў, і глядзеў на яе. Яго твар меў запытальна-задуменны выраз, які затым зьмяніўся плоха схаваным выразам болю.

- Я не затрымліваю цябе, Сандра. Калі ты лічыш, што так будзе для цябе лепш, ты можаш ісьці. Табе ёсьць, дзе жыць? Раптам ён папярхнуўся, і закашляўся. Адпіў кавы, і запаліў цыгарэту. Яны сядзелі на кухні ў іх кватэры, якую яна дзяліла зь ім ужо пятнаццаць год. Як прыйшла тады, так і засталася. Спачатку яны жылі паасобку, у розных пакоях. А потым яна сама прыйшла да яго – ёй хацелася цяпла. І цяпер, вось – сама сыходзіць. Яна ж яму ніколі не належыла. Бог прыслаў яе да яго, ці, наадварот, яго да яе, і Бог вырашыў, што ім прыйшоў час разьвітацца. Сапраўды, ён зрабіў для яе шмат – даў адукацыю, жытло, знайшоў працу. Быў ёй сябрам, і, як ён спадзяваўся, нечым большым. Але ж у глыбіні сэрца ён разумеў, што ня мае права на гэтую жанчыну, якая трапіла да яго ў сілу абставінаў, што вымусілі яе разьдзяліць зь ім дом, а потым і ложак. Насамрэч, гэты выбар яе ўласным ня быў, бо яна выбегла да яго, як затраўлены зьвер на паляўнічага. Ці зьвярнула б яна на яго ўвагу, калі б у яе былі бацькі, свая уласная крыша над галавой, надзейныя сябры, акрамя яго?

Наўрад ці. Ён быў старэйшым за яе амаль на дзесяць гадоў, і ня дужа прывабным для жанчынаў – худы, невысокі, калматы, заўсёды з камерай, заўсёды заняты сваімі справамі, праектамі. Праца была яго жонкай і каханай, і яна гэта разумела, ды і ня дужа намагалася змагацца за яго сэрца зь ім самім. Ды ўсё ж, ён любіў яе. Любіў цёплай, шчырай любоўю, любоўю чалавека да чалавека. Праўду кажучы, як жанчыну ён яе, пэўна, не любіў. У яго сэрцы не было да яе жарсьці. Канешне, ён яе жадаў, яна была прыгожай і маладой, і ім было вясёла і цікава разам. Яны разумелі адно аднаго, мелі шмат агульных інтарэсаў. Але ж ці дастаткова ўсё гэта для каханьня? Напэўна ж, не. Бо боскае жарсці між імі не было, не запаліў Гасподзь тую іскру ў іх сэрцах, якая б узьняла гэтае полымя – ні ў яго, ні ў яе. Можа, калі б ён кахаў яе з жарсьцю, яна б адказала яму, і ён бы здолеў разпаліць у ёй гэтае полымя, але ж яго сапраўднай жарсьцю і каханай была творчасьць. Толькі гэты агонь Бог у ім распаліў – прагу прыгажосьці. Прыгажосьці абстрактнай, той, што, недасяжная, знаходзіцца на нябёсах, і ў сьвеце яе няма – толькі рэшткі, адлюстраваньні яе раськіданы паўсюль. І ён прыназначаны, каб сабраць гэтыя рэшткі, гэтыя іскры яе, раськіданы ў сусьвеце дух. Вызваліць Шэкіну з цянётаў сусьвету. І яе ён таксама вызваліў, толькі яна затрымалася недазваляльна доўга.

Ён памаўчаў яшчэ імгненьне, а потым вымавіў:

- Сандра, скажы шчыра – гэта ўсё праз яго?

Яна маўчала, вывучаючы чашку з рэшткамі астылай кавы.

- Ты мне ніколі не хлусіла, Сандра. Уяві, што я – твой старэйшы брат. І насамрэч, так яно і ёсьць, бо ты мне – як сястра, як мая ўласная кроў. Ён працягваў глядзець на яе. Нарэшце яна ўзьняла вочы.

- Так. Гэта ўсё праз яго. Раптам зь яе вачэй пакаціліся хуткія, буйныя сьлёзы. Адна за адной яны падалі ў астылую каву, а потым яна расплакалася ў голас.

Ён палажыў на яе руку сваю, але ж стол заставаўся паміж імі - як адлегласьць памерам у сусьвет.

- Сандра, Сандра. Ён пакачаў галавой. – Навошта? Раскажы мне, што адбылося?

Яна маўчала.

- Ты была зь ім? – нарэшце запытаў ён.

Яна марудна кіўнула, быццам бы ў сьне, у які да яе далятaлі яго словы.

- Паслухай. Ён ізноў накрыў яе руку сваёй. – Калі справа толькі ў гэтым, табе сыходзіць ня трэба. Я разумею, ён прыгожы, і табе спадабаўся. Вы шмат часу праводзілі побач. Узьнікла натуральнае прыцягненьне паміж мужчынай і жанчынай. Ты ж таксама прыгожая, выклікаеш жаданьне. Шмат хто заглядаецца, і ўвесь час заглядаўся на цябе. Я ж табе ніхто. Нават ня муж. Проста выпадковы падарожнік, які прапанаваў табе застацца. І ты засталася, і прабыла са мной так доўга, як жадала. Ты і цяпер можаш заставацца тут, Сандра. Нічога ня зьменіцца. Мы можам жыць, як брат з сястрой. Ці, калі хочаш, усё будзе, як раней.

- Як раней ня будзе, Паола. Я кахаю яго. І кахаю моцна. І я нашу яго дзіця.

Цяпер яна прама і сьмела глядзела на яго, не адводзячы вачэй. Раптам сьвятло ў яго вачах памеркла. Нешта штурханула яго ў сэрца – нешта благое. Адчуваньне чагосьці непапраўнага, вялікага, што насунулася на іх і раздавіла, зьнішчыла іх маленькі ўтульны сьвет, які здаваўся ім такім трывалым.

Але ж ён хутка ўзяў сябе ў рукі.

– Было каханьне, значыць, можа быць і дзіця. Што тут такога? – вымавіў сам сабе ён.

Цяпер перш за ўсё ён адчуваў, што павінен падтрымаць яе.

- Сандра, слухай, дзіця – гэта заўсёды цудоўна. І можаш разлічваць на мяне ва ўсім. Як і раней. Калі ты хочаш з’ехаць, канешне. Напэўна, табе трэба спакой. Але ж … слухай, канешне ж, гэта не мая справа, аднак… Ты гаварыла яму?

- Не. І не скажу. Яна пакруціла галавой. – Ён не кахае мяне, Паола. Каб ты ведаў …

- Што я павінен ведаць? Ён ніяк ня мог уцяміць, што яна хоча сказаць. Сьлёзы ізноў пабеглі зь яе вачэй.

- Ён цябе згвалціў? Сандра, скажы мне – ён узяў цябе супраціў тваёй волі? Прабач, але ж я бачу нешта, што вы, жанчыны, асабліва закаханыя, ня бачыце наогул. І я магу табе сказаць, што ён – чалавек жорсткі. Можна сказаць, што і бязьлітасны. Я б не жадаў мець такога ворага, як ён. І сябра б такога ня дужа жадаў. Побач зь ім цябе быццам бы накрывае цень – вялікі, халодны, як ад гары. І, можа ты са мной і не пагадзішся, канешне, аднак я б сказаў, што ў гэтага чалавека ёсьць маніі. Як бы гэта выразіцца …

- Ён лічыць сябе Богам? – запытала яна яго прама.

- Кім ён сябе лічыць, Сандра, гэта яго справы. У свой час я вывучаў псіхалогію, псіхіатрыю, пакуль ня кінуў універсітэт, і не заняўся фатаграфіяй і рэжысурай. І я магу табе сказаць, што па пэўным прызнакам, па паводзінам магу вызначыць, што гэта за чалавек. Ён здольны зрабіць гэта, скажам так. У ім ёсьць агрэсія. Яна плоха схаваная, ці, наадварот, ён ня дужа хоча яе хаваць. Ён жорсткі, уладны, дэспатычны. Небясьпечны настолькі ж, наколькі ён вумны, і прывабны праз гэта. І страшны ў той жа меры, у якой і прыгожы, што я не магу адмовіць. У імі ёсьць сваеасаблівая прыцягваючая мужчынская прыгажосьць. Жыві я ў Грэцыі з тысячу гадоў таму, я б зрабіў зь яго статую Зеўса. Ці, можа, Пасейдона. Альбо Аіда. Бога, які валодае сіламі стыхіяў. І гэтая яго дзяўчына. Яна ж зусім дзяўчынка, дзіця. Яна выглядае, як яго дачка. Прабач, але ж я не магу ўявіць, як такі дарослы, сталы мужчына можа жыць, ды яшчэ і пабрацца шлюбам з такім дзіцём. Побач зь ёй і юнак дваццаці пяці гадоў выглядаў бы мужным і сталым. Нешта ёсьць ненармальнае ў гэтых іх адносінах. Канешне, яна ўжо паўналетняя. Ёй споўнілася дзевятнаццаць год. Ён усьміхнуўся.

- Фанкула! Дзевятнаццаць. Гэта ж нават не дваццаць адзін. Што яна разумее?

- Мне было пятнаццаць, Паола, калі ты сустрэў мяне. І я ўжо была жанчынай. А праз год стала жыць з табой. Жанчыны сталеюць хутка. Хутчэй чым вы. Можа, таму, што ў гэтым менавіта вы і вінаватыя. Нарэшце Сандра ўсьміхнулася.

- Да, прабач мяне. Але ўсё ж, дзесяць год розьніцы гэта ня трыццаць. Трыццаць тры, калі быць дакладным. Яму пяцьдзесят два года.

- Звычайная гісторыя. Сандра паціснула плячыма.

- Да не звычайная. Не падобная яна на жанчыну, якая наўмысна абірае старых мужчынаў, каб атрымоўваць ад іх грошы на свае патрэбы. І ён не па гэтай частцы. Калі б ён пажадаў, то жанчыны, якія хочаш, выстраіліся да яго ў чаргу. Прабач, Сандра. Я не жадаў цябе пакрыўдзіць, - напалохаўся ён.

- А гэта значыць, што ён іх не жадае. І гэта мне, як сьпецыялісту, цікава. Аднак, я многа кажу. Ты была зь ім па сваёй волі, ці…? – ён замаўчаў.

- І па сваёй, і не. Сандра пакачала галавой. – Я сама прыйшла да яго. Я вымусіла яго ўзяць мяне. Ён мяне не хацеў, але ж я быццам бы звар’яцела. Я пагражала, што ськінуся з абрыву. І я б ськінулася, калі б ён не схапіў мяне за руку, калі б не прыцягнуў да сябе, не прыціснуў мяне, і не ўтрымаў сілай. Ён доўга не пагаджаўся, і гэта быў мой апошні шанец. Бо я закахалася, Паола, так моцна, што суцэльна згубіла розум. Я ненавідзела гэтую яго дзяўчыну, прыгожую ляльку. Як ён ня бачыць, што ў ёй суцэльна няма душы? Яна ж проста пустая длінноногая дурачка. Улюбёная ў сябе, і жадаючая, каб усе вакол захапляліся ёй, прыўзносілі. Яна ж пазірала на ўсіх зьверху ўніз, як каралева. Ты што, ня бачыў? Зь кім яна пасябравала? Зь кім пажартвала, ці проста размаўляла? Сядзела ў сваім вагоньчыку, і выходзіла толькі на здымкі, каб яе не апаліла сонца. Сандра зьдзекліва рассьмяялася. – Каб не спаліла яе прыгожую белую скуру. Слова “белую” яна выдзяліла голасам.

- Сьватая! – раптам вымавіла яна зьдзекліва. – Ён сказаў, што лічыць яе сьвятой. Што яна для яго – Сьвяты Дух, які асьвятляе

яго шлях.

Так што гэта я яго згвалціла, а ня ён мяне. Яна – сьвятая, а я – грэшная. І цяпер я нашу яго дзіця. І ў тым, што ён жорсткі, ты правы. Не дарма ты вучыўся ў сваім універсітэце.

Тое, што адбылося паміж намі, каханьнем, і нават сексам назваць было нельга. Яна замаўчала.

Калі б я не жадала гэтага, не папрасіла аб гэтым сама, я б закрычала і б паклікала на дапамогу. Ён згвалціў мяне, і згвалціў жорстка. У мяне потым тыдзень не сыходзілі сінякі і нават былі разрывы, а я ж даўно ўжо не дзяўчына.

А потым ён мне сказаў, што жанчынаў наогул ня любіць, і яна – выключэньне. Бо ж яна – сьвятая. А я – грэшная. Сандра паўтарыла гэта ізноў, і нярвова рассьмяялася.

- Я ўпэўнена, што зь ёй ён другі. Ён проста жадаў мяне прынізіць. Таму, што я чорная. Што афрыканка, а ён – белы, і можа рабіць са мной што заўгодна, не так, як зь ёй.

Паола пакачаў галавой.

- Ведаеш, Сандра, такія людзі не мяняюцца. Ён заўсёды такі, і з усімі. Калі б я пагаварыў зь ім, як прафесіянал, я ўпэўнены, ён бы мне распавёў шмат чаго цікавага пра сябе. І таму ня трэба шкадаваць, што ты ня зь ім. Ніякая другая жанчына не змагла б быць зь ім, Сандра, і гэта дзіва, што ён знайшоў сабе кагосьці. Такі чалавек проста зруйнуе жанчыну ў ноль, і псіхічна, і фізічна, і эмацыйна. Ён будзе патрабаваць дужа шмат, ва ўсіх сэнсах. Што ж датычыцца гэтай дзяўчыны, то яна, на мой погляд, таксама не выглядае здаровай. У самым прамым медыцынскім сэньсе. З таго, што я ўбачыў, нярвовая анарэксія – гэта самае відавочнае. Яшчэ ў яе ёсьць схаваныя глыбокія псіхатраўмы, магчыма, што яна перанесла нейкую траўмуючую сітуацыю ў мінулым, пасьля якой яе карціна сьвету стала скажонай, далёкай ад рэальнасьці. Тое, што ты палічыла за пыху, нежаданьне каммунікаваць, усталёўваць зносіны, фанабэрыстасьць, насамрэч крайняя форма інтраверсіі, калі чалавек суцэльна замыкается ў сабе. Яна нікога і нічога ня

бачыць вакол, акрамя яго. Ён жа на ёй таксама сфакусаваны, як на нейкай звышцэннай ідэі. Я б сказаў, яна набыла для яго каштоўнасьць нейкага фетыша, чагосьці для яго сакральнага, і я не зьдзіўлюся, калі ён і праўда лічыць яе Шэкінай, а яна яго – Богам. Такая ў іх гульня, у якой яны абодзьва схаваліся ад гэтага сьвету, у які яны ня ўпісваюцца сваімі вугламі. Ды дзіўна, як яны з такімі складанасьцямі ўпісаліся адно ў адно. Тым яны мне і цікавыя, і таму я і запрасіў іх здымацца, шчыра кажучы. Да таго ж, яны абодзьва фактурныя, яркія, і камера іх любіць. Фільм павіне стаць шэдэўрам. Можа, што і атрымаю Залатого Льва! Паола летуценна ўзьняў вочы.

- Так ты думаеш, ён яе таксама гвалціць, як згвалціў мяне? Сандра запытальна глядзела на яго.

- Я думаю, што ён – садыст. Гэта адзіная для яго форма атрымаць задавальненьне, і форма гэта паталагічная. Насамрэч, я не люблю гэты тэрмін, ён даволі новы і прывязаны к такім відавочным паталагічным паводзінам, як у кнігах маркіза де Сада, да якіх гэты тэрмін прама адсылае. Але ж усё далёка ня так проста, і сьхільнасьць атрымоўваць задавальненьне ад пакутаў, дамініраваньня, праяўленьня агрэсіі з'явілася не сто гадоў таму, калі з'явіўся гэты тэрмін. Уся гісторыя чалавецтва – гэта гісторыя садызма. І ўсе адносіны мужчыны і жанчыны ў сваёй выснове маюць садыстычны асьпект. Валоданьне жанчынай насамрэч аналагічна забойству, і сам аргазм – сьмерці. Эрас і танатас. Чула ты такое?

Сандра пакачала галавой.

- Сэксуальнае жаданьне можа прымаць самыя вычварныя, дзіўныя формы, тым больш, чым большым інтэлектам валодае чалавек. Садызм і перверсіі не ўласьцівыя жывёле. Гэта прадукт інтэлекта, розуму. А ён мае розум значна больш разьвіты, чым большасьць з тых, каго я ведаў. Ведаў жа я нямала цікавых людзей. Толькі такіх – не. Чым больш чалавек узьнімаецца ўгару, тым больш страшнымі становяцца яго дземаны, Сандра. І некаторымі дземанамі і сапраўды валодаць можа толькі Бог. Паола ўздыхнуў, і замаўчаў.

- Так ты лічыш яго Богам? – Сандра ўсьміхнулася. – Тады,

выходзіць, я нашу ў чэраве Хрыста.

- Можа, што і так, дарагая. Але ж паслухай, ужо позна. І табе, і мне патрэбны адпачынак. Калі ты хочаш з'ехаць, гэта можна зрабіць заўсёды. Зачым табе сьпяшацца. Пераедзеш у другі пакой. Паола запытальна глядзеў на яе.

- Дзякуй табе за тваю прапанову, і за тваю дабрыню, Паола. Я ўжо арэндавала жытло. Але ўсё ж, дзякуй. А сёньня я і сапраўды пераначую ў гасьціннай. З гэтымі словамі Сандра ўзьнялася, і пайшла ў душ. Калі яна выйшла зь яго, Паола ужо сышоў да сябе. Як заўсёды, будзе сядзець да раніцы, і мантыраваць фільм, які проста ўжо зводзіць яго з розуму. Раптам ёй захацелася паглядзець, як ён працуе. Ізноў успомніць усё, што было на працягу гэтага месяца. І ізноў убачыць яго. Яго высокую постаць, чорныя доўгія валасы, цёмны ад сонца, парослы барадой твар, ірванае адзеньне, праз якое прасьвечвае скура. Як ён ідзе па бясконцай пустыні, з вачыма, прыжмуранымі, выпаленымі сонцам, і яго позірк нагадвае позірк драпежнай птушкі, азіраючай з вышіні навакольле, а рухі ўласьцівыя вялікаму пустыннаму ільву. Ад яго і сапраўды ішла небясьпека, гэта яна разумела. Але ж яна ніколі ня бачыла, каб ён быў жорсткім зь ёю, сваёй "еленай", ці "сафіяй", ці хто там яна яшчэ. Яна задумалася. Паступова яна пачала прыпамінаць нешта. Вялікія чорныя акуляры, закрытая скура, доўгія рукавы тунікі і спадніца ці джынсы нават і ў сьпякоту. Яе скура была такой белай, што яна, пэўна, баялася сонца. Але ж тут магло быць і яшчэ нешта. Сандра прыпомніла, што, калі неяк вечарам убачыла яе ў шортах, на яе сьцёгнах былі сінякі, але ж яна не прыдала гэтаму ўвагі. Можа, сасуды слабыя, ці яна ўдарылася. Цяпер жа яна магла б паклясца, што гэта былі крывападцёкі ад пальцаў ці вуснаў. Але ж ён так беражна трымаў яе, калі нёс на руках у горад, ён так пяшчотна гладзіў яе пальцы і глядзеў на яе і сапраўды зь любоўю, вялікай, якой яна зайздросьціла. Яна нечакана ўздрыгнула. Што ж, нават калі Паола і правы, і гэты чалавек страшны і жорсткі, і паталагічны, яна ўсё роўна кахае яго. Так, як не кахала нікога, і ніколі. Сандра заплюшчыла вочы, і ўявіла, як ён падыходзіць, і нагінаецца над ёй. А потым закрывае ёй вусны пацалункам, ад якога ў яе спыняецца подых. І – нічога. Нічога не адбылося. Нешта ўжо не ўмяшчалася ў яе,

бо яна была поўнай. Нешта яе пакінула. Яна магла цяпер думаць толькі пра дзіця, якое і было ім. Бо ж цяпер яна атрымала яго ў сабе.

Глава 14: Жюсьціна

- Што ты чытаеш, каханая?

Ён нахінуўся над ёй, і пацалаваў яе вусны. Яна ляжала на шырокай скураной канапе з чыталкай. Ён сеў побач, і яна палажыла галаву яму на калені.

- "Жюсьціна", - вымавіла яна, узьнімаючы на яго вочы. Яго рука абдымала яе плечы, пагладзіла грудзі.

- Я таксама калісьці чытаў, - усьміхнуўся ён.

- Табе падабалася? - сур'ёзна запытала яна, гледзячы на яго зьнізу ўгару.

Яе твар, чысты і белы, у аточаньні чорных локанаў, нагадваў лілею, якая паўставала зь цемры. Вочы, вялікія, прыўкрасныя, з доўгімі чорнымі вейкамі, казалі аб марах і сьненьнях, чароўных, навеяных туманамі над вазёрамі.

Тут ні ў кога не было такіх вачэй, акрамя яе - сьветлых, празрыстых, як халодная вада, у якую хацелася ўвайсьці, адчуваючы пакалваньне на сваёй скуры - лёгкія пацалункі сьмерці.

- Падабалася, любая. Ён пагладзіў яе грудзі пад тонкай шаўковай тканінай, пасунуў брэтэлькі, крыху адкрыўшы іх - зусім нямнога. Яго пальцы адчулі, як яе саскі абазначыліся пад імі - пяшчотныя бугаркі на мяккай скуры.

- Ды гэта было даўно. Ён гладзіў яе грудзі. Яна закрыла вочы, аддаючыся яго рукам.

- "Жюсьціна" прыўкрасна, як прыўкрасна прыгажосьць - абстрактная, нябёсная, недасяжная, - нарэшце вымавіў ён. - Дэ Сад стварыў шэдэўр, пасланы яму Богам. У аточаньні цемры пярліна дабрачыннасьці зьзяе яшчэ больш ярка. Насамрэч дэ Сад не апявае распусту, распутнікі у яго творах - толькі фон, на

якім паўстае прыгажосьць, якую ён марыць дасягнуць.

Яна ўздыхнула пад яго рукамі, якія гладзілі яе цела.

- Зрабі мне балюча, - прашаптала яна. - Так, як там. Я хачу быць тваёй Жюсьцінай. Я пагаджуся на ўсё. На ўсё, што ты захочаш. Я хачу ўсяго цябе, хачу тое, што хочаш ты.

Яго рука на імгненьне спынілася, і ўздрыгнула, быццам бы яго ўдарыла нешта.

- Ты праўда гэтага хочаш, любая? - запытаў ён. Яго далонь пагладзіла яе шчаку.

- Так, - прашаптала яна, закрываючы вочы. - Я моцна жадаю цябе. Хачу табе аддацца поўнасьцю.

Яго пальцы сталі больш уладнымі, сьціскваючы, гладзячы яе грудзі.

Ён яшчэ не кранаў яе так - груба, вымушаючы ўздрыгваць усё яе цела, падпарадкоўваючы яго сабе. Яе саскі гарэлі ад яго дакрананьняў, калі яго цяжкая рука праводзіла па ім, скура пачырванела, і яна адчувала сапраўдны боль, пакалваньне, і разам з гэтым - як сьціскваецца яе ўлоньне. Раптам вільгаць проста пацягла па яе сьцёгнах, намачыўшы бялізну. Такога зь ёй яшчэ не было. Яна нават спугалася сваёй жарсьці, жаданьня, якое было такім моцным, што яна не магла яго кантраляваць.

Ён таксама цяжка дыхаў, і шчакой яна адчувала, як напружваецца яго плоць пад тканінай.

- Каханая, я магу не стрымацца. Не спакушай мяне. Яго голас быў хрыплым, нібыта ён змагаўся з сабою.

- Рабі ўсё, што хочаш, каханы, - вымавіла яна, закрываючы вочы. - Калі хочаш, ты можаш узяць мяне там, - прашаптала яна ледзь чутна.

Ён вызваліў рукой свой чэлес, і цяпер яна дакраналася да яго шчакой. Ён павярнуў яе твар, і прыціснуў да сябе, і яе вусны кранулі яго плоць. Яго рука накіроўвала яе, вымушаючы

мацней прыціскацца да яго - вуснамі, носам, шчокамі, вачыма, ілбом, гладзіла яе затылак і шыю пад валасамі.

- Там табе будзе балюча, - ціха вымавіў ён. - Я не магу, любая.

- Прашу цябе. Я хачу адчуць гэты боль. Боль ад цябе, - прашаптала яна, амаль задыхаючыся.

- Вазьмі яго. Палашчы яго вуснамі. Яго голас быў уладным, хрыплым, якога яна яшчэ ня чула ад яго ў датычаньні сябе. Яго рука сьціснула яе затылак, і пасунула яе наперад. Яна ўбірала вуснамі яго плоць, кранаючы яе языком, і адчувала, задыхаючыся, як пульсуюць пад ім яго вены. Зь яе ўлоньня проста ўжо цякло, уся яе бялізна была мокрая наскрозь, але ён яшчэ не кранаў яе там, дзе яна яго жадала.

- Хопіць, - пачула яна, і ўзьнялася. Яго чэлес стаяў прама перад ёй, і яна ўбачыла яго памер поўнасьцю - значна больш за звычайны. Раней ён ніколі не ўваходзіў у яе пры поўнай эрэкцыі, асьцярожна дапамагаючы сабе рукой, і нават тады ёй было балюча мець яго ў сабе. Цяпер жа яна нават не ўяўляла, як ён войдзе ў яе, і куды.

Яна жадала папрасіць яго, і не магла вымавіць ні слова. Раптам яна зразумела, што, пакуль ён ёй не загадае, яна будзе маўчаць.

Ён пасунуў яе, палажыўшы яе на канапу, і устаў. Яго рукі груба сарвалі зь яе адзеньне, кінуўшы яго на падлогу. Скурай яна адчувала холад канапы, і па ёй прайшлі дрыжыкі. Раптам яна здалася сабе маленькай і безабароннай, адной перад ім у гэтай віле, і ёй стала страшна, і адначасова яна адчувала такое вострае каханьне, і жаданьне яго, што была гатовая на ўсё. Зусім на ўсё, што б ён пажадаў зрабіць.

Ён нахінуўся над ёй, і пяшчотна і мякка дакрануўся да яе вуснаў.

- Ты хочаш мяне ўсюды? - нягромка вымавіў ён.

- Так, каханы. Вазьмі мяне ўсюды, дзе пажадаеш, - адказала яна.

Ён сеў побач, палажыўшы сабе на калені яе сьцёгны. Яго рука

кранула яе ўлоньне, і па ёй пацякла яе вільгаць. Ён паладзіў яе прамежнасьць і ягадзіцы, сьціскваючы іх так, як сьціскваў яе грудзі, а потым яго пальцы асьцярожна ўвайшлі ў яе там, рассоўваючы яе цела, адзін, потым другі. Яна ўскрыкнула, і падалася яму насустрач. Яго пальцы рухаліся ў ёй, і яе жаданьне яго стала проста невыносным. Ён цяжка і глыбока дыхаў, а потым палажыў яе на канапу, высока задраў яе ногі, і ўвайшоў у яе. Яе ўлоньне, хоць і было вільготным, ледзь прыняла яго чэлес, які рухаўся ў ёй, як поршань. Ён гвалціў яе, механічна, груба, як бяруць шлюху, не заўважаючы на яе пачуцьці, суцэльна аддаючыся сваёй жарсьці, у якой яна была толькі інструментам яе спатоленьня.

Нарэшце, ён выйшаў зь яе, і прыціснуўся галоўкай плоці да яе ягадзіц.

- Ты хочаш мяне там? - хрыпла запытаў ён.

- Так, - прашаптала яна, закрыўшы вочы. Ён увільгатніў яе сьліной, і націснуў, уваходзячы. Яе сьцёгны ляжалі ў яе на грудзях, прыціснутыя яго целам, і яна не магла паварушыцца, калі б і жадала вызваліцца ад яго. Яе працінуў востры боль, такі, што яна ўскрыкнула і раптам громка заплакала, але ж ён не спыніўся, уваходзячы ў яе далей. І там, далёка ў сабе, разам з болем яна адчула нешта, што вымусіла яе пасунуцца яму насустрач. Так глыбока ён у яе яшчэ не ўваходзіў ніколі. Было бачна, што гэта дастаўляе яму асалоду, значна мацнейшую, чым раней, калі ён браў яе ва ўлоньні, таму што цяпер ён мог узяць яе поўнасьцю і цалкам, на ўсю сваю глыбіню. Яго муды краналі яе ягадзіцы, моцна білі па ім, а потым ён выйшаў, і пасунуў яе далей пад сябе.

Яго чэлес крануў яе вусны. Прама перад сабой яна бачыла яго сьцёгны і жывот, і яго плоць, якая паўставала з густых чорных валасоў на іх. Яна яшчэ ніколі ня бачыла яго так, пры дзённым сьвятле. Яе сэрца калацілася.

- Абліжы яго. Вазьмі яго ў рот, - загадаў ён, і яна узяла ў рот галоўку, адчуваючы на ёй смак яе цела. Ён глыбока рухаўся ў ёй, вымушаючы яе браць яго ўсё глыбей, а потым выйшаў, і ўвайшоў у яе ўлоньне, і яна ўкрыкнула ад асалоды, якая была

такой вострай, як ніколі. Ён ізноў прыціснуў яе ногі да грудзей, і браў яе па чарзе ва ўлоньне і ніжэй, і нарэшце скончыў туды, дзе пачынаў.

Яе ягадзіцы і сьцёгны ўздрыгвалі ў яго руках. Ён выйшаў і прыпаў да іх вуснамі, быццам бы жадаў выпіць усю яе, цалаваў яе ўлоньне, прамежнасьць і ягадзіцы, і яна ўздрыгвала ад дакрананьняў яго гарачага рту.

Нарэшце ён адарваўся ад яе, і прыпаў да яе вуснаў. Глыбока пацалаваў, і вымавіў: - Кахаю цябе. Ні зь кім і ніколі я не адчуваў таго, што адчуваю з табой. Яго валасы былі мокрыя і зблытаныя, цела пакрытае потам. Сябе яна ня бачыла, але ж уяўляла. Яе скура была пакрытая сінімі і барвовымі плямамі, і ўсё балела там, але ж яна адчувала сябе такой поўнай ім, што ў яе не было словаў. Яна ахапіла яго за шыю, і заплакала.

Яго вусны суцяшали яе, кранаючы яе вусны, рукі абдымалі яе і прыціскалі да сябе.

- Цішэй, цішэй, дзяўчынка мая любая. Цішэй. Гэта была толькі гульня. Я кахаю цябе, я такі ж, як і быў, той жа. Я нікольки не зьмяніўся. Маленькая мая. Ня бойся. Болей такога ня будзе, калі ты ізноў не пажадаеш. Ён усьміхнуўся, і крануў яе вусны сваімі.

- Якая ты прыгожая, - ціха вымавіў ён. - Ты сябе ня бачыш.

Зруйнаваная прыгажосьць. Ён ізноў прынік да яе вуснаў губамі, убіраючы яе сьлёзы, якія асушаў пацалункамі.

Яна і сапраўды была такой прыгожай, што ў яго займала подых. Вузкі белы тварык, мокры ад сьлёзаў, быццам бы амыты імі, як квітнеючы луг пасьля буры, валасы зблытаныя, вочы зьзяючыя, з мокрымі вейкамі-стрэламі, на тонкай скуры чырванеюць адмеціны яго каханьня. Яна ж зусім яшчэ дзіця, слабое, тонкае. Навошта ён зрабіў зь ёй гэта? Таму, што яна сама папрасіла? І где ж быў яго розум? Розуму ў яго не было - тут жа сам сабе адказаў ён. Яна забрала яго. Засталося толькі нешта ў ім, што ён і сапраўды абазначыў бы, як боскасьць, тое, што ня мае межаў, адзінае і сапраўднае, як яе заплаканы твар у яго руках.

- Крані сябе. Пагуляй сама з сабою, - вымавіў ён. Яна ляжала ў яго на плячы.

- Зрабі гэта так, як падабаецца табе. Ён сьціснуў яе саскі, ціхенька.

Яна ляжала ў яго руках, ён гладзіў яе грудзі, сьціскваў іх.

- Хачу, каб табе была хораша. Каб ты адчувала тое, што і я. Яна аддалася яго рукам, адчуваючы, як яе ўлоньне ізноў напаўняецца вільгацьцю, і апусьціла руку праміж сьцёгнаў. Яе цела ўздрыгвала ў яго руках, ён лашчыў яе, гладзіў яе грудзі, і яна адчула, як яе напаўняе пругкая гарачая хваля, якая ўносіла яе кудысьці. Яна выгнулася і застагнала, адчуваючы, як устае яго чэлес ля яе пляча. Ён нахінуўся над ёй, і закрыў яе рот пацалункам, а потым апусьціўся на яе, і увайшоў, глыбока, адным рухам, накрыўшы яе сабою. Яе калаціла ад асалоды, ад адчуваньня зьліцьця зь ім, такога поўнага, што іх ужо было не раздзяліць.

Яго сьцёгны прыціскаліся да яе сьцёгнаў, сьціскваючы іх, штурхаючы, пранікаючы глыбока, у глыбіню яе, у яе бязьмежнасьць яго бязьмежнасьцю.

Яна паснула на ложку, зьнясіленая, накрытая пледам, які ён прынёс, асьцярожна прыкрыўшы яе аголеныя плечы. Дзень ужо блізіўся да вечару. Сеў у крэсьле, наліў сабе стакан каньяку, і задумаўся. Ён адчуваў сябе адначасова і пустым, і поўным, быццам бы яна выпіла яго і напоўніла ізноў. Забрала яго цемру, і аддала сваё сьвятло. У пакоі хутка згушчаўся змрок, але ж ён не запальваў лямпы. Так і сядзеў, праз паўзмрок гледзячы на яе – яна ціхенька дыхала ў сьне, і ад таго выглядала яшчэ больш прыгожай.

- Як паламаная кветка, - падумалася яму. Навошта ён зрабіў зь ёй гэта? У такія часы ён ненавідзеў сам сябе. Але ж яна сама яго папрасіла. Яна гэтага жадала. Нешта ў ёй прагла гэтага болю ад яго, нешта патрабавала выйсьця. І ён нарэшце мог быць зь ёй самім сабой – такім, як ён ёсьць, поўнасьцю, не баючыся, што яна адкіне яго, напалохаецца, што ён зьняважыць яе, зробіць ёй балюча. Ён кахаў яе, кахаў болей за ўвесь сусьвет,

болей за сябе, бо сам сабе безь яе ён быў непатрэбны. Яна заўсёды стаяла перад яго ўнутраным позіркам, нават і калі ён яшчэ не сустрэў яе. Калі яна сыйдзе, ён сыйдзе зь ёй разам, як калісьці гэта і было. Ён быў зь ёй пяшчотным, асьцярожным, кахаючым. Цяпер жа – проста кахаючым. І яго каханьне да яе, якое ён лічыў вялікім, стала сапраўды бязьмежным, затапіла яго ўсяго. Ён жадаў бы намаляваць яе зараз – ціхі, спакойны твар заплаканага дзіця, дзівосная прыгажосьць, да якой было страшна дакрануцца. Але ж бумага не была вартая яе, бо не магчыма было адлюстраваць на ёй той вобраз, які адлюстроўваўся ў яго душы. Бывае так, што мы ахвяруем сябе дзеля кагосьці, і праз гэтую ахвяру ўзьвышаемся так недасяжна, што становімся зоркай, ўказваючай шлях іншым. Так, як на крыжы узьняўся Шымон, які ахвяраваў сябе замест Бога.

Узьняўся на крыжы над сусьветам, і стаў недасяжна высокім, як зараз недасяжна высокай была для яго яна. Той жа, хто ўзьняў яго, застаўся стаяць побач, бо яму болей не было куды ўзьнімацца.

Ён наліў сабе яшчэ адзін бакал, сядзеў, і думаў. Думаў аб сваім жыцьці, аб усім, што ў ім адбылося. Адбылося так, што ён ня змог зьмяніцца, і цяпер яна стала яго ахвярай. Аднак у адрозьненьне ад іншых, яна кахала яго, і прыняла яго такім, які ён ёсьць. Яна любіла ў ім усё, і нават – яго вар’яцтва. Гэта было каханьне безумоўнае, такое глыбокае, што перад ім раскрывалася бездань. І сустракалася з такой жа ня маючай дну безданьню – яго душой. Цяпер, калі іх бездані з’ядналіся, зьліліся ў адзінае, ён адчуваў, што сусьвет стаў поўным і атрымаў дасканаласьць.

Каньяк разьліваўся па яго жылах, напаўняў мышцы цяплынёй. Дзіўна, але ж ён нічога не жадаў пісаць – яна выпіла яго, як бакал віна, як ён – гэты стакан з гаркаватай карычневай вадкасьцю. Ён наліў сабе яшчэ адзін, трэцьці. Спіртное яго ня брала, ён амаль не п’янеў. Нават зайздросьціў тым, хто мог хутка напіцца і адпусьціць сваіх дземанаў вонкі. Ды якія там былі дземаны – так, мелкія бесы. Чэрці. Сваіх жа ён ніколі не адпускаў. Нават і цяпер яны толькі ласкава аблізалі яе языком, вялікія чорныя псы, свору якіх надзейна ўтрымлівала яго рука.

Яна была таксама і іх гаспадарка, уладарка яго дземанаў, драпежнай своры, дзікага паляваньня, якое было так радасна яго душы. Калі ён адпусьціць іх, то яны зьнішчуць усё. Цяпер ён мог сабе ў гэтым прызнацца – агрэсія яго ап'яняла, яна вылівалася зь яго, як семя. Спачатку ён стрымліваў сябе, даводзіў да піку ўзрушанасьці, а потым яно адбывалася. Толькі ў гэтым сьвеце, здаецца, не засталося ворагаў, каб забіваць. Ворагі былі – забіваць іх было нельга. Гэта было б дужа проста, выхапіць меч, выклікаць на дуэль, і парубіць на кавалкі. Ці выпусьціць пару ў адной зь бясконцых боек мінулага, так, як рабілі грэкі ці берсеркі, без дасьпехаў, аголеныя, са шчытом і мячом у руках, не зважаючы на раны, на кроў і боль. І жанчыну ён мог браць толькі так, нібыта ўступаў у бойку зь нечым, што было настолькі магутным, што заўсёды яго пабяждала. Ён шукаў гэтай моцы пачуцьцяў, шукаў у бясконцых адносінах, але ж заўсёды яно ўскользвала ад яго. Так было і з Сандрай – ён проста не адчуў нічога. Спачатку была эрэкцыя і некалькі фрыкцый, а потым была пагарда. Да яе і да сябе. Чаго ён апусьціўся так нізка, што ўзяў гэтую шлёндру, якая сама вешалася яму на шыю? Яму было проста яе шкада. Яна нічога не варухнула ў ім, як жанчына. Боскасьці ён у ёй не адчуў. Ды ён і ведаў, што яе там няма. Проста захацеў выліць у яе сваю жарсьць, накапіўшаеся жаданьне гвалту, зьдзекаў, якое разрывала яго.

Ён жадаў, каб яго перамаглі, каб гэтае слабое цела пад ім зрабіла б зь ім нешта такое, што стала б яго забойцай. Ён хацеў Эраса, якога б перамог Танатас. І тады б ён памёр, і адрадзіўся нанова. Хацеў, і баяўся зрабіць гэта зь ёй. І вось яна сама прапанавала яму тое, аб чым ён баяўся нават і думаць. І цяпер ён сядзеў – павержаны, яна ж была яго пераможца, хоць гэта яна ляжала, пакрытая крывавымі ссадзінамі ад яго вуснаў і рук. Яна была для яго ўсім. Што ён зрабіў зь ёй? Навошта? Яна папрасіла яго, таму што адчувала ў ім гэта. Ведала, што гэта яму патрэбна.

- У жанчынаў ёсьць нейкая тагасьветная інтуіцыя – не ва ўсіх, у некаторых, яны бачаць нас наскрозь, - падумалася яму. – Яны нараджаюць, і забіваюць нас – праз нашае каханьне да іх. Сколькі ўлады ў адной слабой жанчыне, у адным кволым целе,

што яно распаляе такое вар’яцтва, дазваляючае ўзьняцца да Бога, руйнуючае і яе, і яго, і тым самым вызваляючае зь цела душу, а з душы – дух. У ім нічога не засталося акрамя духа, а ў ёй засталося шмат. Столькі, што гэтаму не было канца. Ён мог бясконца чэрпаць з гэтага вытока, напаўняючыся ім. У пакоі стала зусім цёмна, як і ў яго душы. І праз гэтую цемру ён бачыў сьвятло, якое ціха клікала яго. Ён устаў, і падышоў да ложку, на якім яна ляжала. Абняў яе, і лёг побач. Ён ужо быў распрануты. Прыціснуўся да яе цела, абдымаючы яе, прыцягнуў да сябе. Ён кранаў вуснамі яе валасы, плечы, на якіх нават і ў цемры ён бачыў цёмныя плямы, і раптам у яго з вачэй пабеглі сьлёзы. Ён ненавідзеў сябе, а яе кахаў. Недасканалы Бог, які апусьціўся ў недасканалы сусьвет. Як толькі ён пераходзіў гэтую мяжу матэрыяльнасьці, ён рабіўся ім – Д’яблам, Сатаной, прагнучым улады, матэрыі, задавальненьня. Гэтага не было вонкі – яно было знутры. Ён трымаўся за яе, як за Сьвятога духа, які адзіны нагадваў яму тут, у цемры, аб нябёсах. Яна ціхенька дыхала ў яго на плячы – спакойна спала.

Раніцой яны прачнуцца побач, як заўсёды. Ён зробіць ёй каву і на руках аднясе ў ванную. Амые яе цела ў цёплай вадзе. Апрацуе яе сінякі. Агарне ў мяккі халат. Яна нічога яму ня скажа, і потым усё будзе так, як раней.

Калі ён прачнуўся, яна ўжо была ў душы, а на кухне пахла кавай і яшчэ нечым, смачным. Смажаным. Ён адкрыў вочы, і адчуў, які ён галодны – ва ўсіх смыслах. Устаў, пацягнуўся, і прайшоў са спальні ў вялікую, залітую халодным сьвятлом зімовага ранка кухню. Яна ў мяккім белым халаце ўжо сконьчыла гатаваць ежу. На талерке ляжала груда духмяных падсмажаных картафляных аладак з фаршам – як яна і абяцала.

- Як дома! Добрай раніцы, каханая, – ён падыйшоў, і абняў яе. Нахінуўся да яе вуснаў. Яна адказала на яго пацалунак, прыкрыўшы вочы. Ён выцягнуў зь яе валасоў шпільку, і цяжкая хваля палілася яму на рукі, саслізнула зь яе грудзей.

- Потым пасьнедаем, - нягромка вымавіў ён. Узьняў яе на рукі, і панёс у пакой.

Разгарнуў яе халат. Яе цела было пакрытае сьлядамі яго вуснаў

– барвова-сінімі плямамі, быццам бы адмецінамі ад удараў. Ён асьцярожна палажыў руку ёй праміж сьцёгнаў, вагаючыся. Ён ужо жадаў яе, ізноў. Цяпер ён будзе кахаць яе асьцярожна, як і раней. Пяшчотна, мякка дакранаючыся да яе цела.

- Як ты? Ты хочаш гэтага? – ціха запытаў ён.

- Хачу, каханы, - вымавіла яна. Яе вочы нібыта завалало пялёнкай – цемра ўзьнімалася аднекуль, і ў гэтай цемры ён убачыў – мільгацяць дрыготкія зоркі.

- Ты кахаеш мяне, сонейка? Так, як цябе кахаю я? Так, як у гэтым жыцьці кахаць не магчыма, болей, чым сусьвет, як сваю душу, як Бога ў сваёй душы, як адвечнае жыцьцё і нябёсы? Што мне зрабіць, каб вылячыць цябе, і сябе? Каб ты мяне прабачыла? Каб усё стала так, як раней? Ён гладзіў яе твар, трымаючы яго на сваіх грудзях, і яна абдымала яго рукамі, прыціскаючыся да яго шчакой.

- Каханы, нічога ня трэба. Бо ў мяне ўсё ёсьць. У мяне ёсьць ты. Яна ўзьняла на яго вочы.

- Точна ўсё ёсьць, акрамя мяне? – ён усьміхнуўся. – Можа, ты яшчэ нешта хочаш?

Яна ўсьміхнулася:

- Трэба падумаць.

- Тады зьбірайся, - вымавіў ён. – Паедзем ў Мілан. На поездзе. Усё, што ты жадаеш. Неабмежавана.

- Ты і так мяне ніколі не абмяжоўваў. Яна ўсьміхнулася. – А ведаеш, паедзем. У Мілан. Там як раз тыдзень моды пачынаецца. Пагуляем, паглядзем.

Яна ўстала, прычасала валасы, апранула вузкі чорны шаўкавісты швэдар і вузкія джынсы-ськіні у колер бронзы, дастала высокія сапагі. Сьвітар пад самае горла. Дасканалы макіяж хаваў сьляды ад пацалункаў на яе твары. Яна сунула ў сумачку акуляры – Gucci, высока забрала валасы ў доўгі хвост.

Ён глядзеў на яе, і ня мог адвесьці позірку – яна была такая прыгожая, быццам бы з абложкі моднага журналу.

- Я гатовая, - нарэшце вымавіла яна, падыйшла, і абняла яго за шыю. Ад яе пахла дасканалай парфюмай, густы, чараўнічы пах, быццам бы тонкі араматны дым таньчыў вакол.

Чым ты надушылася такім? – запытаў ён яе.

- Ты ж сам мне купіў. Яна ўсьміхнулася, назваўшы вядомую нішавую марку. The Merchant of Venice. Ён успомніў прыгожую амфару ў колер паўліньняга пер'я. Яна выглядала дасканала, стыльна, вытанчана, так, што ён сам сабе зайздросьціў. Толькі ён і яна ведалі, што хаваецца пад гэтым прыгожым макіяжам, пад мяккай, як другая скура, паверней швэдэра.

- Пайшлі, любая. Паедзем на машыне да станцыі, а там на поезде. Так хутчэй. У Мілане таксі возьмем. Ён абняў яе, асьцярожна зьнёс уніз па лесьвіцы. Зачыніў дзьверы вілы, і яшчэ раз агледзеў яе твар у дзённым сьвятле – прыгажосьціь і дасканаласьць, такая, што нельга ні да чаго прыдрацца. Крануў вуснамі яе шчаку, ізноў адчуваючы дзівосны духмяны пах. Голыя галіны дрэваў шумелі суха, але ж неба ўжо стала блакітным, і хмары расступаліся, а вакол ізноў востра пахла морам.

Глава 15: Мілан

У Мілане было зусім сонечна – нібыта надышла вясна. Яны праехалі на таксі ад вакзалу да гатэлю, засяліліся ў нумары. Праз вокны даносіўся шматгалосы шум горада.

- Сёньня сходзім у Галерэю, альбо ў Квадрілатэра-делла-Мода, а заўтра наведаем Дуомо, – прапанаваў ён. – Куды ты хочаш? Скажы.

- Спачатку ў Квадрілатэра-делла-Мода, а потым у Галерэю. Хачу ўсюды. Яна абняла яго за шыю.

- А я хачу цябе, - вымавіў ён. Яго вусны наблізіліс да яе вуснаў. Яна лёгка дакранулася да іх сваімі - ружовымі.

- Здымай, - вымавіў ён, узьнімаючы ўверх яе швэдар. Яго голас ізноў стаў хрыплым. Як жа ён яе хоча, яму самому станавілася ад гэтага страшна.

Яна ўзьняла рукі ўгару, сьцягнула верх, і засталася перад ім без бялізны. Яе маленькія грудзі, белыя, былы пакрытыя сінякамі. Саскі яшчэ былі прыпухлымі ад яго рук. Ён дакрануўся да яе грудзей, і яна ўздрыгнула, паморшчыўшыся.

- Баліць? – ціха запытаў ён.

- Так. Яе голас быў ледзь чутны, шапацячы, як шоўк. Ён сеў на ложак, паставіў яе перад сабой, і крануў вуснамі яе сасок. Узяў адзін, а потым – другі. Асьцярожна ласкаў іх, аблізваючы языком. Яна закрыла вочы, палажыла рукі яму на плечы, і ціхенька стагнала. Здавалася, гэта будзе працягвацца бясконца.

Не адрываючыся ад яе, ён разшпіліў шырынку штаноў, і вызваліў свой чэлес, які даўно ўжо упіраўся ў тканіну.

- Хадзі сюды. Ён пацягнуў яе ўніз за руку. – Зрабі гэта. Ён палажыў на яго яе руку. Яна ўстала перад ім на калені, і ён

нахінуў яе галаву да сябе. – Давай, дзяўчынка мая, паработай губкамі. Вазьмі яго. Глыбей.

Ён палажыў ёй руку на затылак. Нарэшце яна зразумела, што ён хоча. Яе вусны сьлізганулі па яго плоці, увабралі яе, апусьціліся і зноў узьняліся. На яе плячах і шыі яшчэ былі сінякі. Локаць быў зьбіты. Ён ласкаў яе шыю, плечы, валасы, а потым адкінуўся назад і закрыў вочы. – Хопіць, хопіць, - ён крануў яе за плячо. Яна ўзьнялася. Яе вусны былі распухлымі, валасы растрапаліся. Стала яшчэ прыгажэйшая, чым была. Як жа такое магчыма? Ён яе жадае, як малады хлапчук. Быццам бы яму дваццаць. І кахае яе так, як можна кахаць толькі ў сталым узросьце. Усё зьмяшалася ў ім – жаданьне яе цела, валоданьня ёю, грубае, плоцкае жаданьне маладой прыгожай жанчыны, і пранізьлівае, пяшчотнае каханьне да яе, такое, што баліць сэрца.

- Хадзі сюды, кацяня маё. Ён узьняў яе, і ізноў яго вусны зьліліся зь яе вуснамі. Ён абняў яе, пяшчотна прыціскаючы. Яе скура была мяккай, духмянай. Сьляды яго жарсьці пасавалі ёй, рабілі ярчэйшай яе прыгажосьць, падкрэсьлівалі беласьць.

- Станавіся, - ён указаў ёй на ложак, і, болей не жадая трымацца, узяў яе ззаду. На яе вузкай сьпіне, на паясьніцы скура была крыху садраная – нацёрла аб скуру канапы. Ён асьцярожна рассунуў яе ўлоньне – яе цела ўздрыгнула ў яго руках, і ўвайшоў у яе – глыбока, поўнасьцю. Не так, як туды, але ж болей чым на дзьве трэці. Націснуў, і паглыбіўся амаль да сьцёгнаў. Яе ўлоньне было вузкім і гарачым, а яго чэлес – такім напружаным, што нават балеў, таму ён хутка выліўся ў яе праз некалькі штуршкоў, і апусьціўся на яе зьверху. Яна ляжала пад ім, распластаўшыся, і ён цалаваў яе шыю, вушы, шчокі.

- Чаму ты такая чароўная? – ціха вымавіў ён. – Ты мяне з розуму зводзіш. Яго рука ізноў дакранулася да яе ўлоньня, увайшла ў яго, і яго пальцы пачалі рухацца. Яна ізноў застагнала, і ён выйшаў зь яе толькі тады, калі адчуў, як па яго руцэ пацякла вільгаць.

- Табе спадабалася? Ён нахінуўся над ёй, і пачуў ледзь чутнае:

- Так.

Яны ляжалі побач, і ён ня мог адарвацца ад яе вуснаў, а яна – ад яго.

- Ты такая прыгожая. Я гэта табе казаў, і паўтару яшчэ раз. І што кахаю цябе. Казаў, і яшчэ скажу, пакуль магу гаварыць, буду цябе казаць гэта.

Яна ўсьміхалася, гледзячы на яго.

- Калі ты нешта захочаш, што заўгодна, гавары. Я табе ўсё куплю. Ён пацалаваў яе. Яна пакачала галавой.

- Дзякуй, каханы. Мне ня трэба шмат. Толькі самае неабходнае.

- Гэта я ўжо чуў. Ён усьміхнуўся, абдымаючы яе.

- Што ты хочаш?

- Пару сукенак, абутак, нешта зь верхняга, бялізна. Яна задумалася.

- Пойдзем у Квадрілатера-делла-Мода, - вымавіў ён, выслухаўшы яе. – Ты будзеш у мяне самая прыгожая ў сьвеце.

- А я ня самая? – яна ўсьміхнулася.

- Самая, а будзеш яшчэ прыгажэй. Хоць болей ужо і нельга. Ты ў адзеньні прыгожая, а без яго проста багіня. Яна засьмяялася, ён схаваў твар у яе на ўлоньні, прыціснуўся да яго вуснамі.

- Самая-самая найлепшая і найпрыгажэйшая ў сьвеце.

Яна пагладзіла яго валасы. – Ты мой самы любімы і самы прыгожы.

- Я прашу ў цябе прабачэньня, - вымавіў ён, цалуючы яе.

- За што? – запытала яна.

- За ўсё. За тое, што я – вар’ят, і не магу насыціцца тваім целам. За гэтыя сьляды, якія я люблю, бо іх на цябе пакінулі мае

вусны. За тое, што я магу ўзяць цябе, і бяру цябе, калі мне гэта патрэбна. Калі б ты ведала, як ты мне патрэбная! Як вада ў сьпякотны дзень, як хлеб галоднаму. Як жыцьцё паміраючаму. Як душы чалавека патрэбны Бог, і целу чалавека – душа. І як душа патрэбна Богу, а гэта ўжо сур'ёзна.

Я ж быў мёртвы без цябе, а ты ажывіла мяне. Сонейка маё. Ён пацалаваў яе грудзі, узьняў руку да вуснаў, прыціснуў. Яна пагладзіла яго па шчацэ, абняла за шыю.

- Табе няма за што прасіць прабачэньня, любы. Бо хлеб існуе для таго, каб накарміць галоднага, а вада – каб спаталяць смагу. А я існую, каб кахаць цябе. Няма нічога ад цябе, чаго б я не жадала. Я казала табе, што я ўсё прыму ад цябе з радасьцю. Бог мой, - ціха вымавіла яна, цалуючы яго вусны. Я ведаю, хто ты, каханы. Ты – гэта Ён, бо я ведаю цябе, любоў мая.

- Як і я цябе, жыцьцё маё, - вымавіў ён. – Ведаю, хто ты ёсьць – мая Ева, Шэкіна, душа мая, нябёсны мой анёлак. Яго мышцы ўздрыгвалі, і яна замёрла ў яго руках, прыціскаючыся да яго, слухаючы яго сэрца.

Яны таньчылі ў цемры, і яе рука ляжала ў яго на плячы.

Яна адчувала моц яго вялікага цела, да якога прыціскалася, як танюткае дрэва ільне да вялікай скалы, каб быць захінутым ад ветра. Яна ведала, што яго вусны ўсьміхаюцца, хоць і ня бачыла іх. Ён быў тут, побач, надзейны, вялікі, моцны, і між імі зусім не было адлегласьці – нават руку не прасунуць. На ёй была танюткая шаўковая сарочка, на ім – толькі джынсы, і яна дакраналася да яго вялікага цела, да яго аголеных грудзей, мышцы якіх рухаліся ў такт іх рухам, калі ён вадзіў яе рукой. Калі ж дакладней, то таньчыў толькі ён, а яна каталася – стаяла басанож у яго на нагах, адчуваючы маленькімі стопамі цяплыню яго стопаў.

- Я не цяжкая? – запытала яна яго сур'ёзна, і ён рассьмяяўся.

- Сонейка, ты – як сонечны праменьчык. Я адчуваю толькі цяплыню. Раптам ён лёгка падхапіў яе, і ўзьняў на рукі. Цяпер яна ляжала ў яго абдымках, і ён хутка кружыў яе. Ён добра

таньчыў – як прафесіянал, яна сустракала мала мужчынаў, якія б так жа выдатна таньчылі, як ён.

Яна ахапіла яго за шыю, і прыціснулася тварам да яго шчакі. Ёй было так хораша зь ім, утульна на яго вялікіх руках.

- Ты ніколі не пакінеш мяне? – запытала яна яго.

- Ніколі. Ён усьміхнуўся, і пакачаў галавой.

- Нават – праз сьмерць? – сур'ёзна запытала яна.

- І праз сьмерць, і праз жыцьцё, любая – я ніколі не пакіну цябе. Бо ж сьмерці няма, а жыцьцё – яно адвечнае. Паглядзі, вакол нас – толькі прыгажосьць і каханьне.

- Ты – Бог, я ведаю, - ціха вымавіла яна. – Скажы, любы, я бачу цябе такім, які ты ёсьць?

- Такім, які я ёсьць для цябе, сонейка маё. Я – твой уласны Бог. Добры і кахаючы. Для іньшых я – Бог пагрозны. Але ж для тваёй душы я – такі.

- А Міхась – хто ён? – запытала яна.

- Той, хто кахае цябе, сонейка маё. Кахае болей за жыцьцё, бо ж ён – чалавек, Бог, спусьціўшыйся ў нядасканалы сусьвет. Ён кахае цябе так моцна, што зайздросна нават мне. Бо ў ім і сьвятла, і цемры роўна напалову. І нішто зь іх ня можа перамагчы. І таму я ўваходжу ў яго, і прысутнічаю ў ім. Гэта складана растлумачыць, і адначасова – проста. Я – гэта каханьне ў яго сэрцы, і насамрэч толькі яно і ёсьць, каханьне, найвялікшае, болей, чым сусьвет. Якое ёсьць я. Гэта ён зараз трымае цябе на руках, і яго цяплыню ты адчуваеш – чалавека, але ж у той жа час ён – гэта я. Мне нравіцца дакранацца да цябе, трымаць цябе яго рукамі. Вывучаць тваё цела яго вуснамі. Бо ж я стварыў цябе, золатка маё. Душа мая. Ева, адзіная для мяне на ўсім сьвеце. Ты – яе чысты вобраз, не замутнёны, не запэцканы зямным. У цябе нічога няма ад зямной жанчыны. Таму ён цябе і кахае так балюча, так шалёна – як вобраз, як мару. Як самое жыцьцё, як нябёсы, як Бога, як душу. Яго

каханьне сапраўды бязьмежнае, і яно палохае яго самога. Ён дужа баіцца згубіць цябе ізноў, ня ўтрымаць цябе. Бо ж сусьвет – жорсткі і драпежны. І таму Міхась – ваяр. Каб мець дастаткова моцы абараніць цябе перад усім сусьветам. Я зрабіў яго такім, бо ж ён – гэта я. Яго вусны ўсьміхаліся, і яна закрыла вочы, адчуваючы, як ён нахінаецца да яе, і прыціскаецца да іх, набываючы плоць. Яго вусны мелі знаёмы, родны смак, любы ёй, смак яго, каго яна кахала так моцна, так балюча, як яе кахаў ён.

- Мне здаецца, я помню ўсё, любая, - вымавіў ён, ціха, задуменна. – Я памятаю, як трымаў цябе на сваіх руках, шмат разоў, і столькі ж разоў ты ўскользвала ад мяне. Але ж цяпер я трымаю цябе крэпка.

- На ўсё жыцьцё, - вымавіла яна.

- На ўсё жыцьцё, - кіўнуў ён.

Ён кружыў яе па пакоі, а потым апусьціўся на канапу – чорную, скураную. Яна ахапіла яго за шыю. Яго вусны апынуліся зусім побач зь ёй, і яна пацягнулася да іх, але ж ён апярэдзіў яе.

- Amoro te, - вымавіў ён нягромка. У яго вуснах гэтыя словы гучэлі дзіўна прыгожа. Яна адкінулася ў яго руках, і адчула, як ён нахінаецца над ёй, як яго рукі пасоўваюць яе сарочку, здымая яе з плечаў, як яго подых робіцца больш цяжкім, апаляючы яе. Цяпер чалавека ў ім было больш, але ж менавіта яго-чалавека яна кахала найбольш балюча і адчайна, да сьлёзаў, да болі ў сэрцы. Кахаць Бога было суцэльнай радасьцю. Кахаць чалавека было выпрабаваньнем, бо гэтае каханьне нараджалася, і існавала праз боль. Яго рукі былі цяжкімі, і вусны – гарачымі і прагнымі. Ім не даставала лёгкасьці, але ж іх цяжар ап’яняў яе, бо быў цяжарам яго зямной жарсьці, якая дастаўляла ёй і радасьць, і пакуты. Яна застагнала, як ад болю, выгнуўшыся ў яго руках, прыціскаючыся вуснамі да яго вуснаў, які былі салодка-горкімі для яе. Ад яго зьлёгку пахла каньяком, і крыху – лімонам, і ў яе кружылася галава ад гэтага яго паху, мяшаючагася з пахам яго поту, яго цела. На ім былі толькі джынсы, якія мяшалі яму, і ён разшпіліў іх вольнай рукой.

Ён ізноў жадаў яе – жадаў моцна, і ў яе ўсё сьціскалася ўнутры ў чаканьні, калі ён болей ня зможа трымацца, апусьціць яе на канапу, і сам апусьціцца на яе, і яна закрые вочы – ізноў, паглыбляючыся ў цемру, дзе адзінае, што застанецца, яго цяжкое дыханьне і яго рукі на яе сьцёгнах. Яна адчувала яго вусны на сваім улоньні і ніжэй – гарачыя, прагныя, і рукамі намацвала яго цяглы, якія хадзілі пад імі, як хвалі. Ён забываў сябе, паглыбляючыся ў яе, сыходзячы глыбока, туды, дзе яны у дваіх поўнасьцю губляліся ў прасторы, часе і вымярэньнях, з'яўляючыся адначасова ўсімі – Шымонам і Еленай, Міхасём і Летыцыяй, Шэкінай і яе Богам, і, пэўна шмат яшчэ кім іньшым, бо вобразаў гэтых было бясконца – нязьменнымі заставаліся толькі яны сапраўдныя, якое б адзеньне з плоці яны не апраналі на сябе.

Але ж тут ён быў ім, а яна – ёю. Міхась – скульптар і вар'ят, каваль, чыя рука куе найлепшыя ў сьвеце мячы, чалавек кнігі, пісацель і вучоны, грубы і пяшчотны, надзейны і моцны, жорсткі і ўладны, той, чыю жарсьць ня змог задаволіць ніхто, акрамя яе, і яна сама – Летыцыя, дзяўчынка зь дзіўным імём, дзіўнай прыгажосьці, якая бачыць у ім Бога і айца, і якая адмаўляецца жыць безь Яго, без каго ёй зусім не патрэбны гэты недасканалы сусьвет, якая любіць цярпець боль, які ён ёй прыносіць, бо такое моцнае яго да яе каханьне, што яно баліць і ёй, і яму, рэжачы іх сэрцы, як нажом, штурхаючы іх адно да другога, вымушаючы ня спаць начамі ў запаленьні жарсьці, якую яны ніяк ня могуць спатоліць, бо, чым больш яны атрымоўваюць адно аднаго, тым больш яны адно аднаго жадаюць. У гэтым і сапраўды заключаецца боскасьць – ня ведаць межаў у любві, і ісьці далёка, туды, дзе няма нічога, акрамя яе, прагнучы адвечнага зьліцьця ў гэтым жыцьці, і ў адвечным.

Ізноў яна ахоплівае яго нагамі і ўскрыквае пад ім ад удараў яго плоці, бо толькі так у гэтым сьвеце ён можа поўнасьцю зьліцца зь ёй - так, як іх душы зьліваюцца ва ўлоньні Бога, і яго цела раніць і вылечвае яе цела і душу, разам зь яе ўлоньнем працінаючы ёй самое сэрца, і яна прымае яго, як вада прымае вагонь, поўнасьцю праглынаючы яго, і заліваючы яго сабой. Яна – Афрадыта і Венера, ён – Гефест і Вулкан, прагнучы яе

нябёснасьці ў сваёй нядасканаласьці, зьдзіўлены, паўстаючы перад ёй, апускаючы вялікія цяжкія рукі, нябёсны каваль, ствараючы самыя прыгожыя вобразы ў сваём распаленым уяўленьні, і раптам убачыўшы, як да яго з марскіх хваляў выходзіць тая, каго ён нарадзіў сваім каханьнем. Ён яшчэ не рашаецца дакрануцца да яе цела, зьдзіўлены, аслупянелы ад рэальнай, дыхаючай, цёплай прыгажосьці, якая пакінула яго ўяўленьне, каб учалавечыцца перад ім – жывой, існуючай. Але вось ён робіць крок, і кранае яе руку, і яго жарсьць апальвае, і запаляе яе, і яна падае яму ў рукі, якія дрыжаць ад пачуцьця, назвы якому няма на зямлі.

Ён кахаў яе дасканаласьць сваёй нядасканаласьцю, якая яўлялася яму найбольш відавочнай у сьвятле яе ідэальнага вобраза, і прагнуў атрымаць яе поўнасьцю, нібыта жадаў увабраць яе назад, у сваё сэрца, а пакуль са стогнам выліваўся ў яе, адчуваючы, як умацоўваюцца гэтыя нябачныя, зьвязваючыя іх ніці, зь якіх тчэцца дзівоснае палатно, агортваючае іх абодзьвух нябёсным покрывам іх любві.

Гэта каханьне было прыгожым, было ідэальным, як ён жадаў, як уяўляў сабе, без вычварства і зьдзекаў, без болю і адчаю, яе і свайго, без сораму і раскаяньня, без прыніжэньня яе і ўзвышэньня сябе, лёгкім для яго і радасным для яе, бо цемра, як ноч, прайшла, выліўшыся зь яго гарачым патокам, і цяпер ён быў чыстым і сьветлым, годным яе, такім, якім ён жадаў для яе быць, любячым, а не катуючым і пакутуючым Богам. Богам сьвятла і радасьці, і прабачэньня ім абодзьмум – пусць не на заўсёды, а цяпер, пакуль ізноў не надыдзе цемра, якая, ён быў упэўнены, ізноў саступіць перад сьвятлом, якое ён зацяпліў у сваім сэрцы.

- Я цябе хачу. Ізноў. Чаму я заўсёды жадаю цябе?

Ён глядзеў на яе праз стол неадрыўна, вачыма глыбокімі і пранізьлівымі, у якіх, здалося ёй, адлюстроўвалася пакута. Але ж у іх было і сьвятло, нейкае цёмнае, такое, што нібыта засмоктвала ў сябе. Раптам ёй захацелася закрыць вочы, і адчуць яго вусны сваімі. Яна сарамліва апусьціла вейкі, зьбянтэжаная яго позіркам. Ён распранаў яе і лашчыў вачыма прылюдна, не хаваючы сваіх пачуцьцяў да яе, якіх было столькі,

што вакол яго адчувалася нешта цяжкое, як цёмнае, набухлае навальнічнае воблака.

- Ты ведаеш, што ты самая прыгожая тут, птушаня маё? Нарэшце ён усьміхнуўся, і хмара нібыта адышла, пракаціўшыся громам.

- На цябе глядзяць усе, і тут няма таго мужчыны, хто цябе не жадае. Ён крануў яе руку праз стол.

- Каханы мой, мне ніхто не патрэбны акрамя цябе, - вымавіла яна. - Каб нават і ўвесь сьвет глядзеў на мяне, ты застанешся адзіным, каго бачыць мая душа. І мне здаецца, што ўсе жанчыны глядзяць на цябе, любы. Яна мякка ўсьміхнулася. Яе вусны нагадвалі лук Амура, падкрэсьленыя чырвоным. Цёмная пасмачка кранала шчаку, выбіўшыся з высока ўзьнятых валасоў, заколатых шпількай.

На ёй была апранутая новая сукенка - шаўковая, чорная, утрымліваемая залатым ланцужком на шыі, якая мякка аблягала яе цела. Versace, і акуляры такія ж. Жакет вісеў на сьпінке стула - з плотных чорных карунак, ніжэй за сьцёгны, Dolce & Gabbana, з такой жа маленькай сумкай, расшытай упрыгожваньнямі. Яна закінула на калена нагу ў вузкай адкрытай туфельке, і шаўковая ткань абазначыла яе стройнае сьцягно. Мабільнік ляжаў на стале перад ёй, Apple у чорным футляры, перад ім стаяў келіх зь віном і кавалачак піццы на талерцы.

Ён сваю ўжо зьеў, і цяпер піў каву, любуючыся ёй. Яна задуменна торкнула відэльцам у піццу, а потым рашуча ўзяла яе сурвэткай у руку, і адкусіла кавалачак. Рэшткі соуса мазнулі яе па шчаке - як кроў. Яна выглядала дзівосна прыгожа, кіношна - проста хапай камеру, і здымай ракурс для рэкламы Versace у вольным гарадскім атачэньні. Прыгажуня ў вячэрняй сукенцы есьць піццу, а прахожыя скручваюць галовы.

Раптам яму захацелася ўбраць гэтую салодкую чырвоную пляму вуснамі.

- Сядзі ціха. Не варушыся.

Ён пацягнуўся рукой праз стол, і асьцярожна выцер зь яе шчакі чырвоную кроплю. Атрымалася ня вельмі - толькі размазаў.

- Што там? - заклапочана вымавіла яна. Дастала з сумачкі люстэрка ў пудраніцы - Chanel, адкрыла, і акуратна выцерла шчаку вільготнай сурвэткай. Палажыла люстэрка ў сумачку, і зашчоўкнула яе, адставіўшы ў бок. Яе рукі так лоўка зрабілі ўсё гэта, што ён залюбаваўся ёй.

- Якая дасканаласьць у кожным руху, у кожным позірку! - падумалася яму.

Яна зусім не задумвалася над тым, як выглядае - і выглядала цудоўна. Жанчыны кідалі на яе погляды, мужчыны глядзелі, не адводзячы вачэй. Тут яна была каралевай, хоць і не здагадвалася пра гэта. У гэтым італьянскім садзе яна была розай, халоднай і паўночнай, у кроплях духмянай расы. Яму хацелася нахінуцца да яе, удыхнуць яе водар, адчуць дакрананьне шаўкавістых пялёсткаў на сваёй скуры - яе валасоў, гладкай, прахалоднай тканіны яе сукенкі, яе вуснаў, атласных і бліскучых, адчуць, як яе вейкі мякка кранаюць яго шчаку.

Яна была шчасьлівая, і ён жадаў бачыць яе такой - радаснай, і, як і заўсёды, прыўкраснай, у аправе, годнай яе хараства, бо гэта было самае малое, што ён мог зрабіць для яе, са зьзяючымі вачыма, якія зь цікаўнасьцю ўбіраюць усё вакол, у месцы, якое было яе годным, бо тут сабралася ўсё самае прыгожае ў сьвеце, што ён любіў, каб вітаць яе. Ён любіў гэтую краіну, і жадаў падзяліцца гэтай любоўю зь ёю, паказаць ёй усе гэтыя цудоўныя стварэньні чалавека, яго рукі і духа, бо ж месцы як Duomo месьцілі ў сабе ня толькі і ня столькі прыгожыя тварэньні мастацтва, але ж адлюстраваньне боскага сьвятла, якое ўбачыла чалавечае вока, адлюстраваў позірк, і вырабілі рукі. Ён ведаў, якая гэта цяжкая праца – рэзаць камень, высякаць зь яго абрысы жывога цела, перарабляць мармур у карункі, дыхаючы каменнай пыльлю, зьбіваючы ў кроў пальцы, выбіваючы суставы, асьляпляючы гэтай прыгажосьцю вочы, якія болей не жадалі бачыць зямнога. Яго рукі даўно ўжо не краналі прыладаў, ня гладзілі камень, які цяплёў пад імі і набываў жыцьцё. Ён засумаваў і стаміўся па працы, аднак ведаў –

кожнаму пладу свой час. Можа, калісьці ён і вернецца да таго, па чым сумуе, і ізноў зробіць нешта такое, што адгукнецца радасьцю ў яго сэрцы, але ж цяпер быў час высякаць з паперы слова. Ён адчуваў, што павінен сконьчыць кнігу, якая так лёгка пачалася, і так цяжка працягвалася, якую ён ніяк ня мог сконьчыць. Быццам бы нечага баяўся – пэўна, таго, што аб сабе даведаецца ў працягу напісаньня. Бо ж пісаць гісторыі – гэта як ускрываць сабе вены, лежачы ў ваньне з уласнай крывёй. Прэпарываць самога сябе, і ня ведаць літасьці, паступова ўскрываючы свае вантробы і свой мозг, і так далей, дабіраючыся да самае душы, пакуль праз яе не аголіцца зерне духа, якое схаванае недзе так глыбока, што сыйдзе сто крывавых потаў, пакуль ты праб'ешся да яго праз спляценьні нерваў і жылаў, бяссоныя ночы і дні, калі ты ходзіш, як вар'ят, шукаючы патрэбнае табе слова, а потым кідаеш усё, і пачынаеш пісаць, пакуль пішацца, і пакуль ня звалішся ад стомы, сыходзячы некуды ў такія бездані, аб якіх ты ні ў сабе, ні ў сьвеце ніколі ня ведаў.

Дзякуй Богу, што ў яго была яна! Ён напэўна памёр бы безь яе, не напісаў бы ні радка, нават і слова. Яе пяшчотныя рукі на плячах, адчуваньне яе мяккай шчакі ля сваёй шчакі, яе дыханьне ля яго дыханьня – яна была для яго ўсім, натхняла яго, вяла яго праз бясконцыя лябірынты самога сябе, як Арыядна Тезея, паказваючы яму шлях да сьвятла ў яго душы.

Ён шмат чытаў, і цяпер, і дагэтуль. Кнігі заўсёды былі побач зь ім, самыя розныя, якія Бог пашле, ён не цураўся ні мастацкага жанру, ні публіцыстыкі, навуковай жа літаратуры ён за жыцьцё прачытаў столькі, што, можа, і не патрэбна. Філязофія, містыка, рэлігія, і тое, што цяпер завуць эзатэрыкай, таксама чытаў – калі трапляла пад руку.

Але ж пісаць – ня тое, што чытаць. Колькі разоў, прадзіраючыся праз кнігі і маладых, і славутых аўтараў, ён вынаходзіў, што адзіная мэта, зь якой кніга была напісаная, было ўзьвялічаньне самога сябе. Як пярсоны, ці як адзінкі пэўнай часткі грамацтва, еднасьці, супольнасьці – не істотна. Мала хто пісаў дзеля праўды, мала хто, як Мікеланджэла целы, ускрываў чалавечую фізічную і псіхічную плоць, не баяўся прэпарырваць яе, рэзаць

па-жывому, не па-мёртваму, сьцякаючы крывёю, да апошняга моманту, калі разам з аўтарам чытач не памрэ, і не нарадзіцца нанова. Так хацеў ён пісаць, і ў гэтым дапамагала яму яго каханьне. Толькі гэта энергія магла рухаць яго руку, ня істотна, што ў ёй не было пяра, а папера была электронным белым квадратам, які адкрываўся яму бясконцасьцю, накшталт квадрату Малевіча.

Яго Сымон-Шымон выматаў яму ўсю душу. Ён ужо называў яго пра сябе Сымонам, і спрачаўся зь ім, выкрываў яго, слухаў яго бясконцыя маналогі, і верыў яму, як самому сябе, бо Шымон ім ня быў. Ён нарадзіўся нібыта сам па сабе, выйшаў зь яго на паперу, і пайшоў сваёй дарогай. Ён жа толькі пасьпяваў сачыць за ім. Разам зь ім ён прайшоў усю пыльную і гарачую Іўдэю, і цяпер спыніўся ў Ерузалеме, ня ведаючы, што адбудзецца далей. Натоўпы народу сабраліся, і чакалі. І ён, аўтар, чакаў таксама. Вось-вось Шымон выйдзе, і скажа свае словы. Абвесьціць народу аб Богу, і сьвет пераўтворыцца нанова. Але ж Сымон-Шымон пакуль маўчаў. Сядзеў, закрыўшыся ў пакоі, разам з вучнямі, піў келіх за келіхам вінаграднага віна – слабы напой ня браў яго так хутка, як яго самога каньяк, і для асэнсаваньня словаў Каіфы патрабавалася цэлая бясконцая ноч, бяссонная, паглыбляючаяся ў вінныя пары і смутак. Ён піў, і думаў, як яму быць далей. Елена народзіць са дня на дзень, і аднекуль з Усходу прыцягнуліся нейкія ваўхвы. Сказалі яму, што ён – воўхв таксама, і павінен увайсьці ў нейкае іх братэрства, абмяняцца нейкімі дарамі, нешта такое істотнае для іх, ад чаго ён адмахваўся рукой. Дыпляматыі яму яшчэ не хапала. Ён і сапраўды пачаў станавіцца некім накшталт Іўдэйскага цара. Народ ужо пачынаў глядзець на яго, і прасіць хлеба. Неяк так ужо было, калі на адной з доўгіх пропаведзяў агаладаўшы натоўп прыйшлося карміць, спустошыўшы ўсе навакольныя хлебныя і рыбныя лаўкі. Ніхто канешне ж ні шэкеля не заплаціў – усе чакалі цуда. Бог павінен карміць дарма. Тады ён аддаў за ежу большасьць сабранага, махнуў рукой – назьбіраюць яшчэ. Іўда качаў галавой і лічыў грошы, нават Ян засмучана назіраў, як слухачы спустошвалі дармавыя карзіны.

Ну не мог жа ён браць плату за хлеб з гэтай галечы, якая несла

яму апошні шэкель. Ён жахаўся, у якім жудасным стане апынулася Іўдэя – абабраная, абадраная, суцэльна расьціснутая Рымам, цяжкая цень якога ўзвышалася над правінцыямі ня горш за ветхазаветнага Малоха. І гэтага меднага быка Каіфа намагаецца ўлашчыць! Дачакаецца – згарыць сам у яго вантробе разам са сваім клятым храмам. Трэба, пэўна, было ізноў сыходзіць у пустыню, адкуль выйшлі – ізноў хадзіць, і шукаць Бога ў ветхазаветнай прастаце, як у свой час зрабіў ён. Але ж – не, Бог знайшоўся, ды гэта ўжо быў Бог новы. Стары Бог жа даўно сышоў, пакінуў іх, забыўся, махнуўшы на іх рукой. Жывіце як хочаце! Ён жадаў жыць па-новаму, ведаў, што так будзе правільна, лепш для ўсіх – пакінуць толькі адзіны закон, Каханьне, і адкрыць Ерузалем новы, нябёсны, не зямны. Трэба вярнуцца душой да Бога, і тады ён павядзе іх ізноў за сабой, праз адлегласьць і час, туды, дзе адбудзецца, нарэшце, яго царства. Аднак цяперашні паход адрозьніваўся ад мінулага, як вялікі патоп – ад звычайнага ліўня. Бог сказаў яму, што ён кліча іх усіх. Усе народы зямлі, якія павінны пераўтварыцца нанова. Няма болей народу абранага, а ёсьць народ закліканы, тыя, хто пачуюць Слова, і пайдуць за ім. Бог намерваўся вызваліць з сусьвету астатнія рэшткі сьвятла перад тым, як яно назаўсёды згасьне ў сатворанай матэрыі, каб навечна з'яднаць іх з сабою ў духу, у дзіўным нябёсным горадзе – царстве. А што будзе далей, ён ня ведаў. І як яно адбудзецца, і калі – таксама. Бог проста сказаў яму – вызваляй, і ён вызваляў, сказаў – гавары, і ён казаў. А што адбудзецца потым, ня ведаў. Баяўся ведаць. Ён ужо бачыў гэты крыж, у сьне. Ганебнае дрэва, на якім ён вісеў у шутаўской кароне. Навошта яму карона? Які ён цар? Хапіла б і дрэва. Не, яшчэ і зьдзекваліся, апранулі цела ў барвовае, на галаву насунулі нешта накшталт вянца з пасохлых галінаў цёрну. Ён не баяўся сьмерці – баяўся гэтага. Узьнясеньня. Узьвялічаньня. Ганьбы праз сваю славу, якой ён зусім не жадаў. Хай ён сыдзе, а веды застануцца. Хай у будучыні ён застанецца ананімным аўтарам Новага Запавету, і людзі будуць чытаць яго радкі, якія ён пісаў бясконцымі начыма, і думаць, што яны не ад чалавека, а ад Бога. Бо ж ён, чалавек, быў толькі мастом, шляхам, дарогай, якая вяла да Айца. Больш за ўсё ён баяўся, што яго зробяць некім накшталт Праметэя, міфічным персанажам, ці, крый Божа, Божым сынам, як яго, ён чуў, ужо нехта пачынаў клікаць.

- Божа, прабач мяне ад такога блюзьнерства, - маліўся ён. – Я просты чалавек, які ведае цябе, і сьведчыць аб тваёй прысутнасьці, перадаючы тваё слова. Адзінае, што я жадаю – вызваленьне. Ад Закону, Рыму, і ад самога сябе. Госпадзі, пачуй мае малітвы! Вызвалі маю душу, і ўзьнімі мяне ўгару, туды, дзе ёсьць Ты, і дзе мой сапраўдны дом.

Так ён маліўся, а потым прыходзіла яна. Абдымала яго, і ён забываў, што ён – Хрыстас, Мешыах, Бог, ці нехта там яшчэ, на кім ляжыць абавязак памерам у сусьвет. Проста абдымаў і кахаў яе. Адзінае, што ён жадаў, быць недзе рыбаком, ці пастухом, недзе, дзе б іх болей ніхто не кранаў, бо карона Божага сына апынулася надта ж цяжкой і балючай.

Аднак і яна, абдымаючы, называла яго Богам. Зь ёй ён спрачацца ня мог, гледзячы ў яе вялікія карыя вочы, якія верылі ў яго так аддана.

І яна, яго каханая, называла яго Богам. І ёй ён ня мог адмовіць, зруйнаваць гэтую яе веру ў яго моц і ўсемагутнасьць. Ён падорыць ёй цэлы сусьвет, залечыць усе раны, нават, калі трэба, ажывіць і памерлых – усё для яе, калі яна пажадае. Памерлых ён мог пакуль ажыўляць толькі на паперы, ды ў сваіх бясконцых казках і гісторыях, якія яна так любіла слухаць.

З блуканьня ў думках яго вывеў кельнёр, які схіліўся над столікам, убіраючы талеркі. Праляцела некалькі хвілінаў, пакуль яна размаўляла аб нечым з маці па тэлефону, ківала галавой, усьміхалася. А ён ужо пасьпеў у думках ледзь не главу напісаць. Натхненьне прыходзіць нечакана, як і заўсёды.

- У вас прыгожая дачка, сеньёр, - пачуў ён голас побач. Кельнёр, шчыра ўсьміхаючыся, глядзеў на яго.

- Сёньня цудоўны дзень, сеньёр! Буон джорна ойтэ.

- Дзякуй шчыры. Ён таксама ўсьміхнуўся ў адказ. Ізноў яе назвалі яго дачкой. Прыгажуня мая! – падумаў ён. Я і сапраўды, напэўна, для цябе стары. Ізноў вусьмешка кранула яго вусны – таму што ён яе бачыў. Яна палажыла тэлефон у сумачку,

зашпіліла яе, паправіла валасы. Падумала, ізноў разшпіліла, дастала памаду, і падфарбавала вусны. Палажыла яе ізноў у сумачку, і зашпіліла канчаткова. Ён пакачаў галавой.

- Красуня мая, ты і так найлепшая ў гэтым горадзе. Я і так ужо адчуваю сябе як дурань са скарбам пасярод злодзеяў. І навошта я цябе вывез? Не магу бачыць усе гэтыя прагныя позіркі, хачу насалоджвацца табой у адзіноце. А яны ўсе распранаюць цябе вачыма. Адчуваю, зараз пачнуцца забойствы, і праліецца кроў.

- Каханы, ты перабольшваеш. Тут поўна прыгожых жанчынаў – на самы розны густ. І на мяне ніхто асабліва і не глядзіць. Паглядзі, якія тут усе яркія! Яна абвяла рукой вакол.

- Ага. Як сарокі. Ён рассьмяяўся. Цыганскі табар. А ў ім раптам апынулася каралева. Канешне ж на цябе ніхто не глядзіць. Баяцца. Ведаюць, што ім за гэта будзе. Але ж усё роўна – паглядваюць. У рукаў.

Яна рассьмяялася – гучна.

- Ты гатовая? Болей нічога ня жадаеш?

- Не, каханы. Яна ўзьнялася. Ён пакінуў у скураным футляры з рахункам грошы, і махнуў кельнёру рукой.

Яны пайшлі па Галерэі, абняўшыся. Яна на абцасах была ростам яму за плячо, але ўсё ж для яго маленькая. Ішла лёгка, быццам бы не кранаючы зямлі, быццам бы не камень быў пад яе маленькімі ступнямі ў басаножках зь лентамі, а аблокі.

- Хочаш, панясу цябе? – прашаптаў ён ёй на вуха.

- Не, ня трэба! Тады точна ўсе будуць глядзець, - напалохалася яна.

- Хай глядзяць! Ён шырока ўсьміхнуўся, і падхапіў яе на рукі. Нехта запляскаў у далоні за суседнім столікам, яна схапілася рукой за спадніцу. А потым ахапіла яго за шыю. Ён нёс яе, і адчуваў яе дыханьне, пах яе парфюмы, вострай, яркай, які хвалямі ўзьнімаўся, разагрэты яе скурай, ап'яняючы яго, як віно. Яе цела, яе грудзі, ледзь прыкрытыя тонкай тканінай

сукенкі, былі зусім побач. Раптам ён успомніў – Жюсьціна, і яму стала сьпякотна, і штаны раптам сталі цесныя. – Хай думаюць, што ў мяне там пісталет, - ён усьміхнуўся пра сябе.

Наперадзе была стаянка таксі. Ён спыніўся ля белай вялікай машыны, апусьціў яе, і вымавіў назву гатэля. Кіроўца кіўнуў – сядайце.

Яны паселі на задняе сядзеньне, спачатку – яна, потым ён. Машына руханулася, і, не ўтрымаўшыся, ён палажыў яе руку сабе на сьцягно. – Вось што ты нарабіла! – пажартаваў. Яна сьціпла усьміхнулася, гледзячы на яго, але ж руку не ўбрала. Пагладзіла. Ён накрыў яе руку сваёй.

- Хачу цябе, - вымавіў. – Дай толькі да нумара дабрацца.

- А што ты хочаш? – нявінна запытала яна яго.

- Я? Усё. Ён абняў яе ззаду, яго рука лягла ёй на грудзі. Калі б не Versace, разарваў бы гэтую тканіну. Але ж кошт у пару тысячаў еўра вымушаў адносіцца да гэтай шаўковай хусьцінкі з павагай. Да таго ж, яна расстроіцца. Ён пагладзіў тонкі шоўк, адчуваючы, як пад ім узьнімаюцца яе саскі.

У нумары было сьпякотна – за дзень нагрэла сонца, а кандыцыянер ён уключыць перад адыходам забыў. Ці, можа, пакаёўка выключыла. Эканомія - Еўропа, тваю ж маць.

Яна ляжала на ложку, прыкрытая прасьцінай. Ён стаяў, голы, перад вакном, трымаючы тэлефон каля вуха. З тэлефона яму крычэў голас Фёдара – ці паддаты, ці не – было не зразумела.

- Мишаня, братуха! Ён між волі паморшчыўся. Адсунуў тэлефон крыху далей. Зь яго радасна лілося:

- Ты где? Я – уже в Риме! Жди! Бухать будем? За встречу? Я один приехал, без бабы. Чисто па-пацански посидим.

- Па-пацанску не атрымаецца. Я з жонкай. Ты забыўся? Віла твая, дык чаго запытваеш? Канешне, прыязжай. Ты ж гаспадар, мы – госьці. Калі ты нас яшчэ ня гоніш.

- Да ты что! – пачулася з тэлефону – абурана.

- Мишаня! Михаил … Аль-гер-до-вич, - нянатуральна раздзельна вымавіў мабільны.

- Усё ж паддаў, - вырашыў ён канчаткова.

Тэлефон працягнуў:

- Как у нас говорят – мой дом – твой дом. Живи, сколько хочешь! У меня ещё есть, у меня этих вилл на каждый день недели, как трусов-неделька. На тым канцы зарагаталі.

- Хочешь, в другую переедешь? С бассейном? И горничными. С бабами хочешь виллу? Фёдар быў сама гасьціннасьць.

- Не, дзякуй. Я з жонкай. Ты што, ня памятаеш?

- Аааа…, - вымавіў тэлефон. – Да, конечно. Такая красивая татарочка … евреечка. Высокая. Модель. Помню, конечно. Ну, ладно. Ты где сейчас.

- Схлусіць? – падумаў ён. – Але ж неяк няёмка.

- У Мілане, - адказаў нарэшце.

- Круто! Тэлефон узрадваўся.

- А что ты там делаешь?

- Шопінг. Ён паціснуў плячыма. Яму ўжо хацелася ў душ – усё цякло па сьпіне. Кандыцыянер работал на ўсю, але ж разагнаць сьпякоту было ня так і проста.

- Бабу свою одеваешь? Знакомая песьня. На тым канцы зарагаталі. – И сколько? Ладно, ладно, шучу. Можешь не говорить.

- Ня шмат. Тысяч пяць, - адказаў ён. - Пакуль. Сумка была на распрадажы. І туфлі. А то б у двая болей.

У тэлефоне прысьвіснулі.

- Ладно, слушай. Я тут на самолёте, на частном. На своём. Да, купил. А куда деньги девать? Закапывать их, что ли? Короче, я прилечу. Жди. Через час буду. Я тут, в аэропорту, бухаю. Ну, пока ещё до города не добрался. Второй день бухаю в дьютике. В ВИП-зоне. Но уже ничего, проспался. Короче, счас. Жди. Мишаня! Я уже ле-чуууу!!!

Нешта гучна ляснула, так, што Летыцыя на ложку ўздрыгнула, і ўсё раптам абарвалася.

- Каханы, ён што, і сапраўды прыляціць? – вымавіла яна разгублена. Па яе вачах было бачна, што яна гэтага хоча ня дужа.

Ён разьвеў рукамі. – А што я зраблю, любая. Ён жа гаспадар. Яго права, яго віла.

- Канешне, прабач, каханы. Але ж ты пісаць хацеў. Казаў, што шмат чаго прыдумаў. Яна запытальна глядзела на яго.

- Каханая, я зь ім піць не зьбіраюся. Толькі пасядзім за сустрэчу. Ну што я зраблю, ён жа вунь – на самалёце ўжо набліжаецца. Ён глянуў у вакно, быццам бы ў небе ўжо можна было разгледзець самалёт Фёдара.

- Ладна, красуня мая. Пайшоў я ў душ, а тое ён і праўда праз час тут будзе. Хаця … пачакае. Нічога страшнага. Ён апусьціўся на ложак побач зь ёй, адкінуў прасьціну.

- На чым мы там спыніліся? – запытаў.

Глава 16: Споведзь

- Багі ёсьць праяўленыя сілы прыроды. Айцец не пасьціжым.

Філон глядзеў на яго з пагардай.

- Ты памыляешся, шаноўны Філон. Айцец не пасьціжым, так. Але ж - розумам. Я ж яго пасьціг сэрцам.

- Сэрца ня можа разумець! - Філон кпліва рассьмяяўся.

- Усем вядома, што душа чалавека жыве ў галаве! Як толькі яе зносяць, цела памірае. Сэрца ж ёсьць орган па вытворчасьці крыві. І працінаньне яго выклікае сьмерць, але ж больш марудную. Шмат разоў я правяраў на заточанных у вязьніцах, і правёў дасканалыя вылічэньні. Толькі ў галаве! Душа - ажыўляючы цела прынцып, які апасрэдвана зьвязвае яго з Думкай Бога, якая стварыла сьвет. Думка ж выражаецца праз Слова, якое ёсьць Думка праяўленая. А Слова ёсьць Творца, які стаіць напрыначале сусьвету. Аднак Творца знаходзіцца ў сьвеце ідэй, а ў гэтым недасканалым сьвеце форм ён праяўляецца апасрэдвана яшчэ больш недасканалым. Чалавек жа, створаны нядасканалым творцай, самая нядасканалая і ніжэйшая істота ад усіх. І душа яго ёсьць прынцып суцэльна жывёльны, прызначэньне якога - толькі запаляць мёртвую плоць агнём жарсьці. Аднак, як і ўсякі агонь, душа гарыць толькі пакуль мае топліва - матэрыю, у якой яна існуе. Боскі прынцып запаляе плоць, як вагонь топліва, зьядае яе, і знікае з гэтага сьвету сам. Куды - ніхто ня ведае. Можа што і ў Аід. А можа, узьнімаецца да Бога. Нам жа гэта не істотна, бо няма нічога больш процілеглага, чым Бог, і цела зь яго душою.

У позірку Філона былі радасьць, і выклік.

- Душа жыве з Богам. Голас старога быў цьвёрдым, утрымліваючым немалую моц. Ты праводзіў свае вылічэньні год, а я пражыў зь ім усё жыцьцё, і памятаю кожнае імгненьне знаходжаньня ў Богу маёй душы.

- Бог - тагасьветны, невядомы, ненароджаны і не ўміраючы, адвечны прынцып па-за межамі існаваньня, і пасьцігнуць яго нам не дано. Душа ж чалавека, усё ж, мяркую, памірае разам зь яго целам, як вагонь памірае, калі скончваецца паліва, бо Бог ня можа памесьціць частку сябе, бясконцага і непраяўленага, у праяўленае стварэньне, якое абмежавана межамі нядасканаласьці. Дасканаласьць ня можа існаваць у нядасканалым сасудзе, які ёсьць цела чалавека. Яна можа толькі ажывіць яго сваім дакрананьнем, і даць яму тое жыцьцё, часовае, якое абумоўлена межамі цела і яго процілегласьцю Божаму ствараючаму прынцыпу. Бо ж створанае не жывое само па сабе. Яно жывое праз творцу, набыўшае прыданую ім форму, і існуе роўна столькі, колькі існуе ўтрымліваючы яго матэрыял. Камень - матэрыял трывалы, але ж цяжкі і марудны. Чалавечае ж цела мяккае, гарачае, і хутка рухаецца, лёгка запаляецца. Таму яно было абрана Творцай як інструмент яго вытворчасьці каб пасяліць туды душу. Часова, і часовую, бо, адарваўшыся ад Айца, душа згубіла права на бессьмяротнасьць. Памерлага ажывіць не магчыма.

- Магчыма. Я сам неаднаразова ажыўляў. Ён узьняў галаву, быццам бы прыпамінаючы нешта. Яго вочы ўжо амаль ня бачылі - так, рэшткі сьвятла і фігуры.

- Бог пасьціжым, Філон. І мая душа ведае яго, бо суцэльна знаходзіцца ў ім. І, адначасова, яна тут, у целе, але ж яна ім не абмежаваная. Душа бясконцая, як Бог. Бо яна і ёсьць Ён. Ён зь цяжкасьцю узьняўся. Яго сьпіна і плечы балелі - старыя раны давалі аб сабе знаць. Калісьці чорныя, яго валасы сталі белымі, як сьнег, і вочы амаль перасталі бачыць зямное, хоць нябёснае полымя ў іх гарэла яшчэ больш ярка. Яно даўно выпаліла яму позірк, заступіўшы сабой сусьвет. Бог стаяў перад ім твар у твар, і болей не засталося нічога. Даўно ўжо сышла Елена. Яе цела, пахаванае ў мармуровай грабніцы, ня мела нічога агульнага зь яе душой, палымяную існасьць якой ён нябачна кранаў вуснамі - маладымі, такой, як ён яе памятаваў. Сын яго загінуў пад руінамі Храму, у горадзе, які ён вырашыў бараніць да апошняга. Ён ненавідзеў Рым, і не разумеў, што Рыму не было. Ён не існаваў, як сапраўды не існуе нічога з матэрыяльнага. Сапраўды існуе толькі Ён, Бог адзіны, сусьвет,

які распрасьціраецца па-за межы самога сябе. І цяпер Ён літасьціва забіраў яго з самога сябе, паступова вызваляючы яго душу.

Раптам яму стала хораша. Так лёгка, что ён ня мог і ўявіць. Ён разумеў, што цела яму больш не належыць. Ён пакідаў яго - пакідаў лёгка, не шкадуючы і бяз страху. Цяпер ён быў вольны, і быў сапраўдны. Яго рукі агарнулі яе, і яе вусны зьліліся зь яго вуснамі. Сьвятло затапіла яго, такое яркае, што ён прачнуўся.

Прыйшоў у сябе ў крэсьле перад ноўтбукам. Неяк ён задрамаў - пісаў, задумаўся, і раптам галава стала лёгкай, а вочы - цяжкімі. Яе рука лягла на яго плячо.

- Каханы, - пачуў ён яе ціхі голас. - Каханы, будзеш абедаць? Ты зусім запрацаваўся. Яна пацалавала яго.

- Ужо хутка вечар.

- Я заснуў, любая. Якую ноч бяз сну. Ён прытуліўся да яе рукі шчакой, крануў яе вуснамі.

- Сцэнар я закінуў - аддаў усё Паола. Хай ён вырашае Шымонаў лёс. Ён хоча зрабіць канцоўку няпэўнай, мульціварыянтнай. Нібыта Шымона расьпінаюць, і не расьпінаюць. Ніхто ня ведае, каго насамрэч расьпялі - Кірыяніна, ці галоўнага героя. Шымон стаіць у натоўпе перад крыжом, і глядзіць на самога сябе - ён тут, і ня тут, у сьвеце, і ня ў сьвеце. Грае Victimae paschali laudes, ці нешта накшталт. А я спакойна працягну пісаць далей.

Грошы за фільм дазволяць мець добрую падушку яшчэ з год.

А потым я мяркую дапісаць твор. Ён устаў, і прытуліў яе да сябе.

Фёдар яшчэ спаў - піць ён болей ня мог нічога, акрамя Perrier. Адпіўшы з тыдзень, цяпер другі дзень валяўся ў пакоі, і стагнаў, трымаўся за бальную галаву, і быў ціхі настолькі, што ён, нарэшце, змог вярнуцца да сваёй працы, якая цяпер, пасьля перарыву ў тыдзень, давала яму неверагодную асалоду.

Яны прыехалі зь Фёдарам на вілу разам - не на цягніку, а на

арэндаванай машыне. Ён сам быў за рулём, бо кіроўца, як толькі ўбачыў Фёдара, адмовіўся.

- Фанкула! Я нікуды не паеду зь ім. Гэты звар'яцелы рускі зьнічтожыць машыну і знутры, і звонку. Не бясьпечна. Хай прасьпіцца. Міхась паціснуў плячыма.

- Ня хочаш, як хочаш. Баяцца цябе італьянцы, - з мнімым папрокам, і схаванай у вусах вусьмешкай зьвярнуўся ён да Фёдара. Той напаўляжаў на сядзеньні ззаду, зьвесіўшы галаву на грудзі, і гучна ікаў - ці храпеў, не зразумела.

Летыцыя з жахам глядзела на яго, пераступаючы вузкімі чорнымі туфелькамі з аксамітнай замшы.

На ёй быў апрануты сьветла-шэры касьцюм - кароткія, адкрываючыя лыткі штаны і вузкі жакет, пад якім была бачная мяккая, бледна-ружовая атласная блюзка на маленькіх гузіках. Харошая дзяўчынка з дарагога офісу, сексі і стылёвая, нагадваючая выдатніцу-выпускніцу, толькі што выйшаўшую з гутаркі пры ўладкаваньні на працу.

- Сядай, красуня. Ён расчыніў перад ёй дзьверцу пярэдняга сядзеньня, сам жа пайшоў садзіцца за руль.

- Як мы зь ім паедзем? – з жахам вымавіла яна. – Ён жа ніякі.

- Дык гэта і лепш! – супакоіў ён яе. – Калі б ён быў напалову жывы, мы б зь ім гора не абраліся. І насамрэч бы не даехалі нікуды. Яшчэ б яго па ўсёй Італіі лавілі.

- Хай бы ішоў. Яна надзьмулася.

- Нельга, каханая. Ён жа чалавек, хоць і п’яны. І да таго ж, мой сябар. Мы на яго віле жывем - пагадзіліся прыняць яго дапамогу, таму павіны і яго прымаць такім, які ён ёсьць. Сядай, золатка. Ён цябе не патурбуе. Будзе спаць да самага дому. Толькі, пэўна, храпець будзе моцна. Так ты навушнікі адзень, і музыку слухай. Што табе ён? Ляжыць, і хай ляжыць.

- А калі ён прачнецца, і буйны стане? – з трывогай запытала яна.

- Тады я яго супакою, і ён ізноў пасьне. Ён усьміхнуўся.

- А як ты яго супакоіш, калі ён нічога не разумее? – засумнявалася яна.

- А табе гэта ведаць ня трэба. І бачыць – таксама. Супакою, - упэўніў ён яе. – Не хвалюйся, любая. Ты нават і не заўважыш.

Ён сеў за руль, і яны паехалі – хутка, значна больш за сотню. Краявіды ляцелі за вакном суцэльнай паласой – і не разбачыць, што праязжалі.

- Часа за чатыры даедзем, нават і меней - супакоіў ён яе.

Фёдар, як ён і абяцаў, не турбаваў іх – ляжаў ціхенька, не варушыўся, нават не храпеў.

- Можа, ён памёр? – устрывожана запытала яна.

- Да не памёр, спіць. Яму, каб памерці, яшчэ столькі ж выпіць трэба. Я яго ведаю. Яго ад бутэлькі развозіць, потым ён сьпіць, а потым прачынаецца, і ізноў п'е. Так можа і тыдзень, і болей піць. А потым – Perrier толькі. Зь месяц. Пакуль не забудзе, як яму блага было. У яго – традыцыі, і ён іх паважае, любая.

- Ён жа так зусім сап'ецца, - пашкадавала яна. – Ты б зь ім пагаварыў.

- Ён мяне не паслухае, золатка. На яго думку, рускі чалавек тым і адрозьніваецца ад нейкага там італьянца ці каго іньшага, што піць можа неабмежавана. Тады ён душу сваю асаблівую мацней адчувае, тую, якой болей ні ў кога на зямлі няма. Яе так і завуць – вялікая руская душа. У сэньсе – вялікая ў памерах. Шырокая, бальшая. Удакладніў ён.

- У іх усё – вялікае, - яна ўсьміхнулася. – Пэўна, з-за гэтага.

- Зямлі шмат, - пагадзіўся ён. – І грошаў у ёй нямерана. "А куда эти деньги? Закапывать?" – прыгадаў ён словы Фёдара. – Вось яны іх спачатку адкопваюць, а потым – закопваюць. Спускаюць на лайно. Добра, хоць вілу купіў. Хоць нешта застанецца, калі не прап'е і яе. Хоць ён, пэўна, думае, што ў думе яго

пажыцьцёва трымаць будуць, а там даходы сапраўды бясконцыя. Нетры могуць іссякнуць, а шчодрасьць рускага народу – ніколі. Дума да апошняга ўтрымаецца. Пакуль народ не зьнікне. А тое – немагчыма, бо рускі народ асаблівы, жывучы. Ён любую думу перажыве, тым і жывы. І праз яго і дума жывая. Так і будуць жыць разам, бясконца. Народ будзе выжываць, а дума – жыць, каханая, - удакладніў ён.

- Дык гэта ж нейкі кашмар, - з сумам вымавіла яна. – Поўная безнадзейнасьць.

- Менавіта. Ён кіўнуў. – Аднак тут мы маем справу з асаблівай вялікай рускай душой, якая і ў безнадзейнасьці бачыць надзею. Бо чым бы яна тады жыла, калі б надзеі не было?

- А на што яны надзеюцца? - запытала яна.

- На рознае. Ён паціснуў плячыма.

- Што ўлада зьменіцца, і да іх пачнуць адносіцца добра? – працягвала яна запытваць яго.

- Не, любая. На гэта яны ўжо больш не надзеюцца. Ужо так было, што ўлада зьмянілася, толькі ім пасьля гэтага стала яшчэ горш. І цяпер яны моляцца, каб нічога не зьмянілася, бо лепей ім будзе.

- А беларуская душа, яна якая? – запытала яна яго.

- Якая? Звычайная. Як і ва ўсіх астатніх людзей. Нічога асаблівага, каханая. Ён паціснуў плячыма.

Фёдар праспаў да самай вілы. Калі яны прыехалі, было ўжо пазнавата – пачынала цямнець. Ужо калі яны наблізіліся да мора, і пачалі ехаць па яго ўскрайку, ён заварушыўся – нібыта адчуў родныя мясьціны. Калі ж спыніліся, то сеў на сядзеньні, лупаючы вачыма.

- Дзе гэта мы? – запытаў, круцячы галавой, нібыта не пазнаваючы нічога вакол.

- Прыехалі. Выходзь! – Міхась выйшаў з машыны, і адкрыў

дзьверы і яму – шырока. Яна таксама выйшла, і стала побач.

- О, красавица! Татарочка! – узрадваўся ён, зьвяртаючыся не да яе – да Міхася. Нібыта яе тут і не было. Міхась глянуў на яго, але ж не зьвярнуў увагі. Нібыта не зьвярнуў.

Яна ж стаяла, і ня ведала, што яму на гэта адказаць. Нарэшце словы знайшліся.

- Дзякуй, што вы далі нам прытулак, Фёдар. У вас цудоўная віла! Спадзяюся, мы вам ня дужа замінаем.

Ён з цікавасьцю агледзеў яе – усю, ад касьцюма да туфель, і доўгага конскага хвасту на затылке.

- А что ты такая официальная? – вымавіў, узьняўшы бровы, якія на імгненьне нібыта заліплі пад ілбом. А потым апусьціліся – адна, і затым – другая.

- Яна цябе саромееца. Міхась падыйшоў, і абняў яе. – Паглядзі на сябе, у якім ты выглядзе.

- А что? Фёдар зь цікавасьцю агледзеў сябе. Дарагі касьцюм добра памяўся, пакуль ён спаў на сядзеньні, кашуля з аднаго боку была не запраўленая, верх штаноў разшпілены.

- Ой, прошу извинить. Эт-та ещё я рановато … нагнуўшы галаву, ён паспрабаваў зашпіліць гузік, але ж нічога не атрымалася. З хвіліну ён поркаўся, потым махнуў рукой.

- Ничего, у меня галстук длинный, - вымавіў ён, зьвяртаючыся да Летыцыі. – Так что стыдливость дамы я не оскорблю.

Ён зарагатаў.

Міхась махнуў рукой, абняў Летыцыю за плячо, і пайшоў прэч ад машыны, нічога ня кажучы.

Фёдар хутка рушыў за ім сьледам.

Разам яны зайшлі ў хол, чыста прыбраны, з растаўленымі па мястах рэчамі, дзе не было ні пылінкі. Усё вакол зьзяла

чысьцінёй, і добра пахла дарагой парфюмай для дому – Летыцыя пастаралася.

- Слушай, сюда и зайти страшно! Чисто, как в музее. Вы тут вообще жили? – Фёдар закруціў галавой.

- Жылі, і жывем. Гэта яна прыбірае. Кожныя пяць хвілін нешта трэ. Міхась пацалаваў Летыцыю ў шчаку.

- Сама? – Фёдар вылупіў на яе вочы.

- У мяне шмат часу, і мне нравіцца, калі чыста. Яна ветліва ўсьміхнулася. – Праходзьце, калі ласка! Вы ж у сябе дома. А я зараз штосьці прыгатую.

- Она что, ещё и готовит у тебя? – Фёдар адкрыў рот.

- Ды праходзь ты хутчэй. Ня стой у дзьвярах. Гэта ж я госьць, а ня ты. Ты – гаспадар.

Міхась прайшоў у хол, Фёдар – за ім, накіраваўся да шырокай канапы, і апусьціўся на яе.

- А каньячку у тебя нет? – запытаў ён.

- Ёсьць, чаму не. Міхась дастаў з шафы новую бутэльку Хенесі, адкрыў. Летыцыя прынесла нарэзаны сыр, вэндліну, фрукты, і вялікае блюда з крэветкамі.

- Пачакайце, зараз стэйкі зраблю, - вымавіла яна, і ізноў сышла. Фёдар пакруціў галавой.

- Не женщина, мечта! Повезло тебе, Мишаня. Моя не то, что стэйки, чашку кофе с будуна не сделает. Пока в рожу не дашь. Выпендривается. А твоя – послушная. Мне такие нравятся. Ён пацягнуўся.

- Я яе не вымушаю. Міхась паціснуў плячыма. – Яна сама ўсё робіць, што хоча. Калі б не жадала, я б каго наняў. Толькі яна ня любіць чужых у доме.

- И правильно. Фёдар пахабна ўсьміхнуўся. – А то наймёшь

какую филиппинку или мулаточку, а бабы – они ревнивые. Вот она и шуршит, старается. Моя тоже ревнивая. Горничной в волосы вцепилась. Чуть разнял. Ввалил обоим, выли, как кошки по углам. Потом – ничего. Помирились. Ён зарагатаў.

- Мая не раўнівая. Я ёй повада не даю. Бачыш – нікога няма. Міхась разьвёў рукамі.

- Ну и хорошо. Нам лишние уши не нужны. Фёдар раптам стаў сур'ёзным.

- Твоя молчать умеет? – запытаў ён.

- Умее, - упэўніў яго Міхась.

На кухне шыпела мяса і пахла на ўвесь пакой – Летыцыя завіхалася ля пліты. Яна пераапранулася ў дамашні касьцюм – вольныя сьветлыя штаны і свабодная майка, адкрытая на плячах, падкалола высока валасы. Ад цяпла пліты яе твар стаў ружовым, разгарэўся. Яна выйшла з кухні, трымаючы ў руках два блюда са стэйкамі, паставіла іх на стол, паклала прыборы.

- Я зараз, пайду пераапрануся, каханы, - вымавіла яна, і сышла ўверх па лесьвіцы. Толькі мяккія крокі прашапацелі па каменнай плітцы.

- Ого! Как в ресторане! Фёдар з адабрэньнем агледзеў кавалак мяса. Надрэзаў. Той сачыўся крывёю на разрэзе, а зьверху меў чырвоную хрусткую корачку.

- Яна ўмее мяса гатаваць. Любіць. Я навучыў. Міхась узьняў кубак.

- Ну што, за сустрэчу!

- За сустрэчу! Яны выпілі па поўнай. Міхась адрэзаў стэйк, Фёдар падумаў, і ўзяў кавалачак лімону.

- После первой не закусываю, - растлумачыў ён.

- Як пажадаеш. Міхась паціснуў плячыма. – Ну, што там у цябе? Расказвай. Што такое, што ты не жадаў па тэлефону казаць?

Здарылася нешта?

- Здарылася, Мишаня. Боюсь я, война будет, - прама вымавіў Фёдар, і вакол апусьцілася цішыня.

- Якая вайна? Каго і зь кім? Ты прабач, але ж я даўно ўжо справамі сьвету не цікаўлюся. Дужа шмат сваіх. Міхась пільна глядзеў на яго. Яго вочы раптам сталі халоднымі, цёмнымі, і вострымі, як лязо.

- Якая? Самая обыкновенная. Наших с ихними. Фёдар махнуў галавой. Хутка яго пачаў разьбіраць хмель.

- Только это хорошо, что вы тут. И что я – тут. Мне б назад не ехать, а надо. У меня ж – работа. Дума. Как там без меня. И бизнес, рестораны. Подряды обещают хорошие. Кейтеринг специального назначения, так сказать. Ён нярвова зарагатаў.

- Ну, ты пачакай. Можа, яно і абыдзецца. Калі ты пра гэта, то мне нешта ня верыцца. Чэсна. Міхась паціснуў плячыма. – Гэта ўсё шуміха ў прэсе. Маніпуляцыі грамадскім мяркаваньнем.

- Ты что, дурак? Фёдар раптам стаў злым. – Какие манипуляции? Чьим мнением? Я знаю такие вещи, которые ты не знаешь. Я это сам слышал. Ты знаешь, с кем я пил? Ён нагнуўся праз стол, і ціха вымавіў на вуха Міхасю імя.

- Ого! – вымавіў той. – Праўда?

- Я тебе что, врать буду? Не такой я человек. Я не паникую, я – стратег. Великие возможности открываются. И – закрываются. Только мне страшно что-то. А вдруг они – нас? – раптам зашаптаў ён.

- Хто – яны? Каго – вас? – Міхасю гэта ўжо пачало надакучваць. – Слухай, ты прасьпіся лепей. Адпачні. Пайшлі наверх. Я табе на канапе пасьцялю. А заўтра раскажаш усё, што цябе непакоіць, на сьвежую галаву. Маю і тваю.

Раптам па лесьвіцы ўніз пачуліся лёгкія хуткія крокі – на абцасах.

Яны абодзьва павярнулі галовы, і адкрылі рты.

Яна стаяла унізе крыху разгублена, нібыта ня ведала, ці патрэбная яна тут, і ці да месца выглядае. Яе валасы, хвалістыя пасьля пучка, былі вольна распушчаны па плячох, простая белая атласная сукенка з глыбокім выразам, сабраная пад грудзямі, адкрывала шыю, рукі і плечы. І грудзі. Не зусім, але ж даволі глыбока. Раптам ён адчуў нібыта штурхок - навошта так адзелася? Лепш бы была ў касьцюме, - падумалася яму. Яна выглядала дзівосна прыгожай, як заўсёды, і нават лепш, чым заўсёды. Усё гэтае аточаньне падкрэсьлівала яе далікатнасьць, вытанчанасьць, нейкую ўразьлівасьць – і гэтае адкрытае белае плацьце, і вольныя хвалі валасоў, і крыху размазаны макіяж, які яна старанна паднавіла, ад чаго яе вочы зрабіліся яшчэ больш вялікімі, бліскучымі, а вусны нібыта прыпухлі, намазаныя празрыстым бляскам паверх чырвонай стойкай памады, якую яна зьняла, але ж колер глыбока ўеўся ў скуру.

Калі б для яго так апранулася, ён быў быў толькі рады. І ня доўга б яна заставалася апранутай. Але ж тут быў Фёдар, ды яшчэ і выпіўшы. Яму не хацелася, каб ён глядзеў на яе, каб распранаў вачыма тут, у сябе дома, дзе яны, насамрэч, госьці, а гаспадар - ён.

Але ж было ўжо позна.

- О, татарочка! Красивая какая! Садись тут, между нами. Фёдар пасунуўся, даючы ёй месца.

- Сядай сюды. Ён узяў стул, і паставіў ёй справа ад сябе, ў галаве сталу. Яны сядзелі на канапе: ён бліжэй да яе, Фёдар – зьлева ад яго.

- Ой, ну что ты волнуешся, Мишаня. Не украду я твою красавицу. Фёдар шырока ўсьміхнуўся.

- Ня трэба. Хай сядзіць там. Яго голас раптам стаў сухім, жорсткім. Нібыта гаспадар тут быў ён. Фёдар зьдзіўлена глянуў на яго, а потым махнуў рукой.

- Вып’ем? – прапанаваў ён.

Яны выпілі па кубку, але ж размова ня клеілася. Тое, што Фёдар хацеў сказаць, ён сказаў. У галаве яго ўжо пачынала шумець, і гэтая дзяўчына насупраць – проста наважэньне якоесьці. Раптам ён зразумеў, што яе хоча. Ну, хоча, і што тут такога. Калі б тут была Айгуль, яна б ужо радасна абслугоўвала абодзьвух. Ды радасна – гэта яму апрыкла. Не было цікава. Гэтая ж, бачна, што не з такіх. І зь ёй было б значна цікавей. Ён і сам забыў, што гузік у яго на штанах разшпілены. Летыцыя старана адводзіла вочы ўбок, а потым нечакана села збоч ад Міхася на канапу, і ён зусім згубіў яе зь віду.

- Слушай, а чего ты пересела? – блытаючыся языком, запытаў ён.

- Мне тебя не видно.

- Затое цябе відна. Штаны свае зашпілі. Ці табе дапамоч? – голас Міхася раптам стаў злым.

- Ой! – ён глянуў уніз, і зарагатаў.

- Ну, прости, красавица. Поручик Ржевский рад знакомству, так сказать. Не могу застегнуть. Пальцы не слушаются. Мне обычно бабы застёгивают, - неяк вырвалася ў яго, сам ня ведаў, чаму.

Раптам нешта здарылася, і сьвятло ў яго вачах імгненна патухла.

- Вады прынясі, хутка. І льду. Я яго добра стукнуў. Хоць бы не забіў, - праз імгненьне пачуў ён над сабой устрывожаны голас.

Тут на яго стала нешта капаць – праціўнае, халоднае. Хтосьці паклаў яму на лоб мокры рушнік. Ён хацеў зьняць яго, працягнуў руку, і застанаў. На лбу пад рушніком было нешта балючае, і на скуле таксама.

- Што гэта? – прастагнаў ён.

- Нічога. Сонечны ўдар. Міхась абцёр яму твар рушніком.

Вока яго балела, заплывала.

- Ты что, меня бил? – ён цяжка ўстаў, сеў на канапу, адкінуўшы галаву на сьпінку. Летыцыя нахінулася над ім, устрывожаная.

- Вам баліць? – запытала яна.

- Ідзі ў пакой. Няма чаго табе тут рабіць, - вымавіў Міхась. Уся гэтая сітуацыя ўжо пачала яго злаваць. Прычым даўно.

- Пусть останется. Нет, правда. Я штаны застегну. Уже застегнул. Фёдар, нарэшце, справіўся з гузікам.

- Іді, каханая, спаць. Я зараз буду. Голас Міхася стаў нібыта стальным, не дапускаючым пярэчаньня.

- Канешне, любы. Я зараз пайду. Яна, здаецца, і сама напалохалася. Устала, і, апусьціўшы галаву, узьнялася ўверх па ступеньках.

Хутка гук яе крокаў заціх у калідоры. Фёдар зь цяжасьцю павярнуў галаву, глянуў на яго – неяк здзіўлена.

- Ты чего? Тебе чего, бабу жалко? Я ж пошутил.

Ён і сапраўды не разумеў, што здарылася.

- А я – нет, - спакойна вымавіў Міхась. – І калі ты ня спыніш свае заляцаньні, я цябе заб'ю. Завязу ў горы, і ськіну з абрыву. Хай шукаюць. Сумняваюся, што знойдуць. Што ты тут камусьці будзеш патрэбны. А калі і знойдуць, вырашаць што самагубства. Ты думаеш, я дурны? Нічога ня чуў, і ня ведаю, што ў вас адбываецца?

- Как – убьёшь? За бабу? За татарочку? Ты что? Фёдар, здаецца, зусім нічога не разумеў. – Я тебе этих баб целую виллу нагоню. Хочешь, сейчас закажу хоть с десяток? Только ты пойми, у нас, у братвы, так принято. Мы все – как одна семья. Ну, ты ж не наш, понимаю. Просто, давай, без обид. Мне для тебя ничего не жалко. Понравилась баба – бери, пользуйся. Без вопросов обслужит. Моя - вышколенная. Она теперь только на меня работает, ну, и если попрошу дополнительно. Без обид. Честно. Не понимаю. Ты ж – нормальный пацан. Если мы так базарить будем, так может, я первый тебя убью? Ты не думал? И баба

твоя на моей вилле.

- Попробуй. Раптам яго голас стаў страшным, нават і для яго самога. Нешта ізноў варушылася ў ім – цяжкое, цёмнае, пагрознае.

- Варухніся толькі. Ён раптам замаўчаў. Фёдар цяжка дыхаў.

- Дай мне тое, што ў цябе за поясам, - ціха вымавіў ён, і працягнуў руку. – Дай.

Нешта было ў яго голасе такое, што Фёдар нечакана падпарадкаваўся. Ён узяў невялікі пісталет, пакруціў у руцэ, і палажыў збоч ад сябе на стол.

- Хай тут паляжыць. А мы паразмаўляем. Слухай, гэта – ня баба, а жанчына. Мая жонка. Мы вянчаліся, калі табе гэта нешта кажа. І нават калі – не, я жанчынамі не дзялюся. Бо я ня маю справы са шлёндрамі. А жанчынай, якую кахаюць, ня дзеляцца. За яе забіваюць. Зразумеў? Усё зразумеў?

Ён узяў пісталет, пакруціў яго. І палажыў на месца. Небясьпечная гульня.

- Слухай, давай так. Як ты кажаш – па-пацанску. Ты забудзеш, што казаў, я забуду, што зрабіў. І ўсё будзе добра. Я магу табе верыць? Тваё слова нешта значыць?

- Можешь. Фёдар кіўнуў галавой. Яго голас быў хрыплым.

- Я всё понял. Не буду больше приставать к твоей … женщине. Раз ты так нервничаешь. Ещё из-за бабы не хватало проблем.

- Слушай, Федя. Нельзя тебе пить. Дурак ты, когда пьяный. И когда трезвый – не умный. Ён спакойна глядзеў на Фёдара. Той кіўнуў, пагаджаючыся.

- Дурак я, Миша. Пьяный дурак. Ты меня прости. Нечакана на вачах Фёдара з’явіліся сьлёзы.

- Загадкавая руская душа, - падумалася яму. – Напіўся, ледзь мяне не забіў, ня згвалціў жанчыну, і цяпер вось – плача.

Прабачэньня просіць. Ён цяжка ўздыхнуў.

- Пайшлі спаць. Заўтра будзе заўтра. Адпачнеш, і нармальна з табой пасядзім. Зьезьдзім кудысьці. Пагуляем.

- Хорошо, Мишаня. Как скажешь. Ты ж теперь хозяин. Я эту вилу на тебя переписал. Только вот, твоей подписи не хватает. Все документы тут. Ён пахлопаў сябе па піньжаку – і сапраўды, унутры, на грудзях, хрустнуў таўставаты канверт.

- А про бабу я пошутил. Правда. Просто вы, беларусы, шуток не понимаете. Совсем. Занудные вы. Хоть и хорошие люди.

- Як – на мяне? Навошта? – ён ніяк ня мог зразумець, што адбываецца. Толькі што Фёдар ледзь ня выстраліў у яго, а цяпер, аказваецца, што гаспадар вілы – гэта ён! Ну і справы.

- Потому что … чтоб не забрали. Они. Они ж все конфискуют. Если что. Пусть будет типа твоя. В смысле, твоя. Ты ж меня не выгонишь на улицу, Мишаня? – запытаў ён неяк жаласна.

- Чаго я цябе выганю з тваёй вілы? Ідзі ты спаць. Ён ужо, шчыра кажучы, стаміўся.

- Нет, ты подожди. Вот, подпиши. Фёдар сунуў яму ручку і ліст паперы. Дагавор на перадачу жыльля – віла, у дар такому-та. Трэба толькі заплаціць налог.

- Налог я ўжо заплаціў, ты ня бойся. Падпісвай. Усё чыста.

Ён, усьміхнуўшыся, узяў “Паркер”, і падмахнуў паперу.

Калі ён узьняўся па ступеньках наверх, і ўвайшоў у спальню, яна яшчэ не спала. Ціха сядзела, не распрануўшыся, у той жа прыгожай сукенцы, якую ён загадаў ёй зьняць. Калі ён увайшоў, павярнула да яго галаву, і глянула, неяк слаба, разгублена. Яе вочы былі шырока адкрытыя, вусны быццам бы зьбіраліся сказаць нешта.

- Ты чаго ня сьпіш, красуня? – запытаў ён яе. – Ты мяне прабач, я не стрымаўся. Напалохаў цябе. Проста так адбылося. Ён мяне

да краю давёў. Яшчэ хвіліна, і я яго б забіў.

Яна прыціснулася ілбом да яго пляча. Ён абняў яе.

- Каханы, гэта я вінаватая. Ня трэба мне было ў вашыя мужчынскія размовы ўмешвацца. А я сама прыйшла, без запрашэньня. Я не падумала. Раптам яна пачала плакаць. Яе плечы трэсьліся ў яго пад рукой.

- Сонейка, ну ня плач. Што ж такое. Я нічога табе не кажу, што ты вінаватая, раз ён – скаціна. Ну такі ён. Ты ж з такімі справу мець не прывыкла.

Яна працягвала плакаць, не супакойвалася.

- Што здарылася, сонейка? – ён павярнуў яе да сябе, узяў яе твар у рукі.

- Алекс вымушаў мяне, - ціха вымавіла яна, гледзячы прама яму ў вочы.

- Пасьля таго, як мяне згвалцілі, ён сам стаў … прыводзіць. Каго яму было трэба. А потым яны рабілі са мной усё, што жадалі. Пад рэчывамі звычайна. І так. Я нікому нічога не казала. Мне здавалася, што маё жыцьцё сконьчылася, і мне было ўсё роўна. Яму падабалася браць мяне зь некім – і ў дваіх, і ў траіх. Я ўжо ня памятаю. Звычайна ён прыводзіў нейкага сябра, ці мы зь ім ішлі кудысьці, а потым гэта адбывалася там. Яна замаўчала. Некалькі разоў. Два, ці тры. Я ня памятаю. Я нічога ня памятаю. Раптам яна заплакала наўзрыд. Гэта было, быццам бы так і трэба. Мяне быццам бы пазбавілі волі. Разумееш? Я залежыла ад яго. Але ж, пэўна, я сама была вінаватая. Мне трэба было сыйсьці, не дазваляць яму. Толькі ў мяне нікога болей не было. Я бачыла сьвет толькі праз яго. Бо ж ён быў маім мужчынай. Ён быў са мною. Ён … яна заціхла. Яго рукі абдымалі яе. Ён маўчаў.

- Расказвай, каханая. Усё расказвай, - нарэшце ціха вымавіў ён. – Усё, што было.

- Адзін раз, - працягнула яна, - яны прыйшлі ўтраіх. І я, я ня

памятаю, як гэта здарылася … я памятаю толькі, што той, адзін зь іх, я была зь ім, а Алекс узяў мяне ззаду, адначасова. Разумееш? Яна глядзела на яго. А трэці глядзеў. А потым я нічога ня памятаю, ізноў. Я закрываю вочы, і бачу цемру. І сябе. І іх. І гэта – усё. Паступова мне стала настолькі ўсё роўна, што я нават лічыла гэта нечым нармальным. Я ня думала пра гэта. Быццам бы ўсё гэта было асобна ад мяне. Яго каханьне да мяне станавілася ўсё больш і больш вычварным. Як у дэ Сада. Ён браў мяне рознымі спосабамі, ніколі – так, як звычайна. Пры гэтым ён прыніжаў мяне, казаў мне розныя благія рэчы. Што я – вычварная, шлёндра, што гэта я руйную яго, а не ён мяне, і ён жадаў усё больш і больш нечага такога, што было ўжо зусім па-за межамі дапушчальнага. Ён выкарыстоўваў мяне, як гумавую ляльку, і казаў, што гэта тое, што мне падабаецца, што мне патрэбна. Я сама вінаватая, што гэта адбывалася са мной. Яе плечы трэсьліся ў цемры.

Я папрасіла цябе зрабіць гэта, таксама. Ад мяне ідзе нейкае зло, - раптам прашаптала яна. – Чаму гэта робіцца са мною?

- Сонейка маё, ты не вінаватая. Ён абдымаў яе за плечы, прыціскаючы да сябе. – Я б ніколі не запытваў цябе, калі б ты сама не расказала, бо мінулае засталося ў мінулым. Але ж усё тое, што ты кажаш, гэта, насамрэч, жахліва. Я ня ведаю, як табе сказаць. У мяне няма словаў. Як я магу цябе суцешыць? Толькі тым, што я кахаю цябе? Ты гэта ведаеш. Сказаць, што мне не істотна, што рабілі з табою, я таксама не магу, але не з-за таго, што ты вінаватая, ці я буду кахаць цябе меней. Я буду кахаць цябе болей, хоць болей кахаць ужо не магчыма. Я проста буду ведаць. Ведаць, што з табой адбылося, любая. Што з табой рабілі. Я не забуду гэта. Ты не вінаватая. Як ты можаш быць вінаватая, калі твой уласны мужчына правакаваў і стварaў такія сітуацыі.

- Я баялася, што вы … я б зрабіла тое, што б ты сказаў. Усё. Яна ўзьняла на яго вочы. – Калі б ты сказаў мне быць зь ім пры табе, я б гэта зрабіла. Па твайму слову. Няма нічога, што б я не зрабіла для цябе. Калі б ты захацеў гэтага. Нават калі б ты аддаў мяне натоўпу, усё, што ты хочаш, я б зрабіла для цябе. Бо ты для мяне – таксама ўсё. Маё жыцьцё належыць табе, і маё

цела. Калі б ты палічыў годным аддаць мяне Фёдару, я б выканала тваю волю. Можа, па-гэтаму Алекс так паступаў са мной. Я на ўсё пагаджалася. На ўсё, што ён казаў мне рабіць. Толькі на крымінальныя справы я б не пагадзілася, і ён мне не загадваў. Але ж што датычылася сэкса, я не магла адмовіць яму ні ў чым.

- Я разумею, любая. Гэта называецца – давер. Калі ты кахаеш чалавека, ты давяраеш яму. І паступова ты пачынаеш жыць ім, яго думкамі. Яго жаданьнямі. З закаханым, бліскім табе чалавекам можна зрабіць шмат такіх рэчаў, якія ніколі не пагадзіцца рабіць нехта не такі бліскі. Чым дольш вы зь ім былі, тым больш ён злоўжываў тваім даверам да яго. І такім чынам руйнаваў і цябе, і сябе.

Ты давяраеш мне, і я ніколі не змагу выкарыстаць твой давер, і тваё каханьне. За тое, што адбылося паміж намі тады, прабач мяне, бо ж я таксама не ідэальны. Але ж я не падлец, каханая. Бог выпрабоўвае і карае нас, але ж чалавек ня мае на гэта права. Нават калі Бог і папускае спакушэньне і зло, чалавек волен пагаджацца на яго, ці не. І калі нехта саступае сваю волю злу, то адначасова нехта становіцца яго ахвярай. Ты была ахвярай, і ў тым, што з табой рабілі, было вялікае зло.

Такое вялікае, што я нават ня маю яму назвы. Я мог бы доўга казаць, у чым яно. Згвалтаваньне жанчыны, бо гэта быў гвалт, таму што цябе вымусілі рабіць гэта. Насамрэч ты гэтага не жадала. Ты жадала проста кахаць, і быць каханай і абароненай сваім каханым. А ён вырашыў, што найлепшы спосаб паступіць з табой – такі. Так ён адказаў на тваё каханьне, на твой давер. Аддаваў любімую жанчыну сябрам і знаёмым, дзяліўся ёй, як ня дзеляцца нават і рэччу, бо рэч берагуць і шануюць. Рэч для некаторых мае больш варты і інтымнасьці, чым чалавек. Насамрэч, гэта страшна, усё, што ты распавяла мне. Я б хацеў забіць яго, калі сустрэну яго ізноў, але ж ён гэтага ня варты. У жыцьці ён пройдзе праз усю тую боль, праз якую прайшла ты. І ўва сколькі разоў ён мацней за цябе, як мужчына, ён будзе несьці такую ж прыўмножаную адказнасьць. Проста ведай, што такое зло ня можа заставацца без пакараньня. Ён ужо нясе яго, а будзе нават горш.

- Я ня маю да яго нянавісьці, - ціха вымавіла яна. – Бо ж ён – жывы чалавек. Я была зь ім. Я рабіла гэта праз каханьне да яго. І жадала атрымаць каханьне ў адказ. Але ж я не атрымоўвала нічога. І паступова я стала разумець, што я грукаю ў зачыненыя дзьверы. Там, дзе нікога не было. Гэтыя межы дазволенага і недазволенага зусім размыліся, і я зразумела, што проста руйную сябе. І тады я кінула яго. А потым прыйшоў ты. Ты з'явіўся адразу, калі мы расталіся. Быццам бы нешта адпусьціла мяне. Быццам я вызвалілася. Каханы, скажы, табе хораша са мною? – прашаптала яна. – Ты прабач мяне, што я ўсё гэта табе распавяла. Я проста болей не магла маўчаць. Гэта ўсё жыло ў маёй душы, і паўставала паміж намі, як цемра, як ноч, як боль, які я болей не магла трываць. Кожны раз, калі я зачыняю вочы, я бачу гэта. Бачу іх. Вакол мяне цёмна, і яны маюць мяне, як хочуць. І мне ўсё роўна. Гэта жахліва, каханы. Яна ахапіла яго рукамі. Яе твар глядзеў на яго, нагадваючы твар вар'яткі. Ён узяў яго у рукі, і прыціснуўся сваімі вуснамі да яе вуснаў.

- Прабач мяне, каханая, - ціха вымавіў ён. – Прабач мяне за яго. Прабач мяне за ўсіх іх. Ён абняў яе, і яны ціха сядзелі ў цемры. Яго вялікія рукі ахіналі яе, гладзілі яе цела. Ён качаў яе на руках, як маленькую.

- Усё прайшло, любая, - ціха вымавіў ён. – Усё, што адбылося з табой, гэта сон. Страшны сон, у якім не было мяне. Але ж цяпер я – тут, з табою, каханая мая. Я нікому тябе не аддам.

- Праўда, не аддасі? – запытала яна яго.

- Праўда, любая. Нікому.

- Каханы, я зраблю ўсё, што ты захочаш, - ціха вымавіла яна. – Толькі ты. Толькі для цябе. Каб табе было хораша са мною.

- Мне хораша, любая, калі ты мяне проста кахаеш. Калі вось так прыціскаешся да мяне. Калі кладзеш галаву мне на плячо. Калі твае вусны цалуюць мяне. І калі ты прабачаеш мяне за ўсё, прабачаеш мне маю нядасканаласьць, маю ўласную ноч душы, маю цемру, якой у мяне дужа шмат. Толькі я хачу, каб ты ведала – паміж цемрай і подласьцю ёсьць розьніца. Я ніколі не

зраблю тое, што мы, мужчыны, называем подласьцю, нізкім, ня годным таго, каб звацца мужчынай. Катаваць слабую жанчыну, якая табе давярае, якая ня можа табе адказаць, губіць яе і насалоджвацца гэтым замест таго, каб абараняць і ўзьнімаць яе, наўмысна, гэта подласьць найвялікшая. Ёсьць мяжа ўсяму на гэтым сьвеце, і мы ўсе яе адчуваем. Той, хто яе пераходзіць, губляе права на павагу. Чорт, гэта як прапанаваць сябрам сваю родную маці. Яго рукі сьціснулі яе, абдымаючы. Такі чалавек, як сабака, можа разлічваць толькі на адзіную міласьць – лёгкую сьмерць. І тое я б яшчэ падумаў, ці павінна яна быць лёгкай. Я б яе такой лёгкай для яго не зрабіў.

- Ня помсьці яму, каханы. Ня трэба. Хай Бог вырашае, што і як зь ім адбудзецца. Я нікому не хачу жадаць злу, любы. Яна прыціснулася да яго, і ёй было так хораша зь ім, утульна, надзейна. І чамусьці ёй хацелася плакаць.

- Паплач, каханая. Ён пагладзіў яе па плячы. – А я пасяджу з табою. Яму самому хацелася заплакаць разам зь ёй, ад свайго бяссільля перад яе мінулым, перад тым, што зь ёй зрабілі, і што яшчэ зробяць не адзін раз з іншымі жанчынамі, якія становяцца нявіннай ахвярай злу, таго, што ідзе аднекуль з глыбіняў мужчынскасьці, з самага яе нутра, калі Бог перарабляецца ў Д’ябла, і ня ведаеш, як з гэтым быць, і як самому сабе дапамагчы.

- Прабач мяне, любая, за тое, што адбылося з табой. Я б жадаў, каб тваё жыцьцё было суцэльным сьвятлом і радасьцю, але ж калі я знайшоў цябе, зло ужо пакінула на табе свае раны.

- Прабач мяне, любы, за тое, што я не была дасканалай, што не дачакалася цябе. Што ня верыла ў цябе і нашае каханьне, і паверыла ў цемру і яе моц. Я ніколі больш цябе не пакіну, бо вочы мае бачаць, і могуць адрозьніваць цемру ад сьвятла.

- Любая мая, мы заўсёды застанемся разам. Грэх і зло – толькі покрыў, толькі ілюзія, памылка, якія згараюць у промнях майго каханьня да цябе. Ты хочаш быць чыстай, і ты станеш ёю. Ты ўжо чыстая, бо няма нічога нячыстага ўва мне, і той, хто кахае мяне, набывае маё сьвятло, а разам зь ім – і мір, і спакой, і чысьціню, якой няма параўнаньня ў сьвеце.

Глава 17: Абуджаньне

Раніца надышла позна, і пахмурая. Аблокі зацягнулі неба, сыпанулі дробным дажджом, падуў прахалодны вецер. Хмары цягнуліся чэргай караблёў з парванымі лахманамі ветразямі, між якімі раз-пораз бліскала вока сонца, міргала вейкамі-промнямі, і тут жа хавалася, і ізноў плакала сьлязамі дажджу, якія праглынала салёная вільгаць мора. Ён прачнуўся ад адчуваньня смагі, але ж галава не балела. Толькі крыху тахкала сэрца, быццам бы паветра стала малавата ў пакоі. Яна ціхенька ляжала побач, загарнуўшыся ў коўдру. Спала крэпка, бо было яшчэ рана - толькі а восьмай гадзіне. Яна праплакала амаль усю ноч, а ён суцяшаў яе, абдымаў, гладзіў па плячах, прытуліўшы да сваіх грудзей. Нават і калі яны ляглі, і ён ужо правальваўся ў сон, ён чуў яе нярвовыя ўздыхі на сваёй руцэ, якая ляжала ў яе пад галавой. Яны так і паснулі - яна, ахінутая ім, зь яго рукой замест падушкі, і ён, накрыўшы яе сабой.

Калі ён спусьціўся ўніз, Фёдар ужо ўзьняўся. Стаяў, хістаючыся, ля барнай стойкі на кухне, і спрабаваў адкрыць бутэльку мінералкі. Рукі яго так трэсьліся, што зьвярнуць галаву разьбяной пробцы было нялёгкай задачай.

- Дапамагчы табе?

Міхась працягнуў руку, узяў бутэльку, стаяўшую побач, і лёгка скруціў пробку. Наліў у стакан, і працягнуў Фёдару. Сам адпіў з горлышка – з асалодай. Ледзяная вада напаўняла цела жыцьцём, і раніца здавалася ўжо зусім не такой пахмурай.

- Як ты? – запытаў ён, пакуль Фёдар стукаў зубамі па краі запацелага бакалу для віскі. Ваду ён амаль не крануў – так, змачыў вусны.

- Мишаня, голова болит. Херово мне. Фёдар прастагнаў гэта скрозь зубы, адначасова ўліваючы ў сябе жывіцельную вадкасьць. Вакол запахла каньячным сьпіртам – пахам, ад якога Міхася раптам скруціла.

- А чаго піў, як не ў сябе? Канешне, цяпер баліць. І будзе балець яшчэ дні тры. Завязвай давай. Хопіць табе ўжо … лактаць. Ён дапіў сваю Perrier, і кінуў бутэльку ў вядро.

- Не могу я, Мишаня. Душа горит. Я ж тебе всё вчера рассказал, что и почему. Да не понять тебе это. Вы – другие. Вот ты можешь остановиться, а я – нет. Я пока подыхать не начну, пить буду. Потому что мне нужно это ощутить – вот ты почти мёртвый, а потом раз – и живой. И снова солнышко светит! – Фёдар блажэнна ўсьміхнуўся, гледзячы ў вакно, праз якое ў пакой прабіваўся з-за хмараў кволы прамень.

- Можа, табе яшчэ раз прылажыць, каб ты памёр, і ізноў ажыў? Як учора? Міхась зацікаўлена глядзеў на яго. – Можа, табе мала было?

- Нет, Мишаня. Этим душу не обманешь. Ты, конечно, маханул мне хорошо. Я и правда отключился. Молодец, за это – уважаю. Респект, как говорят, и уважуха. Фёдар працягнуў Міхасю далонь. Той глянуў на яго, потым пацісну́ў.

- А што тваёй душы трэба? – зацікаўлена вымавіў ён. – Акрамя бухла?

- Простор моей душе трэба, Мишаня. Вот ты меня опять не поймёшь. Не понимаешь. Вот как, по-вашему, будет – простор?

- Воля, - Міхась пацісну́ў плячыма.

- Вот, видишь, у вас даже слова такого нет – простооор! Каб прадэманстраваць, што такое прастор, Фёдар разьвёў рукамі.

- Бедный ваш язык. А русский – самый богатый язык в мире. Слышал такое?

- Насамрэч, слова такое ёсьць, падобнае. Прастора – “пространство” па-руску. Толькі гэта не зусім тое.

- Мишаня, простор – это не пространство, это чтобы душе было куда лететь! Вот выхожу я на балкон своей дачи – на пятый её этаж, руки развожу, и обнимаю её – Русь-матушку. И лечу, лечу, Мишаня. Понимаешь? Лечу – вы-со-ко! Далеко лечу. В

просторе.

- Дзякуй Богу, што ня ўніз. А то я ўжо за цябе спалохаўся. Думаў, ты мне зараз распавеш, як ты зь пятага паверху грымнуўся. Карацей, прастора ў вас ёсьць, а волі няма. Зразумеў я ўсё. Кожнаму сваё, Фёдар. Каму – прастор, а каму – воля. Што мне тыя твае прасторы бяз волі. Толькі ланцуг доўгі. Ад Масквы да Курылаў.

- Нет, Мишаня, ты не прав. Я дома на свободе. Гуляю, где хочу, как хочу. Это тут мне тесно. В плечах давит. Понимаешь?

- Да разумею я. Няма дзе табе тут разьвярнуцца. Міхась хлопнуў яго па плячы рукой. – Шкада цябе, але ж што зробіш. У цябе пляны якія, акрамя п’янства?

- Да никаких у меня планов, Мишаня, нет. Вот приду в себя…

- Праз тыдзень, - удакладніў Міхась.

- Нет, неделя это много. У меня ещё дела. Нужно в Рим слетать. Там тёрки. Слушай, со мной не хочешь?

- А што мне там рабіць? – Міхась паціснуў плячыма. – На цёркі твае ты мяне н запрашаеш, ды я і сам туды не пайду.

- Тебе это ни к чему. Там ребята серьёзные. Фёдар раптам стаў пахмурым. Наліў сабе яшчэ стакан, марудна выпіў маленькімі глыткамі, смакуючы.

- Только ты со мной все же слетай, - працягнуў ён. – Как-то мне при тебе спокойнее, что ли.

- Ну, калі спакайней, то зьлятаем. Ці ты думаеш, я дзяўчыну адну тут пакіну?

- Ладно, это потом обсудим. Фёдар выглядаў ужо зусім зухавата. – Слушай, а может, погулять съездим? – прапанаваў ён. – Вдоль моря променад.

- Можна і ўздоўж мора, можна і ў горы. Я піць ня буду, буду за рулём. Што дома сядзець? А потым я папрацаваць хачу.

- Наработаешься ты ещё. Фёдар хлопнуў яго па плячы. – Куда тебе спешить?

- Я ў фільме здымаюся. Мы здымаемся, - паправіўся Міхась. – Хачу дапрацаваць тое-сёе. Дапісаць сцэнар. Я яшчэ і кнігу пішу паралельна. Нешта зь яе ў фільм увойдзе, нешта не. У мае дамовіліся працягнуць здымкі.

- Ого! А что за фильм? Как это тебя угораздило? Вас.

Фёдар зацікаўлена глядзеў на яго.

- Да ня ведаю сам. Стаялі ў Саборы Сьвятога Пятра ў Рыме, разглядалі мазаіку. Раптам падыйшоў чалавек, кажа – рэжысёр. Нейкі ён там здымае нефарматны фільм, і хоча нас запрасіць разам.

- Неформатный? Фёдар шырока ўсьміхнуўся. – Это типа для взрослых? Слушай, а я бы посмотрел. И где твоя татарочка, кстати? Спит ещё?

- Сьпіць. Учора позна паснула. А фільм не такі, як ты падумаў. Па евангельскіх падзеях. Пра Хрыста фільм.

- Да ты что! И кого ты там играешь? Дай, угадаю. Сатану, что ли? Фёдар нават спыніў наліваць трэці стакан. Рукі яго ўжо ня трэсьліся, і справа ішла гладка.

- Не здагадаўся. Я там – галоўны персанаж. І яна – таксама.

- Слушай, ты меня так не пугай. Ты что – Бог? Фёдар вылупіў на яго вочы. – А она – кто? Мария?

- Накшталт таго. Ён уклоньчыва пацінуў плячыма. – Калі будзе гатова, я цябе першага запрашу.

Раптам Фёдар адставіў стакан, і ўрачыста ўзьняў руку да ілбу.

- Господи, помилуй, - вымавіў ён нізка, басам. – Отпусти мне грехи мои, отче. Ибо грешен! Пьян, собака. И пью, как свинья, опять с утра. Благослови!

З гэтымі словамі Фёдар ляснуўся перад ім на калені.

- На што цябе блаславіць? На запой? Уставай, блюзьнер. Ён узьняў яго за каршэнь. Уся гэтая камедыя яму ўжо пачала надакучваць.

- Слухай, я пайду ў душ. І табе ў душ трэба таксама. Прыбрацца. У цябе апрануць хоць што ёсьць? Давай, дам што.

- Подожди, Мишаня. Я тут посижу, пусть коньяк усвоится. Хорошо мне, не хочу кайф ломать.

Фёдар прайшоў у хол, сеў на канапу, адкінуўся на высокую сьпінку, і блажэнна закаціў вочы.

- Ну, як жадаеш. Ён павярнуўся, і пайшоў убок, туды, дзе месьцілася душавая і невялічкі басейн. Яму дык так, лягушатнік, а яна часта плавала, любіла ваду.

Як раз у гэты момант уніз па лесьвіцы пачуліся лёгкія крокі. Ён спыніўся. Яна спускалася да яго, апранутая прыстойна, ва ўчорашні касьцюм і белыя дамашнія скураныя туфелькі-балеткі. Яе валасы былі высока ўзьнятыя і закручаныя ў тугі вузел, толькі пасмачка ля скроні вілася – маленькі, танюткі завіток. На яе сьвежым тварыку зусім не было касьметыкі, толькі туш на вейках, і ружовы бляск на вуснах.

- Добрай раніцы, сонейка, - вымавіў ён, цалуючы яе.

- Добрай раніцы, каханы. Яна адказала яму мяккім пацалункам. Ад яе пахла нечым сьвежым, як пялёсткі, і мора. Сакавіты, духмяны пах.

- Як спалося? – запытаў ён.

- Добра, дзякуй. Ты ведаеш, я нават выспалася.

- Малайчына. Ён абняў яе. – Я пайду ў душ. А ты куды накіроўваешся?

- Сьняданак рабіць. Яна махнула рукой у бок кухні.

- А ён дзе? Так на канапе і спаў? – запытала яна заклапочана.

- Ды што яму зробіцца. Так і спаў. Устаў, каньяка выпіў, і ізноў на канапу. Можа, і ізноў паснуў.

- Хоць бы, - падумала яна пра сябе. Ён накіраваўся ў душ, а яна прайшла ў кухню. Фёдар на канапе ня спаў, сядзеў, і глядзеў у паталок. Аб нечым задумаўся. Убачыўшы яе, ажывіўся.

- О, привет, татарочка! Доброе утро! Как спалося? Ён зь цікаўнасьцю глядзеў на яе. У мяккім белым касьцюмчыку і з акуратна закручанымі валасамі яна выглядала яшчэ больш прывабнай. Яе так і хацелася ўзяць на рукі, і паціскаць, як кацяня. Раптам у яго нечакана ўзьняўся.

- Вот ты чёрт, - падумаў ён. – Опять. Опять напугается.

Нарэшце, здагадаўся – злажыў нагу на нагу.

Яна спынілася, акінула яго позіркам, і, здаецца, нічога не заўважыла.

- Добрай раніцы, - вымавіла. Мякка, з вусьмешкай.

- Не злится, - здагадаўся ён. Раптам яму палягчэла. Усё ж, паводзіў ён сябе ўчора ня тое каб галантна. Можна сказаць, что і па-хамску.

- Она не такая, - вырашыў ён. – С ней по-другому нужно. Толькі як, і зачым, яму ў галаву яшчэ не прыйшло.

- Добра спалося. Дзякуй. А вам?

- Мне? Отвратительно. На диване, да ещё и один. Шучу, шучу. Прекрасно спалось, хозяюшка. А теперь вот совсем хорошо. Ён узьняў бакал.

- Будешь?

- Не, дзякуй. Што вы. Вы што жадаеце на заўтрак? Яечню, пасту, ці, можа, сэндвічы? Ці ўсё адразу?

- Что приготовишь, красавица, то и буду. Мне и так уже хорошо. А посмотрю на тебя – ещё лучше. Ён шырока ўсьміхнуўся.

Яна зьбянтэжылася – відавочна. Раптам яе шчокі пачырванелі. Яму падабалася як яна выглядае, як рухаецца. І яе завіткі чорных валасоў на шыі – іх так хацелася крануць, і яе тонкая постаць і маленькія грудзі пад тонкай тканінай блюзкі. Яна не апранула бялізну – ізноў.

- Забыла, или специально? - запытаў ён сябе.

- Наверное, специально, - вырашыў. Яму хацелася так думаць. Хацелася ўяўляць, як яна выходзіць з душа, як выціраецца вялікім рушнікам, апранае вузкія белыя майткі, якія ён разгледзеў праз тканіну, затым вольныя штаны з завязкай-бантам на таліі, і, не апраная станіку, надзявае праз галаву шырокую кароткую блюзку з адкрытымі плячыма. Раптам яго кінула ў жар. Такіх маладых у яго яшчэ не было, падумалася яму. Неяк гэта было няёмка. Яна зусім не нагадвала дарослую жанчыну – ні фігурай, ні тварам. Не было ў яе ні грудзей, ні шырокіх сьцёгнаў, ні вуснаў, нібыта пчолы пакусалі. Нейкі піянерлягер, прыйшло яму раптам на вум. Быццам бы ён апынуўся летам на паляне, пад хвоямі. Паліла сонца, і дзяўчаты ў кароткіх сукенках гулялі ў тэніс – кідалі мяч праз сетку. А адна зь іх раптам села побач зь ім, і стала завязваць шнурок, нізка нахіліўшыся. Ён адчуў яе тонкі пах поту, убачыў яе ледзь намечаныя грудзі ў глыбокім выразе блюзкі, калі яна нагіналася. Ён хацеў пасунуцца, і нібыта анямеў. Ня мог варухнуцца. Відзеньне было такім яркім, што ён на імгненьне трапіў туды – у мінулае. Вынырнуў зь яго, як з вады на паверхню. Яна нахінулася, і паставіла на стол талерку – паста карбанарэ, яечня, салата, мінералка, і кава. Ад усяго смачна пахла. На нейкую долю хвіліны яму здалося, што ён убачыў тое, што толькі што бачыў у кароткім сьне. Але ж яно мільганула, і зьнікла. Яму захацелася, каб яна села яму на рукі. Хоць на хвіліну. Болей ня трэба. Яму б хапіла.

- Слушай, ты такая маленькая. Как фея. И появляешься так же неслышно, и уходишь. Посиди со мной, а то мне скучно. Ён пасунуўся. Яна села на канапу – на адлегласьці ў паўметра, ці

ня болей.

- Ты меня боишься? – запытаў ён. – Не нужно меня бояться. Я тебя не обижу. Это я вчера такой дурной был. На самом деле я – другой.

- Не, што вы. Я вас зусім не баюся. І вы наогул не дурны, у вас жа пасада, адказнасьць. Пэўна, гэта складана – працаваць у заканадаўчым органе? – запытала яна.

- Ничего сложного. Пришел, отоспал своё, и пошёл. А я вообще в офисе работать люблю. С бумагами.

Ён успомніў свой апошні працоўны дзень – зь месяц таму, і яму стала сорамна. Тады ішоў прыём па асабістых пытаньнях, яго ўпэўнілі, што так трэба, ён павінен прысутнічаць, сустрэцца з народам – выбаршчыкамі. І пацягнуліся нейкія бабкі, дзяды, і розны нязразумелы люд – галеча, алкашня з перакошанымі тварамі, шматдзетныя, нейкія касыя і крывыя, і ўсе нешта ад яго хацелі. Ён нічога не разумеў з таго, што яны просяць. Нейкія абвальваючыяся дамы, разьбітыя двары, ацяпленьне ў дзіцячым садку – пячное, нешта для шпіталю, нейкія ці то вуткі, ці то гусі, нейкая школа, якую зачыняюць, а ня трэба, чаму, ён ня ўцяміў. Калі яна не рэнтабельная, то чаму яе не зачыніць? Усё павінна акупацца. Да таго ж, галава ў яго балела моцна, як цяпер. Пры адным успаміне ён паморшчыўся, быццам бы боль узмацніўся ўдвая.

- Ой, тяжело работать. Ужасно. У людей столько проблем, пока все решишь. Ён паспрабаваў пакачаць галавой, ды здолеў толькі павярнуць яе ў бок, да яе, і так і застыў – з роспаччу і пакутай у вачах. Яна з жалем глянула на яго.

- Вам так цяжка! – нарэшце вымавіла. Ён не зразумеў, да чаго датычыцца тое “цяжка”, і таму прымяніў яго да ўсяго адразу, і, найперш, да свайго цяперашняга стану.

- Тяжело, это правда. Но я держусь. Мы все держимся, красавица. Так и живем – поддерживаем друг друга. Без этого – никак. У нас все – как один, и все один за одного.

Ён нёс нейкую лухту, толькі б яна пасядзела зь ім падолей.

- Слушай, ты сядь ближе, а то говорить не удобно. У меня голова болит, я громко не могу, и слышу плохо.

Яна крыху пасунулася да яго – сантыметраў на дзесяць. Ён пасунуўся да яе сам.

- Тебе как Италия? – запытаў.

- Вельмі прыгожая краіна! Як у казцы! Яна ажывілася.

- А что тебе понравилось больше всего?

Ён думаў, яна зараз вымавіць – шопінг, але ж яна нечакана адказала:

- Ватыкан!

Ад нечаканасьці ён ледзь не зваліўся з канапы.

– Ты что, в монашки собралась? – хацелася запытаць яму. Зь яго знаёмых слова «Ватыкан» ня тое што ня ведалі – ня вымавілі б. Айгуль бы вырашыла, што гэта нешта па-узьбекску. Накшталт мантоў. Назва чэбурэчнай.

- А что там тебе понравилось? Поконкретнее расскажи. Яму і сапраўды стала цікава.

- Панравіўся Сабор Сьвятога Пятра – вялікі, прыгожы. І там шмат такіх скульптураў, як жывыя. І фрэскі зь вядомых малюнкаў – Рафаэля. І іньшых. Там дзіўна, нібы ў раі. Быццам бы на нябёсах! Нібыта гэтыя выявы – насамрэчныя, і вакол цябе і сапраўды знаходзяцца анёлы і сьвятыя. І столь такая высокая, проста жах. Адчуваеш сябе пяшчынкай у бясконцасьці. Нібыта ляціш – да яго. Яна замаўчала. Ён таксама замаўчаў. Юная манашка, можна ўявіць, што і нявінная, сядзіць зь ім побач амаль распранутая, ізноў. І разважае аб нябёсах тоненькім сур’ёзным галаском. Яго фантазія пачала разгортваць яркія буйныя карціны, такія, што раптам стала сьпякотна.

- Слушай, а он сказал, вы в кино снимаетесь. Ты кого там

играешь? – ён вырашыў зьмяніць тэму размовы.

- Я выконваю роль блудніцы, якую Шымон Воўхв выратоўвае з рабства, і потым ён са мной прапаведвае слова Божае. Гэта гістарычнае кіно, пра Іўдэю і час станаўленьня хрысьціянства як рэлігіі Новага Запавету. Там многа цікавага, і прыгожых сцэнаў. Паола проста мастак. Ён нібыта малюе камерай, а не здымае. У мяне нават ёсьць фота ў тэлефоне. Хочаце, я вам пакажу?

- Пакажы, - зацікавіўся ён. Яна ўстала, і ўзяла з падстаўкі апарат. Адкрыла галерэю. На яго з экрану глядзела неверагоднай прыгажосьці жанчына ў белым хітоне, з уложнымі кольцамі валасамі. І потым яшчэ адна – у простым чорным покрыве і тонкай хламідзе. На гэтых фота яна выглядала так, быццам бы нарадзілася і жыла ўсё жыцьцё недзе на Ўсходзе, у старажытных пясках, пад палячым сонцам, ад якога старанна ахоўвала сваю белую скуру. На гэтых фота яна была яшчэ больш вабячай, спакусьлівай, грэшнай і недасяжна высокай, як Мадонна на старых палотнах.

- Слушай, ну и бабу он себе нашёл! – падумаў ён. – И где такие водятся? Отпереть бы её. Как бы это придумать? А, все бабы деньги любят. Попробую подкатить – может и получится. А не получится, может ещё что получится.

Гэтая ідэя прочна, як цвік, засела ў яго галаву. А калі ён нешта жадае, то адмаўляцца не прывык.

- Только этот же дурной, как дьявол. Сумасшедший. И её не оставляет ни на минуту просто. Стережёт, как цепной пёс. Хоть бы он забухал, что ли. Заснул.

Але ж тут узьнікала незадача. Бо ва ўсялякім выпадку паснуў бы хутчэй ён. Гэты ж яшчэ і ня п’е. Амаль ня п’е. Бутэльку за вечар – ці гэта пітво. Ён працягнуў руку, і крануў блюзку на яе грудзях. Яна зьдзіўлена глянула на яго.

- Мошка, - патлумачыў ён. – Показалось. Яна устала, і стала заклапочана складаць на паднос посуд.

- Я зраблю яшчэ кавы, - вымавіла. У душы перастала цячы вада,

і хлопнулі дзьверы. Збоч ад басейну раздаліся крокі.

Глава 18: Душа

Ён выйшаў з душу ў рушніку на сьцёгнах, устрахваючы мокрымі пасмамі. На яго скуры блішчэлі маленькія кропелькі вады, перакатваліся, сьцякалі з валасоў па плячах, падкрэсьліваючы рэльеф яго цяглаў, яго шырокіх грудзей, пакрытых цёмным воласам.

- Сонейка, прынясі мне які халат, калі ласка, - крыкнуў ён ёй. З боку кухні даносіўся гук кава-машыны, хол ужо напоўніў цудоўны водар, які плыў густымі хвалямі прама да яго, мінуючы Фёдара, які так і сядзеў на канапе, адкінуўшыся галавой на сьпінку.

Ён падыйшоў, і сеў зь ім побач, шырока расставіўшы ногі, таксама адкінуўшыся на сьпінку, па гладкай скуры якой адразу пабеглі кроплі. “Ролекс” на яго шырокай руцэ пабліскваў ад вады, кропелькі на шкле і метале корпусу пераўтвараліся ў дыяманты, якія абляталі, калі ён варушыў рукой.

- Ну, як ты? – павярнуўся ён да Фёдара, які ляжаў на сьпінке, прыкрыўшы вочы.

Той ад нечаканасьці ўздрыгнуў, руханўўся, і павярнуўся да яго.

- А? Что? Ой, Мишаня, прости … задремал. Не заметил тебя. Как-то ты незаметно подкрался, тихо, как кот.

- Ды я тут ужо хвілін з дзесяць сяджу, ці ня болей.

- Сонейка, халат мой дзе? – крыкнуў ён у бок кухні. Яна выйшла з дзьвума чашкамі кавы, паставіла адну перад ім, другую перад Фёдарам. Ён злавіў яе за руку.

- Хадзі сюды!

Прыцягнуў да сябе, трымаючы праміж сьцёгнаў, і абняў, прыціскаючы да мокрага цела.

- Не нясеш халат, цяпер будзеш мокрая, - пагрозна вымавіў ён, цалуючы яе. Яна засьмяялася, і паспрабавала выкруціцца, але ж не атрымалася. Яе блюзка пакрылася мокрымі плямамі, прыліпла да грудзей, абазначыўшы маленькія кропелькі саскоў, і Фёдар між волі зглытнуў сьліну. Яе грудзі былі, на яго густ малаватымі, дык можна і паболей, але ж мелі прыгожую круглую форму – два паўчашшы, з крыху ўзьнятымі уверх саскамі, якія праступалі з-пад мокрай тканіны.

- Я хацела зараз, каханы. Толькі падумала, што найперш прынясу вам кофе. Яе голас прагучэў крыху разгублена, нібы апраўдваючыся, але ж міла і неяк па-дзіцячаму.

- Хацела зараз? Гэта цікава. Ён, усьміхаючыся глядзеў на яе. Потым нахінуўся, і крануў губамі яе сасок пад тканінай.

- Як гэта – хацела зараз? Нічога, схадзі цяпер. Толькі хуценька, бо я ўжо замёрз. У холе і сапраўды было неяк прахалодна. Можа, з-за адчыненага шырокага вакну, за якім адкрываўся краявід на горы. Віла знаходзілася на адлегласьці паміж прадгор'ем і морам, і адтуль і адсюль да яе было можа нейкіх хвілін трыццаць язды. Апуанскія Альпы беглі ўздоўж берагу і далей сыходзілі на сярэдзіну паўвострава, дзелячы краіну на паловы.

Яны ж былі вышэй, у паўночнай частцы, Фларэнцыя была крыху далей на поўдзень і ўсход, да іх жа бліжэй была Піза. З вакна вілы можна было бачыць горныя храбціны, якія здаваліся зусім блізкімі, і, калі зьліваліся з хмарамі, то засьцілалі неба нібыта адной пагрознай сьцяной. Але ж цяпер яны адкрыліся, і сонца ласкава асьвятляля зелянеючыя сьхілы. Было сьвяжо, хоць і дзень абяцаў быць сонечным. Паўночны вецер разагнаў хмары, аднак і цяпло здуў далей, некуды ў Сіцылію. Січылью, як казалі мясцовыя, як яны ўжо разам прывыклі.

Ён адпусьціў яе, і яна хуткім крокам наківаралася наверх, крыху падскокваючы на хаду. Здавалася, зараз узьляціць, і, не краная ступенек, узмые, як маленькі жаночы прывід, апрануты ў белае.

- О, послушная! – вымавіў Фёдар задаволена-зьдзіўлена.

- Ни слова не сказала. Моя б уже подняла ор. Чего я её заставляю, чего сам не пошёл. Ён зморшчыўся, нібыта ўкусіўшы лімон – так балела галава.

- Мая ня будзе. Яна наогул голас не ўзьнімае. Ніколі ня чуў. Плакаць можа, а крычаць – не. Ён паціснуў плячыма.

- Ой, Мишаня, повезло тебе. Пусть баба лучше плачет, чем орёт. Моя как заорёт, просто уши вянут. Визг, как у поросёнка. И на горничную орёт, на филиппинку, будто та что-то понимает, и на водилу, и на охранников. Те мне жалуются. А я на неё ору. Когда не помогает, втащить могу. По уху, не сильно. Один раз по губам попал – увернулась. Зуб выбил. Потом вставлял. Она заодно захотела всё поменять на виниры. В штук десять косарей мне этот зуб обошёлся, будь он не ладен. Нельзя баб бить, Мишаня. Себе дороже. Ты свою не бьёшь? Не видно, чтоб бил.

Ён павярнуўся да яго.

- Ты што, звар'цяеў? Міхась зьдзіўлена глянуў на яго. – Каго тут біць? І з якога ражну?

- Вот я и говорю – твою не нужно, она послушная. Ну, если только по попе – я б такую отшлёпал. Фёдар летуценна ўсьміхнуўся.

- Я цябе зараз адшлёпаю. Слухай, харош табе лухту нясьці. У цябе болей тэмаў няма для размовы? Раскажы лепей, як у вас там справы. Што новага?

- Да что нового, Мишаня? Кроме того, что я сказал, все по-старому. А это, надеюсь, так и останется в разряде вероятных новостей. Вероятностных.

- Гэта ў сэньнсе – згенерываных выпадковых сьцячэньнем падзей, а не жорстка дэтэрмінаваных? Міхась павярнуўся да яго.

- Ну, типа того. Вероятный – это то, что произойдёт с высокой вероятностью. А вероятностный – баба надвое сказала. Бабка, -

выправіўся ён.

Міхась кіўнуў.

- У Жэневе яшчэ будзе сустрэча. Што там яны вызначаць, хто яго ведае. А ты да чаго гатуешся?

- Я? До всего, Мишаня. До всего. Ой, не знаю. И думать не хочется. А вдруг – втащат они нам? Или – мы им? Что хуже, не известно.

- Сначала – вы им, а потом – они вам. А потом – только Бог его знает, что будет. Міхась паціснуў плячыма, якія ўжо пачалі падсыхаць, і паднёс кубак да вуснаў. Фёдар выліў рэшткі каньяку з бутэлькі ў каву, і таксама жадна адпіў.

- Хоть губы смочить, - вымавіў ён.

- Ты ж ужо колькі разоў іх змачваў. Міхась усьміхнуўся.

- Да нет памяти, Мишаня. Водка отшибла проклятая. Или я водку не пил? – раптам запытаў ён.

- Не, ня піў. Ты піў віскі і каньяк. Можа зь літр віскі, і ўжо бутэльку каньяку засадзіў. І ўчора бутэльку.

- Ну, это нормально. Я ж не сразу – за вечер. Фёдар зьняў піньжак, кінуў яго на ручку канапы. Яму стала сьпякотна, ня гледзячы на адчыненае вакно.

- Слушай, ты ж – Бог. Как ты думаеш, будет война? – нечакана запытаў ён.

- Думаю, што гэта магчыма. З высокай верагоднасьцю. Хоць, насамрэч, яна ўжо ідзе. Ці ты ня бачыш? Ужо амаль трыццаць год. Калі першая чэчэнская пачалася?

- У 1994 - афіцыйна, - падумаўшы, адказаў Фёдар. Мне двадцать лет было. Всё боялся, призовут на хрен. Опять. До сих пор помню тот страх. Я только-только отслужил тогда.

- А я наогул не служыў. Камісію не прайшоў, па сэрцу. У мяне

праблемы былі з-за росту. Я рос хутка.

- Ну и не хрен там делать. Я что служил, что нет – один хер. Только часть мели и маршировали по плацу. Постреляли несколько раз. В целом нормально было. К девкам бегали. И они к нам. Фёдар блажэнна ўсьміхнуўся – нешта прыпомніў.

- Лазили они к нам через забор. Горячие бабы. Им скучно было, и они нас … веселили. А мы – их.

- Мне дзевак хапала і без такіх складанасьцей. Ды я і ня дужа па дзеўкам быў. Больш вучыўся. Міхась таксама задумаўся. Маладосьць – яна такая, заўсёды выклікае ўспаміны, чаго не крані. І наогул, жыцьцё – штука дзіўная. Пакуль жывеш – быццам бы на месцы стаіш, і нічога не адбываецца, але ж потым усё набывае асаблівы сэнс.

- А тяжело на скульптора учиться было? – запытаў Фёдар.

- Ды не. Міхась пацісьнуў плячыма. – Цікава. Для мяне дык наогул гэта было нечым іньшым, большым, чым вучоба. Быццам бы толькі жыцьцё пачалося – насамрэчнае. Я ўсё яе ляпіў, выразаў. Нават з бронзы адліў – як грэкі. Скульптуры грэцкія былі ня толькі з камяню, але ж і з бронзы. Дужа папулярны быў матэрыял. Прасьцей было іх рабіць, чым высякаць. Больш пластычныя, больш магчымасьцяў для ўяўленьня.

- А ты её уже тогда знал? – зьдзівіўся Фёдар.

- Я яе заўсёды ведаў, - вымавіў ён. Яго вочы глядзелі некуды – у мінулае, нібыта ў сваю душу, знаходзячы там нешта каштоўнае, што адкрываць яму не хацелася.

- Как это? Фёдар яго не зразумеў.

- Так. Заўсёды ведаў яе, і бачыў, што яна мая. Дзяўчынка з чорнымі валасамі. Гэта было такое ўнутраннае бачаньне. Яна заўсёды перад вачыма была. Як мара. Кніжку чытаю – яна ў ёй. На малюнак гляжу, і бачу яе твар – дасканалы, такі, як у жыцьці не бывае. А потым, калі яе сустрэў, пазнаў адразу. За жыцьцё я яе добра вывучыў. Ён не сказаў яму, што бачыў яе ня толькі ў

думках, але ж і на яве, так дакладна, быццам бы яна была жывая. Яго мары станавіліся нечым накшталт галюцынацый, нібы сьненьняў сярод яснага дню. А начныя сны станавіліся сапраўднымі вандроўкамі ў мінулае.

- Хто ты? – запытваў ён яе, і яна адказвала яму нешта, але ж вусны яе рухаліся бязгучна. Калі яна казала, ён бачыў і чуў яе, быццам праз ваду. Але ён мог адчуваць яе. Нібыта стук яе сэрца гучэў ў яго грудзях, быццам яна прытулілася да іх, і ўвайшла ў яго, зьліўшыся зь ім у адзінае.

- Слушай, ну это прикольно. Правда. Типа ты её придумал, и она воплотилась? – раптам запытаў Фёдар.

- Накшталт. Я яе зваяў з плоці свайго цела, выліў з гарачыні майго сэрца. І ажывіў сваёй крывёю. Такая вось магія. Ён ціха усьміхнуўся.

- А ты её любишь. Фёдар сказаў гэта зь нейкай зайздрасьцю, ня кпліва, а крыху сумна.

- Люблю, - пагадзіўся ён. – Дужа. Болей за жыцьцё.

- Слушай, а сколько ей лет? – запытаў Фёдар.

- Дваццаць будзе. Восеньню.

Фёдар прысьвіснуў.

- Я думал, ей ещё и меньше. Она лет на восемнадцать выглядит. Школьница.

- Худзенькая, - пагадзіўся ён. – Есьці не заставіць. І ўсё баіцца паправіцца.

- А грудь ты ей сделать не хочешь? – гэта сарвалася з вуснаў Фёдара неяк само-сабой, ён нават і не жадаў.

- Навошта? – зьдзівіўся ён. – Зачым мне псаваць боскае стварэньне? Яна ж дасканалая. Ты што, ня бачыш?

- Ну, не знаю. Бабы все что-то хотят переделать. Чтобы

улучшить свою природную красоту. У кого она, конечно, есть. У твоей есть, - упэўніў ён яго.

- А мая баба страшная была. Пока я ей не оплатил пластику. Ну, как страшная. Обычная. Никакая. Ну, я мог себе позволить, вот и оплатил.

- Ты про Айгуль, что ли? – Міхась не зразумеў, якая-такая баба.

- Ну да. Она страшная была. Узкоглазая. Скулы эти. А так тело нормальное. Только я ей сиськи добавил. Были второго, стали пятого. Люблю такие, как мячики. Чтобы прыгали. Бень-бень.

- Можа, табе ў якую секцыю было б лепш запісацца? Калі ты зь мячом гуляць любіш? Баськетбол ці валейбол. Баськетбол як раз за пяты, а валейбол за трэці сыйдзе.

Фёдар глянуў на яго, і раптам зарагатаў.

- Приколист ты, Мишаня. Согласен. Сделал ей эти дойки, а теперь вот обычных хочется. И даже как у твоей. Чтобы рукой накрыть можно было. Блин, как представлю, ты только не обижайся. Слушай, у тебя ж рука – больше, чем у неё вся грудь. Две груди. И хер у тебя, я извиняюсь. Тоже.

Фёдара ўжо пачало развазіць.

- Слухай, што ты вярзеш. Ён паморшчыўся. - Федзя, ты зусім мозг адпіў, - дадаў у думках. Але ж стрымаўся.

- Нет, ну мне интересно. У меня вот тоже … не маленький. Хочешь, покажу? – раптам вымавіў ён, і нечакана палез у штаны.

Міхась не пасьпеў яму нічога аказаць, як за іх сьпінамі пачуліся крокі. Яна падышла з халатам. Пераапранулася ў сухое – тонкая паласатая маечка накшталт матроскі, і такія ж кароткія шорты, як юбачка. Пышная.

- Дзякуй, каханая. Я ўжо і так абсох. Ён сказаў гэта, таўкануўшы ў бок рукой Фёдара – балюча, які ўжо пасьпеў разшпіліць і амаль вызваліць сваё багацьце.

Устаў з канапы, і падышоў да яе, закрываючы Фёдара сьпіною.

- Пэўна, з паўгадзіны прайшло. Дзе ты, золатка, ходзіш?

- Я пераапраналася, бо ты мяне намачыў. А касьцюм прыйшлося адпрасаваць. А потым маці пазваніла, і пакуль я знайшла халат, тожа час прайшоў. Ты іх звычайна ня носіш. Яны ляжалі ў рушніках, ня бачныя. Я ўсё дастала. Потым склала.

- Гора маё. Шчасьце. Ён абняў яе.

- Трэба цябе адшлёпаць, як Фёдар мне ўжо раіў.

- Чаму? – спугалася яна.

- Не чаму, а навошта. Дзеля прафілактыкі правапарушэньняў. І каб бегала хутчэй па зямлі. А тое ты плывеш, як мара. І ветрам цябе зносіць. Хадзі сюды.

Ён ськінуў рушнік на сьпінку канапы, і ўзяў працягнуты ёй халат.

- Мишаня! – пачуўся голас ззаду.

- Што табе? – павярнуўся ён да яго.

- Ого! – вымавіў Фёдар замест адказу.

- Што – ого?

- То. Нет, а давай сравним! Померяемся.

- Чем? – ён ужо пачаў адчуваць шалёнства.

- Тем. Фёдар сунуў руку ў штаны, і Летыцыя, войкнуўшы, схавалася за сьпіну Міхася. Ён марудна апрануў халат, завязаў пояс, і працягнуў руку, каб узяць Фёдара за каўнер, і добра трахануць, але ж той пасьпеў увярнуцца.

- Да шучу я, шучу. Ты что, думаеш, я правда при бабе член достать собрался. Не такой я уже и пьяный. Нет, ну вы шуток не понимаете, - пакрыўджана вымавіў ён, разводзячы рукамі.

Разшпіленыя штаны ледзь утрымаліся ў яго на сьцёгнах, і ён падхапіў іх, і зафіксаваў рэмнем.

- Мы в детстве так мерились. Коробком. У кого больше, тому – щелбан. Я всегда получал, - горда вымавіў ён.

- І часта тое было? – запытаў Міхась.

- Ой, часто. Всегда выигрывал.

- Цяжкое ў цябе было дзяцінства, - вымавіў Міхась спачувальна.

- Ты ў душ пойдзеш? Я табе адзеньне прынясу. А потым паедзем, пакатаемся. Тут у гарах ёсьць гатэль добры, утульны, і від прыгожы. Пакінем машыну ўнізе, падымемся, пасядзім. Можна там і на ноч застацца.

- Вот это ты классно придумал! – Фёдар павесялеў, хоць і так быў зусім ня сумны. Пашатваючыся, накіраваўся ў душ.

- Счас обмоюсь, приду в себя! – выкрыкнуў ён пад шум адкрываючайся вады.

- Ідзі, ідзі. Ён глянуў яму ўсьлед, і пакачаў галавой. А потым павярнуўся да яе.

- Што ты, маё птушаня, прыціхла? Страшных дзядзек напалохалася? Не зьвяртай ты на яго ўвагі. Ён увесь час дуркуе – такі ўжо блазан.

- Я і сапраўды падумала – ён зараз пакажа. Яна ўздрыгнула.

Ён усьміхнуўся.

- Я б яму таксама паказаў нешта. Ён бы ў мяне на два вокі бачыць перастаў. Калі ў нос атрымоўваеш, адразу абодзьва вокі заплываюць. Ніколі і нічога ня бойся, калі ты са мной. І нікога. Ды хай робіць, і паказвае, што хоча. Клоўн гэты. Ён жа ня шкодны. Толькі што п’яны.

- Я ведаю, - вымавіла яна. – І з табой я не баюся нічога.

- І мяне не баішся? – вымавіў ён, усьміхаюся.

- Не. Яна падзёргала яго за пояс ад халату.

- Гэта што такое? – запытаў ён.

- Нічога. Проста так.

- Не баішся, значыць. Зараз праверым, якая ты сьмелая. Ён падхапіў яе на рукі. Яе твар апынуўся насупраць яго твару. Яго вочы ўсьміхаліся.

- Мяне нават Фёдар спугаўся, - вымавіў ён, гледзячы на яе. Яе усьміхаючыйся тварык зь вялікімі вачыма быў так блізка, што яму захацелася дакрануцца да яго вуснамі.

Ён ніяк ня мог быць строгім зь ёй. Хацеў паругаць яе за халат. Што доўга несла. Калі цябе просяць, трэба адразу выконваць. Але ж тут так не атрымоўвалася. Яна ахапіла яго за шыю рукамі - як галінкі, з вузкімі маленькімі кісьцямі з тонкімі пярсьцёнкамі на пальчыках.

- Пайшлі, наказваць буду. Па попе шлёпаць. Ён злёгку ўшчыпнуў яе зьнізу, пад шортамі. Яна ўскрыкнула. І накіраваўся зь ёй ў бок лесьвіцы.

Лёгка ўзьняўся зь ёй на руках на другі паверх.

- Насіў бы цябе, і насіў, - вымавіў, любуючыся ёю. Яе твар стаў ружовым, вусны прыадчыніліся. Яна прытулілася да яго грудзей, паклаўшы галаву на плячо.

- У цябе там ізноў нічога няма? – запытаў ён, гладзячы яе сьцёгны рукой. Яна пакачала галавой. – Ёсьць.

- Нешта я нічога не адчуваю. Зараз праверым. Ён апусьціў яе, і сьцягнуў уніз шорты.

Яна радавалася, што ўсё атрымалася так гладка. Гэтае дзяўчо насупраць верыць усяму на слова – нават і рэкамендацый не запрасіла. Ніякіх пісем, ці папер. Ну і добра, бо іх, у яе, насамрэч, не было. Яна, канешне, не схлусіла, і поварам яна працавала, нават і шэфам – толькі дома, у Кіеве. Рэстаран украінскай, і еўрапейскай кухні – нічога складанага. Тут жа яна таксама працавала – спачатку мыла посуд, а потым павысілі – стала хостес у бары. На гэтай пасаде яна пратрымалася некалькі месяцаў, а потым здарылася непрыемнасьць – кліент заплаціў ёй грошы, і забыў. Прачнуўся, палез у партманет, і закрычэў, што яго абакралі. Справу здолелі ўладзіць, аднак з работы яе выгналі. У знаёмых уладкавалася ў офісе сакратаркай, аднак там плацілі нямнога, а работы было шмат. Яна сышла “на вольные хлеба”, як яна гэта называла, і паралельна запоўніла анкету ў агенцтве, дырэктарам якога быў яе стары знаёмы, яшчэ з таго бару, адкуль яе выгналі.

Яна, канешне ж, чалавек сумленны, і ніколі ні ў кога ні еўра не скрала. І не зьбіраецца. Да таго ж, праца ў прыстойным доме не замінае і падпрацоўваць, калі будзе такое жаданьне.

Яна ўздыхнула з палёгкай. Нарэшце нейкая стабільнасьць, хоць пакуль і часовая. А можа, усё павернецца і добрым для яе бокам.

- Што там за гаспадар? – падумала яна.

Нібыта пачуўшы яе думку, дзяўчо ў крэсьле пацягнулася, леніва, як кошка, паправіла на плячы споўзшую атласную блюзку, і вымавіла:

- Мой муж будзе праз дзесяць хвілінаў. Ён ужо пад’язжае. Пачакайце, калі ласка.

Марыся кіўнула. Дзяўчо нічога не сказала, і апусьціла вочы ў мабільнік. Яна таксама чакала, аглядаючыся вакол.

Гэта расьпешчаная кошка раптам пачала яе злаваць – сядзіць, і маўчыць. Быццам бы тут, перад ёй, на канапе наогул няма чалавека. Яе цяжкі густы пах, ня ўласны для дзяўчыны яе ўзросту, пафасны, рэзкі, гэтыя туфлі на абцасах і дамашні касьцюм, які каштаваў як увесь яе гардэроб, і асабліва гэтае яе нежаданьне перакінуцца нават і словам раптам здалося ей абразай.

Яна пазірала вакол, і неяк нечакана павярнула галаву да дзьвярэй. На парозе за шклом з'явіўся высокі, цёмны цень. Дзьверы раз'ехаліся перад ім, і чалавек увайшоў у пакой – шырокім крокам, не спыняючыся. Сьвятло з-за сьпіны і паўцемра лоббі хавалі яго твар, толькі высокі сілуэт у цёмным касьцюме абазначыўся насупраць блакітнага неба за ўваходам. Віла выглядала на мора, і яго сінява зьлівалася зь нябёсным блакітам – від быў дзіўна прыгожы.

- Такая віла многія мільёны каштуе, - падумалася ёй.

Чалавек хутка прайшоў праз шырокую пустую прастору ўваходнага пакою, і наблізіўся да іх.

Марыся павярнула да яго твар, і аслупянела.

- Ну и мужик! – падумалася ёй. Гэтая думка быццам бы выбухнула ў яе ў галаве, так, што ў вісках раптам запульсавала кроў. І недзе яшчэ стала горача.

У "мужыка" былі доўгія валасы да плечаў, стыльна пастрыжаныя, густая чорная барада і вусы, ня длінныя, а яшчэ – моцнае, пракачанае, як яна ўбачыла, цела, шырокія плечы і высокі рост – значна вышэй за сярэдні.

- Метра пад два, - вырашыла яна, гледзячы зьнізу.

Ён прайшоў, акінуўшы яе хуткім позіркам, які б яна вызначыла як зацікаўлена-раўнадушны, і пацалаваў дзяўчо, якое ўстала, і абняла яго. Ён таксама прыабняў яе за талію.

На імгненьне памарудзіў, затрымоўваючыся на яе ружовых вуснах, быццам бы не хацеў адрывацца, але ўсё ж адарваўся.

Нарэшце, павярнуўся да яе. Яна паўстала з канапы, і прывіталася яшчэ раз.

- Гэта Марыся, каханы, - вымавіла дзяўчо – томным, танклявым голасам. – Яна працавала шэф-поварам.

- Вось як? – ён акінуў яе вокам, узьняў брыво. Позірк яго быў цяжкім, пранізьлівым, такім, што ёй раптам стала неяк страшнавата. Ніколі яшчэ яна мужчын – «мужиков» – не баялася. Гэты ж быў нейкі “тревожный”, як яна вырашыла. Нешта ў ім было небясьпечнае, непрадказальнае. Яна б, можа, і адмовілася, але ж нешта ўсё ж цягнула яе застацца.

- С таким точно не пропадёшь, - падумалася ёй.

«Гэта можа быць цікава», раптам прыйшла на вум думка.

Мужчына хвіліну вывучаў яе, а потым сеў на канапу побач са сваёй дамай.

- Сядай, - коратка кінуў ён – на мове, якая нагадвала яе родную. – Марыся. Санітарная кніжка ёсьць?

- Ёсьць, - вымавіла яна.

- Пакажы, - патрабаваў ён. Яна пакорпалася ў сумачцы, выцягнула паперы. Ён пэўны час вывучаў іх.

- Здаецца, сапраўдныя. Паспарт, рэкамендацыі, што яшчэ? Усё, што ёсьць, усё паказвай.

Яна моўчкі працягнула запрошанае, зь якога быў толькі паспарт.

- Заўтра прыходзь раніцой, - вымавіў ён. – Я праверу цябе па базе. Калі што знайду, і ты ведаеш, што, то можаш не марнаваць ні мой, ні свой час.

- Прывады ў паліцыю былі?

- Нет. Яна зглытнула. Прывадаў, і сапраўды, не было. Дзякуй Богу.

- Рабіць будзеш усе дамашнія справы, - працягваў ён. – Уборка дому, кухня, гатоўка, даручэньні. Праца з паловы да паловы восьмага. Два выхадных. Аплата – тут ён назваў сумму, ад якой у яе пацямнела ў вачах. Гэта было ўдвая ад яе сакратарскага заробку, і заробак яе як хостес у лепшыя тыдні.

- І паводзь сябе прыстойна, калі ласка. Адно нараканьне, і апынешся на вуліцы. Заказчык мае права скасаваць дагавор па першаму жаданьню без тлумачаньня прычынаў. Ты, наадварот, павінна за тыдзень папярэдзіць. Зразумела?

- Да, - вымавіла яна. За такія грошы яна ўсё, што хочаш будзе цярпець, ня толькі дэспатычнага гаспадара.

- Можаш ісьці, - вымавіў ён. – Заўтра прыходзь пазьней, гадзінаў у дзесяць. Яна табе ўсё пакажа і раскажа, што і як рабіць. Зразумела?

- Да, всё понятно. Яна паднялася, сказала да пабачэньня, і выйшла праз самараскрываючыяся дзьверы на волю. За сьцянамі прахалоднага холу яе абдала гарачыня.

- Ну и повезло, - падумалася ёй. А потым быццам бы самі па сабе прыйшлі словы: “А может, и не очень”.

Яны засталіся адны ў пакоі. Ён адкінуўся на сьпінку канапы, яна падышла, і села яму на калені. Ён абняў яе, і задумаўся.

- Як справы, каханы? – запытала яна яго.

- Цяжка, любая. Але ж усё вырашылі. Як табе дзяўчына? Падабалася?

Яна паціснула плячыма.

- Ня ведаю, каханы. Па мне, дык звычайная. Нармальная. З рускамоўных нікога болей не было. Толькі негрыцянкі і тайкі, італьянкі былі.

А табе, каханы? – запытала яна яго.

- Мне – не, - шчыра адказаў ён. – Нейкая шлёндра, прабач мяне Божа. Ну, можа, затое гатаваць умее. Ты яе не разбэшчвай, любая. Будзь строгай. Хай папрацуе, а там паглядзем.

- Калі яна добра гатуе, і сапраўды была поварам, то чаму ж не. Заўтра праверым. Яна абняла яго за шыю, выцягнулася ў яго на руках. Ён пагладзіў яе жывот, вызваліўшыйся з-пад атласу кашулі.

– Нешта есьці хочацца, - вымавіў.

- Канешне, каханы. Зараз. Яна ўзьнялася, і хутка па пакоі паплылі пахі – кавы і стэйка.

- Можа, гэтая якога баршча зварыць. З галушкамі. Што там яна ўмее? Салоха нейкая, а не дзяўчына. Ён успомніў фільм – “Вечара на хутары бліз Дзіканькі”, пакачаў галавой, і ўсьміхнуўся сам сабе.

Глава 25: Укрыжаваньне

- Зачым вы зрабілі гэта? Вы забілі нявіннага чалавека.

- Ён быў габрэй, а ты - Бог. Луцый прама глядзеў на яго яснымі вачыма, у якіх чыталася праўда. Яго ўласная, такая, ад якой Шымону раптам стала жудасна.

- Я не вучыў забіваць! Яго голас, хрыплы і яшчэ слабы ад перанесеных катаваньняў, узьняўся, і раптам сьціх.

- Ня мір прынёс я вам, але ж меч, - спакойна працытаваў Луцый.

- Меч - гэта Слова! Пропаведзь Каханьня, праўда аб ім, якую я прынёс вам у гэты сьвет.

Ён ахапіў галаву рукамі...

- Пачалося! - падумаў.

Ізноў - ноч, ізноў імгла, чарната душы і боль, і смутак на сэрцы. Нібыта не было тых імгненьняў, нават дзён узьнёсласьці, калі ён і сапраўды адчуваў сябе амаль Богам, быў сам-насам зь ім, у такой недасяжнасьці сьвятла, што цяпер мог толькі ўспамінаць аб гэтым з сумам і жалем.

Сьвятло раптоўна згасла, і апусьцілася ноч. Ці, дакладней, гэта не сьвятло згасла, а яго вочы перасталі яго бачыць.

Ён вылечыў столькіх сьляпых, што ўжо зьбіўся з ліку, але ж цяпер, вось, стаў сьляпым сам. Сядзеў у цемры катавальні, і маліў Бога аб літасьці. Ён і сапраўды забыўся, што ён - ня Бог, бо ж Айцец ня ёсьць Сын. Ніколі тое не магчыма, каб Сын дасягнуў Айца, думалася яму.

Гордасьць. Ён стаў гордым, думаў, што ўзвысіўся над усімі, і цяпер яго апусьцілі ў бруд. І добра, што так адбылося. Гасподзь выратаваў яго ад страшэннага спакушэньня, якое пагражала суцэльна зруйнаваць яго душу. Твар ня можа быць аднасутна

творцы.

- Госпадзі, памілуй! - маліўся ён, апусьціўшы галаву на калені, ахапіўшы яе рукамі.

- Хто я, і хто - ты? Адкажы мне! Правядзі мяне да сьвятла - ізноў. Дай адчуць мне руку тваю на сваім плячы.

Раптам ён суцішыўся, і нечакана зразумеў - рука была. Нават і тое, што ён апынуўся ў вязьніцы, не супярэчыла волі Бога. Бог быў усім, і ўсюды. І ён быў тут. Ён абдымаў яго, захоўваў, абараняў, і вёў яго да сьвятла. Хай і такім жудасным для некага, і - радасным для яго шляхам. Бо ж ён жадаў гэтага пакараньня, зразумеў ён. Гэтай вязьніцы і аковаў. Гэта азначала, што ўсё, што робіцца, правільна, і сон, які яму прысьніўся, сапраўды быў праўдзівы. А гэта значыць, што ёсьць нешта ці нехта па-за межамі гэтай рэальнасьці існаваньня, што гаворыць аб тым, што Ён ёсьць. І гэта значыць, што Ён яго не пакіне. І не пакідаў ніколі. Ён ужо забыўся, што скрываўленае рызьзё прыліпла да яго цела, што ён ня можа ляжаць і ледзь можа сядзець, каб не прысланяцца ні да чаго сьпіной. Глыбокая ціхмянасьць напоўніла яго душу.

Так ён сядзеў колькісь часу, паміж сном і яўю, нічога ўжо не чакаючы, як раптам недзе далёк у калідоры пачуліся крокі. Крокі набліжаліся да яго, і нарэшце сьвятло паходняў прарэзала цемру.

- Тут да цябе прыйшлі!

Вартавы адкрыў засаўку, і адышоў у бок, пакінуўшы ля кратаў дзьве маленькія жаночыя постаці. Яшчэ больш кволыя і гаротныя, якімі яны здаваліся ў паўзмроку пад цяжкімі сводамі вязьніцы.

Нясьмела адна за другой яны ўвайшлі ў пакой.

- Гэта мы, Госпадзі - я, маці твая, і жонка твая, - працурчэлі галасы, адзін і другі, ціхія, як ападаючы ліст.

Ён узьняў твар. Адна з жанчынаў ціха ўскрыкнула. У цемры ён

спазнаў голас - Марыя. Яна ж маўчала.

- Сын мой! Што яны зрабілі з табой! - горка вымавіла яна. Яе вусны ледзь варушыліся, на твары адбіўся выраз болю, які выклікаў жах.

- Яна губляе яго ізноў, - падумалася яму.

Марыя называла яго сынам зь першых дзён, калі ён сустрэў яе, зьнямоглую, недзе на рынке ў горадзе. Жанчына страціла прытомнасьць - пэўна ад голаду. Яны ўзьнялі яе і аднесьлі ў пакой. Пад крышай яна хутка прыйшла ў сябе - яшчэ адна ўваскрослая памерлая, пра якую хутка пайшлі чуткі па навакольлі.

Зь першых імгненьняў яна пачала называць яго сынам. Ён не працівіўся. Яе сапраўдны сын, народжаны ад гвалту рымскімі жаўнерамі, быў імі ж і забіты праз няпоўныя дваццаць год у адным зь бясконцых паўстаньняў, якімі поўнілася Іўдэя.

Сын, значыць сын. Да таго ж, сваёй сапраўднай маці ён нават ня памятаваў - яна памёрла, калі ён быў зусім малечай.

Рукі жанчыны асьцярожна абціралі яго сьпіну сумясьсю уксуса і віна, наносілі гаючую мазь. Навошта ўсё гэта? Каб заўтра прыгожым вісець на крыжы? Але ж ён ня мог сказаць ім нічога - яны верылі, і яны надзеяліся.

- Ты не памрэш, каханы! Я гэта ведаю, бо таксама бачыла сон. Яго паслаў мне Бог. Ён у тваім абліччы прыйшоў да мяне ў сьне, і сказаў, каб я болей ня плакала. Бо сьмерці няма, і крыж - ненасамрэчны. Гэта толькі сон, такі ж самы, як і той, у якім мы зараз. Нас няма тут, каханы, насамрэч мы там, дзе сьвятло. Яе покрыў звалаліўся з валасоў, і ён убачыў перад сабой яе твар, вар'яцкі і прыгожы. Яе рукі цягнуліся да яго, вусны шапталі нешта. Марыя адвярнулася да сьцяны, і ён абняў яе. Яна прыціснулася да яго грудзей. Ён думаў, што яна плакала, але ж яна сьмяялась. Ён нахінуўся да яе твару, і цалаваў яе вочы, якія ня бачылі яго тут, але ж бачылі яго на нябёсах. Яна трымалася за яго шыю крэпка, не расшчапіць. Ён узяў яе прама тут, на грудзе скрываўленай саломы. Не яму было гэта патрэбна - ёй.

Зь яе грудзей цякло малако, дома засталося дзіця. Сын, які ніколі ня ўбачыць айца, таму што той уявіў сябе Богам. Бедны пракляты народ, з году ў год, са стагоддзя ў стагоддзе вымушаны пакутваць і хаваць сваіх дзяцей, адвечна ганімы, адвечна зьнішчаемы, але ж ніколі - не пакорлівы.

Нікому і ніколі не ўдасца скарыць Іўдэю. Той, хто мае вочы, той бачыць Бога, і той, хто мае вушы, чуе яго. Голасам яго гавораць словы прарокаў. І цяпер ён - сасуд і носьбіт Слова. Слова ж не абірае абранага. Яно прыходзіць да таго, хто гатовы яго ўспрыняць, і ўзьняць яго цяжар.

- Сьвіданьне сконьчылася! - прагучэў рыпучы голас. Яна ўзьнялася, ён паспрабаваў стаць, і застагнаў. А потым яго змарыў сон. Ці ён зьнепрытомнеў, тое было не істотна. У сьне ён быў стары, і гаварыў зь некім на беразе мора. Гаварыў аб Богу - упарта і горача.

Наступным днём усё адбылося нечакана хутка. З раніцы яго ўзьнялі штуршком - аполудні мела быць адбыцца пакараньне. Крыж, выструганы, ляжаў на двары. Ён узьняў яго на плечы, якія, на дзіва, зацягнуліся - дзякуй Марыіным лекам. Хістаючыся, пайшоў, марудна пераступаючы, гледзячы ўніз, на дарогу. Зблытаныя валасы закрывалі твар, так, што нічога не разбачыш.

Калі яны выйшлі за сьцены двару вязьніцы, яго быццам бы акунула ў бурлівае мора натоўпу.

Людзі ірваліся да яго, зьбівалі з ног варту. Натоўп равеў, стагнаў, сыпаў праклёнамі. Сонца, сьпякотнае, апаліла яго, горла разьдзірала ад смагі. Ён захістаўся, і ўпаў на калені, амаль раздаўлены цяжарам, які наваліўся на яго плечы.

- Госпадзі, Бог мой! Дазволь мне, я дапамагу цябе! Я панясу за яго. Я - Шымон зь Кірынеі, - пачуў ён над сабой голас.

Вартавы ляніва сунуў за пояс залаты дзенарый, і раўнадушна кінуў - нясі.

Яшчэ адзін жыд ірвецца туды, дзе яму і належыць быць -

расьпятым. Фанатыкі і вар'яты, брудныя, як сьвіньні. Ваяр паціснуў плячыма.

Разам яны ўсталі, і панесьлі крыж далей па дарозе. Хутка ўдваіх дацягнулі яго да Кальварыі, дзе ськінулі з плеч на зямлю. А потым адбылося нечаканае. Жаўнер схапіў яго за руку, і кінуў у натоўп.

- Стой! Гэта я! Я - Сын Божы! Я - цар іўдэйскі! Я - мешыах, і мне належыць быць расьпятым! - выкрыкнуў ён, кідаючыся наперад. Моцны ўдар у грудзі адкінуў яго.

- Луцый, Луцый, ты ж мяне ведаеш! - узмаліўся ён.

- Хто ты? - запытаў Луцый, зьвяртаючыся да чалавека, які нёс крыж, і цяпер разгублена глядзеў на яго.

- Я - Шымон. Шымон з ... слова патанула ў рову чалавечых галасоў.

- Шымон. Луцый кіўнуў.

- Расьпяць яго, - коратка кінуў ён жаўнерам. Тыя схапілі чалавека, і спрытна расьцягнулі яго на крыжы. Справа пачалася - застучэў малаток.

- Не! Гэтак нельга! Гэта няправільна! Адпусьціце яго! Гэта я! Я павінны быць там замест яго!

Яго ніхто ня чуў, не зьвяртаў увагі. Хоць скрычыся - яшчэ адзін вар'ят. Толькі і ўсяго. У адчаі ён зваліўся на пясок, чапляючыся за глебу рукамі. Зьверху раздаўся гром - ліванyў дождж. Зямля затрэслася і застагнала, нібыта жадала яго праглынуць. Да неба ціха і неяк урачыста ўзьнімаўся крыж. Вакол стаяла цішыня - толькі скажоныя, напалоханыя твары і бязгучныя рты.

На крыжы цела, белае, аголенае, нібыта сьвяцілася - Шымон узьнімаўся да Бога. Раптам ён зарагатаў. - Я тут, і я ня тут. Я з вамі, і я на крыжы! Сьмерці няма! Я ўваскрос, я чую цябе, Госпадзі! І ня чую нікога акрамя цябе!

Цяпер ён быў вольны - вольны ад усяго. Павярнуўся, і пайшоў

дамой. Найперш зайшоў да Елены, яна яго спазнала адразу, радасна ўскрыкнула, але ж ня дужа зьдзівілася - яна яго чакала.

- Зьбяры вучняў, - загадаў ён Яну. Абвешчу ім уваскрошаньне.

Вечарам у пакой набілася поўна народу, але ж усе глядзелі на яго апасьліва. Як на дземана, - падумаў ён.

- Мы ня верым цябе. Нарэшце Пётр выступіў насустрач. Ты - ня ён. Мы бачылі, як яго расьпялі, бачылі ўласнымі вачыма.

- Ты ня верыш мне, Пётр? Ты ніколі мне ня верыў. Заўсёды ўва мне сумняваўся, - вымавіў ён горка.

- Хто верыць мне? - запытаў ён натоўп. Апынулася ня шмат. Акрамя Елены і Яна яшчэ Фама, Матвей-мытар, і зь дзясятак чалавек. Ды яшчэ Іўда кінуўся ў ногі - шукаў прабачэньня. Ён быў няўяўна рады, што яго здрада апынулася не сапраўднай. На гэтым - усё. Дзе дзеўся натоўп? Невядома. Натоўп прагнуў крыві, і ён яе атрымаў. Натоўп прагнуў Бога мёртвага, ён жа быў Богам жывым. І цяпер тут яму не было месца, за выключэньнем сэрцаў некалькіх абраных. Так і павінна быць, бо шмат кліканых, ды абраных ня шмат.

Ён сядзеў за сталом, закрыўшы галаву рукамі. Вакол апускалася ноч.

Як хутка прыходзіць ноч у гэты цудоўны край, поўны прыгажосьці і жорсткасьці, амыты незьлічона крывёю, зь якой паўстае Венера.

Як можа быць, што сярод такога хараства так лёгка і проста робіцца зло? Сёньня ён быў відавочцам таго, як праз нейкія паўгадзіны быў вырашаны лёс многіх дзесяткаў, сотняў, тысячаў патэнцыйных ахвяраў, якія мелі стаць зернем, закінутым ва ўрадлівую глебу вайны. Яму хацелася крычэць і біць кулаком у сьцяну. Што ён робіць? Навошта? Яны ўсе, разам зь ім самім, нагадвалі яму дземанаў, якія сабраліся на пякельнае паседжаньне, дзелавіта вырашаючы – каго разарваць, каго – падсмажыць, а каго – атруціць, застрэліць, згвалціць, асьляпіць, пазбавіць канечнасьцяў, збрыдзіць, звонку ці знутры

– не істотна. Галоўнае – нанесьці як мага больш шкоды, пасеяць як мага болей жаху, прынесьці ў ахвяру бязьлітаснаму Малоху вайны дастаткова жаночых і дзіцячых душаў, каб ён задаволіў сваю непамерную жарсьць. На балю Сатаны падавалі целы, і ён быў адным зь іх – галоўным поварам, які дасканала прадумваў, як найпрыгажэй і найсмачней прыпаднесьці ненажэрнай пачвары мяккую, сьцякаючую крывёю плоць.

- Адпраўляйся ў пекла! – хацелася яму сказаць самому сябе. Ён узьняў твар і рассьмяяўся – дык ён жа ў ім і ёсьць!

Пекла можа быць прыгожым, добра ўладкаваным. Напоўненым добрымі інтэнцыямі і разважлівымі думкамі, як галава таго, каго ніколі і ніхто не прызнае вар'ятам, і хто закручвае махавік, які хутка панясе ў разнос. Вар'ятам будзе называцца той, хто вырашыць выступіць супраць. Хто скажа сваё слова праўды, і атрымае на арэхі з абодзьвух бакоў, бо ж на вайне заўсёды сходзяцца двое – нашыя і іньшыя. Стане ворагам для ўсіх, праклятым, якому няма месца на сьвеце. Колькі разоў ён ужо ваяваў, і заўсёды ненавідзеў вайну? Ваяваў у мінулым, і ў сучасным – з самім сабой. Пэўна, не было ліку тым бойкам, якія ён прайшоў, і якія пакінулі шнары на целе яго душы, глыбокія, невылечныя. Аднойчы ён ужо стаў вар'ятам. Адмовіўся, і – паплаціўся ёй. Цяпер жа яму адмовіцца было нельга. Гэтая вайна была і яго вайна, як бы там не лажыліся расклады. Ён дакладна ведаў, за каго, і навошта. І што будзе потым, таксама ведаў. Жах, і горы целаў з усіх бакоў. А поты, як і заўсёды, новы падзел тэрыторыяў, сьфераў уплыву. Калі б што прынцыпіяльна зьмянілася. Аднак - то наўрад ці. Зацішша на пэўны нядоўгі час – да наступнага Апакаліпсісу. Што ён мог ведаць, і бачыць, як чалавек? Як Бог жа ён маўчаў. Назіраў за чалавекам – што ён учыніць, які зробіць выбар па сваёй уласнай волі.

- Госпадзі! – узмаліўся ён. – Пазбаў мяне маёй волі, і зрабі ўсё за мяне і праз мяне так, як лічыш патрэбным.

Цішыня ў адказ.

- Напэўна, так было нельга, - падумалася яму. Які тады сэнс у яго існаваньні як чалавека, калі ўсю адказнасьць сваю ён зараз перакладае на Бога? Да таго ж, ён быў мужчынай. А гэта

значыць, што ў гэтым сьвеце яго адказнасьць і абавязкі сапраўды боскія, ня болей і ня меней. Паступова ў яго думкі ўвайшла яна. Заўсёды так адбывалася – ён пачынаў, з чаго заўгодна, а скончаваў ёй. Для чаго ўсё гэта, як ня дзеля яе? Для чаго ён, наогул, жыве? Для самога сябе? Ды навошта ён сам сабе быў патрэбны? У ім не было нічога такога асаблівага, што б яму самому падабалася. Гэта жанчыне дазваляльна любіць сябе. А каго ёй яшчэ любіць? Хто найбольш дасканалы ў сьвеце, чым прыгожая жанчына? Перфекцыя, узьведзеная ў ступень, калі хараство замыкается самое на сябе, і існуе, самадастатковае, ідэальнае, толькі дзеля таго, каб было чаму пахіляцца, і чаму служыць. Можа, дзе ў сьвеце ці асобнай галаве і ёсьць такая перверсія, што дама павінна служыць рыцару, аднак, дзякуй Богу, ён бачыць сьвет не галавой уніз, каб так думаць.

- Красуня мая, каб ты ведала, чаго каштуюць гэтыя твае сукенкі, упрыгожваньні, прыгожы дом, адпачынак на цёплым моры, жыцьцё сярод найпрыгажэйшых у сьвеце музеяў і галерэй, твой спакой, цішыня твайго сэрца, мірнае неба над тваёй галавой, якое хутка стане нямірным над галовамі іньшых. Дзеля цябе я здрадзіў самому сябе. Стаў тым, кім стаў – чалавекам, які гатовы забіваць. Бо гэта дзеля цябе я не магу сыйсьці з гэтага сьвету, адысьці ў бок, стаць, і спакойна глядзець, як пачвара нянавісьці ўзьнімаецца, закрываючы сабой сонца. У якім сьвеце мы будзем жыць з табой, калі я абяру рукі, чыстыя ад крыві, і пакіну іньшым брудную справу - запляміць свае душы грахом, каб потым гэтымі чыстымі рукамі выкарыстаць плады іх ахвяраваньня, забітых, і забіваўшых, якія будуць усё жыцьцё несьці на сябе цяжар гэтага жаху? Увайду чыстым у новы сьвет, у рай, па целах тых, хто ахвяраваў сабой? Не, любая, пакуль стаіць гэты сьвет, чыстых у ім ня будзе, не так ён зроблены, каб прайсьці праз яго, не запэцкаўшыся. Аднак ісьці ў крыві і гразі – гэта мая справа. Твая ж – заставацца анёлкам, якога я пранясу праз гэтае пякельнае мора на руках. Ты нічога не даведаешся, і ні ў чым ня будзеш мець нястачы. Ні аб чым ня будзеш плакаць. Толькі калі ты крыху паплачаш аба мне, я буду табе ўдзячны. Толькі крышачку – болей ня трэба. Бо ж ты прыйшла ў гэты сьвет не для таго, каб плакаць, а каб сьмяяцца і радавацца. Мая ж задача – не дапусьціць, каб боль азмрочыла твой мілы

тварык.

Венера, з крыві выходзячая, ня ведаючая яе, ступаючая, як па вадзе, па чырвоных хвалях. Цела тваё паўстае зь цемры маёй душы, зьдзіўляючы яе – як такі жах і хаос мог нарадзіць такое хараство? Бо ж Тартар – гэта тое, што разьверзлася ўва мне. Віруючая бездань памерам у нябыт, зь якой ірвецца нешта, чаму я і сам ня ведаю назвы. Як Сьвяты Юры, я працінаю дзідай цела свайго уласнага дракона – сваё уласнае цела, забіваючы сябе самога, каб гэтая цемра, зь якой я складзены, не праглынула свайго уладара. Твая ж рука без усялякае дзіды ўтаймоўвае самага драпежнага зьвяра, і, падаючы, твой шаль спыняе войскі. Можа, ты б магла мяне спыніць? Можа, ты б магла спыніць усё гэта? Каханая, усё у тваёй уладзе.

Ён апусьціў твар у рукі, яго плечы ўздрыгвалі – бо ж яго ніхто ня бачыў.

Яна ціхенька ўвашла ў пакой. Ён сядзеў у цемры, не запальваючы сьвятла, амаль зьліваючыся зь ёю. Толькі экран манітора сьвяціўся, густа запоўнены тэкстам. Перад ім стаяла бутэлька каньяку, напалову пустая, і пусты кубак. Апошнія дні ён многа піў, і многа працаваў – садзіўся адзін, закрываўся ў пакоі, пісаў, ці проста думаў, моўчкі, і ізноў пісаў - толькі шорах клавішаў, ды ўзьлятаючыя над імі пальцы. Ён ніколі не выпраўляў напісанае -аднойчы пакладзенае на паперу, яно заставалася, як ёсьць. Тое, што апрацоўвалася яго мозгам, ужо выходзіла дасканалым.

- На творчыя пакуты няма часу, - жартаваў ён. – Хай лодыры пакутуюць і чакаюць натхненьня. Творчасьць – гэта найперш за ўсё праца. Праца душы.

- Напішы мне казку, каханы, - прасіла яна. І ён адрываўся ад свайго Шымона, і пісаў ёй. А потым чытаў, і яна слухала, сьмяялася, захаплялася, ці чырванела ад яго адкравеньняў, калі ён раскрываў перад ёй глыбіні сваёй душы. Праз яго кнігі яна даведвалася пра глыбіню яго каханьня да яе, і яна палохала яе, і зачароўвала. Яго каханьню і сапраўды не было мяжы. Яна ніколі ня чула, не ўяўляла, што чалавек можа так кахаць другога чалавека, як яе кахаў ён.

Чым яна адкажа на такое яго гарачае каханьне? Ці дастаткова ў яе духоўнае сілы, сардэчнае гарачыні, каб даць яму тое ж, што ён даваў ёй? Яна ж была проста маленькая дзяўчынка, зусім, на яе погляд, не дасканалая, ні целам, ні, асабліва, душой. Чаму ж ён так абагаўляе яе?

- Ты ня бачыш самое сябе, - ціха адказваў ён. – Ружа ня можа адчуваць свой водар, і бабачка не назірае свой палёт і ўздрыгваньне сваіх крылаў, калі яна садзіцца на кветку, і сусьвет замірае. Прыгажосьць прыроды ня бачыць сябе, і адкрываецца толькі вачам мастака. Я – вока, а ты – прыгажосьць, якую я бачу. Перад якой паўстаю на калені, перад якой сьхіляюся. Я стварыў цябе, сонейка, і цяпер я цябе кахаю. А ты? Ты кахаеш мяне? Хоць крышачку? Гэтага будзе мне дастаткова.

- Я кахаю цябе ўсім сэрцам, - ціха казала яна. – Хоць мая душа і ня можа параўнацца з табой, і я ня сьмею ставіць сваю нядасканаласьць побач з дасканаласьцю і вышынёй тваёй душы. Насамрэч, мне здаецца, што маё каханьне сапраўды большае, чым я магу асэнсаваць, ці адчуць. Мне здаецца, яно бязьмежнае, толькі мяне не хапае, каб умесьціць яго. Я б хацела адчуваць бязьмежнасьць свайго каханьня да цябе, каб быць годнай цябе, але ж і такая, якая я ёсьць, я хачу, каб б ты кахаў мяне адвечна са ўсёй сваёй бясконцасьцю, і хачу ўвесь час адчуваць, і аддаваць цябе такое ж каханьне, наколькі гэта магчыма, і немагчыма.

- Мне дастаткова і таго, што ты ёсьць. Што ты проста ёсьць каля мяне, - адказваў ён. Яго рукі змыкаліся вакол яе, і яна забывала аба ўсім на сьвеце.

Цяпер жа яна абдымала яго, і ён дакранаўся шчакой да яе рукі.

- Як справы, каханы? – запытала яна, проста каб пачаць размову. Каб вывесьці яго з гэтага ступару, у якім ён знаходзіўся, згубіўшыся ў сваіх уласных думках. Ёй было так дзіўна, што яна абдымае яго, а ня ён яе. Яна ледзь магла ахапіць яго шырокія плечы рукамі. Прыціснулася тварам да яго валасоў, пацёрлася аб яго, як кошка. Ёй хацелася замурчэць – ён быў такі цёплы, такі вялікі. Яна прыціснулася да яго

шчыльней. Яго рука накрыла яе руку. Ён усё так жа сядзеў, і глядзеў на экран. Але ж цяпер ён быў тут, зь ёй.

- Справы? Добра, любая. Я амаль сконьчыў кнігу. Засталося ня шмат. Нешта накшталт эпілёга. Хутка ўжо пачнуцца здымкі – мне патэлефанаваў Паола, і ськінуў па электронцы накіды сценара канцоўкі. Я хацеў адправіць яму напісанае, але ж вырашыў усё ж дапісаць усё цалкам. Мяркую, мы не пагадзімся ізноў, і ізноў – у галоўным, аднак на гэты раз я падпарадкуюся яму. Хай здымае, што хоча, як бачыць. Ён таленавіты, і я яму давяраю. Насамрэч, можа стацца так, што апынецца правы ён, а не я. Усё ж, гардыня – сьмяротны грэх, і мне надаела змагацца. Кнігу ж я дапішу, і адразу адпраўлю на вычытку. Некалькі выдавецтваў зацікавіліся, і цяпер я нават магу абіраць тое, што прапануе больш прывабныя для мяне ўмовы. Нехта ўжо нават пагадзіўся замовіць права на пераклад. Канешне, тут я павінен дзякваць свайму імя, але ж на штосьці яно павінна быць патрэбнае. А можа, яно ў мяне і ёсьць таму, што я павінны быў напісаць, і надрукаваць гэтую кнігу. Праўда пра Шымона просіцца ў сьвет.

Ён крыва ўсьміхнуўся.

- Толькі сьвет, пэўна, ня будзе дужа ёй рады.

- А там, куды ты ездзіў, усё добра? – запытала яна.

- Там – усё добра, і хутка разгортваецца, каханая. Але ж не скажу табе, добра гэта, ці ня вельмі. Па мне, дык лепш, каб гэтага не было. Аднак такі ўжо наш мужчынскі сьвет. Абяцаю, што ён ня будзе датычыцца цябе, любая. Цябе ня трэба нават і ведаць аб усім гэтым. Золатка маё. Ён пацалаваў яе руку.

Хай хоць хтосьці ў гэтым брудзе застанецца чыстым. Я хачу, каб ты была шчасьлівая. Каб у цябе ўсё было, што ты жадаеш. Каб я мог балаваць цябе яшчэ шмат год. Ты – мая жанчына, а гэта значыць – ты для мяне сьвятая, і першае, што мяне хвалюе ў гэтым сьвеце. Ты і сапраўды не ўяўляеш, якая бездань паміж мной і табой. Толькі ты знаходзішся высока, а я – нізка. Мне б дасягнуць цябе. Яго вусны кранулі яе далонь, і яна ўздрыгнула. Яны былі мяккімі і асьцярожнымі. Ён павярнуўся да яе, і яна

села яму на калені.

Вольнай рукой ён наліў сабе рэшткі каньяка ў кубак.

- Каханы, можа ня трэба? – заклапочана вымавіла яна. – Ты нешта шмат п’еш.

- Баішся, што я пераўтваруся ў Фёдара? – ён усьміхнуўся. – Ня бойся, сонейка. Я – ня Фёдар. Я значна горш. І таму каньяк мяне не бярэ, як яго. Я яму нават зайздрошчу. Як у яго атрымоўваецца? Выпіў стакан, і ўсё – ужо ў раі. Мне са стакана толькі пішацца лепей.

- Усё роўна, - сур’ёзна вымавіла яна. – Я не хачу, каб ты столькі піў.

- Я і сам не хачу. Ён абняў яе, гледзячы ёй у вочы. – Але ж – прыходзіцца.

Прабач, але ж жыцьцё такое – паміж вар’яцтвам і п’янствам я абіраю апошняе. Інакш я зраблю нешта, што можа стаць сапраўды непапраўным.

- Што ты зробіш? – напалохалася яна.

- Заб’ю кагосьці. Дужа хачу кагосьці забіць, толькі вось ня ведаю, каго, і як. Тыя, хто і сапраўды заслугоўваюць пакараньня сьмерцю, нажаль, недасяжныя ні для каго, акрамя Бога. А паколькі нявінных я забіваць не хачу, то прыйдзецца піць. Нічога не папішаш. Толькі ты не турбуйся, зайчаня маё. Гэта цябе ніякім чынам не датычыцца. Для цябе нічога ўва мне ня зьменіцца. Я цябе кахаю і п’яны, і цьвярозы. Ня ведаю нават, які - больш.

- Ведаеш, я таксама кахаю цябе любога. Яна абняла яго. – Проста мне балюча бачыць, што табе балюча. Нешта здарылася?

- Здарылася, любая. І тых грошаў, якія я мяркую атрымаць, я насамрэч не жадаў бы. Гэта – благія грошы. Крывавыя. Аднак так было заўсёды. Кожны раз, калі я прыходжу сюды, яно адбываецца ізноў. Быццам бы ў гэтым сусьвеце ў мяне адзіны

лёс – ваяра і забойцы. Адкуль бы я не пачынаў, мяне ўсё роўна выносіць туды нейкім дзіўным чынам, нейкай плыняй, якая заўсёды накіроўваецца ў адным накірунку. Так было і ў нашых кніжках. Памятаеш? Адкуль бы я не йшоў, усё роўна скончавалася ўсё аднолькава.

- Я ня ведаю, чаму так, каханы. Напэўна, у кожнага з нас у гэтым сусьвеце ёсьць сваё прызначэньне, і свой лёс. Тое, для чаго мы менавіта створаны Богам.

- Цікава, а для чаго Богам створана я? – запытала яна нібыта самое сябе.

- Ты створана для каханьня, зайчаня маё. Ён абдымаў яе, гледзячы ёй у твар. Яго вочы ўсьміхаліся. – Толькі для гэтага. Для каханьня і радасьці. І яшчэ – ты створана для мяне. Толькі я маю права кахаць гэтае дасканалае цела. Кранаць яго. Яго рукі гладзілі яе скуру пад атласнай тканінай кашулі, а потым пачалі асьцярожна разшпільваць гузікі.

- Ты не баішся мяне? – запытаў ён.

- Не, каханы. Яна пакачала галавой.

- Правільна. Ніколі мяне ня бойся. Я ніколі не пашкоджу цябе. Яго вусны апусьціліся ёй на шыю, і яна адкінула галаву. Ад яго моцна пахла каньяком, не непрыемна. Пах мяшаўся з грубаватым водарам яго парфюмы, і рукі яго былі грубаватыя, крыху няўклюдныя, быццам бы ён баяўся кранаць яе, не разьлічваючы сваёй сілы, баючыся расьціснуць яе ў далоні, як крохкага матылька. У такім стане ён заўсёды рабіўся нейкім нязвыклым для яе, ня грубым, але ж быццам бы другім. Нібыта яна яго ня ведала, і гэты чужы для яе чалавек кранаў яе цела, гладзіў яго, скараючы сваім вялікім рукам. І ўсё ж, гэта быў ён, і яна яго кахала. Нешта было блюзьнерскае ў гэтых яго дакрананьнях, нізкае, і разам з тым высокае, быццам бы ён рабіў тое, што не павінны быў рабіць, і яна гэта ведала, але ж дазваляла яму, таму што яго любіла. Яна закрыла вочы, і аддалася яго вуснам, якія блукалі па яе целу.

- Пайшлі ў ложак, - нягромка вымавіў ён, узьнімаючы яе. Ёй

здалося, ён зараз перакіне яе праз плячо, але ж ён асьцярожна трымаў яе на руках. Дзякуй Богу, да ложка ісьці было не далёка, бо стол з ноўтбукам месьціўся ў іх уласным пакоі. Яна апусьцілася на коўдру, адчуваючы, як яе накрывае яго цела. Яго валасы кранулі яе твар, і яна адкінулася, выцягнуўшыся пад ім. Цяпер гэта будзе доўга, пакуль ён не спатоліць сваю прагу яе, бо алкаголь прытупляе пачуцьці, і адначасова абвастрае іх, узьнімаючы жаданьне, і робячы яго невыносна доўгім, цяжкім, пакутлівым. Ён шаптаў ёй словы каханьня, нібыта вызваляючы сваю душу з таго палону, у якім яна апынулася ў апошнія тыдні. Ён хацеў ачышчэньня і прабачэньня, і толькі яна магла зрабіць гэта для яго – ачысьціць яго, і прабачыць. Ён спаведваўся ёй не ў сваіх грахах, а ў сваёй любві, але ж тым самым адначасова пазбаваўляўся і цяжару граху, нібыта праз сваё каханьне да яе шукаў апраўданьня перад усім сусьветам, і нават перад самім Богам.

– Госпадзі, - казалі яго вусны. – Я катаваў, я забіваў, я праліваў кроў. Але ж я кахаў гэтую жанчыну, і ніколі ня здрадзіў свайму пачуцьцю да яе. Хіба ж гэтага, Госпадзі, не дастаткова, каб трапіць разам зь ёй у рай, туды, дзе знаходзішся ты? Я ж проста чалавек, і адзінае, што я магу рабіць, каб выратаваць сваю душу, гэта – кахаць, і каханьне – адзінае, праз што я магу выратавацца. Што яшчэ мне застаецца ў гэтым сусьвеце? Няма такога граху, які б я ня зьдзейсьніў, і ва ўсіх іх я шчыра каюся – не табе, а ёй. Бо калі яна прабачыць мяне, то і ты павінен мяне прабачыць. І калі яна папросіць за мяне, ты адкажаш, бо ж ты, Госпадзі, мужчына, а мужчына ня можа не ўважыць шчырую просьбу жанчыны, асабліва той, якая просіць за таго, хто яе кахае, і каго кахае яна.

Глава 26: Спакуса

Яны прачнуліся пазнавата, бо заснулі пад раніцу. Ён крэпка трымаў яе, ахапіўшы, прыцягнуўшы да сябе. Яе духмяныя валасы казыталі яму твар, рука ў паўсьне намацала і гладзіла яе грудзі, адчуваючы цьвёрдай далоньню мяккую, як шоўк, скуру. Яму, наогул, не хацелася прачынацца - хацелася кранаць яе, прыціскаць да сябе яе мяккае цела, зарывацца тварам у яе густыя, шаўкавістыя валасы зь дзіўным тонкім водарам, знаходзіць вуснамі яе тонкую шыю, маленькае, як ракавіна, вушка, убіраць яе пяшчотную скуру, пакідаючы на ёй сьляды сваіх пацалункаў, адчуваючы, што - вось, яна тут, яна - уся яго, мяккая, падатлівая, тонкая і гнуткая, як чарот, абдымаючая яго ў паўсьне, дакранаючыся да яго грудзей маленькімі грудзямі - бугаркамі мяккай атласнай плоці, вымушаючы яго ўздрыгваць ад жаданьня. У яго ізноў паўставаў - ён ня мог нічога зрабіць. Дакранаўся да яе, і - ўсё, губляў розум. Яму хацелася мець яе ўсю адразу, пранікаць у яе ўсюды, адчуваючы напружанай плоцьцю гарачыню яе вуснаў, вільгаць і шчыльнасьць яе ўлоньня, яго супраціў, калі ён уваходзіў у яе, які ён так лёгка мог пераадолець, і чуць яе ўскрык з прыдыханьнем, які гучэў для яго, як музыка, закрываць яе вусны сваімі, бессаромна лашчыць усё яе цела, робячы яго падатлівым інструментам сваёй жарсьці, і ў той жа час задыхаючыся ад пяшчоты і замілаваньня.

Яму падабалася, калі яе лічылі яго дачкой. Ён і сапраўды так моцна кахаў яе, з такой гарачынёй, ад якой заходзілася сэрца, што проста жанчыну так кахаць было б не магчыма. Кахаў, як уласную кроў, як самога сябе, і нават болей, бо ў ім не было той дасканаласьці, што ён бачыў у ёй.

Яна была недзе там, у вышыні яго ідэальнага сьвету, і належыла нябёсам. Ён жа быў грубым, брудным, плоцкім - быў зямным. Ад жаданьня яе пругкага, тонкага цела ў яго кружылася галава. Ён ужо амаль прачнуўся, яна ж яшчэ спала, кранальна палажыўшы галоўку на яго плячо. Яе подых лашчыў яго скуру - ціхі, мірны сон.

- Красуня мая... Ён прыціснуўся да яе шыі вуснамі. Яго рука паглыбілася ў яе, і яна заварушылася - прачнулася. Але ж не зусім. Застагнала, і пасунулася ад яго. Ён прыцягнуў яе да сябе. Яе мяккія сьцёгны краналі яго жывот, і тое, што цяпер было на ім. Ён рассунуў рукой яе ягадзіцы, крануў прамежнасьць, і ўвайшоў у яе, сьлізгаючы зьверху ўніз, туды, глыбока, у крыху вільготнае і пругкае, што яшчэ спала і ня жадала пускаць яго ў сябе.

Яна цішенька ўскрыкнула - прачнулася. Ён рухаўся ў ёй, незважаючы на яе слабыя стогны, і міжвольны супраціў, увільгатняючы рукой яе ўлоньне, і разумеючы, што так яму падабаецца таксама, а можа і болей: браць яе, калі яна не зусім гатовая, ня спрошваючы, валодаючы гэтым прыгожым целам, як сваім уласным, сваёй маёмасьцю, як дом ці аўто, і ў той жа час разумеючы, што яна далёкая, недасяжная, як зорка, зьзяючая чысьцінёй Мадонна, ідэал чыстай прыгажосьці, які глядзіць з подыўмаў ці палотнаў, і адначасова такі блізкі, зямны, родны, уласны, у які ён можа ўвайсьці і рухацца вось так, вульгарна, адтрахаць яе, аджарыць, ці як там кажуць яшчэ, і як ён ніколі не сказаў бы ёй. Але ж менавіта так ён сябе і адчуваў - трахаў Мадонну, каралеву, маленькую прынцэсу з казкі, і яе вузкія круглыя сьцёгны стукаліся аб яго шырокія ў параўнаньні зь ёй. У яе была шасьцьдзесят сантыметраў талія, яна мерыла, і хвалілася. Сьцёгны былі 88, грудзі 84. Ён дасканала ведаў яе памеры - любіў дарыць ёй бялізну і адзеньне. У яго ж рост быў больш за метр дзевяноста, і вага за сто кіляграмаў, з-за шырыні плечаў і мышцаў. Ён быў ня вузкі ў касьці, можна сказаць, што і шырокі, з крэпкімі рукамі, нагамі і сьцёгнамі, моцнымі плітамі грудзей і жывату, хоць ніколі асабліва і не хадзіў у зал - такім ужо ўрадзіўся. Яго моцы быў патрэбны выхад, і ён любіў плаваць - у сябе ў возеры, тут - у моры, мог праплыць і некалькі кілометраў за раз. Дома ж быў невялікі зал, гіры, і яму хапала. Больш любіў працаваць - рукамі, рабіць нешта цяжкое, складанае. Адзін з вартавых некалі займаўся кэнда, і цяпер ён махаўся зь ім на мячах, калі быў час.

Яна любіла назіраць, сядзела ціхенька, як мышонак. Ён мог узьняць яе, і несьці адной рукой, заміраючы ад замілаваньня.

Ён ведаў, што пра іх казалі, глядзелі зьдзіўлена, ды больш – зайздросьліва, але ж яму было ня проста нават усё роўна – пляваць ён хацеў. Людзі заўсёды любяць плявузгаць языкамі – хай гавораць.

Калі ж заўважаў непавагу да яе ў адносінах, асабліва – персанала, то вырашаў хутка і жорстка. Аднаму з аховы нават і адбіў галаву, калі неяк пачуў пашлаваты выраз у датычаньні яе. Той думаў, што знаходзіцца сам насам з напарнікам, і не заўважыў, як ён выйшаў зь дзьвярэй на ганак і спыніўся пакурыць на двары. Дома яна не любіла, каб ён курыў. Ды рабіў ён гэта ня часта – так, пад настрой. Адкрыць пачку дарагіх цыгарэтаў, накшталт «Данхілл», чырвоныя, ці клясычных «Мальбара», зацягнуцца, і пастаяць, аглядаючы краявіды, дыхаючы паветрам, мяккім, з мора, ці сухім і жаркім – з гор. Вецер ускудлачваў яму валасы, кідаў на лоб, ён адкідваў іх рукой, адчуваючы салёны пах. А на руцэ – яе пах, тонкі водар яе цела, які ён чуў нейкім жывотным пачуцьцем.

Ён любіў назіраць за ёй, як яна ляжыць у шэзлонгу, як марудна ідзе па парку, спыняючыся ля прыгожай кветкі ці пакрытага пладамі дрэва, як боўтае нагамі ў блакітнай вадзе басейну, апранутая ў танюткую паўпразрыстую сукенку, праз якую сьвеціцца ўсё яе цела, нібыта сонечны праменьчык, заблытаўшыйся ў шоўку тканіны. Яна не насіла верх бялізны, навошта ён ёй тут быў, і ён заўважаў, як, сутыкнуўшыся зь ёй, ахова і работнікі адводзілі вочы, у якіх ён вострым мужчынскім позіркам бачыў жаданьне. Не жадаць яе было не магчыма. Яе хацелася узяць прама тут – ля басейну, ці на траве ў садзе, агаліць яе тонкае цела пад небам у колер “аззурра”, убачыць, ці, хутчэй, адчуць, як яе доўгія ногі рассоўваюцца пад ім, саступаючы яго націску, калі яна рыхтуецца прыняць яго жарсьць, як яе вочы закрываюцца, нібыта ад сонца, і на яе шчокі ў колер персікаў падае доўгі цень ад густых веек. Яе скура набыла крыху залацісты колер, але ж супраць яго цёмнай, загарэлай скуры выглядала малочна-белай. Ён жадаў яе так моцна, што ніколі ня мог увайсьці ў яе адразу – яе ўлоньне было шчыльным і вузкім, і яму прыходзілася дапамагаць сабе рукой. Калі б ён увайшоў у яе неасьцярожна, то, пэўна, ўсё б ёй там разарваў. Ён сабе прызнаваўся - яму хацелася гэтага,

хацелася ўзяць яе груба, моцна, ня стрымліваючыся, разрываючы на ёй адзеньне, падпарадкоўваючы сабе яе цела, і адзін ці два раза – яна сама прасіла яго аб гэтым – ён крыху адпускаў сябе ў сваім жаданьні. Але ж толькі крышачку, самую маласьць. І нават тады, калі ён быў амаль пяшчотным, яе цела пакрывалася каляровымі плямамі, і іх каханьне прычыняла ёй боль. У ёй жыла нейкая прага болю, жаданьня адчуваць яго, быццам бы яна за нешта сябе карала. Ёй здавалася, што яна – брудная, ня годная яго з-за таго, што зь ёй было ў мінулым, і ў чым не было ня кроплі яе віны. Але ж яна карала і карала сябе. Яна жадала яго гвалту, болю ад яго, грубага, жывёльнага каханьня, калі яго цела сапраўды катавала яе, і чаго ён ня мог сабе дазволіць. І ў той жа час, прагнучы пакараньня цела, яна так жа моцна патрабавала ў яго глыбачайшага ўзаемапранікненьня душаў, яго каханьне было для яе хлебам, бяз хлеба рэальнага яна і сапраўды магла абыходзіцца, а вось безь яго каханьня – не. Яна не магла існаваць ні імгненьня па-за межамі яго любві, і жадала адчуваць яе ўвесь час, так поўна, як толькі гэта магчыма. І яна кахала яго сапраўды найвялікшай, боскай любоўю. Такой, якая была годная яго каханьня, якое было вялікім настолькі, наскольки вялікім у параўнаньні зь ёй быў ён, сталым, глыбокім, як гэта сіняе мора за пляцоўкай насупраць, ціхім ці бурлівым, штармавым, пагрозным.

Ён выйшаў зь яе, і нахінуўся над ёй. Яе валасы зблыталіся, пад вачыма былі галубаватыя плямы. Ружовыя вусны мякка раскрыліся яму насупраць.

- Добрай раніцы, каханы! – вымавіла яна, усьміхаючыся. – Як спалося?

- Добрай раніцы, кветачка мая. Спалося добра, ды неяк я хутка выспаўся. Вось, ляжу, і думаю – хто нам сьняданак прыгатуе?

Яна заварушылася.

- Ляжы, ляжы, анёлак мой, - вымавіў ён. – Сёньня як раз нашая дама прыйдзе а дзясятай гадзіне. Вось мы яе і выпрабуем. Хай прыступае адразу, чаго цягнуць. Быццам бы ў адказ на яго словы раздаўся званок хатняга тэлефону. Ён зьняў трубку.

- Сіньёре, да вас прыйшлі, як назначана, - пачуўся ў трубцы голас.

- Вось, бачыш, пунктуальная. Пагледзем, які яна повар. Салоха. Ён усьміхнуўся.

- Так і буду цяпер яе клікаць.

- Яна – Марыся, каханы.

Яна ўсьміхнулася, і пацягнулася, выгнуўшыся. Ён дакрануўся губамі да яе саску.

- Давыцягваешся ты, мая любая. Зараз нікуды ня пойду.

Тэлефон зазваніў яшчэ раз.

Ён гнеўна сарваў трубку.

- Вы што, звар'яцелі? – запытаў ён.

- Вам канверт, па DHL, - пачулася ў адказ. – Просяць прыняць асабіста.

- Вось як? Ён узьняў бровы. А потым быццам бы нешта ўспомніў.

- Добра, я зараз спушчуся. Хай пачакаюць хвіліну. Усе яны.

- Любая, - вымавіў ён. – Ты не сьпяшайся, я сам спраўлюся. Адпачывай. Калі будзеш гатовая, спускайся. Ён крануў яе вусны губамі, накінуў халат, і накіраваўся ўніз.

Унізе яго ўжо чакалі.

Кухарка сядзела на канапе, і зацікаўлена глядзела нешта ў мабільніку. Калі ўбачыла яго, тэлефон адлажыла, але ж засталася сядзець, палажыўшы нагу на нагу.

- Здравствуйте, - вымавіла яна гучна і вясёла. Яе накачаныя вусны раз'ехаліся ў вусьмешку, якая магла б лічыцца прывабнай, калі б твар пры гэтым рухаўся. Але ж на ім так і

застыў выраз пластыкавай лялькі – глупаваты. Яе белыя валасы былі забраныя ў высокі хвост – як у Кім Кардашьян, на ёй была апранутая шчыльная белая сукенка з глыбокім выразам, далоні на дзьве вышэй за калена. Калі ж яна сядзела, нізу сукенкі зусім не было бачна. Затое была бачная бялізна у колер, нібыта яе не было.

- Прыгатавалася, - падумаў ён пра сябе, і ўсьміхнуўся.

- Вітаю, - вымавіў ён. – Пачакай, пяць хвілінаў. Ён выйшаў вонкі, дзе на ганку яго чакаў кур'ер, працягнуўшы яму жоўта-чырвоны канверт. Расьпісаўся ручкай, якую дастаў зь кішэню чорнага халату, паставіўшы размашысты роспіс "Паркерам" – В, і шмат завіткоў. Ваўковіч М.А.

Узяў канверт, і прайшоў зь ім у хол, адкрываючы на хаду. У канверце апынуўся пластыкавы файл з дзьвума копіямі дамовы, падпісанай зь іх боку. Адна – яго, а другая – Алега. Старана па дамове абязуецца паставіць … згодна прылажэньню. Ён пралістаў дакумент, глянуў у канец. Пазіцыі ў прылажэньні былі закадыраваныя лічбамі. Абсталяваньне. Якое, не ўдакладняецца. Такімі яны і будуць адпраўлены – ананімнымі. Поўныя назвы пойдуць асобнай, дыпляматычнай почтай. Растаможкі ня будзе, зразумеў ён. Гэта і добра. Ёсьць такія грузы, што ідуць, мінуючы ўсе афіцыйныя каналы. Ідуць пад грыфам кіраўніцтва краіны напрамкі. Ён сеў ў крэсла насупраць. Кінуў на стол канверт з файламі. Яны яму былі ня дужа патрэбныя – гэтыя таварышы не абмануць. Так, для прыстойнасьці.

Ён адкінуўся ў крэсьле. Хлопнуў сябе па кішэню. Чагосьці не хапала.

- Цыгарэты мне падай, - кінуў ён. Яна глянула на яго, хлопаючы вачыма з доўгімі накладнымі вейкамі.

- Там, на каміне. Ён махнуў галавой у бок.

- І каву зрабі. Машына за маёй сьпіной на кухні. Каньяк там недзе стаіць. Знойдзеш.

Ён узяў дамову – усё ж вырашыў прабегчы вачыма. Яна ўстала, абцягваючы сукенку, гледзячы на яго, у туфлях на высокіх абцасах, марудна прайшла да каміну, узяла пачку цыгарэтаў, і падышла да яго, віхляючы сьцёгнамі.

- Ты так працаваць сабралася? – акінуў ён яе позіркам.

- Да, платье – это моя униформа. А вместо туфлей я взяла кроссовки. Яна паказала на невялікую торбачку у куце канапы.

- Ясна. Ён кіўнуў, паглыбляючыся ў дакумент. Старана А пастаўляе Старане В цераз Старану С абсталяваньне згодна перачню, разьлік ажыцяўляецца шляхам пераліку Стараной В цераз Старану С у бок Стараны А суммы … за вылікам … адсоткаў, якія Старана С утрымлівае згодна Пагадненьню такому-та паміж Старанамі … прылагаецца… Усё, як было дамоўлена раней. Усё чыста.

Ён нават і ня ўбачыць, і не даведаецца, што там за абсталяваньне, і як і куды яно пойдзе. Проста пасрэднік, прамежкавая ступенька, на якой асядзе пэўная частка грошаў. Для гэтага ён, нарэшце, і быў патрэбны. Ён зацягнуўся цыгарэтай. Цяпер ён падпіша дакумент, і накіруе яго ў бок Стараны В, інакш, Алега, які будзе мець справы са Стараной А згодна яму. Бяз гэтых прамежкавых каммунікацыйных вузлов дамовіцца б Алегу са Стараной А было не магчыма. Выйсьці на гэтых людзей ня так проста. Толькі Фёдар праз свае сувязі змог няек выбіць гэтую долю ў агульным пуле паставак, памеры якога ён сам ня ведае, і нават не жадае ведаць.

Задумаўся. Як толькі грошы будуць пералічаны, па дамове банк утрымае яго адсотак, і перакіне на рахунак адной маленькай італьянскай фірмачкі, адкрытай на яго імя. Кампанія па арганізацыі мерапрыемстваў. Артыкул рахунка – арганізацыйныя расходы. Сумма – крыху меньш за мільён Еўра. Ня блага за адзін вечар перамоваў. І гэта – толькі пачатак. Цяпер у яго ёсьць віла, і ён амаль мільянер. Амаль. Хутка будзе гатовая яшчэ адна дамова – на сумму, большую ўдвая. Утрыманьне вілы яму абыйдзецца тысяч у трыста еўра ў год, і гэта яшчэ эканомна, без налогаў. Гэты кантракт проста акупіў яму яшчэ год жыцьця ў Італіі. А калі ён пажадае застацца тут на

ўсё жыцьцё? Добра, што налогі за вілу за гэты год Фёдар ужо заплаціў. Вось так – здаецца, мільён еўра, а калі пачнеш лічыць – дык у кішэні застанецца пуста. Толькі можа на цыгарэты і хопіць. Ён яшчэ атрымаў частку ганарару за фільм ад Паола – пяцьдзесят тысяч Еўра яму і ёй. Нейкія сьмешныя грошы. Ды адкуль у Паола грошы? Ён зь ім працаваў не за грошы, наогул, а за ідэю. Яму падабаўся ўвесь працэс, падабаўся Паола. Ды і ня ведаў ён, шчыра кажучы, што апынецца гаспадаром вілы на марскім узьбярэжжы.

Ён жа жадаў мець узровень жыцьця, годны яе. І вось, Бог яму паслаў тую сумму, якой ледзь хапала на ціхмянае жыцьце маленькай дзяўчынкі на берагу цёплага мора ў спакойнай Фларэнцыі. А яна ж яшчэ апранаецца, выкарыстоўвае касьметыку, і шмат яшчэ чаго ёй патрэбна. Есьць, праўда, ня шмат. Ён усьміхнуўся, крыху сумнавата. Трэба зарабляць болей, а тое спазнаюць яны галечу. Ня можа ж ён пазбавіць каханую неабходнага.

Ён дакурыў, і кінуў акурак у попельніцу.

За сьпіной загудзела кава-машына, і Марыся зьявілася з чашкай. Кофе зрабіла хутка, і каньяк знайшла, не запытваючы. Наліла ў крышталёвы бакал.

- Наступны раз у просты налівай. Як для віскі. Лімон ляжаў побач на блюдцы, парэзаны, пасыпаны кавай і цукрам. Па ўсіх правілах.

- І сапраўды, справу ведае, - задаволенна падумаў ён. – Аднак нешта ў ёй яму не падабалася – ён сам не разумеў дакладна, што. Нейкая яна была дужа пластмасавая, нейкая мэтанакіраваная, не жанчына, а трансформер. Быццам бы зараз зложыцца, і пераўтворыцца ў нешта – накшталт пыласмока ці брэндавай сумачкі. Ён пакруціў галавой, каб выгнаць з розуму непрыемную карціну.

- Сядай сюды, - вымавіў ён. Яна падыйшла да яго, і спынілася, быццам бы ня ведаючы, куда сядаць. Быццам бы сабралася сесьці яму на калені. Яшчэ не хапала.

- На канапу, - удакладніў ён, махнуўшы рукой ад сябе. Трэба яшчэ камандаваць навучыцца. Такой прыслугі ў яго дагэтуль не было.

- Марыся, - дадаў ён.

- Раскажы аб сабе. Яна зьдзіўлена глядзела на яго.

- А что расказать? – асьцярожна запытала праз хвіліну.

- Усё, - коратка кінуў ён. – Дзе нарадзілася, хто бацькі, як сюды трапіла. Адукацыю я тваю ведаю, месты працы таксама. Санкніжку бачыў.

Яна замірґала вейкамі, як у шпака крыламі.

- Это не очень интересно, … синьор, - нарэшце вымавіла яна.

- Калі я запытваю, трэба адказваць на пытаньне. На першы раз выбачаю. Потым выкіну вон. Запомні: хочаш тут працаваць – робіш тое, што я кажу. Калі ня ведаеш, як, можаш запытаць. Гэта раз. Два. Калі я пытаюся нешта ў цябе, я павінны пачуць адказ. І ўсё. Я з табой ні гуляцца, ні сябраваць не намерваюся. Ты тут на працы. Ніякіх персанальных стасункаў з табой тут заводзіць ніхто ня будзе, можаш не баяцца.

- Я не боюсь, - вымавіла яна. – На гэты раз яе голас гучэў упэўнена. – Я из маленького городка, почти деревня, под Одессой. В Киеве я работала в ресторане. Родители у меня простые, работают на себя, сад, огород, как у всех. Рынок.

Яна паціснула плячыма.

- Мать работала в школе. Уборщицей.

Яна з выклікам глянула на яго.

- Отец – автомеханик.

А сюда я приехала на заработки. Просто тут можно хорошо заработать. В определённых сферах, - дадала яна.

- Гэта якіх жа? – пацікавіўся ён.

- Гостинично-ресторанный бизнес, - адказала яна, нахіляючы галаву.

- Пасьцельна-рэстаранны, - удакладніў ён. – Прастытутка?

- Сеньор очень проницателен. Яна паправіла выраз сукенкі красамоўным жэстам. – У меня широкая квалификация.

- Наколькі? На яго твары не варухнуўся ні водны мускул. Гэты мужчына сядзеў насупраць яе ў халаце на голае цела – яна бачыла яго расьхінутыя шырокія грудзі, пакрытыя цёмным воласам, і была ўпэўнена, што і там, пад поламі, у яго таксама нічога няма. Ён нават не абцяжарыў сябе адзецца, як трэба, калі спусьціўся. Пэўна, хоча даць ёй такім чынам зразумець, што кухняй яе справа абмяжоўвацца ня будзе. Цікава, а гэта будзе ўваходзіць у плату, ці аплочвацца асобна? Але ж запытаць яна не рашалася. І раптам падумала, што яго яна гатовая абслугоўваць і задарма. На персьпектыву, так сказаць. На будучыню. Не дарма ж яна ўкінула столькі грошаў у сваю знешнасьць.

- Всё, что угодно. Яна паціснула плячыма. – Что сеньор пожелает.

Ён усьміхнуўся – неяк змрочна.

- Тваёй кваліфікацыі на мяне ня хопіць, - вымавіў, пільна гледзячы на яе.

- У меня очень высокая квалификация, - не пагадзілася яна.

- Гледзячы на тваю зьнешнасьць, я б сказаў, што ты зь дзяшовых шлюх. Нічога цікавага. Ён паціснуў плячыма. Аднак ты ведаеш, як падаваць лімон. Раптам яго ўсьмешка стала шырокай, прывабнай.

- Так што будзеш працаваць, як і было дамоўлена, кухаркай. Нікім іншым я тут цябе ня бачу.

Яна ўжо нешта хацела адказаць, як зьверху ўніз пачуліся крокі.

Летыцыя, у шаўковым доўгім халаціку, белым, з карункамі, спусьцілася ўніз. Яе валасы былі вымытыя і высушаныя, і закручаны ў высокі пышны вузел. Сьветлы тварык пабліскваў, нібыта вільготны, на вейках не было нават і тушы, толькі клубнічнага колеру бальзам на вуснах. І бялізны пад халатам не было. На нагах – ізноў мюлі, чорныя, з белым бантам.

Яна падышла да яго, нахілілася для пацалунка. Ён крануў яе вусны сваімі, палажыўшы руку ёй на сьцягно.

- Твоя зато шлюха дорогая, - падумала яна ядавіта.

– И что она тебе такое показывает, интересно. Понтуешься ты, мужик. Я тебя ещё впечатлю. Ты меня потом сам просить будешь. А я – не жадная. И не гордая. За хорошую цену.

- Вы тут паразмаўляйце, а я ў душ пайшоў, золатка, - вымавіў ён, паўстаючы.

Калі яго постаць схавалася ў душавой за басейнам, маленькая гаспадыня, як яна яе сабе вызначыла, павярнулася да яе.

- Добрай раніцы, Марыся. Я рада, што вы прыйшлі, і будзеце нам цяпер дапамагаць. Давайце, я пакажу вам кухню, і раскажу, што Міхась любіць есьці на сьняданак, і наогул. Вы можаце называць яго Міхаіл, гэта тое ж самае.

Яна прайшла на кухню, Марыся – за ёй. Куханная зона была невялікай, аднак тут мелася ўся патрэбная для гатоўкі тэхніка – камбайн, куханны робат, мульціварка, электрапліта, кава-машына, пасудамойка, і вялікі халадзільнік, вышэй за Міхасёў рост.

Яшчэ асобна быў зроблены бар, са стойкай і напоямі. На стале стаяў набор дарагіх кухонных дасок некалькіх відаў, у шкафах месьціўся посуд – ня шмат, але ж ізноў – дарагі, стылёвыя талеркі ў выглядзе неапрацаванай пяшчанай глебы і мармуровых плітаў, яркія чашкі для чая і кавы, некалькі стопак белых талерак рознай глыбіні.

- Я люблю просты посуд, - удакладніла Летыцыя. – Wilmax. Ён

нагадвае мне дом. Ты сумуеш па дому, Марыся?

- Ня дужа. Яна паціснула плячыма.

У халадзільніку была акуратна раскладзена ежа – усё у кантэйнерах пад вакуумам, фрукты па асобку у латках, некалькі стэйкаў у плёнцы, сыр, зяленіна, малако, йогурты, некалькі відаў салямі, соўсы. З прыгатаванай ежы не было нічога.

- Я гатую, і мы адразу з'ядаем, - вымавіла Летыцыя. – Гатовую ежу я не пакідаю, калі не даелі, выкідваю. Міхась разагрэтае ня есьць. Таму гатую ня шмат. Ён любіць усё звычайнае – катлеты, плоў, аладкі картофельныя зь мясам, суп любы. І італьянскае таксама – пасту, піццу толькі ня любіць. Кажа – гэта сялянская ежа. Але ж ня трэба пірагі, усё мучное. Ён толькі пасту з мучнога есьць. Мяса любіць. Рыбу ня дужа. Зеляніну. Кашы ня есьць ніякія. Картошку і ўсё зь яе любіць. Толькі варыць, ці запякаць. Са смажанага толькі аладкі.

Кальмары любіць фаршыраваныя, - падумаўшы, дадала яна. Рызотта. Салаты ўсе. Торт можа з'есьці. Цэлы, калі задумаецца. Яна ўсьміхнулася.

- Наогул, яго карміць проста. Галоўнае, каб дастаткова было, ня многа і ня мала. Лепей болей, чым меней. Ён катлеты чатыры за раз можа з'есьці. Але ж я гатаваць ня дужа ўмею. Я ж не прафесіянал, як вы. Яна паціснула плячыма – вузкімі, ледзь прыкрытымі карункамі халату. Пад халатам нібыта нічога не было. Быццам бы не дзяўчына, а бясплотны дух. Кранула пышны вузел цяжкіх валасоў на макушцы.

Ад яе дорага пахла нейкай тонкай, але ж церпкай парфюмай. Марыся ня ведала яе назвы – з парфюмы яна наогул ведала толькі Versace. Некалі ёй дарылі розавы, і зялёны. Кліент. Але ж апынулася падробка – бо дужа хутка пах зьнікаў. Гэты ж пах не зьнікаў, марудзіў, лунаў побач.

- Вы прыгатуйце, калі ласка, нешта хуткае, з таго, што ёсьць. Ёсьць каўбаскі, сардэлькі ў маразільніку. Паста і крупы тут – яна адчыніла шкафчык унізе. Соўсы тут. Калі нешта будзе

патрэбнае купіць, запішыце, і скажыце мне, я адпраўлю чалавека.

Вы тут гаспадарце, я зараз у салон паеду. Там і перакушу па дарозе, так што не турбуйцеся. Яна ўзяла з палічцы йогурт. Зрабіце мне яшчэ сэндвіч з курыцай – там ляжыць вэнджаная грудка. Зеляніна тут. Яшчэ, калі ласка, зварыце яйцо пашот. Вось тут фарш. Можна катлеты, можна баланьезе пасту.

- Спасибо, я разберусь. Марыся кіўнула. – А потом я вам подготовлю меню на неделю. Вы когда приедете, согласуете. Хорошо?

- Выдатна! – Летыцыя ўзрадвалася. – На абед можаце зрабіць боршч і аладкі картофельныя з фаршам. Ён іх дужа чакае.

- Я пайду, і праз паўгадзіны буду сабраная. Прашу вас, каб сэндвічы былі гатовыя, і кава. Пазваніце мне наверх, калі ласка.

Марыся кіўнула. Летыцыя сышла, толькі атлас халаціку прашапацеў. У душы таксама спынілася ліцца вада.

Ён з’явіўся нечакана ў праёме паміж кухняй і лобі – у тым жа халаце, толькі з мокрымі валасамі, якімі страсянуў, і брызгі паляцелі на сьцены. І часткова на яе, пакінуўшы мокрыя плямы на яе белай сукенцы.

- Ну як, пасябравалі? – запытаў яе ён. – Ня дужа цябе напалохала мая гаспадынька?

- Марыся. Ён усьміхнуўся – шырока. Цяпер ён быў у настроі.

- Да, всё хорошо, спасибо, - вымавіла яна. – Летиция рассказала, что вы любите есть.

- І што я люблю? – ён усьміхнуўся ізноў.

- Оладьи картофельные с фаршем, борщ, плов, - пералічыла яна. – Всё как обычно.

- Селёдку под шубой и салат оливье, - дадаў ён. – Толькі у шубу красную рыбу кладзі. Летыцыя селядзец ня есьць. Ты ж ня

будзеш мне аднаму гатаваць. Сьвініну яна таксама ня есьць. Я – ем. Гэтае запомні. Што яшчэ? Дранікі гэта добра. Я іх ужо паўгода ня бачыў. Неяк тут мы ад іх адвыклі. Мы, наогул, у рэстаране заказваем ежу. Мая каханая зусім не па гэтай частцы. Яна па частцы каханьня, - дадаў ён, гледзячы на яе з-пад чорных мокрых валасоў. На вока ўпала пасмачка, але ж ён не ўбіраў яе. Від у яго быў нейкі драпежны, як у пірата.

- А што ты яшчэ ўмееш, ты казала? – запытаў ён.

- Что будет угодно сеньору. Яна паціснула плячыма.

- Сіньёру – пакуль нічога. Ён падыйшоў да яе, і раптам яго рука узьняла яе твар, узяўшы яе крэпка за горла, пад самым падбародкам, цягнучы яе ўгару, прыпадымаючы.

Яго пальцы крыху сьціснуліся. Некалькі імгненьняў ён пільна глядзеў на яе. Яе твар пачырванеў, і яна закашлялася. Ён адпусьціў руку.

- Прафесіяналка, - усьміхнуўся ён. – Паглядзем.

Зьверху ўніз ізноў прастучэлі абцасікі.

- Каханы, я паехала! Яна абняла яго, ён – яе.

- Ты глядзі, ня доўга, любая. А тое я хвалявацца буду. Ён пацалаваў яе, і лёгка хлопнуў па попе. Шкляныя дзьверы раз’ехаліся, і зьехаліся. Цяпер яна апынулася з гаспадаром адна, сам насам. І раптам ёй стала страшна. Так, як не было ніколі. Тое, што ён зрабіў зь ёй, дагэтуль ніхто не рабіў. Яна, канешне, чула пра такое – усялякае бывае. Але ж пакуль ён трымаў яе так, раптам ёй паказалася, што на яе глядзіць твар забойцы. А можа, ну яго? – падумалася ёй. – Адмовіцца? Сказаць, што перадумала? Але ж кантракт быў ужо падпісаны, і, да таго ж, ёй усё ж было цікава. Не было яшчэ мужчыны, які не падпаў бы пад узьдзеяньне яе чараў. А гэта быў нейкі жарт, вырашыла яна. Цяпер жа у яе нават ўзьнік спартыўны інтарэс.

Ён пайшоў некуды наверх, ізноў па лесьвіцы. Яна апранула фартух, паставіла ваду на вагонь, зварыла пасту, абварыла і

падсмажыла сардэлькі з таматамі, пасыпала ўсё сырам і базілікам, зрабіла каву, і набрала кароткі нумар.

- Гатова? – запытаў ён. – Так хутка? Добра, зараз спушчуся.

Праз пяць хвілінаў ён ужо быў тут, апрануты ў спартыўныя мяккія штаны – Адыдас, макасіны і шэрую майку, крыху падраную для карціннасьці.

Яна моўчкі накрыла на стол, ён так жа моўчкі паеў. Узяў са стойкі газету – Il Giorno, і пачаў чытаць. Нешта прагледжваў хутка, нешта чытаў уважліва. Потым адклаў газету ў бок. Яна адышла да стойкі, і стаяла, чакаючы. Раптам ёй расхацелася нешта запытваць у яго, і захацелся проста стаць незаўважнай, як цень. Як шэрая мышка, якой калісьці яна і сапраўды была. Простай дзеравенскай нязграбнай дзяўчынай, якая дужа хацела знайсьці сваё шчасьце ў вялікім горадзе. Толькі вось, неяк яна пайшла ня той дарогай, бо ж да шчасьця яе гэтая дарога не прывяла. Ці шчасьце яна ўяўляла не такім, якое яно насамрэч было. Але ж дарога прывяла яе некуды яшчэ – да ўпэўненасьці ў сабе і сваіх сілах. Цяпер ёй здавалася, што сьвет гатовы легчы ля яе ног. Трэба яшчэ нямнога пастарацца, падштурхнуць, і яно, шчасьце, абрынецца ўніз, прама ў рукі, як сьпелы плод. Бо ж шчасьце вымяраецца грашыма. А ў гэтага мужыка грошы, без сумненьня, былі. Трэба трымацца бліжэй да яго, і можа, нешта перападзе і ёй. А можа, і ня нешта. Раптам яна ўявіла сябе гаспадыняй гэтай шыкоўнай вілы. Было б ня блага. Яна б глядзелася побач зь ім значна лепей, чым тая бледная немач. Мадэлька. Пэўна, знайшоў на нейкім паказе, ці ў эскорце - заказаў па каталёгу. Дзе яшчэ такі мужык можа ўзяць такую малалетку. І яна яго не задавальняе, гэта ж бачна. Ён на яе глядзеў галоднымі вачыма, пакуль яна сядзела ўнізе на канапе.

- Дзякуй. Ён адклаў у бок газету, пасунуў посуд. Дапіў кавы, і адставіў чашку.

- Зрабі яшчэ.

Яна зрабіла сьвежай. Ён марудна адпіў, нібыта задумаўся.

Запішчэў мабільнік. Ён глянуў у яго, нахмурыўся, і нешта хутка

напісаў.

Потым паклаў на стол, устаў, і павярнуўся да яе.

- Прафесіяналка, кажаш? Яна кіўнула.

Тое, што адбылося потым, яна не магла і ўявіць.

Ён з размаху хлопнуў яе далоньню па твару – з носу брызнула кроў. Яна ўскрыкнула. Яго вочы сталі цёмнымі, амаль чорнымі. Ён разьвянуў яе спіной да сябе, нахіліў, і без усялякіх прылюдзіяў моцна засадзіў ёй туды, закрыўшы рот рукой. Яна хацела закрычаць ці вырвацца, але ж не магла. Толькі дзёргалася ў яго руках. Некалькі хвілінаў ён хутка і глыбока рухаўся, трымаючы яе за сьцёгны, глыбока ўганяючы сабе ў яе, а потым выйшаў, выцерся вільготнай сурвэткай з пачкі, і кінуў яе на падлогу.

Зь яе носу на стол капалі буйныя кроплі крыві, і, здаецца, кроў пачала падцякаць і яшчэ аднекуль, бо боль быў страшэнны.

- Прыбяры тут. Прафесіяналка. Каб болей я такога ня чуў. Хоць адзін яшчэ позірк, ці нават думка ў мой бок, я табе пакажу такое, што табе і ў страшным сьне не прысьніцца. Займайся. У цябе яшчэ абед і вячэра. Падлогу памый, пыл вытры. Я пайшоў працаваць. Там, у каморы, прылады для прыбіраньня. Знойдзеш. Ён махнуў рукой некуды.

Глава 27: Цемра

Ён прайшоў у пакой, і апусьціўся на канапу насупраць вакна. Выцягнуў ногі, палажыўшы іх на нізкі пуфік-тумбачку. Чорная пругкая скура пад ім парыпвала, прыемна халадзіла цела. Уверсе гудзеў кандыцыянер, наганяў холаду – здавалася, зараз з-пад столі сыпане сьнегам. За вакном сонца ўзьнялася высока ўгару, і бязьлітасна палівала зямлю пякельным жарам. Косыя промні падалі на падлогу, падбіраліся да яго, але ж слабелі, і зьнікалі недзе на паўшляху, ня здольваючы дасягнуць той далёкай стараны пакою, дзе ён сядзеў. Сьцены і столь былі афарбаваныя ў антрацытавы і цёмна-шэры колер, быццам бы аднекуль з рашчыліны ў скалах ён бачыў навальнічнае неба. На кантрасьце ложак, засланы кіпельна-белым, з вузкай цёмнай паласой коўдры поперак, выглядаў плато, пакрытым ільдом. Адзінай каляровай плямай, тусклавата-яркай, быў пейзаж у цяжкой бронзавай раме над узгалоўем – рудавата-карычневыя сьцены гораў і далёкія пагоркі пустыні, над якой чырванела заходзячае сонца. У даліне, пакрытай ценем, месьціўся невялікі атрад. Збоч віднеліся вежы ці то крэпасьці, ці то гораду.

Яму б хацелася бачыць яе на гэтым ложку, закінуўшай рукі за галаву, у тонкай шаўковай сарочцы, якая больш падкрэсьлівала, чым хавала яе цела, альбо сядзечую, апёршыся, на падушкі, з кнігай ці тэлефонам у руках, з сур’ёзным тварыкам вывучаючай нешта, што ён даўно ўжо ня тое што вывучыў – пережыў, і цяпер зайздросьціў ёй, таму, зь якой радасьцю яна адкрывае тое, што калісьці так радавала і вабіла яго самога. Ён жа сам, здаецца, стаяў на высокім, шэрым камяністым плато, і глядзеў у бездань, далечыню, пазбаўленую ўсіх магчымых колераў, якія віравалі за яго сьпіной. Бездань паўставала цемрай, разгортвалася перад ім. Здаецца, там нешта было, аднак гэта яго вочы яшчэ не навучыліся бачыць.

- У кожнага свае ўрокі, сонейка, - падумаў ён. Хай твае будуць сьветлымі і радаснымі, напоўненымі хараством і любоўю.

Тэлефон даўно ўжо міргаў паведамленьнем – Марк. Нешта

істотнае, бо ён рэдка пісаў, і яшчэ радзей тэлефанаваў. Аднак цяпер месенджер узрываўся, патрабуючы яго ўвагі. Гэта была асаблівая закадыраваная праграма, якую не спампуеш у звычайным магазіне прылажэньняў. Яна разпрацоўвалася для вузкага выкарыстаньня, і мела ўзмацнёную сістэму аховы, такую ж, як і яго тэлефон лімітыраванай мадэлі Vertu. Чорны глянцавы корпус тэлефона прыемна абцяжарваў руку. Ён і ёй такі набыў, толькі паменьш памерам, жаночы, абцягнуты чырвонай скурай.

Зайшоў у месенджер, і прачытаў:

- Я павінен з'язжаць, і хутка. Ты зможаш мяне прыняць?

- Канешне, - адказаў ён, адпраўляючы адказ. Яго адразу прачыталі. Справы былі і сапраўды няважныя, калі Марк ужо гадзіну сядзіць зь тэлефонам у руцэ, вартуючы яго.

Падумаў, і напісаў наступнае пытаньне:

- Калі?

- Сёньня, - прыляцеў адказ.

Ён не зразумеў. Як так?

Падумаўшы, напісаў:

- А дзе ты?

- У аэрапарту. У Маскве. Праз дзьве гадзіны рэйс да Мілану.

- Ну, добра. Тады бяры таксі, і адразу едзь сюды. Адрас ты ведаеш?

- Удакладні.

Ён напісаў каардынаты вілы, і адправіў паведамленьне. Можа б, і ня трэба, падумаў. Але ж наогул віла Фёдара не для каго не сакрэт. Ды вось тое, што тут жыве ён, шырока не асьветлена. Як і тое, што віла гэтая наогул цяпер яго, аб чым ня ведае ніхто. Нават і Марк.

- Марк, а гэта насамрэч ты?

Пытаньне раптоўна само сарвалася зь яго вуснаў, ці пальцаў, як лепей сказаць, ён ня ведаў.

Імгненьне на тым канцы памаўчалі.

- Я, - нарэшце з’явіўся тэкст.

- Пакажыся. Ня веру.

Тэлефон завібраваў, ён крануў значок зь зялёнай трубкай.

На імгненьне стала цёмна, а потым далонь убралі, і перад ім з’явіўся знаёмы твар. Каротка пастрыжаныя валасы Марка былі схаваныя кепкай, падбародак заросс сьветлым густым шчаціньнем. Але ж, без сумненьняў, гэта быў ён.

- Не магу вольна гаварыць, тут людзі, - вымавіў ён нягромка. – Цяпер ты мне верыш?

- Веру. За плячыма Марка ярка сьвяцілася табло. Рэйс на Стамбул, рэйс на Вену, рэйс на Мілан. І сапраўды, меней, чым праз дзьве гадзіны.

- Ну, як раз да вячэры пасьпееш. Я тут кухарку прыдбаў. Прафесіяналка. Яго вусны расплыліся ў вусьмешцы.

- Да ты што? Ты ж зь дзяўчынай жыў. Жонкай. Навошта табе кухарка, ды яшчэ і прафесіяналка? – зь цікаўнасьцю запытаў Марк.

- Жонка – гэта не кухарка, запомні. Калі хочаш быць шчасьлівым з каханай жанчынай, хатнія абавязкі трэба дэлегаваць. Чорную работу, - памарудзіўшы, дадаў ён.

Марк нечакана рассьмяяўся ў адказ.

- Разумею. У цябе там вясёла, - адказаў ён.

- Прыедзеш, убачыш. Відэа на маніторы зьнікла, і тэлефон згас. Ён устаў, апусьціўся на падлогу, і некалькі дзясяткаў раз

аджаўся. Потым устаў, адкрыў ноўт, прагледзеў навіны – саміт у Жэневе адбыўся, што далей, нікому не вядома – адкрыў дакумент, і паглыбіўся ў працу.

Яна прыгатавала ўсё неяк хутка – і сама зьдзівілася. Ды і сапраўды, чаго корпацца? У ідэальна ўбранай, уладкаванай найлепшым чынам кухні ўсё было разьмешчана зручна і пад рукой, як дасканала разпрацаваны інтэрфейс, калі сам не заўважаеш, як перамяшчаешся паміж укладкамі. Яна хутка начысьціла бульбу, заліла вадой, вылажыла фарш у глыбокую міску, дадала солі і сьпецыяў, парэзала цыбуліну, зеляніну, і адставіла ў бок. Адкрыла ўпакоўку салёнай фарэлі, нарэзала, частку бульбы зварыла, як і яйкі, зрабіла соўс з аліўкавага алею. Вакол было ціха. Ні ў холе крокаў ня чулася, ні наверсе. Паснуў ён там? Ці чым заняты? Хоць бы. Хоць бы ён да ночы адтуль не з'явіўся, падумалася ёй. Тое, што адбылося, яе ня дужа пакрыўдзіла. Але ж дужа раз'юшыла. Якія ўсё ж яны скоты, гэтыя мужчыны. Усе яны. Асабліва такія, як гэты – багатыя. Наглыя. Нікога ня лічаць за людзей. З другога боку, а што яна хацела? І ці можа быць неяк па-іньшаму? Калі падумаць, то нічога асаблівага зь ёй не адбылося. Нейкі звычайны разбэшчаны прыдурак, які думае, што цар і уладар усяго вакол, што знаходзіцца на адлегласьці яго рукі, ці яго кашэля. Да таго ж, цяпер зразумела, што яму патрэбна. Любіцель нетрадыцыйнага сэксу ў стыле "хард". Неяк хутка ён пракалоўся, хоць і выдзелваўся, робячы зь сябе нейкую загадкавую персону. Звычайны "алігарх", ці хто ён там. Гэта, дарэчы, цікава. Даведацца б пра яго паболей…

Але ж раптам нейкі халадок прайшоўся па яе скуры. Колькі б яна сябе не суцішала, і не ўнушала сабе, што ўсё добра, і што ўсё у яе пад кантролем, тое, што яна сапраўды адчувала, быў жах. Яна яго баялася. І ня быў ён звычайным алігархам. Тыя не такія. Яны – простыя і зразумелыя, можна сказаць, што і свае хлопцы. Яна такіх шмат сустракала раней. Яны гаварылі зь ёй на адной мове – мове вуліцы. І задавальненьні, і інтарэсы ў іх былі дужа прадказальнымі. Гэты ж такім ня быў. Выглядаў па-іньшаму, рухаўся, нават пазіраў, еў, піў – усё не так, як тыя, звычайныя. Газету чытаў за сталом – па-італьянску. Ніколі яна ня бачыла, каб багаты рускі чытаў за сталом аркуш на мове

краіны, у якой знаходзіўся, ды яшчэ – так уважліва. Хоць ён і ня быў рускім – беларус, як сказала яна, гаспадыня-малалетка. Аднак беларус ці рускі – хіба ж гэта не адное і тое ж? Ва ўсялякім выпадку, мова ў іх аднолькавая. Ды і ўсе яны аднолькавыя, і яна, і ён, і рускія – размаўляюць на адной мове, любяць адныя і тыя ж грошы. Вырасьлі лічы што разам, глядзелі адныя і тыя ж фільмы, таньчылі на дыскатэках у парку, слухалі “Руки вверх”, “Виагру” і “Цоя”. Аднак, апынулася, што вось гэты – не такі, не зразумелы. Гаворыць, лічы, што па-украінску, на мове, якой яна сама ганьбавала, як сялянскай, бо на ёй размаўлялі яе бацькі-недарэкі, чытае па-італьянску, дзяўчына таксама нейкая халодная, чужая. З роднага толькі – ежа, і тое ад селядца ў шубу адмовіліся.

Яна як раз сконьчыла мыць посуд, і толькі вырашыла зрабіць сабе каву, як дзьверы ў хол раз’ехаліся, і пачуліся лёгкія, хуткія крокі абцасікаў па гладкай і бліскучай, як шкло, падлозе.

Гаспадыня зайшла ў хол, уськідваючы доўгімі, глянцавымі валасамі, якія ліліся зь яе плечаў, як цяжкі вадапад. Ськінула на канапу маленькую сумачку і паўпразрысты карункавы жакецік, застаўшыся ў шаўковых штанах і топе на брэтэльках, і зайшла на кухню.

- Як вы, Марыся? Як справы? Усё атрымоўваецца? – зацікаўлена вымавіла яна.

- Уже все получилось, - у думках адказала яна ёй. – С твоим мужиком. Не долго он ждал момента – только как ты ушла.

- Да, все хорошо, - сьціпла вымавіла яна. – Сделать вам кофе? Я как раз собиралась. Вот, посмотрите, всё готово. Сейчас хочу готовить обед. Вы же сказали – разогретое не едите.

- Дзякуй вялікі. Канешне, зрабіце кавы. Прынясіце мне туды. Яна кіўнула ў бок. Яе твар, зьзяючы пасьля працэдураў, з дасканала нанесеным тонкім празрыстым макіяжам, быццам бы сьвяціўся ў сьвятле заходзячага сонцу, прамень якога адбіўся ў маленькім бліскучым каменьчыку на танюткім ланцужку на шыі. Камень раптам зайграў мноствам колераў – дыямантавая кропелька пакацілася па скуры. Яна павяла галавой,

устрахнуўшы валасамі, убіраючы іх назад.

- Вы отлично выглядите, - раптам вырвалася ў Марысі. – А губы не хотите сделать?

- У сэньсе, губы? – яна глянула на яе зьдзіўлена. – А што я павінна зь імі зрабіць?

- Увеличить. Вы такая красивая, а с губами будете ещё красивее. Гораздо. И ещё можно пару уколов. Тут, и тут. Яна паказала на сабе – на скулы і ў вугалках вачэй.

- Просто это модно. Вы будете яркой. Вашему мужчине понравится, - не ўтрымаўшыся, вымавіла яна.

- Вось як? Дзяўчына зацікаўлена глянула на яе. – Вы і праўда так лічыце?

- Ну да. А что тут такого? Мой жизненный опыт говорит о том, что мужчины любят глазами. И они не замечают мелкие детали. Любят яркие образы, которые «цепляют» глаз. Я проходила на семинаре по психологии – «Как покорить мужчину». Нас учил очень крутой коуч. Опытный, профессионал. Настоящий трансвестит, а они знают в этом толк.

- У сэньсе? Трансвестыты ведаюць тоўк у мужчынах? Ружовы роцік дзяўчыны прыадкрыўся, вочы акругліліся.

- Малолетка глупая, - падумала пра сябе яна.

- Да, конечно. Они же сами мужчины. И одновременно – женщины. Без наших недостатков. Геи – самые лучшие визажисты. Все мировые дизайнеры – геи. Лучше гея мужчину никто не знает.

Яна паблажліва ўсьміхнулася.

– Во всех салонах красоты в Москве геи работают. И в Киеве - только в самых дорогих. К такому мастеру нужно задолго записываться. Я тоже была такая, как вы. Никакая. А потом меня преобразили. Вы знаете, меня в родной деревне никто не

узнал. Все думали, что я столичная фифа.

Я их и не разубеждала.

Яна ўсьміхнулася. Наколькі магла абколатымі вуснамі.

- Вы лічаце мяне ніякай, Марыся? – дзяўчына мякка ўсьміхнулася ў адказ.

- Нет, я не про это. Вы – очень красивая. А будете ещё красивее. Для вашего мужчины.

- Какая ж она дура, - прыйшло ёй на вум. – Совсем тёмная. И недалёкая. Я над ней издеваюсь, а она ничего не понимает.

- Мой муж любіць натуральную прыгажосьць. Можа, што іньшыя мужчыны і любяць такіх, як вы… памарудзіўшы, дадала яна. Але ж я ведаю, што патрэбна яму. Што яму нравіцца. Я яго даўно ведаю, дужа даўно. Раптам яе вочы пацямнелі.

- Ён не такі, як іньшыя. Вы таксама даведаецеся аб гэтым. І, да таго ж, мне самой не падабаецца, калі твар выглядае ненатуральна. Калі б Міхась папрасіў мяне зрабіць нейкія ўколы, я б падумала, што гэта ня ён, а нехта іньшы. Якога я б не змагла болей кахаць. Але ж ён такога ня скажа. Ніколі. Ён – самы лепшы, ідэальны, хоць, канешне ж, у яго ёсьць свае асаблівасьці, як і ва ўсіх нас. Ён – добры чалавек … толькі яго нельга злаваць. Яна замаўчала.

- Прынясіце мне кавы. І яшчэ, вы вафлі рабіць умееце? Я купіла вафельніцу, але неяк мне было ляніва зь ёй разьбірацца.

- Без проблем. Марыся націснула кнопку кава-машыны. Дзяўчына разьмесьцілася на канапе, адкрыўшы планшэт, які дастала з сумкі, ўладкавала яго ў падстаўку, і адкрыла нейкі канал з паказамі. Марыся паставіла перад ёй чашку кавы, але ж тая быццам бы не заўважала яе – паглыбілася ў шоў міравых подыўмаў.

- Ну и дурочка. Будешь смотреть свои шмотки, а твой мужик будет трахать меня. Нужно слушаться старших, если хочешь быть успешной. И не тупые показы смотреть, а что-то полезное.

Коучей слушать, психологию изучать. Нумерологию, таро. А то будешь такой вот ограниченной дурочкой, куклой, которая кроме тряпок ничем не интересуется. Красотка-мечта педофила.

Яна паціснула плячыма, і пайшла рабіць вафлі для гэтай дурной малалеткі, усё больш упэўніваючыся, што правільна зрабіла, калі вырашыла застацца тут працаваць.

Пакуль яна замешвала цеста для вафель, ён спусьціўся ўніз, пацягваючыся. Напісаў добры кавалак, нешта накшталт эпілёга-завязкі наступнай кнігі. Калі паглыбіўся ў тэму, яго зацікавілі іўдэйскія войны – і міжусобныя, і зьнешнія, і, асабліва, апошняя, з Рымам, якая апынулася для краіны ракавой. Ён пакуль адлажыў у бок Шымона – хай праветрыцца галава. Кніга яшчэ не была скончана, але ж неяк яна ішла ў яго дужа цяжка. Шмат чаго прыходзілася чытаць, а пісаць атрымоўвалася значна меней. Тыя ж урыўкі, што ён здольваў напісаць, як жадаў, годнымі, проста разрывалі яму душу на кавалкі. Бывала і так, што, напісаўшы ўрывак, ён проста адкрываў бутэльку, і піў. Сьвет вакол рабіўся для яго яшчэ чарнейшым, яшчэ больш агідным, безнадзейным. А потым ён думаў аб ёй, уяўляў у думках яе твар, выходзіў на балкон-тэрасу спальні, і назіраў захад сонца, і мора, у якім ён адбіваўся. Уключаў нешта такое, пазітыўна-італьянскае, каб разагнаць смутак, і думаў, што ня ўсё так дрэнна, і, пэўна, цемра выступае толькі ў якасьці аправы сонцу, каб яго хараство зьзяла на яе аксамітным покрыве яшчэ больш ярка.

Яна сядзела на канапе, паглыбіўшыся ў экран планшэту, дзе адбывалася нешта, дужа цікавае для яе. Грала мяккая музыка – нейкая клясычная опера. На экране праходзілі чароўныя цені супраціў антычных калёнаў. Яна павярнула галаву да яго. У яе вачах быццам бы яшчэ плылі тыя дзівосныя прывіды.

- Як прыгожа! – вымавіла яна, размаўляючы сама з сабой, і, адначасова, запрашаючы яго далучыцца.

- Што прыгожа, маё сонейка? Ён сеў побач.

- Гэты паказ.

- Гэта там музыка грала? – запытаў ён.

- Так. Я быццам бы трапіла ў казку.

Яна ўсьміхнулася, і палажыла галаву яму на плячо.

– Ведаеш, - ціха вымавіла яна, - мне ўсё падабалася, але ж я хацела бы нечага большага. Нечага такога, каб сэрца разрывалася ад прыгажосьці. Як у Валентына ў 15 годзе – Зіма-Восень 15/16. Я такога болей ніколі ня бачыла. Многа чаго было прыгожага, і раней, і пазьней, але ж гэты паказ дагэтуль стаіць у мяне перад вачыма.

- Хочаш, пакажу табе?

- Пакажы. Мне цікава.

Ён абдымаў яе рукой, не жадаючы перабіваць, спыняць гэты яе паток эмоцый. Яна жыла ў сваім сьвеце – ён у сваім, і калі ён зазіраў у гэты яе сьвет, то яму здавалася, што ён бачыць душу анёла.

Яна набрала ў пошуку назву, і на экране з'явіліся бледныя красуні ў чорных сярэднявечных адзеньнях. Шоу, і сапраўды, зачароўвала. Як мастак ён мог ацаніць майстэрства, зь якім было выканана ўсё – і вобразы, і анатураж.

- Табе б пасавала ўсё гэта. Ён крануў вуснамі яе валасы. – Калі б ты з'явілася там, то была б каралевай, прыгажэйшай за ўсіх.

- На жаль, гэта немагчыма. Яна засмучана апусьціла вочы. – Мне б хацелася, але ж яны – прафесіяналкі. Ня тое, што я.

Ізноў – прафесіяналкі. Ён усьміхнуўся.

- Ты – сапраўдная багіня, годная ўсяго самага лепшага ў сьвеце. Прафесіянал – гэта той, хто імітуе нешта. Ты ж – увасабленьне прыгажосьці. Няма ніякіх праблемаў, каб ты трапіла ў любы паказ, які жадаеш. Толькі сумняваюся, што нехта створыць нешта такое асаблівае, годнае цябе. Я б стварыў для цябе калекцыю. Толькі тваю. Уласную. Такую, як хочаш ты. Каханьне маё. А можа, калісьці і ствару. Хто яго ведае.

Табе які брэнд больш падабаецца?

- Дольче і Габбана, - вымавіла яна. – Мне многа чаго падабаецца, але ж яны – самыя ўражваючыя. Іх ні зь кім не пераблытаеш. Мне нравіцца гэтае іх уменьне спалучаць высокае і нізкае, чалавека і Бога, рабіць Бога больш чалавечным, і царкву з'ядноўваць з карнавалам вуліц, а карнавал узьнімаць да ўзроўню царквы. Гэта ўсё глядзіцца драматычна, і ў іх вобразах шмат жарсьці.

Яна выйшла з кухні, прыслухваючыся. Што яны нясуць там? Ён што, звар'яцеў? Мужык абмяркоўвае з малалеткай нейкія паказы. Дольчегабану. Зусім у гэтых алігархаў дах зносіць ад грошаў.

- А может он - гей? – раптам прыйшло ёй на вум.

Менавіта так! Як яна адразу не здагадалася. Канешне, і сярод звычайных шмат любіцелей розных вычварнасьцей, але ж гэты – точна гей. І таму ён трахнуў яе туды, і дзяўчына ў яго болей нагадвае яго дачку, чым жонку. Ну ня можа ў нармальнага мужыка паўстаць на такую бледную немач. У яе ж ад сілы першы памер, а можа – і нулявы. Плоская, як даска. Ні сьпераду, ні з заду. Задаволенная сваёй здагадкай, пакачваючы сьцёгнамі, яна падышла да іх.

- Пожалуйста, как вы просили. Яна паставіла талерку на стол перад імі. Ад выпечкі ўзьнімаўся прыемны салодкі водар. Вафлі са сліўкамі і джэмам.

- Ого. Ён узьняў на яе вочы. І хутка ізноў на яе забыўся – нешта прыйшло ў тэлефоне.

- Дзякуй вялікі, Марыся. Вы – сапраўдная багіня кухні. Летыцыя ўсьміхнулася. Узяла вафлю, адкусіла, і закрыла вочы.

- Як смачна! А кавы можна?

- Можно, конечно.

Калі яны ўжо нап'юцца? Раз дзесяць за дзень яна ўжо рабіла гэтую каву, то ёй, то яму, то, вось, ім абодзьвум.

Ён прачытаў паведамленьне, і паглядзеў у бок дзьвярэй, быццам бы кагосьці чакаў.

- Да нас сёньня госьці, каханая, - вымавіў ён. – Прыедзе чалавек, якога ты ня ведаеш, але ж гэта ён дапамог мне, даўшы інфармацыю аб тым, што адбылося, і прыпыніўшы працэс, наколькі ён мог, каб даць мне з'ехаць. Ён дужа рызыкаваў, і, на жаль, нешта ўсё ж такі адбылося. Баюся, што яго выкрылі. Я быў абавязаны даць яму прытулак, і таму пэўны час ён будзе жыць тут.

- Канешне, каханы. Я буду рада яго ўбачыць. Яна глянула на яго. Яе тварык сьвяціўся такой натуральнай прыгажосьцю, што ў яго ад замілаваньня выступілі сьлёзы. Гладкія густыя валасы пабліскваліў паўзмроку. У холе было цемнавата, толькі імітацыя полымя ў каміне, ды сьвятло кухні асьвятлялі іх твары. Ды яшчэ – маленькі ліхтарык-сьвечка на стале побач з планшэтам, які яна запаліла. Ён узьняў яе руку, і паднёс да вуснаў, кранаючы губамі яе мяккую скуру. Яго губы дакрануліся да яе пальцаў, і ён правёў па губам імі, а потым асьцярожна ўзяў вуснамі, адчуваючы, якія яны салодкія.

- У цябе салодкія пальчыкі, - вымавіў ён, трымаючы яе руку.

- Гэта ад вафлей. Яна ўсьміхнулася. – У цябе, пэўна, таксама.

- Паспрабуй. Ён крануў яе вусны рукой, і адчуў яе язык на сваёй скуры. Яго раптам кінула ў жар, і, як заўсёды, нешта ўзьнялася да самай рэзінкі штаноў.

- Марк хутка прыедзе. Ён ужо праехаў Фларэнцыю, і цяпер будзе праз якіх дваццаць хвілінаў. Ці нават меней. Уставай, мы хуценька.

Яна ўзьнялася. Ён узяў яе за руку, і павёў у цемры па лесьвіцы на другі паверх, не запальваючы сьвятла. Луна таямніча сьвяціла ў высокія, на два паверхі, арачныя вокны – ноч была сьветлай.

Не даходзячы да пакою, ён прысланіў яе да сьцяны калідору. Яе вусны, такія ж салодкія, як і пальцы, сутыкнуліся зь яго

вуснамі. Яго дыханьне апальвала яе, як і заўсёды, ён быў прагным, ён быў нецярплівым.

- Павярніся. Яго голас быў хрыплым, нягромкім. Рукі ляглі ёй на сьцёгны. Яна павярнулася тварам да сьцяны, адчула, як яго рука кранае яе, як ў яе уваходзіць яго плоць, і прыкрыла вочы. Вакол было цёмна, але ж яна жадала бачыць нябачнае, тое, што адбывалася зь ім і зь ёю цяпер, калі сусьвет вакол ізноў зьнік, і засталіся толькі гэтыя яго рухі, цяжкое і гарачае дыханьне ля яе шыі. Яна ледзь стрымлівала ўскрык, і яго рухі рабіліся ўсё хутчэйшымі, усё больш нецярплівымі, настойлівымі. Нарэшце, ён выліўся ў яе, выйшаў, і прытрымаў яе ўлоньне рукой.

- Каб цябе не запэцкаць, - ціха вымавіў ён. Яна стаяла, адкінуўшыся на яго плячо галавой і цяжка дыхала.

Унізе нарэшце пачуўся гук адкрываючыхся дзьвярэй. Ахову ён папярэдзіў, каб чалавеку не заміналі.

Нехта ў цёмным прайшоў у пакой, і зьняў з галавы капюшон, застаўшыся ў кепцы, якую праз імгненьне таксама зьняў, і стаў разгублена пасярод холу. Ён нахінуўся цераз парэньчы, і крыкнуў уніз:

- Марк, я тут, пачакай. Зараз.

Абцёр руку аб майку, якую зьняў, і кінуў на падлогу. Націснуў выключацель, і хол заліла яркім сьвятлом.

Чалавек прыкрыў рукой вочы.

Яны спусьціліся ўніз – ён, і яна за ім.

Чалавек павярнуўся, аглядаючыся. Яго позірк спыніўся на ім, на твары з’явілася ўсьмешка.

- Міхась! Колькі зім!

Ён усьміхнуўся, падыходзячы да яго.

- Адна, Марк. Толькі адна зіма. Вітаю, сябар.

Яны абняліся.

Жанчына стаяла за сьпіной чалавека, які цяпер абдымаў яго, закрытая яго шырокімі плячыма. Краем вока ён убачыў стройную постаць, якая моўчкі стаяла, не варушася, а потым тонкай рукой адкінула назад густыя, чорныя, як ноч, валасы. На жанчыне, дакладней, дзяўчыне, была апранутая танюткая атласная блюзка-сарочка ў колер яе малочнай скуры, толькі срэбная, і нешта струячаеся, атласнае вакол яе стройных ног. Яго нос адчуў тонкі кветкавы пах, крыху гаркаваты, крыху востры, як тонкае лязо, аб якое лёгка нядбайна парэзацца. Вялікія вочы жанчыны глядзелі на яго запытліва, мякка сьвяціліся, як і ўвесь яе прыгожы твар. Ён ня мог разьлічыць яго рысаў – толькі разумеў, што ён быў прыгожым. Як месяц, ці як сонца, ці – як зорка. Нешта такое, што не магло разбачыць, усьвядоміць яго вока.

- Вітай маю жонку, Марк. Летыцыя. Мужчына павярнуўся і працягнуў жанчыне руку. Яна падышла, і стала побач, яшчэ больш вылучаючыся на фоне яго аголенага цёмнага цела са жгутамі цяглаў, тонкая, і цяпер – маленькая, хоць яна і была высокай, разумеў ён. Амаль зь яго ростам.

- Марк. Вітаю вас. Раптам у яго перасохла ў горле.

Яна мякка ўсьміхнулася, і працягнула яму руку, якую ён асьцярожна ўзяў сваёй.

На яе глядзеў дзіўна знаёмы ёй мужчынскі твар – высокія скулы, шырокі падбародак, прамы нізкаваты нос, і густыя сьветлыя бровы. Адна зь іх была рассечана шнарам, які праходзіў збоч, і апускаўся на шчаку. Мужчына быў сярэдняга, у параўнаньні зь Міхасём, росту, але ж моцным, крэпкім, з шырокімі плячыма. Яны глядзелі адно аднаму амаль у вочы, ён быў толькі крыху вышэй за яе, але ж яна была на абцасах. На ім быў апрануты чорны джэмпер-худзі, і чорныя пацёртыя джынсы. Побач зь ім стаяў рукзак, які ён толькі што зьняў з плечаў – невялікі, бачна, што толькі самае неабходнае. Нешта стукнула ў яе грудзях – нешта старое, знаёмае.

- Яна ведае гэтага чалавека, - зразумела яна. – Заўсёды ведала.

- Дзе я магла яго бачыць? – запытала яна сама сябе, але ж услых нічога не сказала.

- Рада вітаць вас, Марк. Наш дом – ваш дом, - нарэшце вымавіла яна, усьміхаючыся.

- Золатка, мы тут паразмаўляем. Ты прабач, але ж нам трэба пагаварыць прыватна. Ён павярнуўся да яе.

- Канешне, каханы. Я ўжо зьбіралася спаць, - вымавіла яна.

- Ты лажыся, мы пасядзім яшчэ, уладкую госьця, і прыйду. Нікуды не зьбіраюся. Яго вусны кранулі яе шчаку.

Яна ўзьнялася ў пакой, яны ж прайшлі да канапы, і селі на яе, гледзячы адзін на другога.

- Як справы? – запытаў ён, вывучаючы вачыма твар сябра.

- Мяне выкрылі, - коратка адказаў Марк. – Часу было роўна столькі, каб сесьці ў машыну, і перасеч мяжу. Дзякуй Богу, пашаньціла. Не пасьпелі перадаць па базе. У мяне засталіся людзі, якія далі мне выехаць.

- Што там творыцца? – яго твар стаў цёмным, злым. Перакрыўленым нянавісьцю.

- Там? Як заўсёды. Звонку ціха, а знутры – жах. Праз аднаго нас таскаюць, дапрошваюць, і на паліграфе, і так. Запалохваюць. Вымушаюць даваць прысягу. Крывавую. Марк памаўчаў.

- Як гэта? – запытаў ён. Яго скулы хадзілі хадуном.

- Проста. Ты ж разумееш. Вымушаюць цябе катаваць чалавека, і ўсё пішуць на камеру. Каб потым выкарыстаць супраціў цябе. Калі не пагадзішся, то адразу зразумела – не добранадзейны.

- Ты не пагадзіўся? – зразумеў ён.

- Не. Я не пагадзіўся. Я жанчын не катую. Яго скулы таксама сьціснуліся, адзінае вока задзёргалася. Другое, прыкрытае

павейкам, здаецца, нічога ня бачыла, глядзела прама, быццам бы назіраючы нешта тагасьветнае, не даступнае вачам.

- І многа … каго? – нарэшце запытаў ён.

- Ты нават не ўяўляеш, колькі. Там сапраўдныя катавальні. Сьцены мокрыя ад крыві. Чалавека ламаюць так, што ён і падпіша, і скажа, што хочаш. Ды многа каго і катаваць ня трэба. Проста паказваюць ім кіно, і – усё. Мала хто ўпарціцца. Ты ж бачыў, сколькі жадаючых пакаяцца?

- Бачыў. Гляжу калі-некалі вашыя … нашыя каналы. І іхнія – таксама. А што ў іх робіцца? – запытаў ён.

- Што? Ці ж ты ня бачыш? Да вайны рыхтуюцца.

- Да яе ўжо колькі год усе рыхтуюцца. Толькі ці пачнецца? – ён пакачаў галавой. - Хоць бы не пачалася.

- Пачнецца. Марк прама глядзеў на яго. – Пасьля новага году. Дакладнай даты ня ведаю, але ж зь январа па март. Гэта ўжо сто працэнтаў, Міхал. Так што мы стаім на краі чагосьці страшнога. Гэта перавярне сусьвет. Ніхто не ўяўляе памераў гэтай вайны, і таго, чым яна абернецца для нас усіх. Гэта будзе трэцяя міравая.

- Марк, мне здаецца, ты перабольшваеш. Ён палажыў руку сябру на плячо. – Усё будзе так, як і было апошнія восем год. Ну, можа, пастраляюць крыху паактыўней.

- Не, Міхал. Яны нападуць. З той стараны таксама ведаюць, і рыхтуюцца. Ты не ўяўляеш, якія сілы падцягваюцца. Гэта будзе сорак першы.

- Марк, Марк. Ты заўсёды нагнятаеш. Я разумею, табе і Балканы, і Чачня дагэтуль сьняцца. Але ж як такое магчыма? У дваццаць першым стагоддзі, у центры Еўропы, і – ізноў вайна? Мы ж – не Ўсход. Не Сірыя.

Чалавек са шнарам горка ўсьміхнуўся.

- А чым мы лепей, Міхал? Мы для іх – наогул ня людзі. Для іх –

ніхто не людзі. Нават і яны самі – для сябе. Запытай у Фёдара, ён табе раскажа.

- Слухай, я разумею, чаго ты такі змрочны. Мы ж на сухую сядзім. Ён крыкнуў у бок кухні.

- Марыся!

Яна выйшла з кухні, і спынілася перад імі.

- Прынясі нам бутэльку віскі, два бакала, лёд, і закускі нейкай зрабі.

Яна моўчкі кіўнула, пайшла на кухню, дастала Блэк Лэйбл, бакалы, замарожаны ў форме лёд, палажыла на талерку картафляныя піражкі зь мясам, якія як раз дайшлі ў духавым шкафу, дадала міску з салатам з фарэльлю, і паставіла ўсё перад імі.

Мужчына са шнарам прысьвіснуў.

- Ого! Як тут у цябе … гасьцінна.

- А тое. Гаспадар усьміхнуўся. – Прафесіяналка. Нагатавала мне на цэлую роту. Добра, што ты прыехаў. Марыся, можаш ісьці. Ён махнуў рукой у бок кухні. - Пабудь пакуль там. Пачакай. Я цябе паклікаю.

Яны налілі па бакалу віскі, стукнуліся. Марк узяў піражок.

- Смачныя, - вымавіў ён.

- Ня блага. Ён таксама паспрабаваў. – Летыцыя лепш гатуе. Ня ведаю, чаму, але ж усе жанчыны гатуюць адное і тое ж па-рознаму. Дай ім аднолькавыя інгрыдыенты, адна зробіць так, што і сьвіньня есьці ня будзе, а другая – так што за вушы не адцягнеш. У Летыцыі ўсё – ідэальна.

- Гэта – таму, што ты яе любіш, - раптам вымавіў Марк. Само неяк сарвалася.

- Люблю, - пагадзіўся ён. – Як нікога і ніколі не любіў. Яго

позірк пацяплеў. – Насамрэч, яна цудоўная, праўда? Прыгожая, як у казцы.

- Пагаджуся. Марк нахіліў галаву. – Добра табе тут зь ёй?

- Добра, - вымавіў ён. – Толькі тут я адчуў сябе чалавекам. Вольным. На якога нішто ня цісьне, нічога не замінае жыць, і дыхаць. Тут – воля, Марк. Сапраўдная. І Бог тут блізка. Усё ж – Рым. Сталіца хрысьціянства. Мне тут падабаецца.

- Ня ведаю. Марк пацісьнуў плячыма. – Мне здаецца, Міхал, у гэтым сьвеце Бога наогул не засталося. І нашую краіну ён чамусьці пакінуў.

- Не блюзьнер. Бог нікога і ніколі не пакідаў. Гэта чалавек можа пакінуць Бога, а Бог чалавека – ніколі.

Яны ізноў узьнялі кубкі, і выпілі – па поўнай.

- Ведаеш, а я ў фільме здымаюся. Разам зь ёй. Ён адкінуўся на сьпінку канапы, адчуваючы яе прахалоду голым торсам.

- Здорава! А што за фільм? Каго ты там іграеш? – пацікавіўся Марк. Віскі расслабіла яго, крыху адпусьціла напружанасьць мінулых дзён. Ён разумеў, што сапраўднае асэнсаваньне стрэсу яшчэ наперадзе, цяпер у яго было нешта накшталт шокавага стану, у якім усё здавалася звычайным, простым, не істотным.

- Бога. Ён наліў яшчэ па кубку, і сабе, і сябру. У галаве ўжо зашумела, але ж прыемна.

Раптам Марк рассьмяяўся.

- Слухай, а можа, я памёр, і трапіў у рай? І ты там вітаеш мяне, дранікамі зь мясам частуеш.

- Ага. Ён зарагатаў.

Яны яшчэ гаварылі аб нечым, аб усім, што прыходзіла на вум. Хутка галасы і рогат сталі громкімі. Нарэшце, яна выйшла, каб забраць талеркі, і, можа, яны што захочуць яшчэ.

Марк таксама распрануўся па пояс. Кандыцыянер дуў холадам, але ж ім было сьпякотна.

- Сьвет прытушы. Раптам ён заўважыў яе. – Там выключатель, наверсе.

Яна ўзьнялася, і шчоўкнула клавішай на сьцяне. Хол пагрузіўся ў цемру, толькі камін гарэў.

- Хадзі сюды, прафесіяналка, - пачула яна зьнізу.

- Прыбяры, і пацеш госьця. Ён адвёў яе ў бок, і дастаў з кішэні пару сотняў еўра.

- Спаць яго завядзеш на другі паверх, побач са мной пакой. Там усё гатовае, і ложак засланы. Калі скажа застацца, заставайся, толькі каб раніцой я цябе бачыў на кухні ў прыстойным выглядзе. Зразумела? Ён глянуў на яе вачыма, якія ў паўзмроку выглядалі амаль чорнымі. Яго валасы пасмамі зьвісалі на лоб, грудзі блішчэлі ад поту. Ён стаяў роўна, але ж было бачна, што добра п’яны. Спрачацца зь ім у яе не было ніякай ахвоты. Да таго ж, грошы ён пакінуў адразу.

– Сотня – час, - нарэшце, сабраўшыся, яна глянула яму ў вочы.

Ён усьміхнуўся, і дастаў яшчэ банкноту – пяцьсот еўра. – Табе авансам. І за раніцу, хоць ты тады і на еўра не напрацавала. Ён сплюнуў на падлогу. – Радуйся, што чужы чалавек тут. Малі Бога. Сучка.

- Марк, ты выбачай, я пайду. Ты не саромся, усё, што жадаеш. Гэтая ноч твая.

Павярнуўся, і пайшоў, хістаючыся, па ступеньках.

Яна падышла да чалавека са шнарам, і апусьцілася на калені, адчуваючы яго рукі на сваіх плячах. Яна нават не разбачыла яго твар, калі разшпільвала яму джынсы. Раптам ёй захацелася, каб гэта быў той, другі. Яна хацела стаць яго рабой, кім заўгодна для яго. І, адначасова, ёй было так блага, што хацелася плакаць.

Глава 28: Кола

Сусьвет нагадваў кола. Здавалася, зь яго не было выйсьця.

- Дзевачка мая любая, як я жадаю цябе. Яго рукі краналі яе грудзі, асьцярожна, быццам бы ён баяўся паламаць крохкую рэч – такім пяшчотным здавалася яму яе цела. Там, за сьцяной, Марк цяпер гэтую трахае … прафесіяналку. А ён – тут. З жанчынай, якую кахае. І якая кахае яго, і будзе кахаць яго любым, вечна. Які ж ён усё ж такі шчасьлівы. Яго галава кружылася. Можа, і сапраўды ня трэба столькі піць. Можа, яна правая. Канешне ж правая, як і заўсёды. Яна – яго сумленьне, яго ідэальная, яго найлепшая і найпрыгажэйшая, і ўсё, усё, што ён робіць, гэта дзеля яе. Каб яна прачыналася раніцай у гэтым утульным пакоі, глядзела на марскі захад, піла добрую каву з дарагой машыны, каб яна апраналася, як каралева, якой яна для яго і была. Каб увесь сусьвет лажыўся да яе ног. Што ён яшчэ мог зрабіць для яе? Яна казала, што ёй патрэбны толькі ён. Але ж хіба любіла б яна яго, калі б ён ня быў мужчынай – такім, якім ён быў зараз? Які можа абараніць яе, прывесьці яе ў свой дом, стварыць ёй жыцьцё-казку. Для яе, не для самога сябе. Навошта яму гэтая віла, гэтае ўсё, калі б тут не было яе? Ён бы жыў у майстэрні, і высякаў бы з мармуру вобразы, якімі б запаўняў сусьвет. Але ж цяпер яна з’явілася ўяве, і вось, ён высякае сусьвет дзеля яе. Той, які лічыць яе годным. У якім яна будзе шчасьлівая.

- Дзевачка мая прыгожая, анёлак мой, сонечны мой зайчык… Яна ўздрыгвала пад яго рукамі, аддаючыся яго пяшчоце, яго ласкам, яго жаданьню, якое заўсёды абуджала ў ім яе цела. Як гэта можа быць, і як яно адбылося, што ён мог бы зараз прыгласіць хоць зь дзясятак такіх, накшталт Марысі, толькі ў некалькі разоў даражэйшых, і вясёла праводзіць час, як Фёдар ці іньшыя, падобныя яму, бо ж у яго цяпер грошы, і, па ўсім меркам, не малыя, а яму ніхто не патрэбны акрамя яе, і ніколі ня быў патрэбны. Што гэтыя грошы? Сьмецьце і пыл, і пекла, калі застанешся зь імі ў адзіноце. Хіба каханьне за грошы можна назваць каханьнем? Хіба ж яно можа прыносіць

задавальненьне такое, як яму зараз прыносіць яна, нічога асаблівага ня робячы, проста ўздрыгваючы ў яго руках і прыціскаючыся да яго, абдымаючы яго за шыю, слухаючы ўсе тыя глупствы, якія ён ёй кажа, сьвятыя для яго, і яе, бо ж зь кім яму яшчэ гаварыць так шчыра, так улюбёна, з такой гарачынёй і палкасьцю, як ня зь ёю? З бабай, якая кажа яму – сто еўра гадзіна? Ёй, каханай, ён аддаў за імгненьне жыцьцё, і працягвае яго аддаваць кожны момант, кожнае імгненьне вечнасьці, у якой ён жадаў бы апынуцца зь ёй, ніколі не раз'ядноўваючыся там, па-за межамі - дзе няма межаў ні жаданьню, ні асалодзе.

Таму і Фёдар яе жадае, і ўсе астатнія, бо ўсе яны хочуць мець тое, што ні за якія еўра не купіш – няма на сьвеце такіх грошаў, каб яе купіць, купіць яе пяшчоту, яе гарачыню, яе закаханыя вочы, якія глядзяць, як зоркі, адчыняючы шлях у адвечнасьць. Няма такога на сьвеце, і ня будзе, на што можна было вымяняць гэтае шчасьце, але ж вось – яму яно дасталося дарма. Ці ж ён годны яе? Ці ж ён лепшы за таго ж Фёдара, ці каго яшчэ? Такі ж самы, а можа, і горшы. Значна горшы, ён быў упэўнены. Ды вось жа, Бог яму яе паслаў, адкрыў яму праз яе самога сябе.

Як гэта можа быць, што ён кахае яе так узьнёсла, ідэальнай, узвышанай любоўю, якой няма месца на гэтым сьвеце, і ў той жа час яго грубае цела з'ядноўваецца зь ёй, бярэ яе, пэцкаючы яе чысьціню, і, каб атрымаць задавальненьне цела, ён прычыняе ёй боль, вымушае яе цярпець яго плоцкасьць, яго цялеснасьць, якія жывуць па сваім уласным, зусім не нябёсным законам. Каб засьведчыць сваё каханьне і ўладу над ёй, кансуміраваць зямны шлюб, ён робіць зь ёй тое, што зараз Марк робіць з той шлёндрай, і іх целы адчуваюць нешта аднолькавае ў той самы момант, якім скончваецца ўсё, нават і самае прыгожае каханьне, і непрыгожая зямная жарсьць, і просты блуд. Але ж вось – ён адчувае яе сьвятой, і сябе – святым праз яе, а з той бы адчуваў сябе скотам, які апусьціўся ніжэй за нізкае, і якому няма апраўданьня і прабачэньня.

Ён і трахнуў яе па-гэтаму, каб мець магчымасьць ачысьціцца тут, з той, каго сапраўды кахае, каб апусьціцца, і ўзьняцца, каб зразумець, што ён мае, і чаго ён зусім ня варты, але ж, вось, Бог явіў яму гэтую міласьць нават і ў яго нядасканаласьці, у брудзе,

каб ён зразумеў, што ён мае, і што будзе, калі ён згубіць яе.

Узяўшы тую, ён яе прынізіў, але ж яе, каханую, ён браў, каб узвысіць і яе, і сябе. Адное і тое ж дзеяньне, і адначасова – і грэх, і сьвятасьць. Немагчыма гэта ўявіць, але ж яно так бывае. Як можа ацаніць прыгажосьць неба той, хто ня ведаў бруду зямлі, і адчуць асалоду ўзвышаньня, уваскрошаньня, калі не памёр для сьвету?

Радасьць вызваленьня – найвялікшая радасьць, і радасьць сустрэчы пасьля разлукі ня можа параўнацца з роўнай, спакойнай радасьцю таго, што не знаходзіў, таму што не губляў.

Магчыма, у гэтым і ёсьць сэнс існаваньня сусьвету – каб губляць, і бясконца знаходзіць, імкнучыся да таго, што гэтаму сусьвету не належыць, атрымаць гэта, і заставацца тут, балансуючы на кропцы над безданьню, прылагаючы шалёныя намаганьні, каб не апусьціцца туды, адкуль узьняўся, і не згубіць тое, што атрымаў – сапраўднага сябе самога.

Ён ляжаў, накрыўшы яе рукой, на якой пабліскваў цяжкі гадзіньнік. Час ужо быў недзе паміж позна і рана. Яго валасы зблыталіся, дыханьне было цяжкім, хрыплым. У колькі ён прыйшоў? Спачатку яна ня спала, думала, дачакаецца, але ж потым паснула, і амаль адразу прачнулася ад яго крокаў – няўпэўненых, што часта было апошнім часам. Цяпер жа гэта была не бутэлька каньяку, а нешта больш істотнае, бо ж прыехаў сябар, і да таго ж – у стрэссе, які зараз здымаў за сьценкай. Ён прыйшоў узбуджаны – алкаголем і размовай, моўчкі апусьціўся на яе, ахапіў яе рукамі, прыцягнуў да сябе яе цела, якое выгіналася ў яго руках, як вада, што агінае граніт, расступаючыся, і ізноў змыкаючыся хвалямі. Яго вусны блукалі па ёй, убіраючы яе скуру, яе грудзі, не разьлічаючы, прагна насычаючыся кожным яе кавалачкам. Ён казаў ёй словы каханьня, быццам бы размаўляў сам з сабою, быццам бы яе тут і не было, і ён мог казаць усё, што хоча, бессаромна, выкрываючы перад самім сабой сваю душу.

Яе тут не было, і ў той жа час яна была, аддавалася яго рукам,

яго губам, яго плоці, а сам ён быў недзе далёка, у самоце бясконцасьці, дзе адчайна жадаў яе, і ня мог задаволіцца тым, што тут, на зямлі, зь ёй з'ядноўвалася яго цела. Ён быў на зямлі, а яна была на небе, і той, хто быў на небе, прагнуў зямлі, а той, хто на зямлі – нябёсаў. Яна ж была адвечна недасяжная для абодзьвух, і тым самым выклікала шалёную прагу і ў Бога, і ў чалавека. Толькі чалавек мог увайсьці ў чалавека, атрымаць жа чалавека поўнасьцю, і душой і целам, ня мог нават і Бог, навечна застаючыся аддзеленым ад свайго стварэньня, адвечна на дыстанцыі памерам у асалоду, каб мець магчымасьць праз сваё жаданьне нарадзіць тую радасьць, якая не магчымая пры поўным зьліцьці, анігіляцыі, забойстве. Хай прыгажосьць жыве, і хай жыве каханьне. Бог, прагнучы забойства як найвялікшага зьліцьця ў адзінае, праглынаючы аголеныя душы, Кронас, ахвяруючы сам сабе сваіх дзяцей, і ізноў нараджаючы іх, становіцца Богам-ахвярай, адкрыўшы ў сабе радасьць самазабойства, адрачэньня ад самога сябе дзеля аб'екту свайго каханьня, поўнага растварэньня ў ім, а не яго – у сабе, тое, дзеля чаго ён і стварыў гэты сьвет – каб ахвяраваць сябе яму, і таму ён прыйшоў сюды, каб ахвяраваць сябе ёй.

Яна пагладзіла яго зблытаныя валасы, кранула яго шчаку. Выбралася з-пад яго, і накрыла яго сабою. Паступова пачынала днець. За сьценкай заварушыліся. Хлопнулі дзьверы, і нехта спусьціўся ўніз па ступеньках.

Ён павярнуўся, і прыцягнуў яе да сябе.

- Ты чаго ня сьпіш, каханая? Рана яшчэ. Давай спаць. Яго рукі, цяжкія, прыціснулі да сябе яе цела. Ён не жадаў яе адпускаць, не хацеў спаць адзін, без яе. Яна адчувала шчакой яго мернае дыханьне. Хутка золак пачаў калыхацца вакол, раствараючыся ў ранішнім сну.

- Ну што, прафесіяналка, сняданак гатовы?

Ён спусьціўся ўніз па лесьвіцы, выціраючы валасы палаценцам, якое павесіў на плечы. Фенам карыстацца не любіў – ён што, жанчына? І так высахне. Прайшоў на кухню. Яна ўжо была на нагах, прыгатавала прама-такі гатэльны сьняданак – сьпечаная

бульба, пара салатаў, тушаная фасоля ў тамаце, зварыла сасіскі, пасмажыла яечню, і нават зрабіла дэсерт – шакаладныя мафіны.

Ён глянуў адабральна – малайчына.

- Добра стараешся. І наогул, баба ты добрая, Марыська. Толькі вось што ты з тварам зрабіла?

Склаўшы на грудзях рукі, ён аглядзеў яе. Вочы яго былі строгія, але ж вусны ўсьміхаліся.

- Слухай, ну проста сьмешна, ей-Богу. Ты ў якую камедыю на кастынг гатавалася?

- Ни в какую комедию я не готовилась, Михаил Альгердович. Яна ўжо вывучыла яго імя па бацьку.

- Просто это красиво. Вам же самому нравится, признайтесь.

- Мне?! Ён глянуў на яе зьдзіўлена, і раптам рассьмяяўся.

- А чаму ты так вырашыла, даражэнькая?

- Ну, вы же меня на работу взяли. Яна паціснула плячыма.

- Калі б мне падабавался, я б цябе ракам не разьвярнуў. А ўзяў я цябе, таму што ты гатуеш добра. І жанчына ты крэпкая, выносьлівая. Спартыўная. Ён агледзеў яе, як скакавую лошадзь, ссунуўшы бровы.

- Як спалося? На пяцьсот еўра адпрацавала? Што там госьць?

- Спит. Яна паціснула плячыма.

- Ну, хай сьпіць. Ты прыбяры, абед прыгатуй, і вячэру, і можаш ісьці да заўтра. Выхадны табе за работу.

- Зачем? Я могу и остаться. Яна зьдзіўлена глянула на яго.

- Ня трэба. Ён раптам стаў змрочным, строгім. – Калі я кажу – ісьці, значыць ідзеш, і не запытваеш. Тут ня ты вырашаеш, што

трэба, а што – нет.

Ён узяў з вазы яблыка, адкусіў, хлопнуў яе па азадку, і сеў за стол, на якім ужо ляжалі газеты – і італьянскія, і New York Times.

Бегла прагледзеў. Яна паставіла перад ім чашку кавы, ён, ня гледзячы на яе, узяў і адпіў глыток. Закурыць бы. Але ж Летыцыя будзе ругацца. Ну і правільна. Няма чаго ёй дыхаць тытунём. Калі толькі ў вакно. Ён устаў, адкрыў фортку. Запаліў цыгарэту, і зацягнуўся. Зьверху пачуліся лёгкія крокі маленькіх ног. Ён з жалем глянуў на цыгарэту, зацягнуўся апошні раз, і кінуў акурак у ракавіну.

Яна ўвайшла на кухню, пацягваючыся, у белай атласнай піжамцы з ружовымі карункамі – як анёлак. Абняла яго за шыю.

- Ты што, курыў? Ізноў дома?

Нахмурылася.

- Я забыўся. Прабач, любая. Вось, убачыў цябе, і адразу ўспомніў, што нельга. Яна пакачала галавой. Ён прытрымаў яе крыху долей, чым тое было патрэбна, каб яшчэ крышачку адчуваць яе цела насупраць.

Рушнік вісеў за ім на сьпінке стула. Яна заўважыла.

- Марыся, убярыце, калі ласка. Сама падышла да кава-машыны, і хутка ў чашку зацурчэў духмяны напой.

- Як спалося, дарагая? Ён, усьміхаючыся, глядзеў на яе з-пад мокрых пасмаў, якія спадалі на лоб.

- Дзякуй, каханы. Спалося добра апошнія тры гадзіны. Дагэтуль нешта не спалося. Ён рассьмяяўся – радасным, хлапечым сьмехам.

- І хто ж табе спаць не даваў, цікава? Ды жартую я, любая. Хочаш, я табе паслужу?

- Паслужы. Яна ўсьміхнулася. Ён устаў, узяў вялікую талерку,

наклаў па кругу ўсяго, што было прыгатавана, зь яйкам у сярэдзіне, і паставіў перад ёй.

- Пакуль усё ня зьеш, нікуды не пушчу.

Мабільнік збоч ад яго на стале пачаў вібрываваць, а потым надарваўся мелёдыяй. “Сьлёзы дракона”, Брус Дыкінсан. А дагэтуль стаяла “Я вольны” Кіпелава. Толькі яна гэтую песьню не ўпадабала. Ды і сапраўды, які ж ён вольны? Найвярнейшы раб. Ён глянуў на яе, і ўсьміхнуўся.

Яна з апетытам ела, па чарзе кранаючы вілкай зробленае ім каляровае кола, і пры гэтым нешта лістала ў тэлефоне. Хай есьць, наядаецца.

Праслухаўшы часткова песьню, нарэшце ўспомніў, што трэба адказаць.

На тым канцы пачуўся хрыплаваты з прасоньня голас Марка.

- Добрай раніцы. Як ты?

- Галава баліць. Марк, было чутна, і сапраўды пакутваў. Ён хацеў запытаць, як яму прафесіянальныя паслугі за 100 еўра ў час, але ж глянуў на Летыцыю, і праглынуў словы.

Размова не для дзіцячых вушэй.

- Любая, ты што рабіць зьбіраешся сёньня? – запытаў ён.

- Я? Ня ведаю … Яна паціснула плячыма. З плечыка звалілася брэтэлька. Яна хацела паправіць яе, але ж ён яе апярэдзіў.

- З’езьдзі ў Пізу, прагуляйся. Ён працягнуў ёй картку. Тут пара тысячаў. Хопіць? Кіроўцу вазьмі. У кафэ схадзі якое. Купі сабе нешта. Я да абеду буду заняты, і паразмаўляць трэба. Ты ня крыўдзішся? Ён глянуў на яе, адвёў валасы з ілбу.

- Канешне, хопіць, каханы. І не на адзін раз. Яна пацалавала яго.

Ён хацеў працягнуць размову, але ж на тым канцы ўжо

адключыліся. Яна ледзь сконьчыла есьці, і як раз паўстала, каб ісьці, калі Марк спусьціўся з лесьвіцы, і прайшоў праз хол, амаль сутыкнуўшыся зь ею у праёме кухні.

- Прабачце, я вас не заўважыў, - вымавіў ён хрыплавата. Яго твар і валасы былі вільготныя – толькі што з душа. Апрануты ён быў сінюю майку і блакітныя джынсы – прывёз з сабой зьмену адзеньня.

- Нічога страшнага, я ужо амаль сышла. Яна ўсьміхнулася. – Да пабачэньня! Яна махнула яму рукой. Міхась выйшаў за ёй ззаду.

- Пачакай, сонейка. Хадзі сюды. Дай, я цябе пацалую. Ты на мяне не крыўдзішся?

- Нікольки. Яна абняла яго. – Можа, толькі крышачку.

- Гэта будуць мужчынскія размовы, табе не да спадобы. Ён крануў вуснамі яе лоб.

- Глядзі мне, будзь асьцярожнай. Адна не хадзі. Куды ты паедзеш?

Яна назвала назву гандлёвага цэнтра.

- Нешта я ўжо хвалююся, што цябе адпусьціў. Калі што, звані. Доўга ня будзь.

- Не хвалюйся, каханы. Я нядоўга.

- Да абеду, як я і казаў. У две гадзіны каб была дома. Ён глянуў на часы. Было каля дзесяці.

Яна пайшла наверх апранацца, ён жа вярнуўся на кухню, дзе Марк ўжо сядзеў за сталом.

- Што, блага? – запытаў ён яго.

- Ня тое, каб дужа дрэнна, але ж можна і паправіць.

- Вось і я кажу. Ён наліў дзьва кубка – яму і сабе, і схаваў

бутэльку. І сапраўды, хопіць п’янства. Тры дні – яшчэ тое-сёе, а чатыры – гэта ўжо крок у запой.

- Ну, як ты, у цэлым? – запытаў ён яшчэ раз.

Марк узьняў на яго вочы.

- Як бяздомны, без радзімы і працы. Быццам толькі што на сьвет паявіўся.

Ён кіўнуў.

- Гэта блага, я разумею. Слухай, калі ты бяз працы, у мяне для цябе ёсьць прапанова.

- Якая? – вочы Марка запытальна глянулі на яго.

- Кансультаваньне. Ёсьць чалавек, яму патрэбны паслугі такога эксперта, як ты.

- У чым? Марк працягваў глядзець на яго.

- У тым, чаго нам нікому б не хацелася. Чалавек гэты зараз у Маскве, і, мяркую, яму як раз спатрэбіцца твая дапамога. Я магу зь ім паразмаўляць.

- Паразмаўляй.

- Добра. Ён узьняў кубак, і яны стукнуліся.

- Дарэчы, як ноч прайшла? – запытаў ён.

- Як? Спаў. Марк усьміхнуўся.

- А пяцьсот еўра? – ён узьняў на яго вочы.

- Міхась, якія пяцьсот еўра. Я адрубіўся адразу, як лёг. Ня ведаю, што яна там са мной рабіла. Ну а так, нічога. Жанчына як жанчына. У цемры было лепей, - раптам дадаў ён.

Ён імгненьне глядзеў на яго, а потым пляснуў далонямі па сьцёгнам і зарагатаў.

Марк рассьмяяўся таксама.

- Аферыстка! А мне сказала, што адпрацавала, - нарэшце вымавіў ён.

- Ну, можа, яна і адпрацавала. Толькі я ня бачыў – кажу ж, спаў. А вось гатуе яна добра.

Марк паддзеў відэльцам кавалак селядца. І адкуль ён тут з'явіўся? Заказала, пэўна. Ён жа казаў – хоча шубы.

- Яе ззаду нічога так, можна. Сьпераду я б таксама не рызыкнуў. У мяне б не паўстаў. А ззаду твару ня бачна.

Марк пакачаў галавой. – Ня ведаю. Па мне, дык хай ежу лепш гатуе.

- Ну, значыць, будзе працаваць на адну стаўку. Ён узяў мабільнік, і набраў нумар – Фёдар.

- Федзя, добрай раніцы! Чалавек тут у мяне ёсьць, мяркую, табе патрэбны. Па нашых справах. Ты ж повар у нас? Ну дык вось, па поварскіх. Ага. Шэф. Мішленаўскія зьвёзды. Тры. Так. Так. Добра. Разумею. Ён тут у мяне яшчэ тыдзень пабудзе. Можа – два. Мне яго кансультацыя таксама не перашкодзіць. А потым аддаю яго табе. Ты сам прыляціш? Разумею. Забераш яго?

Ну, усё. Дамовіліся.

- На працу я цябе ўладкаваў! Ён хлопнуў яго па плячы. – І, мяркую, не на адну. Яго вочы сталі цёмнымі, змрочнымі.

- А на мяне ты папрацуеш, Марк? – раптам запытаў ён.

Глава 29: Венера

Жанчына, якая стаяла перад ім, была нібыта створана са сьвятла. Як танюткі сонечны праменьчык, вагаючыйся паміж сном і яўю.

Ён амаль абняў яе рукамі, калі яна ледзь ня упала на яго, выходзячы з праёму дзьвярэй, зь якіх за ёй выплываў прыемны кававы водар.

Тут усё было такім цёплым, утульным, дамашнім, што ў яго раптам зашчэміла сэрца. Апранутая ў кароткія шорты з карункамі і такі ж маленькі топ, з накідкай-халацікам на плячах, яна стаяла перад ім, гледзячы яму ў вочы. Без абцасаў яна была не высокая, ніжэй яго амаль на галаву, а Міхася – дык і болей. Метр семдзесят, прыкладна так.

Зусім маладая жанчына, можа, крыху за дваццаць. А можа – і меней. Калі б ня строгія, назіральныя вочы, яна б выглядала зусім падлеткам. Але ж вочы яе выдавалі. Вочы былі дарослыя. Можа, што і дужа. Гэты дыссананс такіх сур'ёзных, вялікіх, сумных вачэй на такім пяшчотным дзявочым твары ўразіў яго, быццам бы ўдарыў нажом у сэрца. Ён ужо бачыў раней такія вочы – у жанчынаў, там, у Босьніі, дзе яны стаялі міратворцамі, і ні ўва што ня ўмешваліся – не было каманды. Назіралі, як растрэльвалі, як гвалцілі, як катавалі, і рабілі выгляд, што іх гэта не датычыцца. Бо ж тыя, хто гэта рабіў, былі ўмоўныя – свае. Такія ж вочы ён бачыў і ў жанчынаў у Чачне, калі яны "віталі" іх, вызваляльнікаў. Ён пазіраў у іх вочы з брані бэтээру – бяздонныя, цёмныя. У іх не было нянавісьці, якая была ў мужчын. У іх нічога не было – праклён пустатой, які перасьледваў яго ў сьне. Яе ж вочы, вялікія і сумныя, поўніліся жалем, які плёскаўся ў іх, як мора, калі глядзіш у яго з борту у бінокль, быццам бы гэтыя хвалі зараз затопяць цябе – шэра-сінія, халодныя, манячыя ў глыбіню. Яго яны ўжо затапілі. Ён не ўсьведамляў – як. Быццам бы ён усё жыцьцё шукаў гэтых вачэй, якія зьліваліся для яго зь небам і морам, і не існавалі на зямлі, па якой хадзіў ён.

Жалобная Венера. Яе чорныя валасы – як галіны спаленага дрэва, і скура белая, як сьнег, на які праліваецца сьвежая чырвоная кроў яе вуснаў.

Яго сябру заўсёды шанцавала, - падумаў ён. – Канешне ж, нарадзіўся прыгожым. Жанчыны кахалі яго, шмат. Толькі ён нікога не кахаў, пакуль не сустрэў вось гэтую жанчыну. І тады суцэльна зьмяніўся. Ён ніколі ня думаў, ня мог нават і ўявіць, што Міхась можа быць пяшчотным, клапаціцца аб некім, што ён наогул можа паважаць жанчыну, шанаваць яе. Тут жа ён быццам бы звар'яцеў. Застаючыся такім жа шалёным і жорсткім, як ён і быў заўсёды, халодна-разважлівым, помсьлівым, небясьпечным, як драпежны зьвер, з ёй ён пераўтвараўся ў поўную працілегласьць самога сябе, як леў пераўтвараецца ў клапатлівага бацьку са сваімі кацянятамі, дазваляючы ім поўзаць па сабе, кусацца і бароцца.

Яго сябар ішоў заўсёды нейкім сваім шляхам – у ценю, праз цемру, выбіраючы абхадныя шляхі, рызыкуючы, парушаючы закон, які ён, Марк, заўсёды ўшаноўваў. Марк быў чалавекам прысягі, ваяром на службе. Для Міхася ж, здаецца, не існавала гаспадара.

– Нада мной – толькі Бог. Людзям я не служу, - часта казаў ён з усьмешкай. Хіба ж так можна ўзвышаць сябе? І вось цяпер – цяпер ён, здаецца, і насамрэч лічыць сябе некім накшталт Бога, які можа вырашаць лёсы іньшых. Гэты фільм яму зусім ня быў патрэбны, бо толькі ўзмацніў яго манію. І што ён цяпер натворыць, аднаму Богу вядома. Бо ў вачах яго ён ужо бачыў нянавісьць – страшную, зьнішчаючую ўсё вакол, бо запахла вайной і крывёю – той, што ён, насамрэч, даўно чакаў і жадаў. Ён ня ведае, што такое вайна. А ён, Марк, ведае. Ён жа нават не служыў, ня бачыў ніколі разшкамутаныя целы, абгарэлыя трупы. Адкуль у яго такая нянавісьць, дзеля якой ён гатовы бросіцца ў самае пекла гэтай непрыгляднай справы? Ён жа чалавек мастацтва, вучоны. Вось жыў бы сабе, і жыў.

Марк яго не разумеў. Але ж разумеў адное – цяпер, выкінуты тымі, каму ён верна служыў, і хто яму здрадзіў, страціўшы ўсё чалавечае, пазбавіўшыся і чэсьці, і годнасьці, пераўтварыўшыся ў гвалтаўнікоў і забойцаў уласнага народу, ён мог шукаць

дапамогі толькі тут, па-за межамі закону, дзе кожны – сам сабе закон, і сам сабе свой уласны Бог, наколькі дазваляе яму гэта яго сумленьне.

- У вайне ніхто і ніколі ня будзе правым, Міхал. Я ўжо казаў табе гэта, і скажу ізноў. Яны падымалі ўжо трэцьці келіх. Бутэлька ізноў з'явілася на стале – ну што ж ты тут зробіш.

- А што ты мне параіш рабіць? – сябар глядзеў на яго цяжкім, упартым позіркам, у якім раптам ён убачыў сапраўдны боль – такі ж, як і ў яго.

- Мяне пазбавілі радзімы, выкінулі, як сьмецьце. А ведаеш, за што? За тое, што я хацеў абараніць сваю жонку. Не даў яе застрэліць. І сябе ня даў застрэліць шалёнаму вар'яту, які ўявіў сябе Богам толькі таму, што ў руках яго быў ствол, а на плячах – пагоны. Хто ён такі, каб вырашаць чалавечы лёс? Нацкаваны пёс, сабака паганая. Не, Марк. Я – не халоп. І ніхто ў маёй краіне мяне ня мае права зьбіваць, настаўляць на мяне зброю, і вышвырваць вон. А цяпер у мяне не засталася іньшага выйсьця. Я буду выкарыстоўваць усе сродкі, якія толькі будуць магчымыя. І – не магчымыя. Ты мне тут, у Італіі, як прапануеш жыць? Каму тут патрэбныя мае скульптуры? Ну, здымуся я ў кіно. Выдам кнігу. І што? На колькі хопіць нам гэтых заробкаў? Я што, прывёз яе ў галечу? Узяў за сябе дзяўчыну на трыццаць год маладзей, каб яна тут са мной падыхала, як са старым сабакам? Не, сябар. Можа, я і не малады, але ж і не сабака таксама. Я – чалавек. І я буду змагацца за сваё, і яе жыцьцё. І буду помсьціць. А спіс у мяне длінны. І ты мне не перашкаджай. Сам-та ты як тут апынуўся – у мяне? Беглага? Дзякуй табе вялікі, што ты мяне папярэдзіў. Усё ж, ты – чалавек, не як тыя. Я на радзіме жыў – спакойна. Нікога не чапаў. За хлебам пайшоў. Яна пайшла. І што? Апынулася – бунтаўшчык. За што мяне цкаваць? За мастацтва? За мову? За тое, што не такі, як іньшыя? За маё імя, мае карані, маю веру? А хто, хто з вас вырашыў, якая на гэтай зямлі павінна быць вера? Якая мова? Хто тут такі апынуўся вышэй за Бога? Я не хачу баяцца, і не хачу, каб яна баялася. Там я маўчаў. Тут жа пачаў размаўляць. Там я ні радку ні напісаў, а калі б напісаў, то ніколі б ня выдаў. Тут жа я магу рабіць, што жадаю. Пісаць, выдаваць, гаварыць

тое, што мне хочацца. Гэтая краіна, Марк, ужо прышчэпнутая. Яна прайшла прышчэпку ад фашызму, вялікадзяржаўнасьці, таталітарызму – комплекна, амаль восемдзесят год таму. А дагэтуль – амаль сямнаццаць стагоддзяў. І цяпер гэтую заразу ізноў трэба скараняць. Усюды, дзе б яна не прарасла. Нажаль, няма такой прывентыўнай меры, вакцыны, якая б не дазволіла захварэць на гэтыя хваробы. І вось цяпер гэтая чума паўзе – цяпер з Усхода на Захад.

Таму ты мне патрэбны. Мне патрэбны людзі, каму я магу давяраць. Хто стане на маім баку. На нашым баку.

- Добра. Я стану на тваім баку. А што потым? – ціха запытаў Марк.

- Ты падумаў, куды ты рухаешся?

- Падумаў. Туды, адкуль няма выйсьця. Няма павароту назад. Бо я ведаю, што так трэба. Карфаген мусіць быць разбураны, як сказаў калісьці адзін з палкаводцаў. Delenda est. Разумееш?

- Разумею. Давай жыць сёньняшнім, Міхал. А сёньня – такі прыгожы дзень. Але ж не такі прыгожы, як твая жонка. Марк падняў келіх.

- І сапраўды, яна – прыгожая. І я яе кахаю. Ведаеш, гэта адзінае, дзеля чаго варта жыць. Ну, давай па апошняй. За каханьне, і хопіць. Ён таксама ўзьняў кубак, далучаючыся.

Вялікі гандлёвы цэнтр гудзеў народам. Магазіны і магазіньчыкі блішчэлі вітрынамі, запрашаючы паглыбіцца ў сябе.

Яна зайшла ў адзін зь іх - зь бялізнай, вядомага бренду, і спынілася ў захапленьні. Але ж цэны тут таксама былі захапляльнымі. Яна нядоўга вагалася, а потым працягнула руку к паўпразрыстаму гарсэту-боды, дасканала выраблену з вузкіх чорных палосачак, на якіх была расьцягнута празрыстая, як туман, тканіна. Прадаўшчыца ўпэўніла яе, што тканіна прочная, нейкі асаблівы трывалы шоўк. Натуральны. Цана была крыху болей за пяць сотняў еўра са зьніжкай. Яна ўздыхнула, а потым узяла яшчэ адзін такі ж - малочнага колеру.

Абодзьва глядзеліся проста ваў. Ей падабалася, як гладка, далікатна сядзіць рэч, як яна акрэсьлівае тела, робячы яго яшчэ больш дасканалым, аголена-апранутым, займаючы месца недзе паміж бялізнай і адзеньнем, выглядаючы ўразьліва, і разам з тым - стрымана, адстранённа, ствараючы дыстанцыю, нагадваючы скульптуру ці прыгожую парцалянавую ляльку, да якой страшна дакрануцца, і лашчыць яе можна толькі вачыма, баючыся нядасканаласьці рук, якія ня годныя, каб крануць гэтае хараство.

Яна купіла абодьзва - і сьветлы, і цёмны, аддаўшы крыху меней за тысячу еўра. У яе засталася яшчэ тысяча. Яна ўзяла на пару сотняў нейкіх дробязяў, зайшла яшчэ ў аптэку, надбаўшы тое-сёе з касьметыкі, у выніку ў яе засталося 500 еўра, і яна вырашыла, што хопіць.

Агледзелася, і села за столік невялічкага кафэ. У чаканьні кельнёра адкрыла тэлефон, праверыла паведамленьні. Напісала яму:

- Усё добра, каханы! Я ўжо справілася. Зараз пап'ю кавы, і дамоў.

Імгненна прыляцеў адказ:

- Малайчынка. Чакаю. І маленькая ружа ў дадатак.

Яна лайкнула ружу, адлажыла тэлефон, і паднесла да вуснаў кубак з кавай. Адламіла лыжачкай кавалачак пірожнага.

Зрабіла глыток мінералкі.

- Сіньера, буон джорно! Нон о аспетто леі інконтраре. П'ячере міо!

- П'ячере! Яна ўзьняла вочы. Перад ёй стаяў мужчына - на дзіва, у сьпякоту апрануты ў касьцюме. Тёмная-шэрая, амаль чорная тканіна, белая кашуля, хрусткая, як крохкі сьнег, бяз краваткі, разшпіленая ля горла. У выразе бачны залаты ланцужок, ня тоўсты і не танюткі - у самы раз. Такі, на якім носяць крыж, што часта бывае ў італьянцаў у адрозьненьне ад іньшых еўрапейцаў,

які схаваўся недзе глыбей пад кашуляй.

Твар мужчыны - вуглаваты, зь вялікімі вачыма пад выразнымі ўзьнятымі бровамі, з прамым крупнаватым носам, быў надзіва сьветлы, быццам бы і не паўднёвы, толькі крыху крануты залацістым загарам.

Яго цёмныя, крыху хвалістыя валасы былі акуратна пастрыжаны і зачэсаны назад, толькі непаслухмяная пасмачка, паблісквачы ад гелю, выбівалася на лоб.

- Non ai riconoscerme? Don't you recognize me?

Ён перайшоў на ангельскую мову.

На хвіліну яна зьбянтэжылася, а потым успомніла - гэты чалавек быў зь імі на сустрэчы ў Рыме. Яна ня дужа разглядала яго, і ён толькі пару разоў зьняў акуляры-авіятары.

Цяпер жа ён стаяў перад ёй, працягваючы візітку, і пільна, без усьмешкі глядзеў на яе.

Раптам яна адчула струмень холаду, якім падзьмула ад кандыцыянера, і яе аголеным плячам стала зябка. Яна пацягнулася за піньжаком, як быццам бы гэтая паўпразрыстая карункавая абарона магла стварыць паміж ёй і ім надзейную заслону. Ён апярэдзіў, і ўзяў яе жакет сам, накідваючы ёй на плечы. Зрабіў гэта так лоўка, што яна і не заўважыла. Як і тое, што яе рука між волі ўзяла візітку, якая цяпер ляжала перад ёй на глянцавай паверхні сталу.

- Джаваньні Гамбіні. Ён назваў імя.

- Мы з вамі сустракаліся ў Рыме, белла донна. Вось, убачыў вас тут, і вырашыў засьведчыць маю павагу. Вам, і вашаму супругу.

Ён працягваў глядзець на яе, вывучаючы. Тонкая, паўпразрыстая, як эльф, жанчына, нібыта створаная з паўночных сьнягоў і нябёсаў, з халоднай сьветлай скурай, вачыма, як крохкі шэры лёд над цёмнай вадой зрэнка, пакрытая густым вэлюмам доўгіх чорных валасоў, якія лашчылі яе вузкія плечы.

Яе адкрытая белая блюзка-сарочка рабіла яе паўаголенай, падкрэсьліваючы танюткую талію ў мяккім поясе высокіх штаноў, перацягнутым шаўковай лентай.

Жанчына выглядала кранальнай і безабароннай. Уразьлівай. - Што яна робіць тут адна? - падумалася яму.

Ён ніколі б не адпусьціў ад сябе такую жанчыну.

- Я выбачаюся, што вас спалохаў, - вымавіў ён. - Проста заўважыў, і вырашыў падыйсьці. Прабачце, калі патурбаваў вас.

Ён усьміхнуўся - аднымі вуснамі.

- Нічога. Нарэшце, яна справілася сама з сабой, і ўсьміхнулася тасама.

- Дзякуй за візітку. Сёньня дужа сьпякотны дзень, а тут я зьмёрзла. Яна зябкавата павяла плячыма, аглядаючыся вакол.

- Гэта небясьпечна, - пагадзіўся ён. - Сіньёра павінна берагчы сябе.

Словы нечакана прагучэлі як пагроза. Ён асекся, нібыта зьбянтэжыўся. Яна таксама маўчала.

- Было прыемна сустрэць вас, прыгожая донна. Яшчэ раз дазвольце мне пасьведчыць сваю павагу вам і вашаму супругу. Перадайце яму, калі ласка, што Джаваньні Гамбіні быў рады знаёмству зь ім. І з вамі, таксама.

- Канешне, я перадам. Яна кіўнула. Ён нахіліўся, каб пацалаваць ёй руку. На імгненьне ўзьняў на яе вочы – халодныя, сінія, як лёд.

- Сінія вочы ў італьянца … дзіва! – падумалася ёй.

- Прабачце, але ж вы выглядаеце не зусім, як мясцовы, - нарэшце вымавіла яна.

- Вы хочаце сказаць, я не падобны на італьянца? – ён усьміхнуўся.

- Не зусім так. Падобны, але ж у вас ёсьць нешта іньшае, тое, што адрозьнівае вас. Яна ўзьняла на яго вочы. Вочы гэтай жанчыны, вялікія, прыгожая, быццам бы высмоктвалі зь яго душу. Зьнянацку ён зьбянтэжыўся – сам таго не чакаючы.

- Нейкая іньшая кроў, - памарудзіўшы, дадала яна. Раптам яе вочы ізноў сталі цёмнымі, як шкло ў начным пакоі. Здаецца, за імі заблішчэлі зоркі – быццам бы ён заглянуў у чорную бездань нябёсаў.

- Вы правы, прыўкрасная донна. Мае продкі прыехалі з поўначы. Сямейнае паданьне кажа, што аднекуль зь Літвы. Ня той, сучаснай, а старой – якая распрасьціралася значна далей. Але ж у мяне ёсьць і мера італьянскае крыві. Прыкладна на чвэрць.

- Як цікава! – вымавіла яна. – Ведаеце, мы як раз – адтуль. Са старой Ліцьвы, як вы кажаце. І ў майго мужа нават некалі быў уласны замак. Раптам яна спыніліся, і засьмяялася.

- Што я кажу, прабачце! Замак належыў яго сям'і, і гэта было дужа шмат часу таму, калі дакладна, то ў пятнаццатым стагоддзі. Ён са старога княскага роду, літоўскага, толькі ня кажа пра гэта. Ён казаў мне, што сам знайшоў рэшткі будынку, і саборна-кляштарнага комплексу. Усё гэта потым засьведчылі архіёлагі. Ніхто ня ведаў, што ў тых мясьцінах быў замак. Толькі ён. Там проста ляжаць камяні ў лесе. Але ж, калі прыгледзешся, то яны ня проста ляжаць, а робяць аснаваньне, і пад ім у часе раскопак была знойдзена крыпта. А ў ёй – старыя косткі ў рацы, мужчынскія і жаночыя. Пахаваньне было зафіксавана ў дакументах, і пакінута, як ёсьць. Ён папрасіў не разбураць, бо ж – сямейная каштоўнасьць. Яны нават рабілі аналіз ДНК, і так і апынулася.

- Няўжо? Ён сапраўды зьдзівіўся.

- Ведаеце, мне было б цікава паразмаўляць з вашым мужам пра гэта, - нарэшце вымавіў ён.

- Ці можаце вы папрасіць яго, каб ён са мной зьвязаўся, калі будзе час?

- Я, канешне, магу …, - яна раптам замаўчала. - Але ж я ня ведаю, можа, я распавяла нешта лішняе. Пра яго. Прабачце.

- Я разумею. Ён кіўнуў.

- Зробім так. Вы проста дадзіце яму візітку, і скажаце, што я дужа жадаў бы з вамі сустрэцца. Што я сам расказаў вам, што мае продкі з вашых мясьцінаў – дарэчы так і было. Вам не абавязкова распавядаць яму ўсю нашую бяседу. Калі, канешне, вы не палічыце гэта патрэбным. Але ж на вашым месцы я б не баяўся, донна. У тым, што вы расказалі, няма нічога асаблівага, таго, што я ўжо ня ведаў. Выбачайце за маю адкрытасьць, але ж калі вядзеш з чалавекам справы такога ўзроўню, то пра яго трэба сабраць як мага болей інфармацыі. Мы ведаем і пра яго, і пра вас, і чаго вы з'ехалі з краіны. Можа, ведаем тое, што і вы ня ведаеце пра саміх сябе. Але ж ваш супруг добра дасьведчаны, донна. У гэтым вы можаце быць упэўнены. Ён і ведае, і магчымасьцяў мае значна болей, чым вы можаце ўявіць.

- Я ведаю гэта, Джаваньні. Раптам яна назвала яго імя. Яно прагучэла ў яе вуснах пяшчотна, і неяк журботна. – Ведаю, што ён нават і болей, чым просты чалавек. Чым чалавек … Раптам яна перарвалася, спыніла самое сябе на палове слова.

- Канешне, я перадам яму ўсё, што вы папрасілі. Дзякуй яшчэ раз. Яна ўзьнялася.

- Мне і сапраўды пара ісьці. Ён чакае мяне. Тэлефон як раз пачаў сьвяціцца ў яе руцэ. Загучэла мэлёдыя.

- Пачакайце імгненьне. Я зараз адкажу.

Яна прыклала апарат да вуха.

- Так, каханы. Я ўжо зьбіраюся дамоў. Так, у кафэ. Затрымалася, так. Я сустрэла сіньёра Гамбіні. Не старога, не. Маладога. Яна рассьмяялася, але ж раптам яе твар стаў сур'ёзным, нават напалоханым. Так, тут. Зараз я перадам яму трубку. Пачакай.

- Вас, - амаль шэптам вымавіла яна, працягваючы яму тэлефон. Яе рука дрыжэла.

- Пронто, - адказаў ён.

На тым канцы мужчынскі голас марудна раняў словы.

- Калі. Нешта. Здарыцца зь ёй. Я. Цябе. Заб'ю. Я папярэдзіў.

- Прабачце, сіньёр Міхал. Я проста сустрэў вашую жонку ў кафе. Яна ўжо зьбіраецца дамоў. Я сапраўды быў рады ўбачыць яе, і перадаць вам свае самыя цёплыя пажаданьні, і шчырае прывітаньне ад маёй фаміліі. Яна распавесьць вам болей, сама, але ж няма нічога, каб вам трэба было турбавацца. Я праважу яе да дому. Так. Я паеду побач, і прасачу, каб ніхто яе не патурбаваў. А потым я жадаў бы сустрэцца з вамі, сіньёр. Па прыватнаму пытаньню. Не па нашых справах. Гэта датычыцца асабіста мяне. Зьвязана зь сямейнай гісторыяй. Так, мне здаецца, у нас ёсьць нешта агульнае. Я быў бы рады прыватнай сустрэчы. Добра. Я як раз вымушаны пакінуць краіну на некалькі тыдняў. Калі вярнуся.

Ён працягнуў ёй апарат.

- Ваш супруг дужа любіць вас. Хвалюецца. Гэта нармальна. Я сам бы так сябе адчуваў … калі б у мяне была такая прыгожая жонка, як вы. Ён усьміхнуўся – аднымі вачыма, і крыху – вугалкамі вуснаў.

Яна ўзяла трубку. Хвіліну маўчала.

- Так. Так, каханы. Усё хораша. Я ўжо выходжу. Праз хвілінаў дваццаць. Добра. Не, я даеду. Ня трэба за мной ехаць. Я буду на сувязі.

Добра, ня буду класьці трубку. Яна хутка пайшла да машыны, размаўлячы на хаду.

- Купіла? Да, бялізну. Прыгожую. Пакажу. Яна усьміхнулася. – Канешне. Відэа? Вось, глядзі. Уключылася камера тэлефона. Яна як раз садзілася ў машыну. Кіроўца закрыў за ёй дзьверы, і павярнуў ключ. Вялікае чорнае аўто руханулася ззаду.

- Добра, добра. Хутка буду.

- Калі ласка, можна ехаць хутчэй? Мой муж хвалюецца, - запытала яна кіроўцу.

- Ноў проблем, донна. Той ударыў па газах, і машына ірванулася наперад, хутка выехаўшы з паркоўкі. Чорны “Мерседес” Джаваньні тронуўся за імі ззаду на адлегласьці.

На павароце да вілы ён прымарудзіў, і крыху адстаў, спыніўшыся, каб яго было бачна за дрэвамі. Яны заехалі на двор. Хуценька выбраўшыся з машыны, яна прайшла праз терасу ў лобі. Яны сядзелі з Маркам на канапе, вакол было накурана так, што хоць тапор вешай. На стале стаяла бутэлька віскі. Другая валялася на падлозе. Акрамя іх нікога не было – Марыся сышла, як і было дамоўлена.

- А памятаеш? – пачула яна. – … у Прышціне … да, малады быў. … Навошта гэтае ўсё. … яна добрая жанчына, Міхал, але ж … не … у мяне не было выйсьця …

Ён раптам устаў, заўважыўшы яе, і руханўўся наперад. Яна спынілася з пакецікам у руках, гледзячы на яго разгубленымі вачыма.

- Я прыехала, - ціха вымавіла яна, але ж болей сказаць нічога не пасьпела.

Ён зрабіў крок, і абняў яе. Ахапіў, як мядзьведзь. Яна так і застыла ў яго руках, з пакупкамі, якія трымала.

- Навошта я цябе адпусьціў? Я месца сабе не знаходзіў. Ужо думаў за табой ехаць. Што ты са мной робіш? Ён трымаў яе, прыцягваючы да сябе, яна нават не магла і паварушыцца.

- Каханы, я толькі ў магазін зайшла, і ў аптэку. А потым сустрэла гэтага чалавека…

- Не ў табе справа, любая. Ён сутаргава сьцінуў яе, а потым крыху адсунуў, і заглянуў ёй у твар.

Яго вочы зазіралі ў яе вочы.

- Я болей ніколі і нікуды цябе адну не адпушчу. Выбачай, але ж

гэта цяпер так. Лічы што свабоды ты пазбаўлена поўнасьцю і цалкам. Гэта – дзеля тваёй жа бясьпекі. Яго вусны прыціснуліся да яе валасоў, якія ён гладзіў – доўгіх, спадаючых па сьпіне.

Яго рука была вялікай, і няўпэўненай. Толькі цяпер яна адчула, што ён дужа крэпка выпіў - ізноў.

- Каханы, - ціха вымавіла яна. – Не хвалюйся. Я ўжо тут. І болей нікуды не паеду без цябе.

- Я не хвалююся, любая. Я розум згубіў. Думаў, звар'яцею, пакуль цябе не было. Ён трымаў яе ў абдымках, прыціскаючы. Нарэшце, адпусьціў яе, і запытаў з вусьмешкай.

- А што ты за бялізну купіла? Пакажаш?

- Пакажу. Яна узьняла пакецік.

- Колькі, не запытваю. Лепей скажы, грошы засталіся?

- Пяцьсот еўра, - горда вымавіла яна.

- Ну, добра. Будзе на што жыць. Ён шырока ўсьміхнуўся.

Узяў яе за руку, і падвёў праз пакой да канапы. Марк сядзеў там, і, здаецца, размаўляў сам з сабой.

- Слухай, я пайшоў. Адпачываць. Ты, калі хочаш, сядзі. Хочаш – што хочаш рабі. Прафесіяналкі няма, жалка. Ён раптам змоўк на паў-слова.

- Ня трэба яна. Я неяк сам. Марк устаў, хістаючыся. – Пайду я ў пакой, таксама. Тэлевізар пагляжу. У цябе ж спутнік?

- Так. Ён кіўнуў. – Расею 24 магу знайці табе. Магу АТН.

- Не ўжо, дзякуй. Я сам штосьці знайду. Для дарослых які канал. Ці спорт. Марк працягнуў яму руку.

Яны ўзьняліся разам па лесьвіцы, і разьвіталіся перад іх пакоем. Марк прайшоў далей па калідору, і зьнік за дзьвярыма.

Ён адчыніў дзьверы, падхапіў яе на рукі, і ўнёс унутр.

Апусьціўся на ложак разам зь ёй, трымаючы яе на руках.

- Ну, што там у цябе, паказвай. Ён зацікаўлена глядзеў на яе.

- Закрый вочы, - папрасіла яна. – І не адкрывай, пакуль я табе не скажу.

Ён падпарадкаваўся.

- Гатова.

Яна стаяла перад ім у празрыстым топе-гарсэце, і чулках, якія таксама купіла. У тонкую, ледзь заўважную сетку. Клясыка. Абрала для дэманстрацыі чорны топ.

- Яшчэ – такі ж белы. Толькі я ня ведаю, які лепш. Яна глянула на яго запытальна.

- Падыдзі сюды, - вымавіў ён.

Яна наблізілася. Яго рукі ахапілі яе сьцёгны, вусны прыціснуліся да грудзей, ледзь прыкрытых празрыстымі чашкамі.

- Лепей як зараз, - ціха вымавіў ён. - А яшчэ лепей – без нічога.

Яго рука правяла па яе таліі, апусьцілася ўніз.

- Як яно здымаецца? – запытаў ён.

- Там, у нізе, засьцёжкі. Кнопкі, - ціха вымавіла яна. – Разшпільваюцца.

- Дзе ў нізе? – не зразумеў ён.

- У самым нізе, - адказала яна, адчуваючы, як яго рукі гладзяць яе цела.

- Ах вось яно што, - вымавіў ён. … У самым нізе… яго рукі асцярожна разшпілілі тонкую тканіну, адсунулі бялізну ў бок.

Ён глядзеў на яе – прама ў вочы, і яна апусьціла позірк, каб сутыкнуцца зь яго рукой, якая асьцярожна дакраналася да яе.

- Хадзі сюды, - ціха вымавіў ён, і яна палажыла рукі яму на плечы.

Яго вусны цалуюць яе - мяккія, уладныя, рукі абдымаюць яе, і яна закрывае вочы.

Цяпер ён належыць толькі ёй. Нікому больш не належыць. Ні сябрам, ні партнёрам, ні кнігам, ні чамусьці ці камусьці яшчэ. Не належыць нават і самому сябе - ён увесь тут для яе, і дзеля яе, так, як і яна - для яго. Гэты сон можа дліцца вечна, таму што ён - адзіная рэальнасьць, і ўсё астатняе - сон у параўнаньні зь ім. І наогул - нічога няма, акрамя гэтага сну, рэальнасьці ў сьне, і сьненьняў ў рэальнасьці, калі калышыцца завеса ад дакрананьняў яго рук і губ, ад яго подыху, а потым ён зрывае яе, як адзеньне, якое падае да яе ног, і яго твар паўстае перад ёй - чысты, ачышчаны ад усяго, што яму не належыць. А яму належыць толькі ён, як і ёй - толькі гэтае яе аголенае цела і яе душа, празрыстая перад яго позіркам, трапяткая, як полымя маленькай сьвячы, якое захінае ад ветру яго рука.

Сваімі вуснамі ён раздувае з крохкага вугалька жарсьць, і распальвае ў ёй касьцёр, трывалае полымя, у якім гарыць ён сам - гарыць бясконца для яе, як і яна гарыць для яго.

Тут, на гэтым ложку, іх целы зьліваюцца так, як і іх душы зьядноўваюцца, і ўсё вакол іх і ў іх робіцца чыстым, як быццам бы толькі што нарадзілася ад Бога: і яны самі, і іх пачуцьцё, якое і сапраўды боскае, існуючае ў Ім, і зь Ім.

Ён заўсёды такі жаркі, і ніколі - халодны, ён апальвае яе, і яна ўскрыквае, не саромячыся, і не хаваючы сваіх пачуцьцяў, і свайго жаданьня яго, ад якога яна шчасьлівая, і якое толькі ён можа ў ёй задаволіць.

Яго вусны прыціскаюцца да яе цела, блукаючы па ім, убіраючы, адчайна насычаючыся ім, і, здаецца, ня думаючы, як задаволіць яе, ап'яняючы яе сваёй шчырасьцю, прагай, улюбёнасьцю, і тым, што стаіць за гэтым усім - каханьнем, якому няма межаў.

- Стань жыцьцём для мяне, - шэпчуць ёй яго вусны. Стань узвышаньнем і прабачэньнем, стань распяцьцем для майго цела і пакараньнем, і выратаваньнем для маёй душы, стань той, хто мяне прымае цалкам і поўнасьцю, хто адсякае ад мяне ўсё зямное, як скульптар адсякае залішняе ад каменнай глыбіны, каб зь яе нарадзілася анёльская істота - душа, зьяднаная з духам.

Ты маё шчасьце, ты - маё сьвятло, ты - мая шчырасьць, мая сіла і мая слабасьць. Няма нічога па-за межамі цябе, і табе належыць ўсё, што ёсьць ува мне. Прымі мяне цалкам, такога, як я ёсьць, адзінага і непадзельнага. Прымі мяне целам, прымі душою і духам, які ёсьць ува мне, зямным і нябёсным, дасканалым і недасканалым, ведаючым і няведаючым, відушчым і сьляпым, бо ты ёсьць усё, і ў табе - усё, чым я жывы.

Яна прынікае да яго, і ён прыціскаецца да яе цела, быццам бы жадаючы зьліцца зь ёй у адзінае, увабраць яе назад, туды, дзе глыбока ля сэрца баліць раскрытая рана - былое рэбра, праз якую так лёгка дастае яго дзіда лёсу.

Ёй усё роўна, які ён, і яна любіць яго любога. Ад яго пахне віскі і табаком, і яго вусны маюць гаркаваты смак. Яго твар нахінаецца над ёй, і яна гладзіць яго густыя валасы, путаючыся ў іх пальцамі. Яны кранаюць яе твар, і ён закрывае яе вочы пацалункамі, шэпчучы ёй словы каханьня, захінаючы яе сабой. Яна абдымае яго шыю, гладзіць яго шырокія плечы, дакранаючыся да іх вуснамі, адчуваючы, як уздрыгваюць яго цяглы, як яны напружваюцца, і па ім ходзяць гарачыя хвалі. Ён шэпча:

- Дзяўчынка мая маленькая, як бы я жыў без цябе? Што б рабіў?

Ты - сонечны мой праменьчык, кветачка мая, мой маленькі анёлак...

Яго дыханьне робіцца цяжкім, і ён уваходзіць у яе, адчуваючы, як вакол яго сьціскваецца яе вільготная плоць. Яна ўскрыквае - ціха, а потым - усё грамчэй і грамчэй, быццам бы ёй не хапае паветра, і ён усё мацней і мацней уваходзіць у яе, стогнучы, з гукам, нагадваючым ільвіны рык, які пракатваецца громам па яе целу, амываючы яе дажджом сьлёз і семені, выліваючагася ў яе зь яго цела.

Яна кахае яго, а ён кахае яе, і нічога болей вакол не істотна. Толькі гэта мае значэньне для іх ў цэлым сьвеце. Гэтую праўду гаворыць яго цела, і яе цела адказвае яму шчырасьцю сваіх дакрананьняў, іх гарачынёй і пяшчотай, якія значаць больш словаў. Словаў цяпер няма, яны сталі залішнімі. Няма нічога. Толькі яны адны ў цэлым сьвеце.

Глава 30: Сяброўкі

- Ну, как у тебя дела, Маришка? Как устроилась?

Карына зь цікавасьцю аглядала яе ўсю - з галавы да ног.

Яна загадкава ўсьміхнулася, паставіла перад сабой на стол усыпаную крышталёвым пылам сумачку зь залатым лагатыпам сьпераду - GC, адна літара, уваходзячая ў другую, зьняла вялікія чорныя акуляры з GD на дужках, пабліскваючыя каменьчыкамі, і дастала з сумачкі маленькі ружовы флаконьчык с крышталам на крышцы. Пшыкнула ў дэкальтэ, пару разоў - на валасы, падумала, і яшчэ раз пшыкнула - на руку. І ізноў - у дэкальтэ.

- Оригинал?

Карына ўдыхнула паветра.

- Да, Турция. Они там для всех брендов разливают. Там самые настоящие. Я знаю место, там напрямую один араб продаёт. Не то, что наши подделки. И выгодно, всего лишь 50 евро вместо 100 за сотку. А если два берёшь, то по 30 евро. Прикинь.

Яна схавала флакон у сумку, спачатку дастаўшы адтуль касьметычку і каляровы партманет. Ізноў злажыла ўсё назад, ададвінула сумачку - літарамі ад сябе, і да Карыны - бокам, толькі залатая дуга паблісквала. Закінула нагу на нагу.

- І сумка у тебя классная. Гуччи?

Карына выгнула шыю лебедзем, скруціўшы галаву, каб разбачыць лагатып.

- Да, Гуччи. Есть один магазин, тут, на набережной. Там всё - брендовый сток. Всё настоящее, и всё за 100 евро штука. Прикинь. И ещё - подарок можно выбрать. Вот, я очки выбрала. Дольчегабана. Яна ўзьняла чорныя акуляры, і задаволена пакруціла перад сабой у паветры.

Каменьчыкі ярка бліснулі, сыпануўшы каляровымі блікамі.

- Слушай, а как твоя работа? Ты, наверное, хорошо зарабатываеш. Карына зь цікавасьцю пасунулася наперад.

- Да. Яна адкінулася на сьпінку, павяла плячыма, прыўзьняўшы грудзі, і глянула ўбок, быццам бы разглядаючы, ці хутка да іх падыдзе кельнёр. Потым, упэўніўшыся, што кельнёра няма, і ніхто наогул не зьвяртае на іх увагі, яна нахінулася пад стол, выцягнула папяровы пакет, і паставіла яго на паверхню перад сабой.

- Вот. Проставляюсь за удачное трудоустройство. Шампанское "Просекко". Самое настоящее. Элитное. Это я всё с премии купила. И духи, и сумочку, и шампанское, и ещё кое-что. И отложила, и своим ещё сотку послала. Они теперь месяц на неё жить будут. Так что, можешь меня поздравить. С работой все хорошо.

Яна з гонарам агледзела сяброўку. Тая пазірала на яе са шчырым захапленьнем.

- Ой, Маришка, какая ты молодец! Вот у тебя всегда все получается, не то, что у меня.

Карына апусьціла вочы, разглядаючы манікюр - новы, срэбны, даўжынёй у сантыметр.

Потым узьняла іх на сяброўку.

- А раскажи!

- Ну что тебе расказать? Яна лянiва пацягнулася, але ж было бачна, што пытаньне яе задаволіла.

- Всё. Карына ў захапленьні глядзела на яе.

- Мне всё интересно. Как ты здесь устроилась? Вот честно. Правда! Ты знаешь, я как со своим рассталась, дела как-то совсем не очень пошли. Деньги, что он дал, быстро кончились. Пришлось работать. Устроилась, вот, в ритейл. Правда, в Сефору взяли, в миланскую. Но платят, ты знаешь, немного. Да

и требования у них. Выглядеть нужно соответственно, зато можно забирать просрочку. Иногда можно заработать неплохо, но тут её никто не покупает, и я отправляю домой. Там Ольга распродаёт, только с неё деньги хрен выцарапаешь. За полгода 300 евро прислала. А тут эта просрочка даже неграм не нужна.

Яна рассьмяялася.

- Слушай, ну не тупи. Сроки можно легко перебить. Я знаю, как. Переклеить. Я тебя научу - всегда так у себя делала, ещё в Одессе когда была.

А устроилась - да, и правда неплохо.

Яна памаўчала, каб вытрымаць паўзу.

- У придурка одного богатого, и его жены придурошной. Готовлю, убираю, ну и ... яна томна ўсьміхнулася.

... пятьсот евро премия. За вечер.

- Ого! - зьдзівілася Карына. - Я столько надбавки в месяц имею при хороших продажах.

- Ну... это ж у тебя, в ритейле. А я-то на частное лицо работаю. Там расценки другие.

Яна шырока ўсьміхнулася, гледзячы Карыне ў вочы.

- А что за мужик? Раскажи. Прямо интересно. Голас Карыны зьвінеў ад нецярпеньня.

- Да алкаш. Придурок. Яна адмахнулася, нібыта адганяючы муху.

- Миллионер. И кобель, каких ещё поискать.

- Да ты что? А что, у вас что-то было? Карына была адначасова і ўсе вочы, і вушы.

- В первый же день. Яна паблажліва ўсьміхнулася.

- Ну и как? Как он тебе? Карына проста лягла грудзями на стол, адсунуўшы бакал "Прасекка".

- Как? Ничего особенного. Для меня. Но вот он впечатлился - сразу дал 500 евро. И сказал, что берёт на постоянку.

- За раз 500 евро? Карына, здаецца, не паверыла.

- Ну да. Сказал - я этого стою. Он бы и больше дал, нала с собой не было. Ну, ты понимаешь, за Это и больше можно было б.

- За Это? - перазапытала Карына, узьняўшы на яе вочы.

- Да, он по Этой части. Яна крыху паморшчылася.

- Слушай, ну ты больше бери. Это как-то ... стрёмно. Карына ўздрыгнула - знарок, і паціснула плячыма.

- Да я потом расценки повышу. И, ты знаешь, у меня другие планы. Не всю же жизнь у плиты стоять.

Кстати, жена у него дура полная. Набитая. Малолетка. Ничего не соображает. Она только за порог, он сразу меня трахнул.

- Так может, ты её место займёш? А что такого? Ты ж красивая, стильная. Прямо инста леди. Карына зацікаўлена глядзела на яе.

- А мужик - как? Ничего хоть? Не старый?

- Мужик не старый. Средний. Внешне такой, стрёмноватый. Здоровый, волосы цёмные, длинные, на цыгана похож.

Непонятный.

С бородой. Не как у попа - короткая.

- Может, восточный? Карына перадзёрнула плячыма.

- Ты с ним, смотри, осторожнее. Восточные все стрёмные. Конченые. Он ещё тебя прирежет. Или придушит.

Карына цяпер глядзела на яе напалохана, уважліва.

Яна на імгненьне замоўкла.

- А что за жена?

Карына вырашыла зьмяніць тэму.

- Ой, ни о чём. Яна махнула рукой.

- Никакая. Ну, с лица норм, такая миленькая. Глаза большие. Но никакой пластики, никаких уколов вообще. Натуральненько. Так, детский сад. Малолетка-старшекласница.

И худая, как скелет. Как модели. Прямо страшно. Груди нет, сзади плоско, бледная, руки и ноги тонкие, невысокая, кстати. Рост средний. Ну, не низкая, но и не дылда. Чуть выше метр семьдесят.

Волосы чёрные, длинные. До пояса. Тоже нерусская, видимо. По мне, на жидовку похожа. Я в Одессе таких видала - жидо-татары. Только эта и правда покрасивее.

Не знаю, где он её откопал. И имя у неё какое-то не русское. Летиция, - вымавіла яна старанна па складах, узьняўшы вочы.

- Летиция?! Карына вытарапілася на яе.

- Слушай, я их знаю! - нарэшце вымавіла яна.

- Ни хрена себе? Откуда? – зьдзівілася яна.

Цяпер Карына адчувала: прыйшоў яе час! Яна паблажліва ўсьміхнулася.

- Я много кого знаю. Особенно – миллионеров. Ты же помнишь, с кем я жила.

- Ну да. Яна паблажліва ўсьміхнулася.

